Беларуская
мемуарная бібліятэка

*Аляксандр Стагановіч*

# Успаміны пасла



Беларуская
мемуарная
бібліятэка

Аляксандр
Стагановіч

# Успаміны пасла

Мінск
«Лімарыус»
2011

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)
С 76

Серыя заснавана ў 2011 годзе

Прадмова
*А. В. Пашкевіча*

Каментары
*А. В. Пашкевіча, А. Э. Гардзіенкі*

Навукова-выдавецкая рада:
*Аляксей Каўка, Вітаўт Кіпель, Адам Мальдзіс, Мікола Нікалаеў, Віталь Скалабан, Алесь Смалянчук, Захар Шыбека, Лявон Юрэвіч*

**ISBN 978-985-6968-14-6**

© Стагановіч А. Л., 2011
© Пашкевіч А. В., прадмова, 2011
© Пашкевіч А. В., Гардзіенка А. Э., каментары, 2011
© ТАА «Лімарыус», 2011

# АДЗІН ГОД ЖЫЦЦЯ АЛЯКСАНДРА СТАГАНОВІЧА

## Партрэт на фоне эпохі

Агульнавядома, што мемуары — крыніца наколькі каштоўная, настолькі і спецыфічная. Далёка не заўсёды іх аўтар праз шмат гадоў пасля падзеяў здольны не паддацца спакусе паказаць іх у святле, больш выгодным для самога сябе, чым гэта было насамрэч. Не заўсёды такое рабілася наўмысна і з кепскімі намерамі — проста чалавеку фізічна ўласціва з гадамі на нешта забывацца, а нешта блытаць. Менавіта дзеля таго крытычнае стаўленне да ўспамінаў — неабходная ўмова выкарыстання іх у навуковых даследаваннях. Правільнае ж успрыманне любых мемуараў немагчымае без добрага знаёмства як з гістарычным кантэкстам той эпохі, якая знаходзіць у іх адлюстраванне, так і з асаблівасцямі біяграфіі іх аўтара.

Гэтыя словы я ўпершыню напісаў, рыхтуючы прадмову да не публікаваных раней успамінаў «На этапах» вядомага беларускага дзеяча Юрыя Сабалеўскага*. Сёння мушу іх прыгадваць зноў, рыхтуючы да друку мемуары Аляксандра Стагановіча, у пэўным сэнсе калегі Сабалеўскага, бо яму таксама давялося ў 1920-х гг. быць прадстаўніком беларускага насельніцтва ў польскім Сейме і таксама ўваходзіць у склад леварадыкальнай беларускай фракцыі, адно што толькі ў парламенце іншага склікання.

З Сабалеўскім, аднак, было трохі прасцей. Усё ж гэты дзеяч у 1920–1950-я гг. адыгрываў даволі прыкметную ролю ў беларускім нацыянальным руху, і дзеля таго пра яго жыццё захаваліся нейкія біяграфічныя даведкі, згадкі ў разнастайных дакументах і мемуарах — заставалася толькі іх крытычна пераасэнсоўваць і лагічна аналізаваць. Прозвішча ж Стагановіча

* Гл.: Пашкевіч, А. Адзін «этап» Юр'я Сабалеўскага // Запісы Беларускага інстытуту навукі і мастацтва. Вып. 31. Нью-Ёрк — Менск, 2008. С. 144–145.

ў беларускай гістарыяграфіі да нядаўняга часу ў найлепшым выпадку толькі згадвалася на самым апошнім месцы пры пераліку паслоў, якія прайшлі са спіса левարадыкальнага Беларускага сялянска-работніцкага выбарчага камітэта «Змаганне» ў польскі Сейм у сакавіку 1928 г.*, часам з прыпіскай, што ў 1929 г. ён быў заменены ў Сейме Паўлам Крынчыкам з той прычыны, што *«праяўляў ваганні ў правядзенні лініі кампартыі»***.

Прычына амаль поўнай адсутнасці да нядаўняга часу ў Беларусі звестак пра гэтую асобу вельмі простая. Стагановіч на паверхні заходнебеларускага палітычнага жыцця знаходзіўся вельмі нядоўга, усяго трошкі больш за год, калі быў паслом, і большую частку тэрміну сваіх пасольскіх абавязкаў сядзеў у польскай турме. Дзеля таго яго прозвішча калі часам і згадвалася ў афіцыйных дакументах ці ў беларускай прэсе, то толькі ў вельмі агульным кантэксце або ў сувязі з чарговым працэсам, на якім ён выступаў у ролі абвінавачанага. Нават у «Беларускім календары на 1929 год», у якім публікаваліся біяграфіі ўсіх абраных на сакавіцкіх выбарах 1928 г. сеймавых паслоў і сенатараў беларускай нацыянальнасці (інфармацыя з гэтага календара пасля стала важнай, а часам і адзінай крыніцай для напісання артыкулаў пра беларускіх паслоў і сенатараў у энцыклапедыях і даведніках), пра Стагановіча змясцілі толькі самыя агульныя звесткі з тлумачэннем, што *«аб грамадскай працы сваёй А. Стагановіч не мог даць рэдакцыі календара дакладных звестак, бо сядзіць у турме ў Горадні»****. Дзеля таго рэдакцыя выдання фактычна толькі перадрука-

* Гл.: Полуян, В., Полуян, И. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. Минск, 1962. С. 124; Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Т. 4. Мінск, 1975. С. 71; Bergman, A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej. Warszawa, 1984. S. 49.

** Гл.: Зелинский, П., Ракевич, Н. Печать КПЗБ в борьбе за свободу. Минск, 1977. С. 43; Полуян, В. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.). Минск, 1978. С. 70–71; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / под ред. А. Н. Мацко и В. Е. Самутина. Минск, 1966. С. 177; Мацко, А. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнёта буржуазии и помещиков (1918–1939 гг.). Минск, 1972. С. 137.

*** Беларускі календар на 1929 год. Вільня, 1928. С. 166.

вала кароценькую біяграфічную зацемку пра Стагановіча з афіцыйнага парламенцкага статыстычнага выдання, якая змяшчала выключна звесткі пра дату ягонага нараджэння (25 студзеня 1890 г.) і адукацыю (4 класы гімназіі)*. Пазней тое самае (з дадаткам звестак пра факт выбрання ў Сейм і потым адмовы ад мандата) пераказвалася і ў іншых нешматлікіх польскіх і беларускіх даведніках, у якіх з'яўляліся асобныя прысвечаныя асобе Стагановіча пазіцыі**. Толькі беларускі даследчык Вячаслаў Даніловіч і польскі гісторык Збігнеў Запароўскі ў свой час паспрабавалі прасачыць лёс гэтага дзеяча больш глыбока. Аднак падрыхтаваныя і выдадзеныя імі біяграмы таксама вельмі няпоўныя і маюць шмат фактаграфічных недакладнасцяў, пра што больш падрабязна скажам ніжэй***.

Цікава, што беларускія гісторыкі доўгі час нават не ведалі (а ў савецкі час, відаць, не надта і хацелі ведаць), які лёс напаткаў Аляксандра Стагановіча пасля адмовы ад пасольскага мандата. Нават у самай свежай працы аўтарства Вячаслава Даніловіча, якая выйшла ўсяго толькі 3 гады таму, ягоная біяграфія прасочваецца адно да кастрычніка 1929 г., калі той быў асуджаны на 6 гадоў зняволення за антыдзяржаўную дзейнасць. Дададзеную да сваёй манаграфіі біяграму Аляксандра Стагановіча Даніловіч завяршыў інфармацыяй, што той *«па адбыцці тэрміну зняволення займаўся сельскай гаспадаркай»*****. Між тым Стагановіч пасля пражыў яшчэ вельмі шмат насычаных падзеямі гадоў і нават актыўна займаўся беларускай дзейнасцю, праўда, ужо збольшага не ў Беларусі, а ў заакіянскай эміграцыі, у якой апынуўся пасля Другой сусветнай вайны. Пасляваенную біяграфію Аляксандра Стагановіча найбольш сцісла і дакладна выклаў у свой час у кароткім біяграфічным артыкуле даследчык беларускай

* Гл.: Rzepeссу, T. i K. Sejm i Senat 1928–1933. Poznań, 1928. S. 125.

** Гл.: Kto był kim w Drugiej Rzeczypospolitej. Warszawa, 1994. S. 434; Чарнякевіч, А. Постаці беларускага нацыянальнага руху ў Гродне 1909–1939 гг.: біяграфічны даведнік. Мінск, 2003. С. 219.

*** Гл.: Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.). Мінск, 2007. С. 152–153; Zaporowski, Z. Staganowicz Aleksander // Polski Słownik Biograficzny. T. 41. Z. 170. Kraków, 2002. S. 461.

**** Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі... С. 152–153.

эміграцыі Лявон Юрэвіч: *«Дзейнасць А. Стагановіча на эміграцыі была шматбаковаю: сумесна з А. Адамовічам, Ф. Кушалем, А. Кахноўскім, Ст. Станкевічам ды іншымі ён браў удзел у з'ездзе ў 1947-м годзе ў Остэргофене і выбарах Беларускага Нацыянальнага Камітэта, увайшоў ва Управу БНК, стаўся адным з закладнікаў аддзела Згуртавання Беларускіх Ветэранаў у Шляйсгайме ў 1952-м годзе, уваходзіў у Епархіяльную Управу, абраную на II епархіяльным з'ездзе духавенства і вернікаў БАПЦ у 1963-м годзе, быў актыўным сябрам БАЗА. У 1957-м годзе, калі Прэзідыум Рады БНР аб'ядналі з Радаю БНР, Аляксандр Стагановіч працаваў заступнікам прэзідэнта М. Абрамчыка ды кіраўніком сектара»*[*].

Памёр Аляксандр Стагановіч 28 снежня 1988 г., толькі месяц не дажыўшы да свайго 99-годдзя, і ўвайшоў у гісторыю не толькі тым, што пражыў найдаўжэй за ўсіх колішніх беларускіх нацыянальных прадстаўнікоў у міжваенным польскім парламенце ў абсалютным вымярэнні, але і тым, што ўсіх гэтых прадстаўнікоў перажыў фізічна (перадапошні з нешматлікіх ацалелых у часы сталіншчыны былых беларускіх парламентарыяў Павел Каруза памёр у Вільні незадоўга перад гэтым, 20 лютага 1988 г.). Але і пасля смерці асоба Стагановіча не выклікала адмысловай зацікаўленасці беларускіх даследчыкаў па абодва бакі акіяна, што і дало падставу Лявону Юрэвічу назваць яго імя забытым. Толькі не так даўно дачка Аляксандра Стагановіча, вядомая беларуская мастачка Тамара Стагановіч, падрыхтавала ўспаміны пра ўласных бацькоў, чым фактычна адкрыла імя бацькі больш шырокай грамадскасці[**]. Пры гэтым, як выглядае, сп. Тамара шырока карысталася і ўспамінамі свайго бацькі[***].

[*] Л. Ю. Забытае імя: Аляксандар Стагановіч // Беларус. 2003. № 492.

[**] Гл.: Стагановіч, Т. Пачаткі ў Амэрыцы былі вельмі цяжкія і балючыя // Адзінец, А. Паваенная эміграцыя: скрыжаваньні лёсаў: зборнік успамінаў. Мінск, 2007. С. 372–404.

[***] Да гэтага ў беларускай эміграцыйнай перыёдыцы друкавалася некалькі адносна невялікіх матэрыялаў Аляксандра Стагановіча палемічнага характару, якія ў значнай супені грунтаваліся на асабістых успамінах: Стагановіч, А. У абарону «Ўспамінаў» В. Рагулі // Бацькаўшчына (Мюнхэн). 10 жніўня 1958. № 29–30 (415–416). С. 3–4; Стагановіч, А. Да «Ўспамінаў» В. Рагулі // Бацькаўшчына. 7 лістапада 1960. № 47 (433). С. 3–4; А.-іч. Адказ С. Прытыцкаму // Бацькаўшчына. 7 лютага 1960. № 6 (490). С. 2; 14 лютага 1960. № 7 (491). С. 2.

Мэтай гэтай прадмовы таксама не з'яўляецца напісанне грунтоўнай біяграфіі Аляксандра Стагановіча, якая ахоплівала б усё ягонае амаль стогадовае жыццё. Дзейнасць гэтай асобы на эміграцыі з часам куды лепш даследуюць і дадуць ёй належную ацэнку тыя навукоўцы, якія непасрэдна займаюцца вывучэннем беларускай прысутнасці ў свеце. Тут жа будзе разгледжаны толькі адзін год з жыцця Стагановіча — ці не найбольш важны, які шмат у чым прадвызначыў яго лёс. Думаецца, што і сам Аляксандр Стагановіч лічыў той год, калі яму воляй лёсу давялося выконваць абавязкі беларускага пасла ў польскім Сейме і за гэта асабіста моцна пацярпець, найбольш значным у сваім жыцці. Нездарма ж і мемуары, якія друкуюцца ніжэй, маюць назву «Успаміны пасла», нягледзячы на тое што храналагічна яны ахопліваюць значна больш шырокі перыяд. У гэтых успамінах былы пасол даволі шырока апісаў свае тагачасныя перажыванні (і тым самым несумненна ўзбагаціў крыніцавую базу гісторыі беларускага палітычнага змагання ў складзе міжваеннай Польшчы), аднак жа правільнае іх успрыманне не заўсёды магчымае без разумення агульнага гістарычнага кантэксту, у якім адбываліся апісаныя падзеі. Таму на гэты кантэкст і звернем асаблівую ўвагу, асоба самога Стагановіча можа пры гэтым часам выступаць і на заднім плане дзеля адсутнасці ці абмежаванасці адпаведных крыніц.

Перыяд 1927 — пачатку 1928 г. быў асаблівым часам для развіцця беларускага нацыянальнага руху ў Польшчы. У студзені 1927 г. польскія ўлады нанеслі магутны ўдар па найбольш масавай тагачаснай заходнебеларускай арганізацыі — Беларускай сялянска-работніцкай грамадзе. Грамада, якая ў форме пасольскага клуба паўстала ў чэрвені 1925 г., пасля здзейсненага Юзафам Пілсудскім травеньскага перавароту 1926 г., набрала настолькі ашаламляльны тэмп развіцця, што праз паўгода колькасць яе афіцыйных сяброў дасягнула некалькіх дзясяткаў тысяч чалавек (паводле неафіцыйных звестак, заявы на ўступленне ў партыю паспелі падаць 100–120 тыс. чалавек). Адчуўшы ў гэтым для сябе вялікую небяспеку і небеспадстаўна лічачы, што ў арганізацыі і развіцці Грамады актыўны ўдзел бяруць камуністы, прытым не толькі мясцовыя,

але і мінскія ды маскоўскія, польскія ўлады вырашылі нанесці апераджальны ўдар і ў студзені 1927 г. правялі шырокамаштабныя арышты сярод грамадоўскага кіраўніцтва, пачаўшы з найбольш аўтарытэтных правадыроў партыі — сеймавых паслоў Браніслава Тарашкевіча, Сымона Рака-Міхайлоўскага, Пятра Мятлы і Паўла Валошына, а таксама іншых актыўных грамадоўцаў як у Вільні, так і на правінцыі. Партыя была фактычна абезгалоўленая, а 21 сакавіка 1927 г. распараджэннем міністра ўнутраных спраў увогуле пастаўленая па-за законам.

Такім чынам, саму Грамаду як легальную палітычную арганізацыю ўлады афіцыйна ліквідавалі, але гэта ўсё ж не вырашыла асноўнай праблемы. Уражвальны колькасны рост шэрагаў Грамады толькі ў малой ступені можна было патлумачыць падтрыманнем партыі (і не толькі маральным) з-за ўсходняй мяжы, хоць спакуса спісаць усё на гэты фактар у польскіх чыноўнікаў заўсёды існавала. Галоўнай прычынай грамадоўскага ўздыму было тое, што лозунгі, якія пашырала Грамада, патрапілі на надзвычай прыдатную глебу і знайшлі гарачы водгук у першую чаргу сярод вясковага беларускага насельніцтва. Грамадоўскі рух быў у значнай ступені стыхійны і неўсвядомлены, многія нават афіцыйныя сябры Грамады (не кажучы пра проста сімпатыкаў) не надта разумелі сутнасць яе праграмных установак, але тым не менш да яе далучаліся як да партыі, якая выступае супраць наяўнага стану рэчаў ва ўсіх галінах грамадскага жыцця — палітыцы, эканоміцы, культуры, адукацыі і г. д. — і дабіваецца радыкальных зменаў. Фактычна далучэннем да Грамады селянін заяўляў пратэст супраць тых парадкаў, якія склаліся ў Заходняй Беларусі падчас польскай улады — супраць павольнага і непаслядоўнага правядзення зямельнай рэформы без уліку інтарэсаў мясцовага насельніцтва, насаджэння вайсковага асадніцтва, занадта высокіх падаткаў і неабходнасці выконваць розныя павіннасці на карысць дзяржавы, усеагульных злоўжыванняў мясцовай адміністрацыі, асіміляцыйнай палітыкі ў галіне культуры ды адукацыі і г. д. Хтосьці з публіцыстаў хрысціянска-дэмакратычнай газеты «Białaruskaja Krynica», разважаючы неўзабаве пасля разгрому Грамады над гэтым пытаннем, пісаў, як падаецца, цалкам

слушна: *«“Грамада” ніколі не была арганізацыяй, збудаванай на грунце моцным, бо яе рост быў штучны, не натуральны, рост, каторы спужаў самых правадыроў “Грамады”. Быў гэта рост стыхійны, масовы, які ўзнік не на ідэалогіі “Грамады”, для масаў чужой, недаступнай, але на горкім расчараванні да Польшчы за яе беспраграмную і несправядлівую палітыку да беларусаў»*[*]. Сам перад сабой прызнаваў факт характэрнай для большай часткі сябраў Грамады малаідэйнасці нават адзін з яе галоўных лідараў, Сымон Рак-Міхайлоўскі, думаючы над гэтым пытаннем ужо ў турме: *«Грамада налічае да ста тысяч — сіла вялікая, каб яе ўдалося і быў час усведаміць і нацыянальна, і сацыяльна, і палітычна»*[**].

Рэпрэсіямі ўладам удалося трохі прыгасіць працэс браджэння заходнебеларускай вёскі, а павярхоўнасць нацыянальнай і сацыяльнай свядомасці большай часткі шараговых грамадоўцаў дазволіла правесці афіцыйную ліквідацыю стотысячнай арганізацыі малой крывёй, без асаблівых хваляванняў (вядомы заходнебеларускі паэт Валянцін Таўлай, сведка тых падзеяў, у аўтабіяграфіі акрэсліў гэтую сітуацыю па-мастацку вобразна і адначасова ёмка: *«Стыхія, пабурлеўшы, апала...»*[***]). Адзін з камуністычных дзеячаў[****], які адначасова працаваў у Таварыстве беларускай школы (ТБШ), характарызаваў у сваёй справаздачы наяўную сітуацыю так: *«Магутная арганізацыя (Грамада) без надляжачага кіраўніцтва пачынае пакрысе распаўзацца. Актыў — мясцовыя кіраўнікі — адыходзяць у шэрагі К[амуністычнай] П[артыі], самая шматлічбовая частка Грамады прымае нейкае невыразнае становішча — прытаілася і ціханька седзячы чакае, што будзе далей, адкуль чакаць небяспекі і як на*

[*] B. Byůšaja «Hramada» i wybary // Biełaruskaja Krynica. 16 lutaha 1928. № 14. S. 1.

[**] Рак-Міхайлоўскі, С. Турэмны дзённік / падр. да друку і прадмова А. Пашкевіча // Куфэрак Віленшчыны. 2007. № 1 (12). С. 56.

[***] Таўлай, В. Дакументы, успаміны, артыкулы. Мінск, 1984. С. 23.

[****] Даволі часта даводзіцца спасылацца на сведчанні камуністычных дзеячаў, асобы якіх дакладна высветліць не ўдалося. Звязана гэта з тым, што КПЗБ была нелегальнай партыяй, і таму дзеячы КПЗБ сваю карэспандэнцыю дзеля канспірацыі часта не падпісвалі ці падпісвалі псеўданімамі, далёка не ўсе з якіх сёння ўдаецца адназначна ідэнтыфікаваць.

*гэтую небяспеку рэагаваць, трэцяя частка — шпікі, канфідэнты і правакатары — звярнуліся нават туды, адкуль былі пасланы»**.

Аднак жа, нягледзячы на вонкавае затуханне актыўнасці былых грамадоўцаў, праблема масавай (ледзьве не ўсеагульнай) незадаволенасці польскім панаваннем на так званых крэсах заставалася па-ранейшаму нявырашанай і асабліва востра пачала праяўляцца з набліжэннем чарговых парламенцкіх выбараў, дату якіх прызначылі на 5 сакавіка 1928 г. у Сейм і на 12 сакавіка 1928 г. — у Сенат. Сумленнае правядзенне ўладамі выбарчай кампаніі магло прывесці да таго, што ў рэгіёнах, дзе ў свой час найбольш актыўна дзеяла БСРГ, большасць насельніцтва прагаласуе за выбарчы спіс той палітычнай сілы, якая зможа падаць сябе ў якасці пераемніцы ліквідаванай партыі. Улады былі рашуча настроеныя гэтага не дапусціць і рыхтаваліся актыўна задзейнічаць так званы адміністрацыйны рэсурс. На агульнапольскай канферэнцыі ваяводаў у студзені 1928 г. міністр унутраных спраў Польшчы Феліцыян Славай-Складкоўскі адкрыта заклікаў кіраўнікоў мясцовых органаў улады аказаць падчас выбараў усёмагчымую падтрымку спісу створанага незадоўга перад выбарамі праўладнага Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам (ББСУ). Ваяводы, у сваю чаргу, выдавалі цыркуляры павятовым старастам, у якіх таксама абавязвалі апошніх узяць актыўны ўдзел у выбарах на баку ўрада**.

Што тычыцца беларускіх дзеячаў, якія ў той час працавалі на тэрыторыі Польшчы, то ўсе яны таксама выдатна ўсведамлялі, што ключом для поспеху на выбарах (а гэта значыць, і да падвышэння сваёй уласнай палітычнай вагі) з'яўляецца заваяванне прыхільнасці былога грамадоўскага электарату. Шляхі для такога заваявання розныя дзеячы бачылі па-рознаму, таму беларускі рух у Польшчы, і ў грамадоўскія часы далёка не маналітны, да часу выбараў 1928 г. раскалоўся на мноства дробных груповак, якія часта трацілі больш часу на высвятленне адносінаў паміж сабой, чым на змаганне з агульным магутным праціўнікам

---

* Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 101. Арк. 189.

** Гл.: Czubiński, A. Centrolew. Kształtowanie się i rozwój demokratycznej opozycji antysanacyjnej w Polsce w latach 1926–1930. Poznań, 1963. S. 93.

у выглядзе польскіх як праўладных, так і апазіцыйных партый. Трапна акрэсліў сітуацыю ў заходнебеларускіх палітычных асяродках журналіст найбуйнейшай тагачаснай заходнеўкраінскай газеты «Діло», рыхтуючы для свайго выдання агляд выбарчых спраў у нацыянальных меншасцяў Польшчы: *«Найбольшы раскол, акрамя ўкраінцаў і яўрэяў, праяўляецца сярод беларускага грамадства... Развал, празмерная партыйнасць, асабістыя амбіцыі, прыкрытыя псеўдапраграмамі, нястача грамадска-палітычнай дасведчанасці — вось што кідаецца ў вочы сярод беларускага грамадства»**.

У выніку, нягледзячы на пэўныя няўдалыя і непаслядоўныя ініцыятывы з боку асобных дзеячаў, скіраваныя на стварэнне адзінага беларускага фронту, перад выбарамі 1928 г. беларускі рух падзяляўся на 4 асноўныя палітычныя лагеры:

1) Аб'яднанне Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД), Беларускага сялянскага саюза (БСС) і Беларускага праваслаўнага дэмакратычнага аб'яднання (БПДА), якія ішлі на выбары ў складзе Блока нацыянальных меншасцяў Польскай Рэспублікі, у якім аб'ядналіся, акрамя беларусаў, таксама прадстаўнікі асобных украінскіх, яўрэйскіх і нямецкіх партый;

2) Радыкальныя былыя грамадоўцы, якія праводзілі кампанію ў цесным саюзе з КПЗБ;

3) Беларускія нацыянальныя арганізацыі і дзеячы, якія выказваліся за больш памяркоўную пазіцыю ў адносінах з польскай дзяржавай і за пашырэнне культурна-асветнай працы сярод беларускага насельніцтва за кошт абмежавання палітычнай. З'яўленне такой плыні ў беларускім руху тлумачылася разуменнем часткі дзеячаў, што залішняя радыкалізацыя беларускага руху і ўсё большае апанаванне яго камуністамі выклікае ўзмацненне рэпрэсій з боку дзяржаўных органаў Польшчы ў дачыненні не толькі да палітычных, але і да культурна-асветных арганізацый. У той жа час было відавочным, што, нягледзячы на ўздым палітычнай актыўнасці беларускага сялянства ў 1926–1927 гг., да свядомай і паслядоўнай палітычнай барацьбы яно яшчэ не было гатовае. Найбольш вядомымі

* Перед виборами. Розбиття серед білорусів // Діло. 19 січня 1928. Ч. 13. С. 2–3.

дзеячамі гэтай плыні былі Янка Станкевіч, Аляксандр Уласаў, Радаслаў Астроўскі і інш.

4) Беларускія паланафільскія арганізацыі*.

Як ужо адзначалася, усе згаданыя плыні беларускага руху ставілі сабе за мэту дасягненне падтрымкі былых грамадоўцаў, і надзеі на поспех такога змагання кожнай з іх дадавала разгубленасць і нявызначанасць пазіцый многіх былых сябраў Грамады, асабліва на правінцыі. Забягаючы наперад, адразу адзначым, што іхнае палітычнае вызначэнне фактычна працягвалася ўвесь перыяд выбарчай кампаніі, і ўрэшце ў той ці іншай колькасці былыя грамадоўцы прысутнічалі ў складзе ўсіх беларускіх груповак.

Найбольш вострая барацьба за «грамадоўскую спадчыну» на выбарах у Сейм мусіла разгарнуцца ў Навагрудскай выбарчай акрузе № 61, якая аб'ядноўвала Навагрудскі, Слонімскі, Баранавіцкі, Нясвіжскі і Стаўпецкі паветы. Гэты пераважна праваслаўны сельскагаспадарчы рэгіён быў адным з тых месцаў, дзе Грамада перад сваёй ліквідацыяй найбольш актыўна развівалася і дзе яна мела ў сельскай мясцовасці шматлікіх і энергічных актывістаў. Праўда, улады правялі на пачатку 1927 г. арышты і сярод мясцовых дзеячаў, але тым не менш шмат хто з іх яшчэ заставаўся на волі і быў гатовы падчас выбараў ахвярна працаваць дзеля перамогі таго выбарчага спіса, які працягваў бы, на іхную думку, грамадоўскія традыцыі. Іхную гатоўнасць да самаахвяравання (якая была спалучаная з моцнымі прасавецкімі настроямі) у першую чаргу разлічвалі скарыстаць у сваіх мэтах мясцовыя камуністы з Баранавіцкага акруговага камітэта КПЗБ. Увогуле, камуністы выношвалі планы стварэння на аснове былых грамадоўскіх гурткоў новай легальнай партыі. Як пісаў адзін з камуністаў-падпольшчыкаў у лісце ў ЦК КПЗБ, *«перад намі стала пытанне: што рабіць з гурткамі* (БСРГ. — *А. П.*). *Было вырашана іх захоўваць і трымаць з імі сувязь, уцягваючы ў працу, у прыватнасці ў выбарную. [Вылучаць] найбольш актыўных і вы-*

---

* Больш падрабязна пра расстаноўку палітычных сілаў падчас выбарчай кампаніі 1928 г. у Заходняй Беларусі і асаблівасці яе правядзення гл.: Пашкевіч, А. Удзел беларускіх арганізацый у выбарах польскага парламента ў 1928 г. // Беларускі гістарычны часопіс. 2006. № 1. С. 19–25.

*трыманых гурткоўцаў, якія маглі б узяць на сябе тую ці іншую кіраўнічую ролю ў будучай легальнай арганізацыі. [...] Мы вырашылі ствараць перыферыйныя партыі па ваяводствах».* Што тычыцца канкрэтна рэгіёну, які нас цікавіць, то *«ў Навагрáдку было даручана Мальцу пазначыць групу з 5–7 чалавек, якія б з'явіліся ініцыятарамі і заснавальнікамі новай партыі. Ён павінен быў перапрацаваць статут групы, пазначыць канкрэтныя магчымасці працы і г. д. З аднаўленнем сувязі неабходна зноў заняцца гэтым пытаннем, бо ў Навагрáдскім ваяводстве ёсць шанцы на поспех»**. Але да выбараў увасобіць у жыццё гэтыя намеры камуністам не ўдалося ў першую чаргу з той прычыны, што польскія ўлады пасля ліквідацыі БСРГ не мелі намеру дапускаць яе аднаўлення ў любой новай форме. Адзінае, што ў такіх умовах было магчыма рабіць у легальнай сферы, пакуль пачалася выбарчая кампанія ў парламент, — гэта спрыяць разбудове структураў Таварыства беларускай школы, якое яшчэ лідары Грамады імкнуліся ператварыць у *«другую лінію акопаў»* на выпадак сваёй дэлегалізацыі**. Паводле звестак II аддзела польскага Генштаба, у 2-м квартале 1927 г. гурток ТБШ узнік сярод іншага і ў роднай вёсцы Аляксандра Стагановіча — у Нясутычах***. Трэба думаць, без ягонага асабістага

* НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 46. Арк. 15–16.

** Гл.: Bergman, A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej. S. 245. Трэба, аднак, адзначыць, што апанаванне ТБШ камуністамі і ўвогуле імкненне апошніх да кіравання беларускім радыкальным рухам не надта віталася некаторымі аўтарытэтнымі беларускімі дзеячамі, якія перад гэтым шчыльна супрацоўнічалі з грамадоўскім кіраўніцтвам, у прыватнасці з Антонам Луцкевічам і Аляксандрам Уласавым. *«Мы неаднаразова патрабавалі сувязяў з Грамадой у ЦК і прасілі пра тое ж Антона* (Луцкевіча. — *А. П.*), *але нічога не выходзіла. [...] Шэраг пытанняў, звязаных з вёскай, тармазіўся дзеля гэтага. Былі зробленыя спробы звязацца. Быў пасланы ліст Антону, але адказу не атрымалі. Тады ўдалося злавіць Улас[ава] паразмаўляць з ім наконт сувязі, грамадоўскіх спраў і галоднай кампаніі. З гэтай размовы высветлілася, што ў Варшаве існуе нейкі Беларускі Камітэт, які мае сувязі з замежжам і да т. п. Меркавалася, што праз яго Улас[аў] і будзе паступова наладжваць сувязь, але гэтаму аказаў супрацьдзеянне А[нтон]. [...] Аказваецца, у Школьным Т-ве сабралася група, чужая нам, у выдавецтве наша легальная літаратура цалкам адсутнічае, у гімназіі дырэктар* (Радаслаў Астроўскі. — *А. П.*) *вядзе барацьбу супраць камсамольскай арганізацыі ды т. п.* (НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 46. Арк. 16).

*** Centralne Archiwum Wojskowe (CAW). Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I. 303.4.2696. K. 69.

ўдзелу гэтая падзея не абышлася. Пазней структуры Таварыства беларускай школы на Наваградчыне адыгралі не апошнюю ролю пры правядзенні выбарчай кампаніі на карысць леварадыкальных беларускіх спісаў.

Камуністы, разумеючы, што ўлады будуць любымі сіламі імкнуцца перашкодзіць іхнаму выбарчаму поспеху і дзеля гэтага будуць намагацца адразу ж адхіліць іх ад выбарчай кампаніі шляхам нерэгістрацыі пракамуністычнага спіса з-за нейкіх фармальных зачэпак, імкнуліся забяспечыць сабе рэзервовыя варыянты. Дзеля гэтага яны прынялі тактыку падачы на рэгістрацыю ў адной і той жа акрузе некалькіх ідэалагічна блізкіх сабе спісаў з рознай ступенню радыкальнасці. У заходнебеларускіх умовах гэта звялося да тактыкі адначасовага выстаўлення трох спісаў: 1) агульнапольскага, адкрыта камуністычнага пад назвай «Рабоча-сялянскае адзінства» (такі «псеўданім» камуністы мусілі ўзяць з-за нелегальнасці КПП і, адпаведна, КПЗБ і КПЗУ ў Польшчы); 2) радыкальна-грамадоўскага на чале са зняволенымі былымі сеймавымі пасламі ад БСРГ; 3) таксама радыкальна-грамадоўскага, але ўжо не настолькі правакацыйнага — без знакавых і адназначна непрымальных для палякаў асобаў у сваіх шэрагах. На пачатковым этапе выбарчай кампаніі прыкладаліся намаганні ў фармаванні і рэгістрацыі ўсіх гэтых спісаў, а далей рашэнне, на каго менавіта рабіць стаўку, прымалася ў залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі: вынікаў рэгістрацыі, магчымасцяў для агітацыі, настрояў насельніцтва, асабістай папулярнасці тых ці іншых кандыдатаў і г. д.

У адпаведнасці з гэтай схемай у Наваградскай выбарчай акрузе былі выстаўленыя тры радыкальныя спісы, фармаванне якіх адбывалася пры большым ці меншым удзеле КПЗБ. Першым з іх быў выразна камуністычны спіс № 13 пад назвай «Рабоча-сялянская еднасць». У яго ўключылі кандыдатуры вядомых польскіх камуністаў Адольфа Варскага-Варшаўскага, Шмуля Маргуліса, Якава Вайцюка (якія да Наваградчыны і ўвогуле да Заходняй Беларусі не мелі аніякага дачынення), трохі разбаўленыя асобамі мясцовых вясковых актывістаў (Уладзімір Грыц і Аляксандр Малец з Наваградскага павета). На першых месцах другога спіса (які атрымаў № 38 і назву «Беларускае

рабоча-сялянскае аб'яднанне») фігуравалі прозвішчы зняволеных лідараў Грамады Браніслава Тарашкевіча, Пятра Мятлы і Максіма Бурсевіча, а следам за імі — мясцовых сялян Клаўдзіі Гоцкі, Івана Кузьміча, Івана Дударэвіча, Паўла Аўсянага і Аляксея Баля. Першыя двое з гэтых сялян былі таксама зняволеныя ў той час па справе Грамады, і недапушчэнне гэтых асобаў у Сейм было для польскіх уладаў справай прынцыповай. І толькі ў трэцім спісе не было прозвішчаў, якія надта раздражнялі б польскія ўлады самі па сабе: першапачаткова на двух першых месцах у ім стаялі сяляне з вёскі Нясутычы Наваградскага павета Аляксандр Стагановіч і Канстанцін Савонь, затым ішлі вядомыя беларускія культурна-асветніцкія дзеячы з Вільні Ігнат Дварчанін і Язэп Гаўрылік, а яшчэ далей — селянін са Слонімшчыны Павел Крынчык, кіраўнік наваградскай акруговай управы ТБШ Анастас Аляшкевіч і селянін з Наваградчыны Аляксандр Лойка*. Нас у дадзеным выпадку цікавіць перадусім апошні спіс, бо менавіта дзякуючы ягонаму выстаўленню і наступнаму выбарчаму поспеху сталі магчымыя ўсе тыя падзеі, пра якія пойдзе гаворка ніжэй.

Адзін з тагачасных актывістаў КПЗБ на Наваградчыне і актыўны ўдзельнік выбарчай кампаніі Аляксандр Багданчук у пазнейшых успамінах распавёў амаль дэтэктыўную гісторыю, як спіс «Змагання» нібыта фармаваўся за адзін дзень і быў зарэгістраваны за 40 хвілін да канца тэрміну падачы неабходных дакументаў, калі ніхто на гэта ўжо і не спадзяваўся**. Аднак жа пры больш уважлівым аналізе дакументаў і фактаў вынікае, што мемуарыст тут шмат чаго элементарна перабольшыў. Так, звяртае на сябе ўвагу тое, што спіс «Змагання» ў Наваградскай акрузе атрымаў № 39, але гэты нумар быў тут не апошнім: № 40 меў спіс Беларускага гаспадарчага незалежнага саюза сялян і работнікаў (на чале з даволі вядомым у той час беларускім дзеячам Яўгенам Міткевічам), а № 41 — спіс Беларускіх сялян

* CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I. 303.4.2583. K. 59–60.

** Гл.: Багданчук, А. У барацьбе за правядзенне нашых дэпутатаў у польскі сейм // У суровыя гады падполля. Успаміны былых членаў КПЗБ — актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Мінск, 1958. С. 106–112.

і работнікаў (на чале з настаўнікам Наваградскай беларускай гімназіі Міхалам Чатыркам). Згодна ж з арт. 61 польскага выбарчага закону, акруговым спісам мусілі прысвойвацца нумары ў парадку чарговасці іх падачы*. Калі б сапраўды змаганцы падавалі спісы ў апошнія хвіліны, для гэтага адведзеныя, то прынамсі адначасова з імі мусілі б гэта таксама рабіць і Міткевіч з Чатыркам, што малаверагодна, бо апошнія выстаўлялі свае спісы ў паразуменні з польскімі ўладамі. Калі верыць сведчанню Васіля Рагулі, спіс № 39 якраз і з'явіўся ў адказ на «здраду» Чатыркі, які спачатку насіў «грамадоўскую маску»**.

Дзеля вылучэння ўсіх спісаў трэба было сабраць за кожны з іх і падаць у акруговую выбарчую камісію не менш за 50 подпісаў выбарнікаў. З гэтай задачай наваградскія былыя грамадоўцы разам з камуністамі паспяхова справіліся. За спіс № 13 было сабрана 183 подпісы***, за спіс № 38 – 420 (!), а за спіс № 39 – 120****. Апошняя лічба выглядае зусім нязначнай у параўнанні з папярэднімі, але менавіта яна сведчыла пра выключную згуртаванасць і арганізаванасць былых грамадоўцаў на Наваградчыне, бо сабраная была і сапраўды на працягу аднагодня*****, адно што толькі падавалася не ў апошні момант. Чаму так атрымалася — варта спыніцца трохі падрабязней.

Каб зразумець, што змусіла наваградскіх былых грамадоўцаў праявіць такую аператыўнасць у зборы подпісаў выбарнікаў, варта прыгадаць версію той выбарчай кампаніі, выкладзеную ва ўспамінах вядомага беларускага дзеяча Васіля Рагулі.

---

* Гл.: Prawo polityczne Rzeczypospolitej Polskiej 1918–1939: Wybór źródeł / prolog, wybór, opracowanie i indeksy W. Sudnik. Warszawa, 2002. S. 142.

** Гл.: Рагуля, В. Успаміны. Мінск, 1993. С. 65–66.

*** Аляксандар Багданчук пасля ўспамінаў пра нібыта 5000 подпісаў, сабраных за камуністычны спіс (Багданчук, А. У барацьбе за правядзенне нашых дэпутатаў у польскі сейм. С. 107), але гэтая інфармацыя — толькі плён фантазіі аўтара.

**** НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 54. Арк. 31–32.

***** Гэтая інфармацыя цалкам вартая даверу, бо пра гэта пісаў не толькі А. Багданчук ва ўспамінах (Багданчук, А. У барацьбе за правядзенне нашых дэпутатаў у польскі сейм. С. 108–110), але і тагачасны кіраўнік баранавіцкіх камуністаў Фелікс Кантар («Макар») у сваёй паслявыбарчай справаздачы (НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 54. Арк. 31).

Ён, у прыватнасці, пісаў: *«Цікавая палітычная эквілібрыстыка Чатыркі. Фактычна перад выбарамі ў другі Сейм ён узначаліў Грамаду ў Наваградскай акрузе. Грамадоўцы яму выказалі 100 % даверу. [...] На з'ездзе ў Гарадэчні Чатырка атрымаў поўны давер. За Беларускі Пасольскі Клуб і Сялянскі Саюз галасавалі толькі дэлегаты Любчанскай воласці. Там стала ясна, што Беларуска-Украінскі Блок на выбарах пацерпіць паражэнне. Пераможа Грамада. Чатырка гэта разумеў таксама, і вырашыў дзеяць спосабам нечаканасці. Вядучы закулісныя перамовы з Бэчковічам* (наваградскім ваяводам. — *А. П.*), *ён стараўся дакладна хаваць да апошняй мінуты свае сапраўдныя намеры. Бэчковіч гаварыў: мандат Чатыркі мураваны. Грамадоўцы гаварылі: перамога Чатыркі і ягоных прыхільнікаў цалкам забяспечана. Так ён і заставаўся сядзець на двух крэслах, пакуль неабходнасць не змусіла яго выбраць адно з іх. Прыйшоў час скласці лісту кандыдатаў. І тут, хочаш не хочаш, Чатырка змушаны быў зняць грамадоўскую маску і паказаць сваё сапраўднае аблічча — аблічча ўгоды. На прапанову грамадоўцаў узначаліць лісту "Змагання" ён адказаў адмоўна і падаў сваю ўласную лісту. Можна ўявіць, якое было абурэнне грамадоўцаў супроць яго. Заставалася не больш 10-ці дзён для перагрупавання грамадоўскага фронту. Грамадоўцы паспелі за гэты час скласці новую лісту на чале з Дварчаніным і да канца знішчыць аўтарытэт Чатыркі. Гэта ім цалкам удалося»*[*].

Можна думаць, што менавіта сітуацыя, калі нечакана заняў іншую ад раней меркаванай пазіцыю Міхал Чатырка, на якога ўскладаліся вялікія надзеі, вымусіла грамадоўцаў — працаўнікаў паразумення з польскімі ўладамі дэманстраваць цуды

---

[*] Рагуля, В. Успаміны. С. 66. Фактычна ўсё сказанае Рагулем пра «палітычную эквілібрыстыку» Міхала Чатыркі пацвярджае ў сваёй справаздачы і Фелікс Кантар, прывёўшы пры гэтым іншыя цікавыя факты: *«Да апошняга месяца мы лічылі яго сімпатыкам, у сеймік ён прайшоў з нашае лісты, быў старшынём Наваградскай управы ТБШ і г. д. Першы раз, калі гэты тыпус прыехаў у Дзятлава, ён сказаў нашым таварышам, што мае згоду Савецкага консула ў Польшчы на выстаўленне асобнай лісты, але Наваградскі АК пра гэта не ведае. Дзеля таго, што Дзятлаўскі раён нядаўна арганізаваны, таварышы яму паверылі і пачалі агітацыю за ягоную лісту да нашага прыезду. Адзін таварыш так і застаўся пры ім, выйшаўшы з партыі, кажучы, што свой свайго не пазнае»* (НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 54. Арк. 37).

аператыўнасці пры зборы новых подпісаў. Хутчэй за ўсё, раней прынамсі нейкая іх частка ўжо была сабраная (бо выстаўленне такога спіса планавалася адпачатку), але засталася ў Міхала Чатыркі, і, трэба думаць, была ім пазней скарыстаная пры выстаўленні ўласнага спіса, які ён у выніку падаў самы апошні з усіх удзельнікаў выбарчай кампаніі. Аляксандр Багданчук, праўда, сцвярджаў, што подпісы для новага спіса давялося збіраць пасля таго, як улады анулявалі два папярэднія*, але гэтая інфармацыя — таксама недакладная, бо грамадоўскі спіс № 38, у адрозненне ад сапраўды ануляванага спіса № 13, застаўся ў агульным пераліку да самага канца выбараў. Прычына ж таго, што кіраўніцтва КПЗБ прыняло рашэнне адмовіцца ад ягонай падтрымкі і скіраваць агітацыю на карысць № 39, была іншая. Як ужо адзначалася, на першых месцах у гэтым спісе планавалася змясціць зняволеных лідараў Грамады і яшчэ двух сялян, якія таксама сядзелі ў турме. Аднак жа, згодна з патрабаваннямі выбарчага закону, змяшчэнне кандыдатураў у выбарчым спісе было немагчымае без іхнай пісьмовай згоды, і менавіта яе зняволеныя грамадоўцы не па сваёй віне своечасова пераслаць не здолелі — патрэбныя дакументы спазніліся на адзін дзень. У выніку, як пісаў тагачасны кіраўнік баранавіцкіх камуністаў Фелікс Кантар («Макар») у сваёй адмыслова прысвечанай выбарам справаздачы, *«пасля тэрміну засталіся толькі 3 кандыдаты»*, і такі кароткі спіс быў акруговай камісіяй ахвотна зацверджаны. Аднак жа такой малой колькасці кандыдатаў у спісе было відавочна замала: па-першае, грамадоўцы небеспадстаўна разлічвалі на тое, што ім па сілах здабыць і больш за тры мандаты, а па-другое, у выніку поспеху на выбарах яны заставаліся б без кадравага рэзерву ў выпадку смерці, арышту ці афіцыйнага пазбаўлення мандата кагосьці з выбраных паслоў. Дзеля гэтага ўсе наяўныя магчымасці былыя грамадоўцы і камуністы скіравалі на агітацыю за параўнальна найменш радыкальны спіс № 39. Гэты спіс як *«найбольш суадказны»* ў Наваградскай акрузе 22 лютага 1928 г. прэзентавала выдаваная былымі грамадоўцамі газета**.

---

* Гл.: Багданчук, А. У барацьбе за правядзенне нашых дэпутатаў у польскі сейм. С. 108.

** Гл.: Лёс акружных сьпіскаў // Сіла працы. 22 лютага 1928. № 8. С. 2.

Увогуле сабраць подпісы на карысць таго ці іншага спіса было толькі паловай усёй справы, бо нават пасля здачы подпісаў у акруговую выбарчую камісію і зацвярджэння апошняй спіса з кандыдатамі яго яшчэ маглі ануляваць праз нейкія фармальныя зачэпкі. Галоўны інструмент, якім карысталіся польскія ўлады дзеля зняцця з выбарчай дыстанцыі непажаданых для іх спісаў, — праца з асобамі, што падтрымалі вылучэнне спіса, каб дабіцца ад іх адклікання свайго подпісу. У ход ішлі пры патрэбе самыя розныя метады: і запалохванне, і кароткачасовыя арышты, і нагадванне секвестратарамі пра пратэрмінаваныя падаткі, і падпойванне, і подкуп, і г. д. Але ўсе гэтыя захады дапамаглі толькі пры ануляванні спіса № 13. Адносна ж грамадоўскіх спісаў Фелікс Кантар адзначаў, што *«ад Грамады, якая мела 420* (подпісаў. *— А. П.*), *і мясцовых імёнаў — 120, ніхто не адмовіўся, заяўляючы адкрыта, што яны грамадоўцы»**. Дадзены факт, нават калі ён і перабольшаны (што не адмовіўся ўвогуле ніхто), усё ж таксама дае ўяўленне пра ўзровень папулярнасці ў той час Грамады (ужо аб'яўленай нелегальнай) сярод насельніцтва.

Пішучы пра правядзенне былымі грамадоўцамі выбарчай кампаніі ў парламент 1928 г., ніяк нельга абысці ўвагай пытанне іх узаемаадносінаў з камуністамі. Ужо факты, выкладзеныя вышэй, не пакідаюць аніякага сумневу ў тым, што супраца паміж былымі сябрамі БСРГ і камуністамі існавала і была вельмі цеснай, аднак жа пры гэтым наўрад ці яна мела чыста ідэйны характар. Многае сведчыць пра тое, што галоўныя кіраўнікі выбарчай кампаніі з грамадоўскага боку, у першую чаргу вядомы беларускі дзеяч Ігнат Дварчанін, не падзялялі безаглядна камуністычнай інтэрнацыянальнай ідэалогіі, а ў сваёй практычнай дзейнасці не кіраваліся слепа інструкцыямі партыйных функцыянераў, імкнучыся па магчымасці праводзіць уласную палітыку. Як вынікае з матэрыялаў, падрыхтаваных ЦК КПЗБ да I з'езда гэтай партыі летам 1928 г., грамадоўцы акрэслілі сваё бачанне выбарчай кампаніі з гледзішча беларускіх нацыянальных інтарэсаў яшчэ на этапе выстаўлення выбарчых спісаў (стылістыка дакумента захоўваецца): *«Адной з галоўных цяжкасцяў у гэтай кампаніі былі цяжкасці ў сувязі з кіраўніцтвам*

* НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 54. Арк. 34.

*легальным рухам. Нашая фракцыя ў Грамадзе падпала пад уплыў найбольш правых элементаў грамадоўскага руху. Тав[арышы] з Грамады ставілі ва ўпор пытанне аб выстаўленні дзяржаўнага спісу ў сейм і сенат, акрамя спісу Грамады на чале з арыштаванымі грамадоўскімі пасламі, і свой (правы) грамадоўскі спіс. Яны выразна на шэрагу сумесных нарадаў супрацьпаставіліся партыі, высоўваючы супраць яе наступныя асноўныя моманты: 1) партыя недаацэньвае легальнага руху (легальнасць любой цаной); 2) партыя недаацэньвае інтэлігенцыі, яе значэння ў кіраўніцтве і ўплыве на масы (не было б Тарашкевіча, не было б Грамады); 3) у ігнараванні інтэлігенцыі і супрацьпастаўленні ёй мясцовых працаўнікоў (сялян з месцаў); 4) у надзвычайна вялікім ціску на яе; 5) у недаацэнцы значэння "свайго" беларускага прадстаўніцтва ў сейм»*.

Праўда, тады *«ЦК удалося шляхам ціску знізу і перамоваў з кіраўнікамі не дапусціць да выстаўлення асобнага дзяржаўнага спісу (правай) Грамады»*, але, бачачы такія настроі, камуністы ўсё ж вымушаныя былі пагадзіцца на выстаўленне на падкантрольным сабе выбарчым спісе ў Наваградскай акрузе, дзе былі надзвычай вялікія грамадоўскія ўплывы, прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі** (у чым, дарэчы, пасля выбараў раскайваліся, прызнаючы, што *«сакратарыят ЦК дапусціў памылку, паставіўшы на першае месца мясцовых спісаў дзеячаў Грамады, якія праявілі хістанні і ваганні ў момант перажыванага крызісу нацыянальна-вызваленчага руху»****).

Такімі складанымі дачыненнямі паміж заходнебеларускімі камуністамі і беларускай інтэлігенцыяй ды ўзаемным недаверам, якімі поўніліся стасункі паміж імі, можна патлумачыць і той на першы погляд нелагічны факт, што на чале акруговага спіса «Змагання» ў Наваградскай акрузе стаў не вядомы

---

* НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 191. Арк. 38.

** Варта адзначыць, што ў іншых заходнебеларускіх акругах у адпаведнасці з артадаксальнымі камуністычнымі ўстаноўкамі на аналагічных спісах стаялі амаль выключна мала каму вядомыя за межамі свайго рэгіёну мясцовыя сяляне, рабочыя ці ў лепшым выпадку настаўнікі (CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I. 303.4.2583. K. 58–63, 72–73).

*** НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 191. Арк. 41.

ў Заходняй Беларусі інтэлектуал Ігнат Дварчанін (як гэтага варта было б чакаць), а мясцовы селянін з чатырма класамі адукацыі Аляксандр Стагановіч. Камуністы, відаць, цалкам лагічна меркавалі, што не вельмі адукаваны чалавек, які перад гэтым быў толькі адным з шматлікіх і не надта вядомых рэгіянальных грамадоўцаў, у выпадку абрання яго ў Сейм будзе мець куды менш магчымасцяў для нейкіх манеўраў, чым адзін з найбольш вядомых і аўтарытэтных дзеячаў беларускага нацыянальнага руху ў Польшчы, які быў знаёмы асабіста з большасцю віленскіх беларусаў, у тым ліку і вядомых сваім крытычным стаўленнем да камунізму. Выстаўленне на першым месцы спіса «Змагання» ў Наваградскай акрузе не інтэлігента было, відаць, пастаўлена камуністамі як абавязковая ўмова для працягу супрацы (зусім адмовіцца ад якой у тых умовах беларускія дзеячы не маглі), і адзінае, што тут заставалася таму ж Дварчаніну, — толькі паспрабаваць паўплываць на канкрэтны выбар такой «неінтэлігенцкай» кандыдатуры. Як згадваў сам Стагановіч ва ўспамінах, з Дварчаніным ён быў асабіста знаёмы яшчэ з часоў Першай сусветнай вайны, і той сам прыязджаў, каб угаварыць яго балатавацца ў парламент. Такім чынам, Стагановіча на першым месцы сеймавага спіса «Змагання» можна ўспрымаць як у пэўнай ступені кампрамісную фігуру, якая больш-менш задавальняла абодва бакі: і камуністаў, і беларускую інтэлігенцыю. Цікава, што спачатку другім у спісе пасля Стагановіча планавалася выставіць ягонага земляка, селяніна з Нясутычаў Канстанціна Савоня, але ў канчатковым варыянце ягонага прозвішча ў спісе не аказалася*, і другое месца

* Гл.: Акружныя сьпіскі кандыдатаў на Зах. Беларусі // Сіла працы. 8 лютага 1928. № 3. С. 3; CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I. 303.4.2583. K. 60. Дарэчы, сітуацыя з К. Савонем выразна характарызуе стан тагачаснай сувязі паміж цэнтрам і правінцыяй і, значыць, выключную ролю ў правядзенні выбарчай кампаніі ў асобных рэгіёнах менавіта мясцовых дзеячаў. 15 лютага 1928 г. друкаваны орган былых грамадоўцаў «Сіла працы», які выдаваўся ў Вільні, паведаміў толькі, што на першым месцы спіса № 39 у Наваградскай акрузе стаіць *«адзін мясцовы селянін (адзін з іх зрокся кандыдатуры, які — добра невядома)»* (Лёс акружных сьпіскаў // Сіла працы. 1928. 15 лютага. № 6. С. 2). Для апанентаў жа Грамады адмова К. Савоня балатавацца ўвогуле засталася па-за ўвагай: іхная прэса пасля заканчэння галасавання аднагалосна пералічыла

заняў Ігнат Дварчанін. Цяжка са стопрацэнтнай упэўненасцю сказаць, што стала галоўнай прычынай такой перастаноўкі, здзейсненай у апошні момант, — выкананне ўмоваў пагаднення паміж камуністамі і беларускай інтэлігенцыяй ці нежаданне балатавацца самога Савоня. Аднак жа пазнейшы крытычны разбор памылкі камуністычнага кіраўніцтва, *«звязанай з выстаўленнем на першае месца Дварчаніна»**, праведзены падчас І з'езда КПЗБ, дазваляе прыпусціць, што перасоўванне кандыдатуры Дварчаніна на больш высокую пазіцыю ў выбарчым спісе адбылося з ведама камуністаў і пры іхным ухваленні. Тое ж, што дэлегаты камуністычнага з'езда паслядоўна казалі пра *першае* месца Дварчаніна, у той час як ён рэальна стаяў толькі на *другім*, не выключае і такой магчымасці (хоць яна і не вельмі верагодная), што пагадненне грамадоўцаў з камуністамі магло ў прынцыпе ўтрымоўваць і варыянт адмовы Аляксандра Стагановіча ад мандата на карысць Дварчаніна ў тым выпадку, калі б са спіса «Змагання» ўдалося б правесці ў Сейм усяго толькі аднаго пасла, а не трох, як гэта ў выніку атрымалася. Як бы там ні было, выглядае на тое, што кандыдатура Стагановіча ад самага пачатку была толькі «тэхнічнай», і ў якасці самастойнай палітычнай фігуры яго не ўспрымалі ні камуністы, ні беларускія інтэлігенты.

Супярэчнасці паміж камуністамі і «нацыяналістамі» пасля канчатковага выстаўлення выбарчага спіса і пачатку агітацыйнай кампаніі не скончыліся. Камуністы імкнуліся трымаць усе дзеянні «Змагання» цалкам пад кантролем, у той час як Дварчанін намагаўся ўсімі сіламі захаваць хоць нейкую самастойнасць у прынцыповых пытаннях. Як сведчыў у справаздачы адзін з дзеячаў ТБШ, каптаваны ў арганізацыю камуністамі для кантролю за ёй, якраз у гэты час *«пачынаецца, ці лепш кажучы, выкрышталізоўваецца паступовы адыход т. Дварчаніна ўправа, завяршыўшыйся поўным адказам у часе выбараў да Сейма*

прозвішча гэтага дзеяча ў ліку паслоў, выбраных у Сейм на Наваградчыне са спіса «Змагання» (Выбарная фільма // Сялянская ніва. 14 сакавіка 1928. № 23. С. 1; Wyniki wybaraŭ u Sojm u paasobnych wokruhach // Białaruskaja Krynica. 6 sakawika 1928. № 20. S. 1).

* НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 179. Арк. 21.

*ісці па лініі, намечанай ЦК КПЗБ, на карысць розных камбінацыяў, выдуманых "Беларускаю інтэлігенцыяю ў Вільні"»**.

Адхіленне грамадоўцаў ад партыйных установак адзначаў у сваёй справаздачы і Фелікс Кантар, пішучы пра нейкую перадвыбарчую ўлётку (на жаль, выявіць хоць адзін яе асобнік пакуль што не ўдалося), якая выйшла ад імя «Змагання» перад самымі выбарамі і не цалкам адпавядала партыйнай лініі: *«Улётка, надрукаваная і канфіскаваная, якая разышлася па двух-трох раёнах у колькасці 300 штук, не з'яўляецца ўлёткай акруговага камітэта. Тав. Макара не было ў Навагрудку, ён сядзеў у Баранавічах і пра гэтую ўлётку ведаць не мог. Тав. Клім, знаходзячыся ў Навагрудку, таксама на 99 % не напісаў яе. Гэтая ўлётка з'яўляецца, мяркуючы з усяго, кандыдата Дварчаніна. Выкарыстаць гэтую ўлётку для фракцыйнай працы з'яўляецца злачынствам, як і ўся фракцыйная праца»***.

Апошняя фраза з гэтай цытаты патрабуе дадатковага тлумачэння. Згадваючы пра «фракцыйную працу», Ф. Кантар меў на ўвазе вострую тэарэтычную дыскусію ў Камуністычнай партыі Польшчы, якая ішла якраз у той час і ўрэшце скончылася афармленнем унутры фармальна адзінай партыі дзвюх фракцый — так званай большасці і так званай меншасці. Прадстаўнікі «большасці» стаялі на больш гнуткіх пазіцыях і дапускалі супрацу ў тактычных мэтах з сацыялістычнымі партыямі і партыямі прыгнятаных нацыянальных меншасцяў, у той час як «меншасць» была фракцыяй сектанцкай, дагматычнай і безаглядна падпарадкаванай лініі, якую праводзіў у СССР Сталін. У КПЗБ сітуацыя была ў параўнанні з агульнапольскай партыяй трохі адрозная: прыхільнікі «меншасці» тут складалі большасць, а прыхільнікі «большасці» — меншасць. Тым не менш, як выглядае, асноўнае кіраванне камуністычнай выбарчай кампаніяй у Навагрудскай акрузе апынулася ўрэшце ў руках прыхільнікаў «большасці», і менавіта гэтым можна растлумачыць тое, што прыхільнікі нацыянальнай плыні былой Грамады атрымалі ў гэтай акрузе пэўныя магчымасці для хоць бы абмежаванай рэалізацыі ўласных памкненняў. Нездарма на

* НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 101. Арк. 192.

** НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 54. Арк. 33.

I з'ездзе КПЗБ адзін з ягоных удзельнікаў, які меў псеўданім Сідар, заяўляў, што выстаўленне ў спісе «Змагання» Ігната Дварчаніна было з боку камуністаў несумненнай памылкай, прытым памылкай, *«зробленай таварышамі з большасці»**.

У рэзалюцыі па паслявыбарчай справаздачы сакратарыята ЦК КПЗБ адзначаліся *«тэндэнцыя ў частцы кіраўнічых колаў радыкальнага руху адмежавацца ад рабоча-сялянскага блока ўсіх працоўных Польшчы і арганізаваць адзіны беларускі нацыянальны фронт... паслабленне барацьбы з беларускімі згоднікамі... нацыяналістычныя настроі, недаацэнка кіруючай ролі Камуністычнай партыі ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе і радыкальна-сялянскім руху»***. Наколькі вялікім грахом у вачах камуністаў-інтэрнацыяналістаў былі падобныя адхіленні, можна ўявіць, калі прыгадаць змест адной з іхных уласных улётак, якія распаўсюджваліся падчас выбарчай кампаніі нелегальна ад імя самой КПЗБ: *«Хто выступае процій адзінага фронту нацыянальна-вызваленчага руху Зах. Беларусі з агульнапольскім рэвалюцыйным рухам, хто праціваставіць «беларуса» наогул — «паляку» наогул, хто дзеля апраўдання контррэвалюцыйнага лозунга «адзінага беларускага нацыянальнага фронту» абвінавачвае польскіх рэвалюцыйных рабочых і сялян у шавінізме і ў захопных імкненнях — той аслабляе сілы антыфашыстоўскага блока, той дапамагае польскаму фашызму — узмацоўвае польскі акупацыйны рэжым у ЗБ, той вораг нацыянальна-вызваленчае барацьбы беларускіх народных масаў»****.

Вяртаючыся ж да саміх выбараў, варта адзначыць, што акрамя вышэйзгаданых спісаў пад № 38 (Беларускае рабоча-сялянскае аб'яднанне), № 39 (спіс «Змаганне за інтарэсы сялян і работнікаў») і № 41 («Беларускія сяляне і работнікі») у Наваградскай выбарчай акрузе было выстаўлена яшчэ 3 беларускія спісы: № 18 (Блок нацыянальных меншасцяў), № 37 («Агульна-беларускі народны спіс»), № 40 (Беларускі гаспадарчы незалежны саюз сялян і работнікаў). № 37 быў выразна паланафільскім, а ягоным тварам на Наваградчыне

* НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 179. Арк. 21.

** НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 179. Арк. 144.

*** НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 42. Арк. 127.

стаў шырокавядомы ў той час, але вельмі скампраметаваны ў вачах выбарнікаў сваёй адкрыта прапольскай пазіцыяй беларускі дзеяч Арсень Паўлюкевіч. № 40 арганізаваў таксама даволі вядомы ў той час дзеяч Яўген Міткевіч, які ў першай палове 1920-х гг. таксама быў сярод стваральнікаў шэрагу паланафільскіх арганізацый і адначасова з'яўляўся канфідэнтам II аддзела Генеральнага штаба. На выбары Міткевіч ішоў пад апазіцыйнымі сацыялістычнымі лозунгамі, але ў сувязях ягонага спіса з дзяржаўнымі ўладамі таксама мала ў каго ўзнікалі сумневы. Гэты спіс быў выстаўлены адмыслова, каб адцягваць галасы прыхільнікаў былой Грамады. Нарэшце, у складзе Блока нацыянальных меншасцяў ішлі на выбары дзеячы з асяродку Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і Беларускага сялянскага саюза на чале з Васілём Рагулем. Апошні паходзіў з вёскі Ачукевічы з-пад Любчы і не траціў надзеі на вяртанне хоць бы часткі сваёй былой папулярнасці на радзіме, якой ён карыстаўся ў 1922–1925 гг. і якая значна зменшылася пасля таго, як даволі нечакана гэты дзеяч не далучыўся да наваствoранай Грамады, хоць і меў левыя погляды ды лічыўся «сялянскім радыкалам».

З ліку польскіх партый найбольш моцнымі супернікамі былых грамадоўцаў былі праўладны спіс № 1 (Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам), а таксама спісы польскіх левых партый: № 2 (Польская сацыялістычная партыя), № 3 (Польская народная партыя «Вызваленне») і № 10 (Сялянская партыя). Пад № 20 у Сейм балатаваліся расійскія нацыяналісты, якія пры пэўных умовах таксама маглі скласці беларусам канкурэнцыю, туманячы галаву малапісьменным вяскоўцам праваслаўнага веравызнання (як гэта адбылося ў Пінскай выбарчай акрузе, дзе расійцы здолелі нават атрымаць адзін мандат, у асноўным за кошт масавага за іх галасавання насельніцтва вялікіх праваслаўных вёсак у ваколіцах Давыд-Гарадка). Толькі 3 спісы фактычна не з'яўляліся змаганцам канкурэнтнымі, бо былі чыста яўрэйскімі: № 4 (Агульны яўрэйскі рабочы саюз «Бунд» у Польшчы), № 33 «Агульнаяўрэйскі нацыянальны выбарчы блок у Сейм і Сенат» і № 37 — індывідуальны спіс яўрэйскага дзеяча Э. Закгейма*.

* Гл.: Rzepeccy, T. i K. Sejm i Senat 1928–1933. S. 125.

Самі ўмовы правядзення выбарчай кампаніі, як ужо вышэй адзначалася, былі для апанентаў улады, перш за ўсё з ліку нацыянальных меншасцяў, надзвычай неспрыяльныя. Мясцовая адміністрацыя прыкладала ўсе намаганні, каб выканаць пажаданні свайго непасрэднага начальства (пра якія ішла гаворка вышэй), і дзеля гэтага не спынялася ні перад якімі парушэннямі заканадаўства. Так, было зафіксавана шмат выпадкаў свядомага незапісання ў спісы «няпэўных» выбарнікаў. Многія вясковыя выбарнікі ў Заходняй Беларусі не атрымалі магчымасці прагаласаваць, бо іх не дапусцілі на выбарчыя ўчасткі. Шырока распаўсюджаная была практыка канфіскацыі друкаваных выданняў, асабліва левара-дыкальных, ды і ўвогуле агітацыі апанентаў праўладных спісаў чыніліся ўсялякія перашкоды. Пра вялікі маштаб парушэнняў, здзейсненых падчас выбараў, сведчыць тое, што ў Вярхоўны суд Польшчы пасля іх былі пададзеныя 183 пратэсты, якія паходзілі пераважна з тэрыторыі так званых усходніх крэсаў*. Няма сумневу, што гэтыя пратэсты ў большасці сваёй мелі пад сабой грунт, бо пасля іх разгляду (праўда, вельмі зацягнутага ў часе) вынікі выбараў у 7 акругах, у тым ліку ў заходнебеларускіх Лідскай і Свянцянскай, у 1930 г. анулявалі і прызначылі паўторнае галасаванне.

У такіх умовах патрэбная была сапраўды вялікая энергія, ахвярнасць і вынаходлівасць з боку прадстаўнікоў апазіцыйных арганізацый, каб супрацьдзеяць парушэнням і злоўжыванням. Так, выбарчаму камітэту «Змагання» давялося выкарыстоўваць падчас сваёй кампаніі розныя хітрыкі, напрыклад распаўсюджваць агітацыйныя матэрыялы ў выглядзе маленькіх рознакаляровых картак, папяроснай паперы альбо брашураў з замаскаванай вокладкай**. Дзеячы, якія наважыліся на адкрытую працу на карысць спіса «Змагання», мусілі ўвесь час быць гатовымі да рэпрэсій з боку адміністрацыйных і паліцэйскіх уладаў.

* Гл.: Ajnenkiel, A. Parlamentaryzm w II Rzeczypospolitej. Warszawa, 1975. S. 267.

** Гл.: Розеншейн, Д. В Центральной редакции // Годы испытаний и мужества / сост. Н. С. Орехво, Н. С. Сташкевич. Минск, 1973. С. 198.

На жаль, захавалася зусім няшмат звестак пра тое, наколькі вялікую ролю падчас гэтай кампаніі адыграў Аляксандр Стагановіч — першы кандыдат у спісе «Змаганне». Вядома, што ён быў таксама намеснікам паўнамоцнай асобы ўсяго спіса № 39 (паўнамоцнай асобай быў Анастас Аляшкевіч)*. Няма сумневу, што і ў перадвыбарчай агітацыі ён мусіў браць актыўны ўдзел, але, відаць, ягоныя заслугі ў гэтай сферы не асабліва вылучаліся сярод іншых, бо ні афіцыйныя польскія, ні камуністычныя крыніцы адмыслова ягоную асобу пры апісанні хады кампаніі на Наваградчыне не вылучаюць. Толькі ў справаздачы Ф. Кантара ў адным месцы прозвішча Стагановіча пералічваецца ў ліку асобаў, якім на заключным этапе агітацыі даручылі выступаць на мітынгах у найбольш значных населеных пунктах акругі. Стагановіч павінен быў, паводле гэтага дакумента, правесці мітынгі ў Дзятлаве і Наваградку, аднак не паспеў гэтага зрабіць, бо польскія ўлады, адчуваючы сваю бяссільнасць перад грамадоўска-камуністычнай агітацыяй, наважыліся за тыдзень да галасавання на крайнія меры: масавыя арышты найбольш актыўных дзеячаў «Змагання». Усяго на Наваградчыне тады арыштавалі каля 100 чалавек, у тым ліку і Аляксандра Стагановіча**.

Аднак жа дадзеныя захады польскай паліцыі не далі жаданага выніку. «Змаганне» ўсё адно заняло ў Наваградскай выбарчай акрузе першае месца, набраўшы 71706 галасоў выбарнікаў. На другім месцы апынуўся Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам — 53926 галасоў. 14216 галасоў здабыў Блок нацыянальных меншасцяў, 8818 — Польская сацыялістычная партыя. З астатніх спісаў цікавыя для нас у першую чаргу беларускія. За спіс № 40 прагаласавалі 4467 чалавек (збольшага ў Баранавіцкім павеце), за спіс № 41 — 3167 (у асноўным на Нясвіжчыне), а за спіс № 38 — 1495 чалавек (таксама ў асноўным на Нясвіжчыне). Цалкам правальнымі аказаліся выбары для спіса № 37 Арсеня Паўлюкевіча — ва ўсіх пяці паветах ён здабыў усяго толькі 229 галасоў, пры гэтым у Слонімскім павеце яго падтрымалі

* CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I. 303.4.2583. K. 60.

** НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 54. Арк. 35–36.

толькі 9 чалавек, а ў Стаўпецкім за № 37 не аддалі ўвогуле ніводнага голасу*.

Наваградскі павет стаў для змаганцаў сапраўдным апорным пунктам ва ўсёй акрузе — агульны выбарчы поспех спіса быў дасягнуты дзякуючы менавіта мясцовым галасам, якіх тут за яго аддалі аж 30 772 (для атрымання аднаго мандата патрабавалася 17 975 галасоў). Брольніцкі выбарчы ўчастак, у які ўваходзілі стагановіцкія Нясутычы, быў адным з найбольш празмаганскіх — з 820 галасоў мясцовых выбарнікаў, прызнаных сапраўднымі, 766 (93,4 %) былі аддадзеныя за спіс № 39. Рэшта галасоў прыпала тут на долю ББСУ (51 голас) і Блока нацыянальных меншасцяў (3 галасы)**. Такія лічбы несумненна сведчаць пра значны аўтарытэт і высокі давер, якімі карыстаўся Стагановіч сярод сваіх землякоў.

Роўна праз тыдзень адбыліся выбары ў Сенат, на якіх левaрадыкальная прэса першапачаткова парэкамэндавала сваім прыхільнікам падтрымаць спіс Беларускага сялянска-работніцкага аб'яднання (№ 38)*** (сенацкі спіс № 39 быў прызнаны несапраўдным). Аднак і спіс № 38 да дня выбараў не датрымаўся і быўануляваны (відавочна, дзеля таго, што ўлады напалохаліся вялікай папулярнасці змаганцаў сярод насельніцтва Наваградскага ваяводства, якая фактычна гарантавала ім атрыманне прынамсі аднаго сенатарскага мандата). Кіраўнікі мясцовай «змаганскай» выбарчай кампаніі ў такіх умовах наважыліся на неардынарны крок: яны заклікалі сваіх прыхільнікаў галасаваць за Блок нацыянальных меншасцяў, на першым месцы сенацкага спіса якога стаяў беларус Васіль Рагуля, у той час зняволены ўладамі. Такое рашэнне прынялі насуперак пазіцыі мясцовага кіраўніцтва КПЗБ — тое настойвала, каб прыхільнікі змаганцаў дэманстратыўна галасавалі за камуністычныануляваны спіс № 13)****.

---

* Гл.: Rzepeccy, T. i K. Sejm i Senat 1928–1933. S. 125.

** Гл.: Wybory do ciał ustawodawczych w województwie Nowogródzkim w r. 1928. Nowogródek, 1928. S. 188–189.

*** Гл.: Сяляне і Работнікі! // Воля працы. 8 сакавіка 1928. № 1. С. 2.

**** НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 54. Арк. 32.

Падтрымка змаганцаў забяспечыла Блоку нацыянальных меншасцяў у Наваградскім ваяводстве 27 247 галасоў (ледзь не напалову больш, чым на сеймавых выбарах), чаго якраз і хапіла для атрымання сенатарскага мандата. Першае месца з 65 045 галасамі тут заняў Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам, а з беларускіх 8984 галасы набраў спіс № 41 і 62 — спіс № 37*.

Такога выніку ў тых умовах змаганцам было дасягнуць вельмі няпроста, улічваючы тагачасныя зусім не вялікія магчымасці данясення сваёй пазіцыі да грамадства. Характэрны прыклад гэтага — вынікі галасавання на тым жа стагановіцкім Брольніцкім выбарчым участку. Ва ўмовах адсутнасці ў вёсцы самога зняволенага ўладамі Стагановіча, насельніцтва, даведаўшыся пра ануляванне спіса, за які яно збіраліся галасаваць, і не маючы ніякіх інструкцыяў, што ў такой сітуацыі належыць рабіць, проста не пайшло на выбары. З 810 мясцовых жыхароў, якія мелі права галасаваць на выбарах у Сенат, на ўчастак у Брольніках 11 сакавіка 1928 г. з'явіліся толькі 189, з якіх 120 апусцілі ў урны карткі з нумарамі ануляванага спіса (такія галасы паводле закону прызнаваліся несапраўднымі). З астатніх 69 чалавек 48 прагаласавалі за ББСУ, 19 — за Блок нацыянальных меншасцяў, а 2 — за спіс № 41**.

Дадаткова трэба таксама адзначыць, што перад гэтым, падчас выбараў у Сейм, самі змаганцы прыклалі нямала намаганняў, каб Рагулю здыскрэдытаваць, і не шкадавалі для гэтага чорнай фарбы. Так, пра ягоную партыю ў радыкальнай прэсе пісалася, што *«ролю падгалоскаў агентаў фашыстаўскай буржуазіі ўзялі на сябе, аб'ектыўна кажучы, дзве родныя сабе групы — Сельсаюз з Хадэкамі, або буржуазны блок меншасцяў»****, а самому Рагулю інкрымінаваўся *«публічны данос на выдатных дзеячаў беларускага працоўнага руху, разбіванне еднасці працоўных і ашуканства масаў»*****. Што гэткая агітацыя дзейнічала ў патрэбным

* Гл.: Rzepeссу, T. i K. Sejm i Senat 1928–1933. S. 194.

** Гл.: Wybory do ciał ustawodawczych w województwie Nowogródzkim w r. 1928. S. 244–245.

*** Два лягэры // Думка працы. 21 студзеня 1928. № 6. С. 1.

**** «Посьпехі» Рагулі ў Наваградчыне (Карэспандэнцыя з Наваградку) // Сіла працы. 4 лютага 1928. № 2. С. 2.

змаганцам кірунку, бачна па выніках выбараў у Сейм, асабліва ў найбольш апанаванымі змаганцамі Наваградскім (родным для Рагулі) і Слонімскім паветах. На Наваградчыне сеймавы спіс Блока нацыянальных меншасцяў здабыў усяго толькі 2215 галасоў, з іх 1970 — на гарадскіх і местачковых участках (гэта значыць у першую чаргу сярод яўрэйскага насельніцтва) і толькі 245 — на вясковых. На Слонімшчыне 1770 галасоў за БНМ размеркаваліся ў прапорцыі 1612 галасоў на гарадскіх і местачковых участках і 158 — на вясковых*.

Тым больш здзіўлялі пасля гэтага вынікі выбараў у Сенат. Для прыкладу, на Нягневіцкім выбарчым участку на сеймавых выбарах за «Змаганне» прагаласаваў 1041 чалавек, а за Блок нацыянальных меншасцяў — толькі 16, на сенацкіх жа выбарах БНМ на гэтым самым участку меў ужо 726 галасоў. На Яновіцкім участку ў тым жа павеце на сеймавых выбарах спіс № 39 атрымаў 1088 галасоў, у той час як спіс № 18 — аніводнага, а праз тыдзень на выбарах у Сенат за № 18 галасавалі ўжо 445 чалавек**. Несумненна, для таго каб магчы ў тых умовах так хутка рэгуляваць настроі выбарнікаў і паварочваць іх у патрэбны бок, пераадольваючы вынікі сваёй жа ранейшай супрацьлеглай агітацыі, трэба было праяўляць незвычайную актыўнасць і энергію, а галоўнае — карыстацца сярод насельніцтва незвычайным аўтарытэтам і даверам. Нездарма, прыгадваючы праз гады тую выбарчую кампанію, Васіль Рагуля прызнаваў, што *«вонкі нас засталіся самыя ідэйныя працаўнікі. Імі і былі былыя грамадоўцы»****.

Аляксандр Стагановіч вестку пра сваё выбранне ў паслы атрымаў у Наваградскай турме. Паводле польскіх законаў, зняволены пасол ці сенатар павінен быў вызваляцца для выканання сваіх абавязкаў, але толькі пасля таго, як гэтага на даручэнне большасці Сейма запатрабуе маршалак палаты. Дзеля таго да канца сакавіка Стагановіч заставаўся ў турме і быў вымушаны нават прапусціць першае паседжанне новага Сейма, якое адбылося

---

* Гл.: Mniejszości narodowe w wyborach do Sejmu i Senatu w r. 1928. Warszawa, 1928. S. 279, 283.

** Гл.: Mniejszości narodowe w wyborach do Sejmu i Senatu w r. 1928. S. 285.

*** Рагуля, В. Успаміны. С. 66.

27 сакавіка 1928 г.*. Аднак ужо на наступны дзень, 28 сакавіка 1928 г., ён разам з іншым беларусам Іванам Грэцкім, таксама зняволеным падчас выбарчай кампаніі, склаў урачыстую пасольскую прысягу**, а неўзабаве заняў пасаду скарбніка навастворанага Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клуба «Змаганне за інтарэсы сялян і работнікаў»***.

Акрамя Стагановіча, у клуб «Змаганне» ўвайшлі выбраныя на Наваградчыне з таго ж спіса Ігнат Дварчанін і Язэп Гаўрылік (апошні ўзначаліў клуб, а Дварчанін стаў ягоным намеснікам), а таксама вышэйзгаданы Іван Грэцкі, які прайшоў у Сейм у Брэсцкай выбарчай акрузе са спіса ўкраінскай левай партыі «Сельроб-лявіца» (фактычна, украінскі аналаг Грамады). Праз некалькі месяцаў да клуба «Змаганне» далучыўся таксама пасол Флягонт Валынец, абраны ў Лідскай акрузе са спіса Выбарчага камітэта беларускіх сялян і работнікаў, які сфармаваў і ўзначальваў вядомы беларускі дзеяч Янка Станкевіч. Сам Станкевіч знаходзіўся ў гэты час у вострым і прынцыповым канфлікце ледзьве не з усімі іншымі беларускімі дзеячамі, таму, хоць таксама атрымаў пасольскі мандат, ні да якой фракцыі ў Сейме не далучаўся, застаўшыся так званым дзікім паслом. Акрамя таго, паслы Фабіян Ярэміч, Альбін Стаповіч, Павел Каруза, Канстанцін Юхневіч, а таксама сенатары Васіль Рагуля і Вячаслаў Багдановіч, выбраныя са спіса БНМ, стварылі Беларускі пасольскі клуб (БПК) на чале з Ярэмічам. Узаемаадносіны паміж пасламі з розных беларускіх фракцый былі ад самага пачатку складаныя, што тлумачылася ў першую чаргу ідэалагічнымі прычынамі: калі для прадстаўнікоў БПК галоўнае значэнне, прынамсі дэкларатыўна, мела абарона нацыянальных правоў беларускага насельніцтва, то прадстаўнікі «Змагання» на першае месца (перадусім пад ціскам камуністаў) высоўвалі класавыя патрабаванні.

---

* Гл.: Sejm Rzeczypospolitej Polskiej. Okres II. Sprawozdanie stenograficzne z 1 posiedzenia z dnia 27 marca 1928 r.

** Гл.: Sejm Rzeczypospolitej Polskiej. Okres II. Sprawozdanie stenograficzne z 2 posiedzenia z dnia 28 marca 1928 r. Ł. 3.

*** Гл.: Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі... С. 33.

Вызваленне Аляксандра Стагановіча з-пад варты не азначала, што ўсе абвінавачанні супраць яго аўтаматычна здымаюцца. Гаворка магла ісці толькі пра адтэрміноўку заведзенай крымінальнай справы да заканчэння пасольскіх паўнамоцтваў, і тое пасля таго, як адпаведная прапанова будзе падтрымана Сеймам. 24 красавіка 1928 г. на чарговым сеймавым паседжанні якраз і разглядалася гэтае пытанне ў дачыненні да цэлага шэрагу парламентарыяў. Звычайна падобныя справы разглядаліся ў парламенце хутка і на карысць паслоў, аднак у дадзеным выпадку здарылася неспадзяванка: прапанова клуба «Змаганне» аб адтэрміноўцы справы, заведзенай падчас выбараў на яго сябраў Аляксандра Стагановіча і Івана Грэцкага, была адзінай з усіх большасцю ў 175 галасоў супраць 161 адхіленая*, дзеля чаго абодва паслы надалей заставаліся ў падвешаным стане — паліцыя ў любы момант магла іх арыштаваць. Не выключана, што пэўную ролю ў прыняцці Сеймам негатыўнага рашэння адыграла правакацыйнасць самога тону адпаведнай прапановы, пададзенай клубам. Перад гэтым яе рашуча адмовіўся падпісаць беларускі пасол Янка Станкевіч, вядомы ў беларускім грамадстве сваімі антыкамуністычнымі поглядамі, аргументаваўшы сваю пазіцыю тым, што дакумент, сфармуляваны падобным чынам, можа толькі пагоршыць становішча арыштаваных**. Як пасля аказалася, ён якраз меў рацыю, хоць за сваю пазіцыю і быў пасля жорстка раскрытыкаваны ў змаганскай прэсе***.

Аляксандр Стагановіч, такім чынам, ад самага пачатку выканання пасольскіх абавязкаў апынуўся ў вельмі няпэўным стане, аднак, нягледзячы на гэта, імкнуўся ў гэты час у меру сваіх магчымасцяў праводзіць актыўную дзейнасць. У Сейме, праўда, ягоная праца абмяжоўвалася толькі тым, што ён падпісваў разам з калегамі розныя інтэрпеляцыі і прапановы, прытым

---

* Гл.: Sejm Rzeczypospolitej Polskiej. Okres II. Sprawozdanie stenograficzne z 7 posiedzenia z dnia 24 kwietnia 1928 r. Ł. 31.

** Гл.: Białorusini. Białoruskie pzedstawicielstwo parlamentarne. Sprawa senatora B. Rahuli. Deklaracje białoruskie w Sejmie. Interpelacje. Prasa białoruska o wyborach i o pierwszych wystąpieniach posłów białoruskich // Sprawy Narodowościowe. 1928. № 2. S. 216.

*** Гл.: З Сойму // Голас працы. 28 красавіка 1928. № 5. С. 3.

не толькі тыя, якія падаваліся ўласным клубам ці ягонымі хаўруснікамі, але і тыя, якія падавалі парламентарыі з канкурэнтнай беларускай фракцыі — Беларускага пасольскага клуба*. Асноўная ж дзейнасць праводзілася Стагановічам па-за сценамі парламента. Так, 7 красавіка 1928 г. ён прысутнічаў на агульным з'ездзе сябраў Таварыства беларускай школы Наваградскага павета, які сабраўся ў сувязі з праведзенымі незадоўга перад гэтым арыштамі паводле абвінавачання ў правядзенні камуністычнай дзейнасці лідараў мясцовай управы ТБШ. Стагановіч выступіў з прамовай, у якой *«падкрэсліў неабходнасць правядзення ТБШ культурна-асветніцкай працы, згадаўшы ж пра арыштаваных сябраў Акруговай управы ТБШ, ён зазначыў, што яны былі добрымі працаўнікамі»***.

У тым жа самым месяцы Стагановіч зрабіў «інтэрвенцыю» ў наваградскім старостве адносна лёсу арыштаваных мясцовых радыкальных беларускіх дзеячаў***, а 1 траўня ён вёў прапагандысцкую дзейнасць сярод жыхароў Наваградка****. Усё гэта ацэньвалася польскімі ўладамі адназначна: *«згаданы ў справаздачны перыяд — да моманту арышту — карыстаючыся правам недатыкальнасці, праводзіў вельмі рашучую антыдзяржаўную дзейнасць»******.

24 траўня 1928 г. у памяшканні беларускай гімназіі ў Наваградку адбыўся яшчэ адзін акруговы з'езд ТБШ з удзелам 57 чалавек. Стагановіч узяў удзел і ў ім і ў выніку быў разам з іншымі мясцовымі актывістамі абраны ў наглядчую раду. Супрацоўнікі II аддзела Камандавання 9-й вайсковай акругі з цэнтрам у Брэсце акрэслілі пры гэтым у рапарце, што ўсе сябры новай наглядчай рады з'яўляюцца *«прыхільнікамі ці сябрамі КПЗБ»*******.

---

* Гл.: Sejm Rzeczypospolitej Polskiej. Okres II. Druk № 105, 134, 135, 141.

** CAW. Dowództwo Okręgu Korpusu IX. Sygn. I. 371.9/A.127. Podteczka 6; Archiwum Akt Nowych (AAN) w Warszawie. Ministerstwo Spraw Wewnętrznych (MSW) 1918–1939. Sygn. 1021-dopływy. S. 405.

*** Гл.: Наша хроніка. Інтэрвэнцыі Клюбу «Змаганьня» // Голас працы. 21 красавіка 1928. № 3. С. 4.

**** Гл.: Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі... С. 52.

***** CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I. 303.4.2706. K. 78.

****** CAW. Dowództwo Okręgu Korpusu IX. Sygn. I. 371.9/A.127. Podteczka 6.

Падобная ацэнка дзейнасці Аляксандра Стагановіча з боку польскіх уладаў не пакідала сумневаў адносна таго, што хутка яны могуць прыкласці намаганні, каб яе спыніць. Чакаць рашучых дзеянняў з боку паліцыі доўга не давялося: ужо 3 чэрвеня 1928 г. Стагановіч быў арыштаваны паліцыяй у Наваградку. На наступны дзень маршалак Сейма Ігнацы Дашынскі проста паведаміў пра гэта паслам, адзначыўшы, што іхнае папярэдняе рашэнне дапускае, што *«падчас следства па крымінальнай справе любы сродак крымінальнай працэдуры, які вядзе да мэты, вызначанай судом, можа быць ужыты»*. Зыходзячы з гэтага, маршалак адмовіўся ад асабістага ўмяшання ў дадзеную справу, тым самым фактычна даўшы судовым органам свабоду дзеянняў у дачыненні да Стагановіча*.

З такой пастаноўкай пытання не пагадзіліся калегі Стагановіча па клубе, якія падалі новую прапанову аб адтэрмінаванні крымінальнай справы і неадкладным вызваленні арыштаванага пасла. 8 чэрвеня 1928 г. з прамовай у гэтай справе з сеймавай трыбуны выступіў Ігнат Дварчанін, які звярнуў увагу на грубае парушэнне арт. 21 польскай Канстытуцыі, які адназначна вызначаў, што *«на працягу ўсяго часу дзеяння мандата паслы не могуць быць прыцягнутыя да судова-крымінальнай ці дысцыплінарнай адказнасці і пазбаўленыя волі без дазволу Сейма»*. Акрамя таго, ён паставіў пад сумнеў правільнасць працэдуры падліку галасоў паслоў пры першым разглядзе пытання аб адтэрміноўцы справы Аляксандра Стагановіча і Івана Грэцкага 24 красавіка 1928 г. Нягледзячы на тое што супраць прысваення прапанове клуба «Змаганне» статусу спешнай тут жа выказаліся пасол ад клуба ББСУ Багдан Падоскі і намеснік міністра юстыцыі Станіслаў Цар, маршалак усё ж быў вымушаны паставіць гэтае пытанне на пайменнае галасаванне, і ў выніку змаганцы атрымалі невялікую перамогу: за прысваенне прапанове статусу спешнай прагаласавалі 103 паслы супраць 85 тых, якія выказаліся супраць**. Аднак гэтым усё і скончылася:

* Гл.: Sejm Rzeczypospolitej Polskiej. Okres II. Sprawozdanie stenograficzne z 16 posiedzenia z dnia 4 czerwca 1928 r. Ł. 4.

** Гл.: Sejm Rzeczypospolitej Polskiej. Okres II. Sprawozdanie stenograficzne z 19 posiedzenia z dnia 8 czerwca 1928 r. Ł. 92–95.

іншага рашэння, для Стагановіча больш пазітыўнага, Сейм так і не прыняў. Праўда, паслы-змаганцы не забыліся пра свайго калегу і пастаянна нагадвалі Сейму пра ягонае становішча, як гэта зрабіў у выступленні з сеймавай трыбуны 12 чэрвеня 1928 г. Флягонт Валынец, аднак іхнае меркаванне ў гэтай справе пад увагу абсалютна не бралася*.

Зрэшты, самі калегі Стагановіча, прынамсі Дварчанін і Гаўрылік, у той час апынуліся ў даволі цяжкай сітуацыі, і праблема арышту таварыша не была для іх адзінай і найгалоўнейшай. Ад самага пачатку працы ў Сейме яны мусілі адчуць усе мінусы свайго ўваходжання ў парламент пры дапамозе камуністаў. У падзяку за падтрымку паслы-змаганцы вымушана пагадзіліся на тое, каб іхная парламенцкая тактыка накіроўвалася камуністычнай партыяй, а на паседжаннях клуба прысутнічаў прадстаўнік КПЗБ**. Апошні ж ад імя партыі патрабаваў ад паслоў правядзення ў сценах Сейма і за яго межамі такой працы, якая не зусім адпавядала іхнаму ўласнаму бачанню сваіх задачаў у якасці выбранцаў беларускага народа. Сакрэтная справаздача з сустрэчы старшыні клуба «Змаганне» Язэпа Гаўрыліка з дарадцам паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Польшчы Ю. Кацюбінскім, якая адбылася 30 ліпеня 1928 г., утрымлівае шмат фактаў, якія наўпрост сведчаць, што шматлікія «рэвалюцыйныя» дзеянні, пасля ўслаўленыя і распрапагандаваныя савецкай гістарыяграфіяй, камуністам даводзілася з паслоў-змаганцаў літаральна выціскаць. Так, Кацюбінскі сведчыў, што Гаўрылік *«увесь час падкрэсліваў, што ён не камуніст і з "Вашымі", як ён пастаянна кажа, ён нічога агульнага не мае, не адказвае за іх дурноту, але ў душы ён большы рэвалюцыянер, чым "Вашы"... Палітычна ён чалавек мала развіты і вельмі сыры. Ён лічыць, што ім трэба завязаць непасрэдную сувязь з Савецкай Беларуссю, бо сувязь з польскай Кампартыяй вельмі дыскрэдытуе. Наагул яны вельмі незадаволеныя гэтай сувяззю...»*.

---

* Гл.: Sejm Rzeczypospolitej Polskiej. Okres II. Sprawozdanie stenograficzne z 22 posiedzenia z dnia 12 czerwca 1928 r. Ł. 3–4.

** Гл.: Ковальский, Ю. С послами клуба «Змаганне» // Годы испытаний и мужества / сост. Н. С. Орехво, Н. С. Сташкевич. Минск, 1973. С. 97.

Таксама Гаўрылік лічыў памылкай, што *«Валынца адарвалі ад Станкевіча. Пагадзіліся на гэта яны пад ціскам апекуноў і вельмі пра гэта шкадуюць, бо Валынец зараз пад вялікай пагрозай... Другой памылкай яны лічаць наданне Таварыству беларускай школы палітычнага характару і, у прыватнасці, вылучэнне на кіроўныя ролі вядучых палітычных дзеячоў. Таму яны вырашылі зрабіць змену вярхушкі, вылучаючы на кіроўныя пасады менш прыкметных людзей. Яны лічаць, што Таварыства беларускай школы стаіць напярэдадні ліквідацыі, і яны хочуць "так здыпламатнічаць, што, не ідучы на ўгоду, захаваць Таварыства беларускай школы, а для гэтага не трэба мазоліць вочы паліцыі" [...] Ён паведаміў, што яны вырашылі купіць у Вільні вялікі дом, назваць яго Домам беларускай культуры і засяродзіць у ім усе культурныя беларускія ўстановы і арганізацыі.*

*Месяцы два таму меркавалася зліццё абодвух беларускіх нацыянальных камітэтаў на наступных умовах: 1) пратэст перад польскім урадам супраць асуджэння на працэсе грамадоўцаў самой Грамады як арганізацыі; 2) аб'яднаны нацыянальны камітэт бярэ на сябе ўтрыманне асуджаных і іх сем'яў; абодва камітэты спыняюць барацьбу і зліваюцца ў адзін камітэт....*

*Яны хацелі зладзіць зборы на зняволеных грамадоўцаў і, у прыватнасці, дэпутатаў. Збор яны хацелі зладзіць ад імя "Дабрачыннага таварыства"..., якое павінна, на іх думку, узяць апеку над зняволенымі, бо МОПР безнадзейны і абыходзіць беларусаў. З вялікай цяжкасцю адгаварыў іх ад гэтай справы.*

*Яны вырашылі, што Таварыства беларускай школы павінна прыняць удзел у "Торгах Полноцных", якія адкрываюцца 18 жніўня ў Вільні. Таварыства беларускай школы выставіць беларускія самаробныя вырабы. Прасілі прыслаць з Мінска экспанаты для іхнага павільёну. Я раіў не браць удзелу ў выставе, але яны ўжо купілі месца і адмовіцца ад удзелу не хочуць»*[*].

Гэтыя і іншыя супярэчнасці захоўваліся паміж пасламі «Змагання» ды камуністычнымі функцыянерамі і надалей і з цягам часу не толькі не змякчаліся, але ўсё больш паглыбляліся.

[*] Знешняя палітыка Беларусі: зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 3 (1928 г. — чэрвень 1941 г.) / склад. У. Міхнюк, У. Ракашэвіч, Я. Фалей, А. Шарапа. Мінск, 2001. С. 34–35.

Пасля ў высвятленні ўзаемных стасункаў давядзецца ўзяць непасрэдны ўдзел і Аляксандру Стагановічу. Пакуль жа ён сядзеў у Гродзенскай турме пад следствам, і далейшы ягоны лёс выглядаў зусім цьмяным, хоць ягоныя таварышы па клубе не трацілі надзеі, што ўрэшце ім удасца дабіцца вызвалення Стагановіча і спынення справы яго і Грэцкага. Паводле ўсё таго ж Кацюбінскага, *«двух дэпутатаў, выдадзеных сеймам, яны не замяняюць іншымі, бо спадзяюцца, што старыя будуць апраўданыя судом. Калі будзе суд, невядома, але верагодна, што не хутка»*[*].

Аднак жа ў апошнім выпадку засцярогі паслоў «Змагання» аказаліся беспадстаўнымі, і чакаць суда над Стагановічам давялося не так і доўга. Ужо 14 верасня 1928 г. наваградская пракуратура скончыла падрыхтоўку абвінаваўчага акта па справе Стагановіча і іншых асобаў, абвінавачаных у камуністычнай дзейнасці, а 25 верасня 1928 г. гэты акт быў перасланы ў Наваградскі акруговы суд[**]. Падчас судовага працэсу, які пачаўся ў Наваградку 27 лістапада і доўжыўся да 3 снежня 1928 г., на лаве падсудных, апрача Стагановіча, сядзелі яшчэ 20 чалавек, і ўсе яны абвінавачваліся ў камуністычнай дзейнасці на тэрыторыі Наваградскага і Баранавіцкага паветаў. Як сцвярджалася ў прэамбуле да абвінаваўчага акта, *«таемная паліцыя ў 1927 і 1928 гадах устанавіла, што на тэрыторыі Наваградскага ваяводства, асабліва Баранавіцкага і Наваградскага паветаў, існуе камуністычная арганізацыя, дзеянні якой, што пацвярджалася неаднаразова раней, сталі легалізаванымі, яна выступае адкрыта з камуністычнымі адозвамі да насельніцтва, вывешвае чырвоныя сцягі і заклікі антыўрадавага зместу, агітуе за пераварот, ладзіць камуністычныя дэманстрацыі. У сувязі з выбарамі ў Сейм і Сенат камуністычная арганізацыя разгарнула інтэнсіўныя агітацыйныя дзеянні. Гэтая ж самая паліцыя ўстанавіла, што сябры партыі арганізуюць канферэнцыі, на якіх абмяркоўваюцца справы партыі, у арганізацыі ёсць агнястрэльная зброя, а таксама ўсё патрэбнае для друку адозваў. На падставе гэтых звестак*

[*] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 3 (1928 г. — чэрвень 1941 г.). С. 34.

[**] Гл.: Наша хроніка. Яшчэ вялікі працэс беларускага сялянства, на чале з паслом Стагановічам // Слова працы. 17 кастрычніка 1928. № 5. С. 4.

*у пачатку сакавіка 1928 года была распачата ліквідацыя гэтай арганізацыі»**.

Як высветлілася падчас працэсу, у адносінах да Стагановіча следства, нягледзячы на ўсе намаганні, так і не здолела знайсці бясспрэчных доказаў ягонай віны, у той час як сведчанняў на ягоную карысць было даволі шмат. Цікава, што нават навагардскі староста Грынеўскі выступаў на працэсе сведкам ад абароны і сказаў пра Стагановіча, што *«знае яго як вельмі добрага селяніна і чыннага дзеяча на грунце земляробчай вытворчасці»***. Сведка Гутовіч, грамадзянін з Наваградскага павета, сусед Стагановіча, акрэсліў яго як добрага грамадскага дзеяча, які *«досыць добра адносіўся да "зямяньства"»*. Да падобнай характарыстыкі далучыўся таксама і дзеяч мясцовага сельскагаспадарчага таварыства Сенажэцкі. Добрую характарыстыку Стагановічу далі і ягоныя палітычныя апаненты з ліку беларускіх дзеячаў. Так, Васіль Рагуля засведчыў, што, нягледзячы на палітычныя непаразуменні з Стагановічам, ён не лічыць апошняга камуністычным дзеячам, а наконт колішняга выбарчага спіса «Змагання» сказаў, што гэта *«беларускі радыкальна-нацыянальны спісак, фундаментам якога з'яўляюцца сацыяльныя пачаткі»*. У той жа час Міхал Чатырка адзначыў, што падчас працы ў Таварыстве беларускай школы Стагановіч *«даў дужа прыкладаў сваёй ахвярнасці»****. У выніку 5 чалавек былі асу-

---

* На жаль, падчас працы над дадзенай прадмовай яе аўтар не меў доступу да арыгінальных матэрыялаў судовага працэсу (якія, паводле Збігнева Запароўскага, захоўваюцца ў: AAN. Archiwum Teodora Duracza. Sprawa N. Andrejuka i in. Sygn. 105/1255) і дзеля таго быў вымушаны тут і далей выкарыстоўваць рускамоўны пераклад абвінаваўчага акта, які захоўваецца ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі і быў ласкава прадастаўлены аўтару супрацоўнікам дадзенага музея Андрэем Вашкевічам (вялікі яму за гэта дзякуй). Дзеля таго поўную і літаральную адпаведнасць з арыгіналам усіх прыведзеных з дадзенага дакумента цытат гарантаваць цяжка (тым больш што і сам гэты рускамоўны пераклад — не надта высокай якасці), аднак жа ўяўленне пра агульны характар доказнай базы, якую следчыя здолелі сабраць супраць Стагановіча і іншых абвінавачаных, з гэтага матэрыялу скласці, несумненна, можна (калі і ёсць нейкія скажэнні, то наўрад ці яны маюць прынцыповы характар).

** Наша хроніка. Вялізарны палітычны працэс у Наваградку // Да працы. 1 сьнежня 1928. № 1. С. 5.

*** З палітычнага працэсу ў Наваградку // Да працы. 8 сьнежня 1928. № 3. С. 1–2.

джаныя судом на 8 гадоў зняволення, 8 — на 4, а астатнія, у тым ліку і Стагановіч, былі апраўданыя*. У выніку гэтага Аляксандр Стагановіч займеў магчымасць вярнуцца да выканання сваіх пасольскіх абавязкаў, што і зрабіў, адразу ж пасля вызвалення з-пад варты выехаўшы ў Варшаву.

Вяртанне Стагановіча ў Сейм адбылося ў спецыфічных умовах. Фактычна адразу ж пасля прыезду, 7 снежня 1928 г., яму давялося ўдзельнічаць у клубным паседжанні, на якім абмяркоўвалася дзейнасць Ігната Дварчаніна, скіраваная на дасягненне кампрамісу і супрацоўніцтва ў важных агульнанацыянальных справах з іншымі беларускімі пасламі — ідэалагічнымі праціўнікамі змаганцаў. Паводле інфармацыі польскай выведкі, 4 лістапада 1928 г. Дварчанін заключыў пагадненне з БСС і БХД, згодна з якім прадугледжвалася ўтрыманне адзінага нацыянальнага фронту на культурніцкім грунце. Хаўрус заключылі на «свабоднай» аснове, гэта значыць кожная арганізацыя магла праводзіць сваю далейшую працу згодна з уласнымі праграмнымі і тактычнымі ўстаноўкамі, але пры гэтым прадугледжвалася ўстрыманне ад узаемных нападак у прэсе. Пагадненне, праўда, не прадугледжвала далучэння да яго Янкі Станкевіча, дзейнасць якога была ацэненая як *«шкодная і нават правакацыйная»***.

Паводле звестак, атрыманых супрацоўнікамі II аддзела Генеральнага штаба Войска Польскага, падчас згаданага паседжання пачынанні пасла Дварчаніна былі сябрамі клуба жорстка раскрытыкаваныя, а Стагановіч разам з Ф. Валынцом і Я. Гаўрылікам выказаўся за тое, што *«тактыка павінна больш яскрава ісці ў левым напрамку, у тым ліку і ў adносінах да іншых арганізацый»*. Аднак у іншым месцы той жа справаздачы супрацоўнікі II аддзела, зрабіўшы спробу падзяліць усіх сябраў БСРПК і іхных сімпатыкаў ды супрацоўнікаў на правую, цэнтрысцкую і левую плыні, адносна Стагановіча зрабіць гэта выразна не здолелі, падкрэсліўшы, што ягоная пазіцыя нявызначаная***.

---

* Гл.: З палітычнага працэсу ў Наваградку // Да працы. 12 сьнежня 1928. № 4. С. 2.

** CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I. 303.4.2706. K. 194.

*** CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I. 303.4.2706. K. 196.

Службоўцам II аддзела падалося надта дзіўным, што *«лявіца БСРПК больш чым месяц цярпела акцыю пасла Дварчаніна, не знаходзячы ў ёй анічога заганнага, і што толькі 7 снежня 1928 г. Клуб прыйшоў да згаданага пераканання»*. Дзеля таго прыпушчалася, што *«ўсталяванне кантакту з дробнамяшчанскімі партыямі Клуб зрабіў самастойна і пад уласную адказнасць, з ініцыятывы пасла Дварчаніна, якому з "нацыянальнай правіцы" ішоў у гэтым выпадку насустрач з працягнутай рукой кс. Адам Станкевіч з БХД. Аднак жа вышэйстаячая ўлада, у дадзеным выпадку несумненна КПЗБ, а можа нават і Мінск, рашуча выказалася супраць падобнай камбінацыі, заключанай насуперак камуністычнаму сумленню»**.

Ёсць усе падставы прызнаць слушнасць гэткіх высноў супрацоўнікаў польскіх спецслужбаў, бо яны не супярэчаць тым звесткам, якія мы атрымліваем пра тагачасную сітуацыю ў клубе «Змаганне» з камуністычных крыніцаў. Апошнія сведчаць, што на мяжы 1928 і 1929 гг. унутраныя супярэчнасці ў клубе абвастрыліся настолькі, што куратарам ад КПЗБ даводзілася пра іх згадваць ледзь не ў кожным сваім лісце-справаздачы. Так, у канцы студзеня 1929 г. адзін з такіх куратараў (магчыма, Лявон Мэнке) пісаў: *«Узаемныя адносіны ў сяброў не такія добрыя. Францішак* (хто менавіта з паслоў меўся на ўвазе пад гэтай мянушкай, пакуль дакладна не вядома, але з кантэксту падаецца, што Флягонт Валынец. — *А. П.*) *незадаволены Г[аўрылікам] (я Вам ужо пісаў пра гэта). Ф[ранцішак] даў шэраг прыкладаў, дзе сапраўды Г[аўрылік] не ў парадку, такой жа самай думкі і Улад[ак]. Я намагаўся супакоіць яго і звярнуць увагу на неабходнасць у далейшым правесці тую ж самую лінію. Пасля дадзенай размовы ён супакоіўся і прызнаў, што мы маем рацыю, спадзяюся, што ўдасца бязбольна гэта ўсё вырашыць. Вядома, даводзіцца лавіраваць, але нічога»***.

2 лютага 1929 г. іншы куратар клуба ад КПЗБ Арсень Канчэўскі (пс. Уладак) таксама наракаў у справаздачы свайму начальству: *«Г[аўрылік], на якога, безумоўна, найбольш пасрэдна і беспасрэдна (часта міма яго волі) мае ўплыў белсанацыя, вельмі часта робіць глупствы. [...] Прымаючы пастанову аб уваходзе*

* CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I. 303.4.2706. K. 195–196.

** НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 217. Арк. 7.

*Г[аўрыліка] у тройку, мы не ўчлі, што, канцэнтруючы ў яго руках старшын[ства] і скарбн[ікоўства], не толькі стаўляем яго ў курс усіх спраў, але робім яго фактычным кіраўніком клуба. Нараканні Франціішка на тое, што на ім ляжыць фактычнае кіраўніцтва і адказнасць, калі ён ува ўсіх драбніцах залежыць ад Г[аўрыліка], што часта нават падрывае яго аўтарытэт, маюць пэўную падставу. Уважаем, што трэба ўзяць курс на скарбнікоўства іншага чалавека, хоць бы Гр[эцкага], а такжа большую калектывізацыю працы»**. Там жа Канчэўскі адзначаў, што *«кампанія па барацьбе з голадам сустракаецца з поўным незразуменнем яе значэння як у партыі, так і пасярод нацыянальна-вызваленчых колаў, а ў першую чаргу ў Б.С.Р. Клубе... У пас[ольскім] Клубе ізноў некаторыя адзінкі хварэюць на баязнь перад масамі»***.

Характэрна, што ва ўсіх дагэтуль выяўленых рэляцыях камуністычных куратараў клуба «Змаганне», датычных перыяду студзеня — лютага 1929 г., нідзе і ў аніякім кантэксце не фігуруе прозвішча (або нейкія празрыстыя крыптанімы ці ініцыялы) Аляксандра Стагановіча. Рызыкнем прыпусціць, што гэты дзеяч неўзабаве пасля выхаду з турмы нейкім чынам недвухсэнсоўна засведчыў камуністам, што не мае намеру праводзіць дзейнасць у адпаведнасці з накрэсленай імі лініяй, альбо ім самім падалося надзвычай падазроным ягонае вызваленне з турмы паводле рашэння польскага суда, і дзеля таго яны не выключалі нейкіх нечаканасцяў з ягонага боку. Недавер камуністаў да Стагановіча, а таксама малавядомасць і малааўтарытэтнасць асобы апошняга ў асяроддзі беларускіх нацыянальных дзеячаў за межамі Наваградчыны і ў сувязі з гэтым ягоная лёгкая замяняльнасць без асаблівай шкоды для справы схілялі камуністаў да рашэння аб ягонай замене на іншага пасла, ад якога можна было б спадзявацца больш рашучага і паслядоўнага правядзення камуністычнай лініі ў клубе «Змаганне». Сам Стагановіч, відаць, пра намеры камуністаў адносна яго ведаў ці прынамсі здагадваўся, змагацца за захаванне свайго мандата не збіраўся і дзеля таго ва ўнутраныя справы клуба асабліва не ўмешваўся. Праўда, ягоныя подпісы ў гэты час можна знайсці пад некаторымі прапановамі

* НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 211. Арк. 45.

** НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Адз. зах. 211. Арк. 47.

і інтэрпеляцыямі, якія падаваліся клубам «Змаганне» і іншымі хаўруснымі гэтаму клубу фракцыямі*, але гэта цяжка лічыць актыўным удзелам у працы клуба. Магчыма, і ўвогуле Стагановіч большую частку часу тады праводзіў па-за Варшавай, тым больш што і Сейм у студзені 1929 г. збіраўся на паседжанні толькі эпізадычна, а калі ад канца гэтага месяца стаў збірацца штодзённа, то 7 лютага 1929 г. Стагановіч узяў сабе афіцыйны адпачынак на 9 дзён**. Дзеля таго і не згадвалася ягонае прозвішча ў камуністычных справаздачах — Стагановіч проста сам не даваў да гэтага асаблівых нагодаў.

Затое рэгулярна ў гэтых справаздачах на пачатку 1929 г. з'яўлялася прозвішча селяніна са Слонімшчыны і аднаго з тагачасных чальцоў Галоўнай управы ТБШ, а адначасова сябра КПЗБ Паўла Крынчыка, які на парламенцкіх выбарах 1928 г. у Наваградскай акрузе стаяў на выбарчым спісе «Змагання» на чацвёртым месцы і, паводле патрабаванняў выбарчага закону, мог замяніць у Сейме любога з паслоў з гэтага спіса ў тым выпадку, калі б той памёр, дзеля нейкай прычыны быў пазбаўлены мандата ці сам ад яго адмовіўся. У справаздачах Крынчык фігуруе ў кантэксце выключна пазітыўным (натуральна, з камуністычнага гледзішча). Напрыклад, у справаздачы за канец студзеня 1929 г. пісалася: *«Робім захады, каб сабраць культурнікаў* (г. зн. дзеячаў Таварыства беларускай школы. — *А. П.*) *на маленькую нараду... К[рынчык] напісаў, што ён з намі і гатовы на ўсё, што яму загадаюць. Мы ўказалі канкрэтна на форму, як арганізаваць гэтую нараду (у нашым духу), на днях я буду ведаць падрабязнасці»****. 2 лютага 1929 г. Арсень Канчэўскі, пішучы пра ўнутраную барацьбу ў кіраўніцтве ТБШ паміж прыхільнікамі камуністаў і іх апанентамі, згадаў, што *«Кр[ынчык], які заявіў аб поўнай салідарнасці з намі, паставіць ультыматыўна справу склікання з'езда або канферэнцыі прадстаўнікоў управаў. Паколькі на гэта тройка не дасць згоды, Кр[ынчык] выступае з яе складу і супольна з Д. ад імя старай управы і рэвізійнай камісіі склікаюць прадстаўнікоў управаў дзеля*

* Гл.: Sejm Rzeczypospolitej Polskiej. Okres II. Druk № 378, 385, 422, 423, 424.

** Гл.: Sejm Rzeczypospolitej Polskiej. Okres II. Sprawozdanie stenograficzne z 47 posiedzenia z dnia 7 lutego 1929 r. Ł. 3.

*** НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 217. Арк. 6.

*выбару новай камісіі, якая павінна будзе склікаць агульны з'езд ТБШ»*[*]. Дзеля таго выглядала цалкам рэальным, што праз увядзенне ў склад пасольскага клуба «Змаганне» сапраўды ідэйнага і актыўнага камуніста П. Крынчыка КПЗБ удасца ўзмацніць сваё кіраванне ім (другі член КПЗБ у складзе «Змагання», Іван Грэцкі, да таго часу не праявіў якасцяў, неабходных для таго, каб перахапіць кіраўніцтва клубам з рук Язэпа Гаўрыліка і Ігната Дварчаніна). Сам Крынчык, паводле ягоных уласных успамінаў, у той час *«паводле распараджэння ЦК быў вызвалены ад актыўнага кіравання масавымі акцыямі і падтрымліваў сувязь толькі з абмежаванымі адказнымі таварышамі, бо з-за няўдалага выбару кандыдатаў мандаты атрымалі людзі недысцыплінаваныя, і ў бліжэйшы час прыйдзецца аднаго з іх адклікаць, каб даць магчымасць атрымаць мандат мне»*[**].

25 лютага 1929 г. адбылося паседжанне Краёвага бюро ЦК КПЗБ, прысвечанае пытанню партыйнага кіраўніцтва беларускім нацыянальна-вызваленчым рухам, на якім была сярод іншага прынятая наступная пастанова:

*«а) Даручыць С[акратарыя] ту тэрмінова азнаёміцца з [кандыдатурай] Кр[ынчыка] і канчаткова вырашыць пытанне пра яго.*

*б) У выпадку станоўчага вырашэння пытання аб ягонай кандыдатуры, лічыць неабходным ягонае ўваходжанне ў склад кл[уба].*

*в) С[акратарыя]т прыме ўсе захады для паскарэння складання паўнамоцтваў С[тагановi]чам»*[***].

Усе пункты гэтай пастановы былі аператыўна выкананыя. Кандыдатура Паўла Крынчыка, як адзначалася вышэй, выклікала ў той час у заходнебеларускіх камуністаў толькі станоўчыя эмоцыі, і таму Аляксандр Стагановіч неўзабаве падаў маршалку Сейма заяву аб сваёй адмове ад пасольскага мандата. У Сейме пра гэта афіцыйна аб'явілі на паседжанні 13 сакавіка 1929 г.[****],

[*] НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 217. Арк. 42.

[**] Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. Ф. 27444 (Крынчик, П. С идеями Карла Маркса, Фридриха Энгельса, Владимира Ильича Ленина – дорогой народовольцев я пошел в народ (Краткие воспоминания. II часть). С. 18.

[***] НАРБ. Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 4292. Арк. 38–39.

[****] Гл.: Sejm Rzeczypospolitej Polskiej. Okres II. Sprawozdanie stenograficzne z 57 posiedzenia z dnia 13 marca 1929 r. Ł. 4.

і якраз з гэтага часу Стагановіч пераставаў быць паслом. Праз адно паседжанне, 20 сакавіка 1929 г., прысягу прыняў ягоны наступнік Павел Крынчык*.

Са з'яўленнем у складзе клуба «Змаганне» Крынчыка і без таго няпростыя адносіны тут яшчэ больш абвастрыліся. Камуністы зрабілі на яго галоўную стаўку пры рэалізацыі сваёй палітыкі поўнага кіравання клубам, а сам ён імкнуўся чаканні, якія на яго ўскладаліся, апраўдваць. Таму Крынчык у сваёй дзейнасці часта дазваляў сабе дэманстратыўна ігнараваць думку кіраўніцтва клуба, пра што сам згадваў у пазнейшых успамінах**. Такія ягоныя паводзіны выклікалі ўсё больш актыўнае непрыманне і нават абурэнне астатніх членаў клуба, што правакавала сталыя канфлікты як на асабістай, так і на палітычнай глебе, якія працягваліся фактычна да самага заканчэння існавання клуба ў жніўні 1930 г. пасля датэрміновага роспуску прэзідэнтам Польшчы парламента. Аднак падрабязна спыняцца на разглядзе гэтай цікавай праблемы ў межах нашага даследавання немэтазгодна, бо асноўны герой, Аляксандр Стагановіч, да дадзеных канфліктаў аніякага дачынення ўжо не меў***.

Што ж тычыцца лёсу гэтага дзеяча пасля ягонага сыходу з Сейма, то даўно планаваная заходнебеларускімі камуністамі, але даволі нечаканая для шырокай грамадскасці адмова Стагановіча ад мандата не магла абысціся без розных чутак і прыпушчэнняў на гэты конт. Польскія чыноўнікі з Міністэрства ўнутраных спраў здагадваліся пра тое, што тут не абышлося без уплыву КПЗБ, і нават мелі звесткі (невядома, з наколькі верагоднай крыніцы), што *«пасол Стагановіч перад атрыманнем мандата падаў Антону Мальцу (дзеяч КПЗБ, які цяпер знаходзіцца ў турме)*

---

* Гл.: Sejm Rzeczypospolitej Polskiej. Okres II. Sprawozdanie stenograficzne z 59 posiedzenia z dnia 20 marca 1929 r. Ł. 3–4.

** Гл.: Кринчик, П. «Неприкосновенность» послов // Годы испытаний и мужества / сост. Н. С. Орехво, Н. С. Сташкевич. Минск, 1973. С. 75.

*** Часткова праблема ўзаемаадносінаў у клубе «Змаганне» пасля адмовы ад мандата Аляксандра Стагановіча знайшла адлюстраванне ў артыкуле: Пашкевіч, А. КПЗБ і Беларускі сялянска-работніцкі пасольскі клуб «Змаганне» ў 1928–1930 гг.: некаторыя аспекты супрацоўніцтва // Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў: зборнік навук. артыкулаў / рэдкал.: І. Крэнь, У. Навіцкі, В. Белазаровіч (адк. рэд.) і інш. Гродна, 2006. С. 168–174.

*дэкларацыю, у якой абавязаўся адмовіцца ад пасольскага мандата на патрабаванне КПЗБ»**. У бачанні ж супрацоўнікаў II аддзела Генеральнага штаба сітуацыя выглядала так: *«У апошні час у асабовым складзе БСРПК адбылася персанальная змена: пакінуў клуб пасол Стагановіч, які адрокся ад мандата на пажаданне КПЗБ. Матывы адмовы павінны быць наступныя: Стагановіч абвінавачваўся ў камунізме, але Акруговы суд яго апраўдаў. КПЗБ, відавочна баючыся, каб ён не пайшоў па слядах Астроўскага (*маецца на ўвазе Радаслаў Астроўскі, які быў апраўданы падчас судовага працэсу над лідарамі БСРГ і пасля гэтага перайшоў да супрацоўніцтва з польскімі ўладамі. *— А. П.), запатрабавала, у асобах Гаўрыліка і Дварчаніна, каб ён праводзіў камуністычную акцыю. Стагановіч нібыта супраціўляўся гэтаму і таму мусіў адмовіцца ад мандата, бо КПЗБ пагражала яму далёка ідучымі наступствамі»***.

Каб хоць неяк апраўдаць свой крок і адвесці ад сябе падазрэнні ў прыналежнасці да камуністычнай партыі і дзеяннях у адпаведнасці з яе дырэктывамі, сам Стагановіч заяўляў, што падставай для адмовы ад мандата былі сямейныя прычыны і жаданне падняць занядбаную апошнім часам гаспадарку, аднак такое тлумачэнне нікога асабліва не пераконвала і падавалася малаверагодным (асабліва ўлічваючы надзвычай высокія пасольскія заробкі, якія развіццю гаспадаркі маглі толькі спрыяць). Праз паўгода пытанне, што прымусіла Стагановіча адмовіцца ад выканання пасольскіх абавязкаў, узнікла ўжо на апеляцыйным судзе ў Вільні, і гэтым разам ён паспрабаваў патлумачыць матывы сваіх дзеянняў праблемамі са здароўем і недастатковым узроўнем адукацыі. Праўда, на суддзяў і гэтыя аргументы не зрабілі вялікага ўражання, бо, паводле іх, *«абвінавачаны не робіць уражання цяжка хворага чалавека... і пры гэтым агульнавядома, што і многія іншыя паслы маюць вельмі малую адукацыю, што ім не замінае мець мандаты»****. Натуральна, сам па сабе факт адмовы ад выканання пасольскіх абавязкаў з якой бы то ні было прычыны не з'яўляўся паводле польскага заканадаўства злачынствам, аднак для абвінаваўцаў

* AAN. MSW 1918–1939. Sygn. 1032-dopływy. K. 52.

** CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I. 303.4.2706. K. 12.

*** НАРБ. Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 18474. Арк. 27.

Стагановіча гэтая цьмяная справа стала лішнім доказам цесных сувязяў былога пасла з камуністычнай партыяй і нават асабістага ў ёй сяброўства. Урэшце, як вядома, суд афіцыйна прызнаў Стагановіча ўдзельнікам «камуністычнай змовы» і прысудзіў за гэта да вялікага тэрміну зняволення.

Думаецца, якраз у гэтым месцы самы час паразважаць: наколькі суд меў рацыю і наколькі Стагановіч быў асабіста звязаны з камуністамі? Тое, што пэўныя сувязі, і нават даволі шчыльныя, ён з імі меў (як і любы дзеяч тагачаснага levарадыкальнага беларускага руху), сумненняў, натуральна, не выклікае. Але ці быў ён хоць бы на нейкім этапе сваёй біяграфіі сябрам камуністычнай партыі? Сярод нешматлікіх сучасных біёграфаў Стагановіча адзінства ў гэтым пытанні няма. Так, Вячаслаў Даніловіч у біяграме гэтага дзеяча, прыкладзенай у дадатку да сваёй манаграфіі, наўпрост сцвярджае, што Стагановіч быў сябрам не толькі БСРГ і ТБШ (у чым аніякіх сумневаў у нікога, у тым ліку і ў аўтара гэтай працы, не ўзнікае), але і КПЗБ*. Аднак жа ў асноўным тэксце гэтай манаграфіі аўтар сам гэтаму адназначнаму сцверджанню і супярэчыць, пішучы пры характарыстыцы персанальнага складу пасольскага клуба «Змагання», што *«ўсе паслы былі членамі БСРГ, а Я. Грэцкі — яшчэ і камуністам»***. Адмысловае падкрэсліванне камуністычнасці Грэцкага (а што якраз гэты дзеяч камуністам быў — факт даказаны) лагічна мусіць прыводзіць да высновы, што тады ўсе астатнія паслы «Змагання», у тым ліку і Стагановіч, камуністамі не з'яўляліся. Згаданая супярэчнасць у звестках у першую чаргу сведчыць пра тое, што Даніловічу не ўдалося выявіць нейкіх дакладных і неаспрэчных звестак пра сапраўдную партыйную прыналежнасць Стагановіча, і дзеля гэтага ён не змог заняць па гэтай праблеме выразна акрэсленай і паслядоўнай пазіцыі, ды, хутчэй за ўсё, і не лічыў яе асабліва важнай для дасягнення мэтаў і задачаў свайго даследавання.

У адрозненне ад В. Даніловіча польскі даследчык з Любліна Збігнеў Запароўскі ў тым, што Стагановіч несумненна з'яўляўся сябрам КПЗБ, перакананы цвёрда. Ён паслядоўна праводзіць

* Гл.: Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі... С. 152.

** Гл.: Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі... С. 35.

гэтую думку ва ўсіх сваіх працах, датычных тэмы*, аж да таго, што ў адмысловым артыкуле для «Польскага біяграфічнага слоўніка» Стагановіч з самага пачатку пададзены як *«селянін, беларускі камуністычны дзеяч»*.

Аднак жа да высноваў гэтага даследчыка ў дадзеным пытанні трэба ставіцца вельмі асцярожна, бо праведзены намі крытычны аналіз біяграмы Стагановіча, падрыхтаванай З. Запароўскім для «Польскага біяграфічнага слоўніка», паказаў, што яна ўтрымлівае надзвычай шмат як дробных недакладнасцяў, так і сур'ёзных фактаграфічных памылак. Так, паводле Запароўскага, Стагановіч вярнуўся ў Заходнюю Беларусь з Францыі толькі ў 1925 г., у той час як гэта адбылося яшчэ ў 1921 г., а пасля вяртання дзейнічаў, нібыта, не толькі ў КПЗБ, але і ў Камуністычным саюзе моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ). Апошняе сцверджанне выглядае зусім непраўдападобным, калі ўлічыць далёка ўжо не камсамольскі ў той час узрост Стагановіча. Нічога не ведаў З. Запароўскі пра факт арышту Стагановіча перад выбарамі ў Сейм у сакавіку 1928 г. і вымушанае вызваленне яго ўладамі толькі пасля набыцця ім пасольскага мандата. Польскі даследчык адзначыў толькі, што *«ў сакавіку 1928 г. паліцыя ліквідавала структуры Акруговага камітэта КПЗБ у Баранавічах, ажыццяўляючы шматлікія арышты, канфіскуючы зброю, камуністычныя ўлёткі і брашуры. У следстве з'явілася прозвішча Стагановіча, але пасольскі імунітэт ахоўваў яго перад арыштам»*. Здзіўляе інтэрпрэтацыя Запароўскім факта падавання калегамі Стагановіча па пасольскім клубе прапановы Сейма адтэрмінаваць разгляд крымінальнай справы супраць дзеяча на час выканання ім пасольскіх абавязкаў. Даследчык гаворыць пра «непрадуманы» (*nieopatrzny*) крок, хоць у тых умовах падобныя захады якраз былі абсалютна натуральнымі і лагічнымі, бо рабіліся адначасова з чальцамі іншых пасольскіх клубаў, якія сутыкнуліся з аналагічнымі праблемамі. Урэшце, згадаўшы пра новы арышт Стагановіча (ужо як пасла) 3 чэрвеня 1928 г. і пра наступны суд

* Гл.: Zaporowski, Z. Sejm Rzeczypospolitej Polskiej 1919–1939. Działalność posłów, parlamentarne koncepcje Józefa Piłsudskiego, mniejszości narodowe. Lublin, 1992. S. 35, 204; Zaporowski, Z. Białorusini w Sejmie RP II kadencji 1928–1930 // Annales Universitatis Mariae Curie-Skłodowska. Lublin — Polonia. 1999/2000. Sectio F. Vol. LIV–LV. S. 254; Zaporowski, Z. Staganowicz Aleksander // Polski Słownik Biograficzny. T. 41. Z. 170. Kraków, 2002. S. 461.

над ім, Запароўскі ані словам не згадвае, што гэтым самым судом пасол быў першапачаткова апраўданы і яшчэ нават вярнуўся ў Сейм у якасці пасла, а асуджаны быў на 6 гадоў турмы (а не на 5, як сцвярджае Запароўскі) толькі праз год, ужо пасля адмовы ад сеймавага мандата (якая, зноў-такі, адбылася не 20 лютага, а 13 сакавіка 1929 г.)*. Усё вышэйадзначанае дазваляе зрабіць выснову, што аўтар вывучыў як біяграфію Аляксандра Стагановіча, так і спецыфіку агульнай сітуацыі ў тагачаснай Заходняй Беларусі ўсё ж не так грунтоўна, як бы гэта належала, і дзеля таго да ягоных высноваў трэба ставіцца вельмі крытычна. Падобна, што надзвычай вялікае ўздзеянне на фармаванне думкі З. Запароўскага пра заходнебеларускі радыкальны рух левай арыентацыі і ягоных актыўных дзеячаў зрабіла выкарыстанне ў якасці крыніцаў для даследаванняў перадусім матэрыялаў тагачасных польскіх адміністрацыйных і паліцэйскіх установаў, супрацоўнікі якіх часта былі схільныя трактаваць любую праяву беларускага руху як камуністычную дзейнасць і не надта жадалі глыбей разбірацца ў гэтай праблеме**. Між тым праблема гэтая зусім не такая простая і мае шмат нюансаў, што выразна высвятляецца пры спробе супаставіць афіцыйныя польскія матэрыялы з тымі, якія выйшлі з беларускіх нацыянальных ці з камуністычных асяродкаў.

Характэрна, што нават два польскія суды, перад якімі Стагановічу давялося выступаць у якасці абвінавачанага і нават адзін раз быць асуджанаму на значны тэрмін зняволення за сваю нібыта прыналежнасць да КПЗБ, мелі ў сваім распараджэнні вельмі супярэчлівую доказную базу, наўпраставых жа і адна-

---

* Гл.: Zaporowski, Z. Staganowicz Aleksander. S. 461.

** Характэрны ў гэтых адносінах фрагмент абвінаваўчага акта на працэсе ў Наваградку, у якім сцвярджаецца, што *«дапытаны следствам старэйшы паліцыянт Лабяк паведаміў, што кандыдатамі на паслоў у Сейм спісу № 39, а таксама ўпаўнаважанымі ці сакратарамі акруговага камітэта гэтага спісу маглі быць выбраныя толькі члены КПЗБ»*. Аднак пра тое, што не ўсё было так адназначна, сведчыць хоць бы прыклад Ігната Дварчаніна і Язэпа Гаўрыліка, якія стаялі ў выбарчым спісе № 39 на другім і трэцім месцах адпаведна, але справа аб іх уступленні ў партыю не была вырашана дзеля іхнага асабістага нежадання стаць камуністамі, нават і праз 2 гады пасля выбараў. Урэшце Я. Гаўрылік быў проста пастаўлены перад фактам: яго залічылі ў партыйныя шэрагі без ягонага ведама і без падачы адпаведнай заявы. Гл.: Адамушка, У. Язэп Амяльянавіч Гаўрылік // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 3. С. 181; Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі... С. 114.

значных доказаў супраць яго следства не выявіла*. Калі б сапраўды, як сцвярджае З. Запароўскі, *«у хаце і гаспадарчых пабудовах Стагановіча былі знойдзеныя зброя і камуністычная літаратура»*, то наўрад ці Наваградскі акруговы суд у канцы 1928 г. яго цалкам апраўдаў бы і вызваліў бы дзеля выканання пасольскіх абавязкаў**. Насамрэч абвінавачанне супраць Стагановіча, як вынікае з матэрыялаў працэсу, грунтавалася толькі на падставе сцверджанняў пра яго нібыта як пра камуніста з боку іншых

* На жаль, не давялося нам таксама атрымаць доступу і да арыгінала акта абвінавачання апеляцыйнага суда ў Вільні, дзеля чаго і тут, падобна як з абвінаваўчым актам наваградскай пракуратуры, мусім задаволіцца выкарыстаннем рускамоўнага перакладу, які быў зроблены ў 1941 г. супрацоўнікамі віленскага НКУС на просьбу менскіх чэкістаў і сёння захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь: НАРБ. Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 18474. Арк. 1–36. Улічваючы невысокую якасць і гэтага перакладу, заўвагі адносна крыніцы, зробленыя намі ў зносцы 79, мусяць брацца пад увагу і ў дадзеным выпадку.

** Зброя ў выглядзе двух зараджаных рэвальвераў сістэмы «Наган» была знойдзена, паводле абвінаваўчага акта, толькі ў аднаго з арыштаваных — Антона Мальца, які сапраўды быў у той час адным з найбольш актыўных дзеячаў КПЗБ на Наваградчыне і як такі згадваецца ў большасці афіцыйных савецкіх выданняў, прысвечаных гэтай праблеме. У астатнім закід у захоўванні абвінавачанымі зброі грунтаваўся фактычна на інфармацыі, змешчанай у расшыфраваным адным са службоўцаў II аддзела Генеральнага штаба лісце камуністаў, што *«КПЗБ мела на тэрыторыі Наваградскага раёна склады зброі»*, сцверджанні супрацоўнікаў паліцыі С. Крэмеса і Цвіркі-Гадыцкага, што, *«паводле звестак паліцыі, сябры КПЗБ маюць зброю»*, а таксама на тым, што *«дапытаны намеснік начальніка следчага аддзела пры галоўнай камендатуры паліцыі ў Наваградку Антоні Лабяк пацвердзіў, што сябры КПЗБ забяспечаныя зброяй»*. Відавочна, што такіх агульных сцверджанняў паліцэйскіх чыноўнікаў без прадастаўлення доказу віны канкрэтных абвінавачаных было недастаткова, каб выносіць ім прысуды па гэтым эпізодзе. Гэтак жа сама малакарысным для практычнага выкарыстання на судзе было пацверджанне Антонам Мальцам інфармацыі, што *«ёсць асобны член партыі, які праводзіць улік зброі»*, бо сярод абвінавачаных дадзеная адказная асоба, калі яна сапраўды існавала, у любым выпадку адсутнічала.

Што тычыцца камуністычнай літаратуры, сродкаў для яе вырабу ці камуністычнай сімволікі, то ўсё гэта таксама было знойдзена толькі ў асобных абвінавачаных, большасць з якіх за гэта ўрэшце атрымалі пэўныя тэрміны зняволення. Але пры гэтым, відаць, у суда ў пэўных момантах выклікалі сумневы метады паліцыі пры здабыцці «рэчавых доказаў», бо, напрыклад, абвінавачаныя Аляксандр Нікіпяровіч з вёскі Падкасоўе, у якога, паводле абвінаваўчага акта, падчасператрусу былі знойдзеныя 3 камуністычныя ўлёткі, Сцяпан Нікіпяровіч з Нясутычаў, у якога выявілі чырвоны сцяг з камуністычным надпісам, і Іван Лецка з вёскі Пабрэззе, які захоўваў камуністычную брашуру «Матэрыял да дыскусіі аб травеньскіх памылках», былі судом цалкам апраўданыя.

абвінавачаных і сведкаў*. Некаторыя ж фатальныя для Стагановіча сведчанні накшталт таго, што *«ў запісной кніжцы абвінавачанага Кандрацюка ёсць запіс аб выдачы з партыйнага фонду 600 злот. нейкаму "СТ"»,* увогуле сведчаць, хутчэй, за тое, што прынамсі афіцыйным сябрам Кампартыі Аляксандр Стагановіч (калі сапраўды ён меўся на ўвазе пад гэтым «СТ») не быў. Вядома, што сапраўдныя камуністы ва ўмовах падполля заўсёды мелі партыйныя мянушкі, якія звычайна і выкарыстоўваліся ва ўсіх магчымых выпадках, у тым ліку і ў асабістых запісах, у той час як пад рэальнымі прозвішчамі ці ініцыяламі ў іх нататках праходзілі, як правіла, толькі дзеячы-некамуністы, хай сабе і ідэйна блізкія. Натуральна, бывалі з гэтага правіла і выключэнні, але ў гэтым выпадку зусім не выключана, што пад крыптанімам СТ у канфіскаваным паліцыяй нататніку быў зашыфраваны бясспрэчны камуніст Антон Малец, які меў партыйную мянушку Стась (сцвярджаць гэта з усёй упэўненасцю, натуральна, немагчыма, бо з тэкстам згаданага дакумента азнаёміцца не давялося). Урэшце, пра тое, што камуністы ніколі не ўспрымалі Аляксандра Стагановіча як адназначна свайго чалавека, ускосна можа сведчыць і ўжо вышэй згаданы факт

* Так, мяркуючы па абвінаваўчым акце навагрудскай пракуратуры, супраць Стагановіча следству ўдалося «накапаць» толькі наступны кампрамат:

*«Аляксандр Стагановіч — не прызнаў сябе сябрам КПЗБ, сцвярджаў, што адзіна толькі быў старшынёй Таварыства беларускай школы ў Нясутычах.*

*Дапытаныя абвінавачаныя паведамілі:*

*Міхаіл Альшэўскі — што Аляксандр Стагановіч быў сябрам КПЗБ на тэрыторыі Навагрудскага раёна, а таксама Журко Уладзімір — што калі яму Антон Малец прапанаваў стварыць ячэйку ў Нясутычах, то тады ён назваў Стагановіча Аляксандра як надзейнага чалавека, які пасадзейнічае яму ў арганізацыі ячэйкі.*

*Сведкі Ян Янкоўскі і Майсей Пятровіч устанавілі, што Стагановіч быў касірам Навагрудскага райкама. Дрозд, камендант паліцыі ў Гарадзечне, а таксама паліцыянты Міхоўскі, Гарчыца і Сулак — што Стагановіч быў членам кампартыі на тэрыторыі Гарадзечанскай гміны.*

*Сведка Аляксандр Светлік — што Стагановіч праводзіў антыўрадавую агітацыю. Агляд рэчавых доказаў, знойдзеных у Файвеля Кантара («Макара») і Міхаіла Альшэўскага, даказалі: 1-е, што Аляксандр Стагановіч быў выкарыстаны падчас перадвыбарчай кампаніі Акруговым камітэтам Баранавічаў як дзеяч ад КПЗБ; 2-ое, што Аляксандр Стагановіч атрымаў ад Міхаіла Альшэўскага 500 злотых на партыйныя мэты.*

*Прагляд следчага акта суддзёй 2-га следчага аддзела Навагрудскага павета № 33/28 пацвердзіў, што Стагановіч Аляксандр быў кандыдатам спіса № 39 у Сейм, стаяў на першым месцы ў спісе, а таксама быў намеснікам упаўнаважанага адпаведнай групы выбаршчыкаў».*

з негатыўнай ацэнкай удзельнікамі I з'езда КПЗБ выстаўлення падчас выбараў Ігната Дварчаніна нібыта на ***першым*** месцы ў спісе. Тое, што камуністамі-крытыкамі пры гэтым не браўся пад увагу факт, што перад Дварчанінам у спісе фігуравала прозвішча Аляксандра Стагановіча, таксама можа сведчыць пра тое, што гэтага дзеяча яны не лічылі безумоўна сваім.

Сярод агульнапрынятых прынцыпаў працы дэмакратычнага суда ёсць, як вядома, і такі, што ўсе спрэчныя выпадкі трактуюцца на карысць абвінавачанага. Фактычна, у адпаведнасці з гэтым прынцыпам і дзеяў Наваградскі акруговы суд у снежні 1928 г., калі адмовіўся асудзіць Аляксандра Стагановіча на аснове адных толькі дадзеных сведкамі паказанняў, наконт дакладнасці і праўдзівасці якіх меліся сумневы. Апеляцыйны ж суд у Вільні, які адбыўся 8 кастрычніка 1929 г. пасля падачы наваградскім пракурорам Хадэцкім касацыйнай скаргі, узяў на ўзбраенне ўжо зусім іншыя прынцыпы. Новых бясспрэчных доказаў прыналежнасці Стагановіча да КПЗБ і гэтым разам у суд пададзена не было, але віленскія суддзі, разгледзеўшы ўсё тыя самыя супярэчлівыя паказанні сведкаў, інтэрпрэтавалі іх зусім іначай — на карысць абвінавачання. Так, напрыклад, адзін з галоўных абвінавачаных па справе, Назар Кандрацюк (Міхаіл Альшэўскі), паведаміў суду, што Стагановіч, безумоўна, быў сябрам Кампартыі, але асабіста ён гэтага чалавека не ведаў. Наваградскі суд не палічыў такое сцверджанне дастатковым для таго, каб скарыстаць яго для асуджэння чалавека, і таму не ўзяў яго пад увагу, у той час як, паводле апеляцыйнага суда, *«гэтая акалічнасць* (што Кандрацюк ведаў пра Стагановіча толькі з чужых слоў. — *А. П.*) *сведчыла б, хутчэй, наадварот, пра тое, што Стагановіч адыгрываў у Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі прыкметную ролю, калі ягоная дзейнасць была вядомая нават сябрам партыі, якія не мелі з ім асабістага кантакту»*. Не палічыў наваградскі суд, што адназначна даказвае віну Стагановіча і змешчанае ў абвінаваўчым акце сцверджанне Уладзіміра Журко, *«што калі яму Антон Малец прапанаваў стварыць ячэйку ў Нясутычах, то тады ён назваў Стагановіча Аляксандра як надзейнага чалавека, які пасадзейнічае яму ў арганізацыі ячэйкі»*, бо, як высветлілася падчас падрабязнага разгляду судом гэтага пытання, выказванне Мальца не было адназначным, і ён толькі выказваў спадзяванне на тое, што Стагановіч можа ім дапамагчы, не даўшы пры гэтым

Журко аніякага паролю, з якім ён мог бы да Стагановіча як да сябра партыі, падуладнага партыйнай дысцыпліне, падступіцца. Наваградскі суд дзеля гэтага не выключыў магчымасці, што Малец *«лічыў Стагановіча толькі чалавекам, у якога погляды набліжаныя да камунізму і які цяпер можа ўключыцца ў справу партыі»*, і таму, не маючы цвёрдай упэўненасці, таксама не стаў выкарыстоўваць гэтае сведчанне супраць Стагановіча. У той час апеляцыйны суд палічыў сведчанне У. Журко дастатковым для доказу віны Стагановіча на той падставе, што яно ўскосна пацвярджаецца паказаннямі супрацоўнікаў паліцыі, нягледзячы на тое што адносна аб'ектыўнасці і бесстароннасці апошніх было шмат пытанняў*. Падобная была пазіцыя апеляцыйнага суда і па іншых пунктах абвінавачання, адхіленых акруговым судом. У выніку ранейшы прысуд быў адменены, і Аляксандр Стагановіч адправіўся адбываць шасцігадовае зняволенне, а ягоныя таварышы па няшчасці Анастас Аляшкевіч і Іван Раманюк — чатырохгадовае**.

Сёння ўвогуле цяжка зразумець, навошта польскім уладам спатрэбілася паўторна судзіць і прысуджаць Аляксандра Стагановіча да такога вялікага тэрміну зняволення (максімальнае пакаранне паводле гэтага артыкула Крымінальнага кодэкса складала 8 гадоў цяжкой турмы***) ужо пасля таго, як ён адмовіўся ад пасольскага мандата і фактычна пакінуў актыўную палітыку, перастаўшы такім чынам быць асаблівай небяспекай для дзяржаўных інтарэсаў. Ніякіх крыніцаў, якія давалі б нам магчымасць адназначна адказаць на гэтае пытанне, выявіць падчас падрыхтоўкі даследавання не ўдалося, таму адзінае, што тут можна, — гэта выказваць нейкія гіпотэзы. Так, нельга, на нашую думку, цалкам выключаць таго, што польскія ўлады мелі намер выкарыстаць Стагановіча ў сваіх мэтах і падчас першага ягонага зняволення схілілі яго да заключэння нейкага нефармальнага пагаднення, сутнасць якога — дараванне свабоды ў абмен на пазнейшую супрацу. Пра тое, што такое было ў прынцыпе магчымае, сведчыць вядомы прыклад з апраўданнем на працэсе Грамады беларускіх дзеячаў Радаслава

* НАРБ. Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 18474. Арк. 24–25.

** Гл.: Мясцовая хроніка. Апэляцыйны працэс «16» // Беларуская газэта. 24 кастрычніка 1929. № 1. С. 6–7.

*** Гл.: Ustawy karne tymczasowo obowiązujące na ziemiach b. zaboru rosyjskiego. T. 1. Kodeks Karny z ustawami dodatkowemi wydanemi do dnia 18 marca 1921 i skorowidzem / oprac. A. Mogilnicki, E. St. Rappaport. Warszawa, 1921. S. 33.

Астроўскага, Аляксандра Каўша і Антона Луцкевіча, якія за гэта пагаджаліся на пэўную супрацу з польскімі ўладамі. Даючы ацэнку гэтага факта з біяграфіі Луцкевіча, Янка Станкевіч пазней, ужо на эміграцыі, сцвярджаў: *«Я перакананы, што А. Луцкевіч, будучы ў турме, даў згоду на супрацу з польскім урадам, але не супрацаваў»**. Нельга выключаць, што нешта падобнае магло адбыцца і з Стагановічам — што і ён першапачаткова *«даў згоду на супрацу»*, а пасля таксама *«не супрацаваў»*. Магчыма, у тым ліку і з спробай унікнуць выканання дадзеных палякам абяцанняў звязаны таксама ўхіленне Стагановіча пасля вызвалення ад актыўнай працы ў складзе пасольскага клуба «Змаганне», а пасля і адмова на першае патрабаванне КПЗБ ад пасольскага мандата. Заціснуты паміж камуністычным молатам і польскім кавадлам, зацкаваны пасол мог пабачыць у складанні ганаровых, але занадта ўжо, як аказалася, клопатных паўнамоцтваў адзіны шанец вылузнуцца з надзвычай небяспечнай для сябе і сваёй сям'і сітуацыі. Далейшае ж «ажыўленне» нібыта ўжо завершанай крымінальнай справы з наступным прысудам, зусім несувымерным здзейсненым Стагановічам «злачынствам» (прынамсі тым, пра якія гаварылася на судзе), можна ў такім выпадку разглядаць як элементарную помсту польскіх функцыянераў, якіх хітры беларускі селянін мерыўся надурыць.

Іншая гіпотэза таксама звязаная з магчымасцю помсты, але ўжо не з боку ўсіх польскіх службаў дзяржаўнай бяспекі, а толькі асобнага чалавека і не канкрэтна Стагановічу, а ўсяму беларускаму нацыянальнаму руху. Маецца тут на ўвазе тое, што старшынёй Віленскага апеляцыйнага суда ў той час быў Бохвіч, вядомы як вялікі непрыяцель беларускіх нацыянальных дзеячаў. Васіль Рагуля ва ўспамінах згадваў, што *«Бохвіч меў на мяне зуб з асабістых прычынаў. У свой час сын і зяць Бохвіча задушылі ў лесе аднаго селяніна, і я як пасол умяшаўся ў гэтую справу»*. Пры гэтым ён распавёў захапляльную гісторыю, як Бохвіч і старшыня Беларускага пасольскага клуба Фабіян Ярэміч у 1928 г., калі Рагуля, выбраны ў Наваградскім ваяводстве ў сенатары, знаходзіўся ў турме і чакаў рашэння парламента адносна свайго далейшага лёсу, вялі *«тайнае змаганне вакол мае асобы. […] Першы* (Ярэміч. — *А. П.*) *у парламенце пускаў у ход усе пружыны дзеля майго вызвалення для выконвання сенатарскіх абавязкаў, другі ж* (Бохвіч. — *А. П.*) *спяшаўся хутчэй за-*

* Станкевіч, Я. За родную мову і праўдзівы назоў. Вільня, 2006. С. 275.

*кончыць працэс, каб вынесці прысуд у акружным судзе».* Тое «тайнае змаганне» скончылася ў выніку на карысць Ярэміча, які нібыта *«на 12 гадзін выперадзіў Бохвіча»*, і Рагуля быў, на вялікае расчараванне Бохвіча, вызвалены*. У сувязі з гэтым нельга выключаць, што Бохвіч пры разглядзе справы Стагановіча проста адыграўся пры такой зручнай нагодзе за тую адносна яшчэ нядаўнюю справу, асабліва калі памятаць, што Рагуля быў на працэсе адным са сведкаў абароны і выказваўся пра Стагановіча толькі станоўча.

Як бы там ні было, Аляксандр Стагановіч атрымаў свой тэрмін і быў вымушаны яго адбываць. Калі праз акрэслены час ён нарэшце выйшаў з турмы і вярнуўся ў родную вёску, былі ўжо зусім іншыя часы. Колішні парламент быў даўно распушчаны Пілсудскім, а калегі Стагановіча па клубе «Змаганне» пасля амаль двухгадовага зняволення ў польскай турме выехалі ў выніку абмену палітзняволенымі ў БССР і ўжо прызвычайваліся да ўмоваў існавання ў іншай турме — савецкай. Ад колішняга грамадоўскага ўздыму не засталося і следу, палякі перайшлі ў наступ на ўсіх франтах, знішчаючы ўсялякія праявы арганізаванага беларускага руху, які б выгляд, хоць бы нават чыста культурнаасветніцкі, ён ні меў. Стагановічу ў такіх умовах анічога не заставалася, як толькі заняцца ўласнай гаспадаркай ды чакаць таго часу, калі адкрыюцца новыя магчымасці для працягу дзейнасці на карысць беларускай ідэі. Чакаць жа заставалася зусім нядоўга. Ужо праз некалькі гадоў, у верасні 1939 г., пачаўся новы сусветны закалот, які кардынальна змяніў палітычную сітуацыю ва Усходняй Еўропе і пасеяў у сэрцах многіх беларускіх дзеячаў, нават тых, якія перад гэтым ужо расчаравана адышлі ад усіх спраў, новыя надзеі на магчымасць ажыццяўлення ў змененых умовах нацыянальных ідэалаў. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя...

У гэтае выданне акрамя ўласна «Успамінаў пасла» ўключаны і артыкулы Аляксандра Стагановіча, якія прысвечаны тым самым падзеям з жыцця Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд і маюць выразны мемуарны характар. Сабраныя разам гэтыя тэксты ўяўляюць з сябе цікавую крыніцу інфармацыі па палітычнай гісторыі нашай краіны, а таксама адлюстроўваюць погляд на асобаў і час аднаго з удзельнікаў тых падзей.

*Аляксандр Пашкевіч*

* Гл.: Рагуля, В. Успаміны. С. 67–68.

# УСПАМІНЫ ПАСЛА

У вёсцы Нясутычы Гарадэчанскай воласці Наваградскага павета Менскай губерні[1] 25 студзеня 1890 г. ад маткі Паўліны з дому Родзькаў і бацькі Лявона прыйшоў на гэты свет другім па чарзе, але першым сынам я, Аляксандр. У той час бацька мой быў заможным селянінам на ўсю ваколіцу. Здавалася, што маё жыццё на гэтым свеце добра забяспечана.

Аднак, як мне было тры гады, сталася вялікае няшчасце ў нашай сям'і: на працягу аднаго года памерлі мой дзед і бацька, які лячыўся ў Вільні ў шпіталі Св. Якуба, а таксама мой малодшы брацік. Мала гэтага, у тым самым годзе здохла чатыры валы, двое коней, пяць кароў, васямнаццаць штук свіней, збожжа на полі разакралі людзі.

Гэта была Боская кара, хаця мой бацька, а таксама дзед былі вельмі добрымі, ахвярнымі людзьмі. Дзеда за падтрымку паўстання ў 1863–1864 гг. расейцы высеклі розгамі. У Наваградчыне паўстаннем кіраваў нейкі Маслоўскі, якога маскалі ў 1864 г. павесілі. У тую ноч цела яго было ўкрадзена паўстанцамі і перавезена ў двор Сянна, дзе пахавалі.

Пасля гэтакага вялікага няшчасця і маладога веку мае маткі мы засталіся на сваёй собскай 6½ гект. гаспадарцы, а арандаваную зямлю, у ліку 34½ гект., абшарнік аддаў другому. Пачалося новае жыццё, якое нельга назваць жыццём, а існаваннем.

Праз тры гады па смерці першага мужа матка выйшла замуж, беручы новага мужа на сваю гаспадарку. З-за нядбайлівасці мужа, для нас айчыма, у сям'і жыццё нічагусенькі не паляпшалася, хіба толькі тое, што быў у хаце мужчына. Не ведаю, чым усё скончылася б, калі б не было роднай цёткі ў гэтай вёсцы, якая вельмі шчодра падтрымлівала нашую сям'ю.

На шостым годзе майго жыцця я пайшоў у школу (калі яе можна так назваць, бо настаўнікамі маімі былі хлопцы на пару год старэйшыя за вучняў, якія, скончыўшы царкоўна-прыхад-

скую школу, у познюю восень, як жывёла ўжо не пасецца, прыходзілі ў вёску і ўмаўляліся настаўнікамі з тымі бацькамі, якія пасылалі сваіх дзяцей вучыцца. Вучыліся па хатах, з чаргі ў кожнага школьніка. Вучоба канчалася з растаяннем снегу. Такую школу мне давялося наведваць на працягу толькі пяці зімаў. Жыццёвыя абставіны сям'і не пазвалялі вучыцца далей, бо трэба было ісці ў двор на працу, калі пагоняць з малатарні, за 15 кап. у дзень, а летам кароў, сваіх і чужых, пасвіць.

Будучы хлапчуком, я вельмі мала забаўляўся з сваімі аднагоднікамі. Я любіў слухаць розныя апавяданні старэйшых мужчын, калі яны збіраліся і разгаварвалі аб сваіх уражаннях у заробкавых паездках у Вільню, Гародню, Менск і інш. гарады і мястэчкі. Сёння не магу сказаць, чаму я пераймаў толькі добрыя, карысныя апавяданні. Усё благое, шкоднае мною не трымалася.

Калі мне было 14 год, мяне матка аддала ў двор пасвіць коні. На другі год, у 1905, я застаўся парабкам у двары. Мне далі пару коней і ўсё прыладдзе, як даросламу парабку.

У гэтым самым годзе двор наведалі два вучні гарадскога вучылішча, П. Булыга з вёскі Селішча і Гірш Ражанскі з вёскі Куровічы, з мэтаю нагаварыць нас, парабкаў, да страйку. З пяцёх парабкаў я на гэта пагаджаўся, пазасталыя не пагадзіліся.

Трохі пазней я даведаўся, што яны разам з В. Рагулем[2] належалі да партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў[3], куды мяне ўлучылі ад тады, лета 1905 г. Я быў знаёмы з В. Рагулем і, нягледзячы на маю маладосць, я выконваў усе загады, якія на патаемных сходах мне даручалі.

Улетку на Спаса, 06.08.1906, за расклейванне «Выбарскай адозвы»[4] на тэлеграфных слупах на шляху з Наваградка ў Любчу быў арыштаваны разам з В. Рагулем, Н. Булыгам і Гіршам Ражанскім. Я, як вельмі малады, дастаў ад станавога прыстава ў Наваградку толькі бізуноў. В. Рагулю, Н. Булыгу выслалі ў Адэскі павет на ½ гады[5], а Г. Ражанскі ўцёк з-пад арышту.

Падчас рэвалюцыі я і двух хлопцаў, А. Барыс і У. Дарашэвіч, у летні час амаль штоноч раскідвалі рэвалюцыйныя адозвы на ўзгорках, начамі на тычках палілі змочаныя анучы ў газу, што наводзіла страх у насельніцтва, якое не адважвалася ісці ў двары на працу.

У гэтым самым часе я праз аднаго аднасяльчаніна, шмат старэйшага ад мяне, які меў можнасць хадзіць вельмі далёка на фэсты з мэтаю выбраць сабе жонку, атрымаў беларускую газету. Калі я пачаў першы раз чытаць свой родны язык, я ніяк не мог прыстасавацца да некаторых гукаў, галоўна да *дз, дж, шч, ч, ц, цьц* і інш. Аднак у мяне паўстала думка прыслухоўвацца да гутаркі людзёў. Я пераканаўся, што ўсе гэтыя словы ёсць. Ад тады мне было лёгка чытаць свой родны язык.

Пасля прачытання некалькіх нумароў у мяне паўстала думка пабачыць тых людзёў, якія друкуюць сваю родную газету. У мяне, вясковага хлапца, гэтыя асобы ўяўляліся як нешта надзвычайнае.

Восенню 1907 г., папрасіўшы ў маткі дазволу, я з вялікім захапленнем направіўся ў Менск. Мне здавалася, што я найшчаслівейшая істота на свеце, не зважаючы [на тое], што я ў хадаках і шарачковым убранні.

Чаму ў Менск, а не ў Вільню? У той час я быў фанатычна рэлігійным, і маё варожае настаўленне да каталікоў, якое мне прывілі расійскія папы, змусіла мяне ісці ў Менск, бо Вільню папы вучылі каталіцкаю.

Выйшаўшы ў Менск, я вельмі быў захоплены. Даўгі той дзень быў для мяне, дзе я затрымоўваўся на працы, каб зарабіць 15–25 капеек на сваё падарожжа.

Прыйшоўшы ў Менск, я абышоў увесь горад. Нягледзячы на маё вялікае захапленне перад гэтым, я нічагусенькі не найшоў, аб чым марыў. Зайшоўшы ў гатэль «Еўропа», пераначаваў там за 50 капеек у нумары пад страхою і назаўтра, зыходзячы па сходах, набіў сабе гуз на лобе аб люстраную сцяну. Яшчэ раз абышоў галоўныя вуліцы і з вялікім болем на сэрцы пайшоў дамоў.

У тую самую восень у лістападзе месяцы мне здарылася нагода паехаць у Вільню. Мой сусед наняўся ў жыдоў загнаць каровы ў Вільню і мяне ўзяў сабе ў дапамогу.

Я вельмі быў рад гэтай паездцы. У думках я снаваў, што ў Вільні мне ўдасца знайсці тое, аб чым я марыў. Аднак і тут мяне спаткала няўдача, бо матка папрасіла гэтага дзядзьку, каб ён не адпускаў мяне ад сябе. У сапраўднасці не было нагоды адхіліцца.

Прыехаўшы ў Вільню вельмі рана, зараз жа паехалі з каровамі на рынак. Прастаяўшы ўвесь дзень, пад вечар там жа на талкучцы з'елі гарачай капусты па 5 капеек, селі на воз і паехалі дамоў.

Так тое, да чаго я імкнуўся ў тыя юнацкія гады, мне не ўдалося зрэалізаваць. Хвароба маткі, якая палажыла яе на тры гады ў ложак, а ў 1909 г. смерць затрымала мае імкненні шукаць свайго роднага, блізкага сэрцу, да чаго я імкнуўся ад юнацкіх гадоў.

Нягледзячы на мой малады век, я ў ваколіцы карыстаўся пашанаю. Я сам не знаю, чым я мог спрычыніцца да такога стаўлення людзёў да мяне. На агульным сходзе Басінскай вясковай грамады[6], у якую ўваходзіла 8 вёсак, у 1910 г. мяне аднагалосна выбралі старастам грамады, але сакратар воласці Кунцэвіч сказаў, што сход не мае права выбраць А. Стагановіча дзеля таго, што А. С. непаўналетні (паўналетні — 22 гады).

У тым годзе, маючы 35 рублёў у кішэні, я адчыніў краму ў сваёй вёсцы з мэтаю даказаць людзям, колькі нажываюцца гандляры, і гэтым самым заахвоціць сялян адчыніць кааператыў. Аднак дзякуючы беднасці сялянства мае намеры не здзейсніліся.

У 1911 г. распрадаваўся двор Гулятычы. Я, маючы пустыя кішэні, задумаў купіць 8 дзесяцін зямлі. Пазычыў 90 рублёў у валаснай касе і план свой здзейсніў.

У пачатку 1912 г. Наваградскае павятовае земства запрапанавала мне працу ў сельскагаспадарчым складзе ў Баранавічах у якасці заступніка загадчыка складам за 50 рублёў. На гэта я пагадзіўся, перадаў сваю краму брату і ад'ехаў у Баранавічы.

Першых некалькі тыдняў для мяне было вельмі несамавіта з прычыны мае мінімальнае адукацыі перад такімі асобамі, як раённы аграном Я. Мурашка, лугавод Ф. Ігнаценка, практыкант-студэнт з жонкаю Маеўскія і інш. Пасля кароткага часу нашага сужыцця я даведаўся, што ўсе працаўнікі — беларускія сялянскія сыны, якія мелі можнасць закончыць вышэйшыя школы. Для мяне разам з працаю да некаторай ступені гэта было палітычнаю школаю сярод такіх людзей, як асабліва Я. Мурашка, які паходзіў з вёскі Ябланаўшчына каля Міра. Ён належаў да сацыял-дэмакратычнай партыі (меншавікоў)[7]. Праз амаль трохгадовае нашае жыццё я палітычна пачаў разбірацца.

Праз увесь гэты час Я. Мурашка прывозіў з Менску «Нашу Ніву», якая прачытвалася мною некалькі разоў. Ад тады я поўнасцю з вялікаю любоўю да свайго народа-Бацькаўшчыны асазнаў і даў сабе слова служыць Ёй і толькі Ёй, сваёй Бацькаўшчыне — Беларусі — Народу, дзе б я ні быў. Мой фанатызм да свайго Народа паставіў мяне варожа ставіцца да ўсіх тых, якія імкнуліся і імкнуцца прысабечыць сабе маю Радзіму.

Выконваючы данае сабе слова, [калі] мяне паклікалі на вайсковую камісію ў 1912 г., каб пазбегчы вайсковай службы ворагу, я змушаны быў ужыць сродкаў, каб лекары мяне прызналі няздатным. Так было і ў 1913 г., а ў 1914 г. дзякуючы даносу аднаго русацяпа воінскаму начальніку мяне без перагляду лекараў забралі ў расійскую армію служыць «за веру, цара і ацечаства». Нельга было з гэтакімі лозунгамі пагадзіцца...

У ліпені 1914 г. я быў у Фінляндыі на сельскагаспадарчай экскурсіі, якую арганізавала Менскае губернскае земства. Мелі зведаць Швецыю, але выбух вайны стаў перашкодаю. Зведаўшы шмат якія рознага памеру гаспадаркі і жыццё фінаў, якога я нават не спатыкаў у нашых абшарнікаў, я прыйшоў да перакананні, што народ, які сам кіруе, хоць і не поўнасцю, і над якім няма расійскіх цівуноў, зможа рабіць цуды.

Выбух вайны змусіў нас перадчасна вярнуцца дамоў. Прыехалі ў Баранавічы. За гэты час з складу служачых загадчыка Ф. Мазалевіча мабілізавалі ў армію, агранома Я. Мурашку выселілі ў Гарадзею як палітычна ненадзейнага (бо ў Баранавічах быў штаб галоўнага камандавання). Студэнт з жонкаю Маеўскія ад’ехалі на ўніверсітэт.

Сумнае настала жыццё. З другога боку, была надзея, што вайна давядзе да рэвалюцыі, а за гэтым — да самастойнага жыцця ўсіх народаў Расійскай імперыі. Гэтыя словы Я. Мурашкі давалі мне атух* да змагання з сумным жыццём, якое мяне чакала ў будучым, у расійскай арміі.

У лістападзе 1914 г. вялікі склад цялячых вагонаў, дзе змясцілі маладых хлопцаў Наваградчыны, забраных у расійскую армію, завязлі ў Яраслаўль над Волгаю, раздзяліўшы па палках. Я папаў у 211-ты пяхотны запасны полк. Прыехалі ў Спаскія казармы[8],

* Атуха (ад. польск. *otucha*) — бадзёрасць, смеласць, надзея.

дзе не было ніякага абсталявання, замест ложкаў двухпавярховыя нары, на якіх нічагусенькі не было для спання. Улёгшыся на голых дошках, мы пачалі гутарыць, рабіць кпіны з славянскай місіі велікарускага народа. Але ў гэты час пачулі з цемры павышаны голас: *«Спать, серые черти. Уже после поверки!»* Зразумела, некаторыя з нашых далі «ветлівыя» адказы і на гэтым уціхамірыліся.

Нягледзячы што мы амаль усе паходзілі з вёсак, шмат якіх нас камандны персанал лічыў інтэлігентамі, і некаторыя вельмі часта змушалі малодшы камсастаў капітуляваць перад навабранцамі.

Пасля трохтыднёвай муштры пачалі рыхтаваць да ад'езду на фронт. У гэтую мясарубку я не папаў, хоць я нікога не прасіў. З пакінутых утварылі падафіцэрскую школу, якую закончылі ў красавіку 1915 г. З паваротам у свае кампаніі камандзіры пачалі назначаць у школы прапаршчыкаў, ад чаго я стараўся ўхіліцца. Дзеля гэтага мяне адаслалі на фронт у 17-ты стралковы полк, які ў гэты час быў на пазіцыях каля Панявежу Ковенскай губерні.

Трохмесячны адыход на ўсход расійскай арміі жаўнераў пацяшаў, бо ў такой практычнай сітуацыі была надзея, што вось-вось жаўнеры кінуць зброю і разыдуцца хто куды, адмаўляючы загадам камсаставу.

Каб ратаваць Рыгу як стратэгічны пункт ад здачы немцам, пад Дзвінск прыслалі сібірскіх стралкоў, а таксама расійскіх стралкоў, якія праз месяц вялі зацятыя баі з немцамі.

У гэтым часе мне прыпадкова надарылася пазнаёміцца з І. Дварчанінам[9], з якім 13 год пазней буду змушаны падставіць сваю галаву, неадпавядаючую да гэтага задання. Бо лекары, дактары, інжынеры, магістры, адвакаты, якія надаваліся выконваць народную місію, дзеля сваіх асабістых выгад і дзеля належання некаторых да польскай фашыстоўскай арганізацыі ОЗОН[10] пахаваліся, каб пазней крытыкаваць.

У канцы 1915 г. я, будучы на фронце, захварэў і быў адасланы ў шпіталь у горадзе Вятка[11], дзе Вяцкая вайсковая камісія звольніла мяне на трохмесячны водпуск, які я правёў у Менскай і Смаленскай губернях. Па адбыцці водпуску я зноў

апынуўся ў тым самым палку ў Яраслаўлі, адкуль мяне ў хуткім часе назначылі ў Маскву на сфарміраванне 7-га асобага пяхотнага палка, які ў жніўні месяцы 1916 г. адплыў з Архангельска ў Францыю. Выгрузіўшы ў горадзе Брэст[12], нас накіравалі на адпачынак на поўдні Францыі ў горад Сант-Тафагель. Даўшы адпачыць пару тыдняў, нас на параплавах морам перавезлі ў Грэцыю, горад Салонікі[13].

На шляху ў Міжземным моры нам прыйшлося падабраць на свой параплаў 1200 жаўнераў, сербаў і неграў, якія з Афрыкі пасля выздараўлення ехалі на Балканскі фронт у агульным ліку 3000 жаўнераў, але нямецкі падводны чавень патапіў іх параплаў. Надзвычайна сумна-жахлівае з'явішча было для нас падбіраць застаўшыхся пры жыцці, бо на вадзе плавалі трупы людзей, якія з поспеху няправільна палажылі ратуючыя кругі, і ад перавесу тулава нагамі ўверх. Ад перагружанасці наш параплаў мусіў зайсці ў найбліжэйшы порт Бізарці[14], Афрыка, дзе, выгрузіўшы жаўнераў, адплылі ў назначаным кірунку.

Пасля прыгожай прыроды Францыі Грэцыя, Македонская правінцыя, выглядала паўдзённаю, асабліва Салонічная катлавіна, якая займала плошчу 40×60 км, голыя скалы, гарачы клімат, калі ў жніўні спёка даходзіла да 65 градусаў Цэльсія. Гэта ўсё вельмі дрэнна ўплывала на здароўе жаўнераў, якія пачалі хварэць на дызентэрыю, малярыю. Мяне малярыя прыкавала да ложка на тры месяцы, пасля чаго ў мяне было малакроўе.

На вясну 1917 г. пасля Лютаўскай рэвалюцыі мяне з некалькімі дзясяткамі жаўнераў адклікалі з Салонік, дзе я прабываў некалькі месяцаў. У чэрвені месяцы 1917 г. адзін батальён нашага палка быў пасланы ў Афіны, Грэцыя, каб там у падступны спосаб абяззброіць частку грэцкай арміі, якая была верная свайму каралю, які не хацеў ваяваць супраць Вільгельма II[15], свайго крэўніка[16].

З прыходам Керанскага[17] да ўлады па загадзе з Петраграда былі ўтвораныя дзве дывізіі, 1-я ў Францыі, 2-я на Балканах. У ліпені 1917 г. 2-я дывізія была на пазіцыі між азёраў Брэсьба — Ахрыда[18], у спісках трох гаспадарстваў — Грэцыі, Сербіі і Албаніі. Неспрыяльныя кліматычныя ўмовы вельмі кепска адбіваліся на здароўі жаўнераў, і ў лістападзе 1917 г. лічбавы стан жаўнераў

на фронце настолькі зменшыўся, што жаўнер ад жаўнера стаяў на [адлегласці] 50–70 метраў. Такое палажэнне непакоіла камсастаў, а таксама палкавыя камітэты. Да гэтага на фронце пачалося братанне з немцамі. Немцамі былі пастаўленыя паштовыя скрыні між франтоў, у якія жаўнеры расійскай арміі з акупаваных немцамі абшараў клалі і бралі лісты да/ад сваіх родных. Да гэтага немцы клалі ў скрыню дзве газеты: «Гоман»[19], які выдаваўся ў Вільні, а другой назову не помню.

Дзеля такога палажэння жаўнерскія камітэты паставілі штабу дывізіі ўльтыматум: даць папаўненне або скараціць фронт. Калі гэтага нельга выканаць, адказнасць за прарыў фронту будзе на штабе дывізіі. Каб выйсці з палажэння, штаб дывізіі нагаварыў камандзіру корпуса французскай арміі, што дывізія скамунізаваная і яе неабходна зняць з фронту і абяззброіць, што і было выканана на куццю 1917 г. За пару дзён перад адыходам з фронту штаб дывізіі выдаў загад, у якім прапаноўваў жаўнерам пакінуць зброю ў акопах дзеля таго, што прыйдзецца ісці пешшу 200 км, на што ахвоча жаўнеры пагадзіліся.

У гэтым часе я знаходзіўся на выспе Корф[20], па дарозе ў Італію за купляю 17 аўтаў «фіят» і канцылярыйных прыладаў дывізіі. Дзякуючы вытварыўшамуся стану на фронце я змушаны быў павярнуцца ў полк, які ў гэты час ужо стаяў пабатальённа ў вёсках Македоніі. Сітуацыя за гэты час змяніла аблічча армейскай адзінкі да непазнавальнасці. З вышэйшага камсаставу нікога не было, зніклі няведама куды.

Прастаяўшы каля двух месяцаў у такім палажэнні, у адзін зімовы дзень быў прачытаны загад, што ўсе жаўнеры і афіцэры з сваім транспартам абавязкова маюць з'явіцца на адзін хутар на камісію перад палкоўнікам французскай арміі і даць адказ на тры пытанні: 1) калі дасі згоду далей ваяваць, будзеш мець аднолькавыя правы з французскім жаўнерам; 2) калі адмовішся ваяваць, то будзеш прымусова працаваць за 25 сантымаў[21] у дзень; 3) калі на першыя два пытанні адмовішся, то будзеш высланы на выспу архіпелагу.

Маё супрацьбальшавіцкае настаўленне за часоў знаёмства з Я. Мурашкам змусіла даць згоду застацца ў арміі. З дывізіі далі згоду 755 жаўнераў і афіцэраў.

З Грэцыі праз Адрыятычнае мора і Італію нас прывезлі ў Францыю. У Францыі мы даведаліся, што ў першай дывізіі, да якой належалі 1-я і 3-я брыгады, у жніўні месяцы 1917 г. міжсобку быў зацяты бой. Прычынаю да гэтага было нялюдскае абыходжанне камсаставу да жаўнерскай масы, а самае галоўнае — гэта матэрыяльны бок, бо па дагаворы французскі ўрад даваў усё тое, што свайму жаўнеру, аднак камсастаў палічыў віна жаўнеру не даваць, а за гэта пабіраў па 13 сантымаў у дзень за кожнага жаўнера ад французскага ўрада, што ў агульным была велізарная сума франкаў, лічачы, што 1-я брыгада, стан якой быў 5000 жаўнераў, прыехала ў Францыю ў 1915 г. Каб пазбегнуць усяго гэтага, камандзір дывізіі ген. Лахвіцкі[22] ўгаварыў камандзіра корпуса французскіх войск, каб той дазволіў яму заняць пазіцыю дывізіяй, што і было зроблена. Заняўшы пазіцыю, ген. Лахвіцкі ў адпаведны час даў загад ісці ў атаку. Немцы, не маючы сілаў, пусцілі на атакуючых газ, ад якога некалькі тысяч жаўнераў аддалі сваё жыццё. Пасля вялікіх стратаў астаткі дывізіі адвялі на адпачынак аж пад іспанскую мяжу ў лагер Ля Куртэн[23].

Прыехаўшы на месца, усе афіцэры пакінулі дывізію. Жаўнеры выбралі ўвесь камсастаў з свайго асяроддзя. Камандзірам дывізіі быў старшы унтэр-афіцэр Глоба ці Жлоба, латыш. Адышоўшыя афіцэры не пакінулі ў супакоі жаўнераў, але рознымі нагаворамі, асабліва жаўнераў з 3-й брыгады, падбухторвалі да розных правакацыяў і гэтым выклікалі падзел у дывізіі, і частка адышла ў другі лагер Курно, куды павярнуліся ўсе афіцэры. Застаўшыеся жаўнеры ў лагеры Ля Куртэн дамагаліся павароту ў Расію, не пакідаючы аружжа. На паварот у той час не магло быць і гутаркі. Французскі ўрад даў загад, каб да 4 жніўня 1917 г. да 12-й гадзіны ўсе жаўнеры лагера Ля Куртэн злажылі зброю, інакш будзе змушана ўжыць сілы. У гэтым часе ўрад Керанскага прыслаў у Францыю артылерыйскую брыгаду, камандзірам якой быў ген. Бяляеў[24]. Французскі ўрад са згоды ген. Лахвіцкага выкарыстаў жаўнераў расійскай арміі, якія былі ў лагеры Ля Курно, і ўспомненую артылерыйскую брыгаду, абстаўляючы імі лагер Ля Куртэн навокал. З тылу расійскіх жаўнераў была французская армія. Расійская [...]* уважала загад

* У арыгінале слова напісанае неразборліва.

за жарт і на лагерным пляцы распачала мітынг. Аднак а гадзіне 12-й поўдня адначасна навокал лагера Ля Куртэн разнясло-ся рэха арудзійнай стральбы па гушчы жаўнераў, якія былі на мітынгу. Пасля першага гарматнага залпу на плошчы засталіся толькі забітыя і параненыя. Пазасталыя ўсе разбегліся па казармах. Так закончаны падбухтораны бальшавікамі і подлымі паступкамі афіцэрства непатрэбны супраціў нясведамай жаўнерскай масы. Вынікі: некалькі дзясяткаў забітых, сотні параненых, 11 жаўнераў засуджаны на даўгія гады астрогу, 250 жаўнераў вывезлі ў Афрыку, пазасталыя пайшлі будаваць дарогу і секчы лясы.

Расійскую армію французскі народ і ўрад спатыкалі з кветкамі, выправаджалі з аружжам. На гэта расейцы поўнасцю заслужылі.

Наш саланійскі батальён, прыехаўшы з Францыі, хутка стаў адчуваць расійска-азіяцкае адношанне да жаўнераў. Жывучы ў такой дэмакратычнай краіне, нам штодзённа прыходзілася бачыць адносіны французскіх афіцэраў да сваіх жаўнераў. Гэтыя спасцярогі змусілі некаторых жаўнераў батальёна весці агітацыю супраць сваіх афіцэраў за іх нялюдскія адносіны да жаўнераў.

Мушу адцеміць, што камсастаў батальёна складаўся з князёў, графаў, фон баронаў, якія паўцякалі пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Гэтая агітацыя дала свае наследкі, бо батальён перавозілі з месца на месца, і ні адзін камандзір дывізіі французскай арміі не хацеў прыняць пад сваю каманду рускіх, знаючы наследкі з 1-й расійскай дывізіяй. Аднак камсаставу батальёна ўдалося ўгаварыць камандзіра 14-й дывізіі 10-га армейскага корпуса, на што капітан 14-й дывізіі даў сваю згоду.

Перад адыходам на пазіцыі былі разданыя трохкаляровыя шматкі расійскага манархістычнага сцяга дзеля нашыўкі на рукавах вопраткі. Чатырох жаўнераў 2-й кампаніі адмовіліся выканаць загад. Гэта былі два беларусы, Балюк з Берасця і я, украінец Рабчэнка і армянін Чывіджыеў. Нас усіх арыштавалі; назаўтра а гадзіне 7-й рана вывелі на плошчу і зараз жа была дана трывога, на якую ўсе жаўнеры выбеглі з аружжам. Была дана каманда занесці аружжа ў казармы, вярнуцца на пляц без

аружжа, што і было выканана. Адвёўшы нас пад скалы, дзе здабывалі графіт, каравул паставіў нас пры скале, а камандзір князь Лобач-Растоўскі (?) прачытаў загад у наступных словах: за невыкананне вайсковага загаду ваеннага часу і баронячы гонар афіцэра, клянуся, што — вымяняе па прозвішчы — мусіць быць расстраляны.

Ні адзін з нас супраць самаволі расійскіх варвараў нічога не сказаў. Мы як бы гэтым паказалі: страляй, ідыёт, мала табе крыві — мо прыйдзе час, захлынешся. Аднак нехта з нас быў шчаслівы. Неспадзявана прыехаў французскі генерал Дзю Жувэль (?), камандзір 10-га армейскага корпуса. Убачыўшы генерала, уся афіцэрская свора была ні жыва ні мёртва. Перагрупіраваўшы батальён, які засланіў нас, ён штось пагутарыў з афіцэрамі, якія пайшлі ў казармы, а да жаўнераў звярнуўся з прамоваю, выклікаючы ўсіх тых, якія зналі французскую мову. У сваёй кароткай прамове генерал сказаў: ***«Я хачу мець пад сваім камандаваннем жаўнераў, якія наважыліся весці змаганне з ворагам да канца. Хто з вас пачуваецца да гэтага, прашу падаць на маё імя заяву»***.

За дзве гадзіны пасля гэтага батальённы паштальён завёз у штаб корпуса каля трох сотак заяваў. Трэба адцеміць, французы вельмі добра зналі расійскае афіцэрства. На Балканах ген. Сарайль[25] уратаваў жыццё жаўнера, якога мелі расстраляць.

Мы разам з усімі жаўнерамі, як бы нічога не было, прыйшоўшы ў казармы, пачалі радзіцца міжсобку. Мы, двох беларусаў, былі за тое, каб чакаць наследкаў з сказаных французскім генералам слоў. Украінец і армянін былі за тое, каб уцякаць у Швейцарыю, якая знаходзілася за 300 км, што яны і выканалі. Як я пазней даведаўся, яны былі па дарозе арыштаваныя. Па заканчэнні вайны я дазнаўся, што абодва памерлі ў астрозе ад грыпы.

Пасля прамовы генерала ў некалькі дзён прыехаў палкоўнік французскай арміі і кожнаму паасобку запрапанаваў: дзе хочаш ваяваць — у расійскім легіёне, у французскім іншаземным (дзе мусіш даць подпіс на тры гады) — ці хочаш ісці на працу. З 755 жаўнераў легіёну 55 запісаліся ў французскі легіён, у тым ліку і я, у расійскім засталося, дакладна не помню, здаецца, трохі болей за 100 жаўнераў. Пазасталыя пайшлі на працу.

Праз няпоўных 5 месяцаў вайна закончылася. Усіх, хто даў падпіску на тры гады, звольнілі з правамі на працягу гэтых трох год выплочваць жаўнерскую платню, бясплатны праезд на чыгунках, дармовая вучоба на важнейшых вучэльнях.

Пасля пяцігадовай адсутнасці з роднае Бацькаўшчыны нічога не было міла. Імкненне павярнуцца туды, дзе ўсё было блізкае, мілае сэрцу. Але падзеі ў Польшчы, на Бацькаўшчыне і ў Расіі не пазвалялі на хуткі паварот на радзіму. Прыйшлося зміріцца і вандраваць па Францыі.

У гэтым часе ў Парыжы расейцы выдавалі газету. Дакладна не помню назову, «Последние» ці «Русские Новости»[26]. Аднаго дня ў 1919 г. у ўспомненай газеце чытаю адозву беларускіх прадстаўнікоў на мірнай канферэнцыі ў Версалі, у якой быў зварот да ўсіх беларусаў, каб запісваліся ў латышскую армію. У гэтым часе я і М. Ждан з вёскі Скрыбава Сноўскай воласці[27] жылі ў Валезах[28]. Пагутарыўшы міжсобку ў гэтай справе, рашылі паехаць у Парыж пагутарыць з дэлегатамі А. Луцкевічам[29], К. Езавітавым[30] і Ладновым[31]. Прыехаўшы, мы гутарылі толькі з А. Луцкевічам і Ладновым, Езавітава не было. Пасля досыць доўгай гутаркі А. Луцкевіч нам сказаў: на Бацькаўшчыне мы не маем ніякай магчымасці тварыць свае вайсковыя аддзелы дзеля тэрору з боку бальшавікоў і палякаў. Мы выказалі свой пагляд, што хто знае расійскіх генералаў, той з беларусаў не пагодзіцца быць у арміі Юдзеніча[32]. Зразумела, мы не зналі дакладна, што робіцца на Бацькаўшчыне з увагі на супярэчныя весткі французскай прэсы ў той час.

У пачатку 1919 г. французскі ўрад распачаў адсылку расійскіх жаўнераў у Расію. У Марселі пачалі фарміраваць штаб для рэгістрацыі, куды я, а таксама Ждан былі запрошаныя: я — кіраўніком гаспадарчага аддзела, а Ждан — заступнікам. Нягледзячы на вельмі добрыя жыццёвыя ўмовы, рускі жаўнер зненавідзеў Францыю і патокам штурмаваў базу рэпатрыявацца. Першы параплаў, які павярнуўся з Адэсы, прывёз трох шчаслівых, якія, высадзіўшыся на беразе, бачылі, як бальшавікі расстралялі тых, што адмовіліся ваяваць. На другім былі такія ж шчасліўцы, якія бачылі, як расстрэльвалі белыя за тое самае. Так чаргавалася ў залежнасці, хто быў гаспадаром горада Адэсы, якая пераходзіла ад бальшавікоў да белых ці зялёных.

На вясну 1920 г. фронт польска-бальшавіцкі быў на Беразіне. Аднаго вечара на галоўнай вуліцы гор. Марселя мы спаткалі старэйшага векам добра апраненага мужчыну. Чуючы нашую беларускую мову, ён затрымаў нас і ў расійскай мове запытаў: *«Што, вы рускія?»* Мы сказалі, што мы беларусы. Незнаёмы перайшоў на беларускую мову і гавора: я ўчора прыехаў з Менску. На нашае пытанне, як жывецца на Бацькаўшчыне, незнаёмы адказаў: *«О, вельмі добра! За адзін франк вы ў Менску ў першакласным рэстаране дастанеце абед (1 франк = 13 польскіх марак[33])».*

Гэтая кароткая гутарка дадала яшчэ болей ахвоты на паварот.

Недалёка ад нашай базы знаходзіўся польскі кансулат. Аднаго разу мы рашылі зайсці і даведацца, як можна хутка выехаць дамоў. Але якое мы мелі расчараванне, калі, пазваніўшы, выйшла прыгожая пануся і на запытанне, ці можна бачыць консула, па-французску перапрасіўшы нас, сказала, што тут ніякага польскага консула няма. Падзякаваўшы, мы выйшлі з нічым.

Аднаго вечара, вяртаючыся з оперы, прыйшлі да трамвая, які быў перапоўнены, бо быў апошнім па гэтай лініі. Уціснуўшыся наперадзе, мы заўважылі, як да трамвая ідзе яшчэ адна пара, у якой пазналі панусю з павятовага кансулата. Мы ім саступілі сваё месца, а самі сталі на ступенях трамвая.

Праз пару дзён мы зноў направіліся ў кансулат. Гэтым разам консул ветліва нас прыняў, нават радзіў не вяртацца, матывуючы ваеннымі дзеяннямі. Аднак на нашае дамаганне мы былі адпушчаныя ў Парыж да распараджэння рэгістрацыйнай камісіі, якая 7 чэрвеня 1920 г. праз Нямеччыну і Чэхію нас адправіла ў Польшчу. Падарожжа было вясёлае, радаснае, бо пасля амаль шасцігадовай адсутнасці здагадвалася [уяўлялася], як цяпер на роднай зямельцы. З Варшавы наш цягнік затрымалі ў Бярэсці.

У нашым вагоне ехала пару жаўнераў польскай арміі. Да нашага вагона пачалі ўваходзіць матка з пяцёма дзяўчынкамі ў белых світках. Можна было здагадвацца, што гэта ўдава, муж якой загінуў на вайне. Пражыўшы амаль тры гады ў такой свабоднай краіне, як Францыя, і не бачыўшы нідзе гэткае бядоты і здзеку чалавека над чалавекам, для нас, пачуўшых словы польскага жаўнера, скіраваныя да няшчаснае сям'і *(«тшэба вшысткіх*

*беларусінаў павывешваць на сухіх галендах»**), здалося, што хтось стукнуў у патыліцу, і кроў заліла вочы. Тут мы адчулі, што мы павярнуліся ў свой родны край, каб разам з сваім народам перажываць нечуваны глум, здзек, гвалт, а нават кулю толькі за тое, што ты гутарыш сваёю роднаю мовай. Маеш свае звычаі, абычаі, абрады, традыцыі і не пагаджаешся з гвалтам, разбоем, несправядлівасцю і не жадаеш мець над сабою няпрошаных варвараў XX стагоддзя.

Маланкава думкі абляцелі ўвесь свет: што рабіць, да каго звярнуцца, дзе шукаць паратунку? Можа, Версаль, дзе мужныя гэтага свету гэтак падзялілі Еўропу, што ў імя равенства, брацтва і свабоды з аружжам у руках і крыжам на грудзях маюць права павывешваць на сухіх галендах вшысткіх беларусінаў? Сэрца аблівалася крывёю, назіраючы з акна вагона з Берасця да Баранавіч, як усе палі пазарасталі беразняком, толькі дзенідзе тырчэлі смыкі студняў як сведак нядаўняга жыцця, хоць беднага, але ў сваім родным кутку.

У Баранавічах, развітаўшыся з М. Жданам, я перасеў на цягнік, які адходзіў на Вільню. Ад'ехаў некалькі кіламетраў, як польская палёвая жандармерыя пачала рабіць з пасажыраў абшукі. Забралі некалькі рэчаў у мяне. Я запратэставаў супраць бяспраўя. Аднак дзядзька, што сядзеў каля мяне, незаўважна пацягнуў мяне за каптан. Я зразумеў, што далейшыя мае пратэсты могуць быць для мяне вельмі непрыемнымі.

Прыехаў у родны Наваградак, выгляд якога зрабіў на мяне вельмі прыкрае ўражанне, бо вуліцы і рынак былі зарослыя травою. Быў падвячорак і дзякуючы паліцыйнай гадзіне я змушаны быў начаваць у Наваградку. Зайшоў у гатэль. Знаёмы гаспадар быў вельмі здзіўлены маім прыездам, бо ўсе гаварылі, што я загінуў на вайне.

Кожнаму начуючаму ў гатэлі трэба было мэльдавацца** ў паліцыі. Зайшоў у паліцыю. Напачатку са мною даволі ветліва абышліся. Далей адзін з паліцыянтаў, распытваючы мяне, адкуль я прыехаў, засунуў два пальцы ў кішэньку майго фрэнча. У гэты час я забыўся, што маю справу з асобамі, якія не мелі

* Трэба ўсіх беларусаў павывешваць на сухіх галінах (польск.).

** Мэльдавацца (ад. польск. *meldować się*) — рэгістравацца, прапісвацца.

ў сабе нічагусенькі людскага, і павышаным голасам зрэагаваў на подлы ўчынак яго, і ён сканфужана адышоў.

Мой прыезд для родных і знаёмых быў вялікай радасцю. Для мяне быў і вялікі смутак па тых, якія адышлі ў вечнасць за час маёй адсутнасці. Наведваючы мяне, сяляне вельмі крыўдзіліся на палякаў. Яны нават гатовы былі аддаць свае жыцці, каб пазбавіцца культурных бандытаў. Але што ўзамен маглі прынесці народу ўсходнеазіяцкія варвары? Гэтая думка паўстрымлівала народ ад рашучага дзеяння супраць «мілых вызваліцеляў». Для мяне ж, успрыняўшага французскую свабоду-справядлівасць, было траха недаверу гэтым нараканням. Я думаў, што людзі, шкадуючы мірных часоў, выяўляюць сваё абурэнне. Аднак нядоўга прыйшлося чакаць, каб пераканацца справядлівым цверджанням маіх суродзічаў.

На другі тыдзень майго прыезду польская армія з-пад Беразіны пачала адыход. Першыя вайсковыя аддзелы на шляху свайго адыходу грабілі сялян, асабліва забіралі коней і грошы. Як толькі людзі даведаліся, што палякі ўцякаюць, пабралі коней і самі ўцяклі ў лес.

Аднаго дня я быў у сваім агародзе. Гляджу — да майго суседа пайшоў польскі жаўнер. Адразу чую крык: *«Давай каня!»* Сусед адказвае, што каня не мае. Той тады давай шукаць «каня» за абразамі, у куфрах. Не знайшоўшы нічога, выйшаў на двор, выцягнуў са страхі саломы, дастаў запалкі і гавора: *«Не дасі коня, запаля халупа»*.

Гледзячы на гэта бяспраўе, мяне трасло ад злосці, але ці можна было што зрабіць гэтаму лотру*?! Па ўсёй вёсцы грацавалі такія ж самыя бесты, якія цэлыя вёскі палілі разам з жыхарамі, як гэта было з вёскаю Лядкі каля Міра за тое, што каля вёскі знайшлі шынэлю расійскага жаўнера.

Таго самага дня ў нашай вёсцы затрымалася артылерыйская брыгада. Штаб памясціўся ў майго родзіча. Нічога не падазраючы, я наведаў родзіча. Пасля гэтага мне сяляне гаварылі быць на старажы. Назаўтра пад вечар брыгада пачала збірацца на ад'езд. Раптам знікла ўсё сялянства з вёскі, на вуліцы не было жывое душы. Нават сабакі пахаваліся. Толькі па вуліцы нагола

* Лотар (ад. польск. *łotr*) — нягоднік, мярзотнік.

з шашкамі на конях гойсалі азвярэлыя польскія жаўнеры. Тут я асазнаў, што справа дрэнная, і схаваўся ў каноплі, а як сцямнела, убег у хату і, з пахвату ўхапіўшы жаночы жакет замест свайго, уцёк у лес, дзе прабыў усю ноч.

З прыходам бальшавікоў, якія прабылі два месяцы і тыдзень, трэба прызнаць, што народ не меў ніякіх здзекаў. Зразумела, яны паказалі сябе сапраўднымі дэмакратамі. Толькі тое, што бальшыню мабілізавалі ў армію. Я як ваенны абязаны быў мабілізавацца ў адміністрацыю ваенрэўкома. Старшынём быў малады вайсковец Цыдзілін, прысланы 54-й дывізіяй. Я займаў два становішчы: скарбнік і кіраўнік зямельнага аддзела. Не знаю прычыны, але я на гэтага «прэдсядацеля» меў велізарны ўплыў. Што я яму радзіў, тое ён і рабіў. За час прабывання бальшавікоў у Гарадэчанскай воласці нікога не арыштавалі. Аднаго дня з уездрэўкому прыйшоў загад арыштаваць графіню О'Рурк з двара Бардзячы. Старшыня парадзіўся са мною. Я яго пераканаў, што гэты арышт не прынясе ніякай карысці, а больш шкоды. Паслухаўшыся мяне, ён паехаў у ўездрэўком, дзе з ім пагадзіліся. Аднаго дня ў вёсцы Гарадзечна затрымаўся атрад па рэквізіцыі збожжа. Камандзір атрада начаваў у Дземука-Цішэўскага, які да рэвалюцыі быў кантралёрам пасажырскіх цягнікоў Палескай чыгункі. Гэты Дзямук-Цішэўскі нагаварыў яму, што ў валасным рэўкоме працуюць адныя беларучкі, сынкі былых памешчыкаў і ўпраўляючых дварамі. Назаўтра камандзір прыйшоў у валрэўком, арыштаваў старшыню і завёз у ўездрэўком, дзе ён прабыў чатыры гадзіны. Вярнуўся ў валрэўком, не страціўшы да мяне даверу.

У верасвнёўскую ноч адыходу [прыходу?] польскіх «вызваліцеляў», а другой гадзіне ночы, конскі топат разбудзіў усіх жыхароў. Зараз жа пачуўся стукат у дзверы: *«Адэмкнуць»**. Святла, газы не было, запалілі свечку. Я спаў на канапе. Увайшоўшы ў хату, загаварылі: *«цо, тутай жыдкі»*, але, пабачыўшы святыя абразы на покуце, адразу звярнулі ўвагу на мяне, кажучы: *«цо, комуніста»*. Пачалі аглядаць абутак і вопратку, што ляжала на крэслах і выглядала на вайсковую ўніформу. Дадаўшы да гэтага маю вялікую чупрыну, яны ўсё гэта ўзялі пад увагу і палічылі

* Адэмкнуць (ад польск. *odemknąć*) — адчыніць.

мяне бальшавіцкім камісарам. Адзін з вельмі праціўнаю васпаватаю мордаю пытае ў генерала: *«Цо маем з ім зрабіць?»* Генерал адказаў: *«Улоб»*, — і выйшаў ніц.

Пасля гэтых словаў уся сям'я пачала прасіць генерала і даказваць, што я толькі пару тыдняў, як павярнуўся з Францыі. Гэты здзек прадоўжваўся некалькі гадзінаў. Перагледзеўшы ўсе паперы, генерал, штось пагутарыўшы з другімі афіцэрамі, сказаў: *«Нех выйдзе»*. Што я і зрабіў, пераходзячы ў другую палавіну хаты, дзе жыла ўдава з дзвюма дачкамі. Паміж іх я лёг і прабыў да 9-й гадзіны раніцы.

На кожным двары ў тую ноч было не меней за 30 коней. З гумнаў не толькі сена, авёс, але жыта, ячмень, пшаніцу, грэчку — усё павыцягвалі для коней. Пасля гэтага паляванне пачалося за курамі, качкамі, гусямі, свіннямі, нават за маладняком рагатым. У вёсцы было нешта страшнае: коні іржалі, каровы раўлі, свінні пішчалі, куры, качкі, гусі, сабакі сваймі галасамі прасілі ратунку, а да гэтага жаночыя галасы наводзілі страх і помсту да тых, што чамусь не разумелі ці не хацелі разумець любові, якой вучыў Хрыстос, а з зацятаю лютасцю нішчылі ўсё і ўся чужое. Маю сцвердзіць, што гэтая ноч для жыхароў в. Нясутычы, а таксама для ўсіх істот, якія Бог даў чалавеку, была ноччу біблійных Садому з Гамораю. Сумныя, чорныя дні насталі, дні перажыванняў, здзекаў, паняверкі, гвалту народа, які нічагусенькі не зрабіў такога, каб над ім тварыць такі нялюдскі дзікі гвалт.

Хутка за «культурнымі вызваліцелямі» паехала зграя цывільнай улады, якая ў першую чаргу занялася расправаю з усімі тымі, якія працавалі пры бальшавіках, арыштоўваючы і замыкаючы ў астрогі. Мяне і майго дваюраднага брата І. Мазалевіча першымі арыштавалі ў нашай воласці. Нічога не знайшоўшы прабальшавіцкага, мне закінулі, што я асабіста змусіў быўшага войта здаць мне ў валрэўком польскую валюту. Я ім даказаў, паказваючы загад уездрэўкому. Тады мы былі звольненыя з астрогу. Не прамінула двух месяцаў, на Вадохрышча, як мы зноў апынуліся за кратамі астрогу. Гэтым разам воляй-няволяй прыйшлося перадаць справу ў рукі адваката. Перад ім пракуратура не магла махляваць, і гэта змусіла нас звольніць.

У гэтым годзе я пазнаёміўся з кс. Ф. Абрантовічам[35], які быў вядомым сваім патрыятызмам і агітаваннем сярод насельніцтва Навăградчыны, каб гутарылі сваёю роднаю моваю ва ўсіх урадавых установах. Кожнага кірмашовага дня кс. Ф. Абрантовіч хадзіў па крамах і, калі чуў, што селянін стараецца гаварыць папольску, сарамаціў яго. Бачачы перад сабою ксяндза, селянін адразу ўспрымаў бадзёрую паставу і не баяўся паліцыі, якая хадзіла па крамах з бізунамі, змушаючы сялян гутарыць папольску.

Кс. Ф. Абрантовіч падчас гутарак быў вялікім аптымістам у здзяйсненні Акту 25 Сакавіка. Ён цвердзіў, што неабходна ўсведамляць народ у змаганні за гэты акт; да гэтага неабходна павысіць жыццёвы ўзровень народа праз агранамічнакультурныя арганізацыі. Мала было такіх высокамаральных патрыётаў, якім быў кс. Ф. Абрантовіч, які перадчасна загінуў у засценках НКВД дзякуючы польскаму ўраду, які не мог цярпець пакойнага за ягоны патрыятызм да свае Бацькаўшчыны. Каб пазбыцца кс. Ф. Абрантовіча, польскі ўрад пастараўся ў Папы Рымскага, каб яго дзесь выслаць, што і было зроблена. Папа хіранітазаваў кс. Ф. Абрантовіча ў епіскапы і назначыў яго ў Харбін місіянерам. У канун вайны 1939 г. епіскап Ф. Абрантовіч прыехаў на радзіму ў Навагрудак, адтуль ён паехаў у Львоў да мітрапаліта Шаптыцкага[36], і там з прыходам бальшавікоў знік па ім след[37]. Вечная памяць яму, вялікаму патрыёту сваёй Радзімы-Бацькаўшчыны.

Пасля Слуцкага паўстання пражываў у сваіх родзічаў, у тым ліку і ў мяне, Ю. Лістапад[38], які ўцёк за мяжу. Пасля даволі вялікага часу павярнуўся дамоў, дзе быў арыштаваны, і знік па ім след. Падчас нямецкай акупацыі мне не ўдалося натрапіць на след яго ці ягонае радзіны[39].

З прагалошаннем у 1922 г. польскім урадам выбараў у Сейм і Сенат ажывіўся беларускі рух, пачалі адбывацца напаўлегальныя сходкі сведамых беларусаў. З кожным днём народ набіраў большае смеласці, адвагі ў выказванні свайго незадавальнення з польскага панавання над ім. Прычынаю гэтай адвагі была сведамасць, якая пашыралася з кожным днём сярод насельніцтва больш свядомымі беларусамі. Да гэтага ў прыгранічнай пала-

се дзейнічалі беларускія партызаны. У передвыбарчай акцыі старэйшая векам інтэлігенцыя ў вельмі малой колькасці прымала ўдзел, рэй вяла моладзь і жанатыя да 35 гадоў. На доказ гэтага ў канчатковым паседжанні зацверджання св. памяці В. Рагулю кандыдатам на лісце № 16[40] у памяшканні адваката Друцкага-Падбярэскага[41] з 28 асоб прысутных былі толькі два прадстаўнікі, старэйшыя векам. На гэтым паседжанні былі вызначаныя мужы даверу ў раённыя і акруговыя выбарчыя камісіі. Мяне прызначылі ў раён в. Бральнікі, дзе старшынём камісіі быў абшарнік паляк Пянткоўскі.

У часе галасавання якісь шляхціц звярнуўся да старшыні камісіі за дазволам галасаваць за хворую матку, што засталася ў хаце. Старшыня звярнуўся да ўсіх сяброў і да мяне, мужа даверу № 16, ці мы пагодзімся даць права на галасаванне. Я зараз даў згоду, мяркуючы скарыстаць на сваю карысць. Зразумела, было гэта няпраўна, але ўсё прайшло добра, бо ніхто не запратэставаў у акруговай камісіі.

Вялікая радасць была ў народа пасля выбару сваіх прадстаўнікоў у Сейм і Сенат лікам 11 паслоў і 3 сенатараў[42]. Аднак, нягледзячы на тое што нашыя прадстаўнікі ў Сейме і Сенаце даводзілі правы беларускага народа, дадзеныя на Версальскай мірнай канферэнцыі, Сейм і Сенат, а таксама ўрад не думалі прытрымлівацца гэтага права. Наадварот, дэкрэт за дэкрэтам уневажнялі ўсе прывілеі нацыянальных меншын. Пераканаўшыся, што польскі ўрад не дазволіць беларускаму народу карыстацца аднолькавымі правамі з польскім народам, нашыя прадстаўнікі перайшлі да адкрытай апазіцыі і, раз'язджаючы па гарадох і мястэчках, рабілі мітынгі, на якіх выяснялі народу імкненні польскага ўрада здэнацыяналізаваць нацыянальныя меншыні ў Польшчы. Пазбаўленыя правоў беларусы пачалі ўцякаць у другую частку свае Бацькаўшчыны (БССР), асабліва моладзь, якая не мела ніякай перспектывы на будучыню, бо нават ад падмятайлаў вымагалі знаць «Ойча наш» па-польску.

У аднаўленай пасля Першай светавой вайны Польшчы не магло ўстабілізавацца ані палітычнае, ані гаспадарчае жыццё. Частыя змены ўрада давялі ў шмат якіх мясцовасцях да

забурэнняў, якія жорстка былі здушаны жаўнерамі і паліцыяй. Тагачасныя падзеі, як на Усходзе, так і на Захадзе, а таксама патаёмныя кантакты на два бакі — хто болей заплоціць, учынкі Р. Астроўскага[43] ды іншых спрычыніліся ў 1925 г. да падзелу Беларускага пасольскага клуба на тры партыі: БСР Грамада[44], Сельсаюз[45], Хрысціянская дэмакратыя[46], а рэшта засталася беспартыйнаю[47]. Да траўня 1926 г. Грамада на правінцыі не праяўляла амаль ніякай палітычнай дзейнасці, толькі пачалася грызня ў Вільні. З траўня 1926 г. Пілсудскі за падтрымку ягонага путчу нацыянальнымі меншынямі ў Сейме[48] дазволіў Грамадзе легальна праводзіць палітычную дзейнасць у чатырох ваяводствах. У гэтым часе ўтварылася, адкалоўшыся ад «Вызвалення»[49], Партыя Хлопска[50] з пасламі: Ваявудскі[51], Хамінскі[52], Балін[53], Шакун[54], Шапель[55], Галавач[56] і Фідэркевіч[57].

З дня дазволу пачалі арганізоўвацца як грыбы пасля дажджу гурткі Грамады. Да хуткага росту Грамады ў вялікай меры спрычыніўся тадышні пасол св. п. Васіль Рагуля, які на мітынгах на працягу мінулага часу выгалошваў вострыя прамовы супраць палякаў за іхныя злачынствы супроць беларускага народа. Надзвычайны рост гурткоў спанукаў Грамаду да закладвання народных дамоў, бібліятэк-чытальняў, ладжання канцэртаў, прадстаўленняў, рэфератаў, палітычных мітынгаў. Усё гэта спрычынілася да ўсведамлення і росту ахвярнасці нашага народа, а таксама да разумення абавязкаў перад Бацькаўшчынаю. Грамаду падтрымалі другія меншыні — жыды, татары, нават некаторыя палякі з ліку ўрадоўцаў: пракурор акружнога суда, не памятаю прозвішча, віцэ-ваявода Серафімовіч (швагер Трэпкі), Бокун з жонкаю, шмат ніжніх урадоўцаў і паліцыянтаў.

Як ведама, варожа ставіліся да грамадаўскага руху расейцы і тыя беларускія янычары, якія не маглі зразумець, што яны належаць да апрычонай нацыі-народа, які ў даўнюю мінуўшчыну меў сваё незалежнае дэмакратычнае гаспадарства, якое першае ўнясло культуру ў Усходнюю Еўропу. Велізарны ўздым Грамады занепакоіў ворагаў беларускага народа — расійскі бальшавізм і польскі паўфашызм. Яны баяліся, каб грамадаўскі ўздым разам з «Узвышшам»[58] не прагналі няпрошаных «вызваліцеляў» з свае роднае зямелькі. Меркаванні нашых ворагаў злучылі іх

супраць беларускага вызвольнага руху. Абедзве тыраніі як бы дагаварыліся знішчыць беларускае змаганне — як грамадаўскае, гэтак і ўзвышанскае ў БССР.

У праграме Грамады не было ніводнага пункту, які б заклікаў да якіх-небудзь гвалтаў ці самаволі, аднак наплыў камуністычных правакатараў з-за мяжы стараўся справакаваць маласведамых грамадаўцаў, асабліва пры мяжы савецка-польскай, да збройных нападаў на ўрадавыя ўстановы. У гэтым камуністычным правакатарам дапамагалі польскія, якія выконвалі тыя самыя заданні.

У памятную трагічную ноч з 14 на 15 студзеня 1927 г. падчас арышту грамадаўскіх паслоў у Заходняй Беларусі было арыштавана 3854 асобы. Вялікі смутак перажываў народ, даведаўшыся аб гэтай трагічнай падзеі, толькі ворагі лікавалі.

Каб дакладна даведацца аб тым, еду ў Наваградак, іду да Чатыркі[59], з якім быў у добрых адносінах, аднак ён нічога канкрэтнага не знаў, толькі тое, што падалі польская прэса і радыё. На шляху ў Наваградак мне ў некалькіх пунктах рабілі абшукі. Я зразумеў, што справа паважная, бо ўся паліцыя і войска былі напагатове. Шалёны тэрор, якога не перажываў ніводны народ, хіба толькі жыды — ад чорнай сотні[60] за царскім часам. Паліцыя, прыязджаючы ў вёску, здзірала стрэхі з будынкаў, з камораў высыпалі ўсё ў адну горбу — муку, крупу, авёс, ячмень, грэчку і інш. Здзек, гвалт, неабмежаваную самаволю рабілі тыя, у якіх на штандарах напісана: *«За нашу і вашу волю»*[61]. Дзясяткі тысячаў беларускіх сыноў паверылі ў гэты надпіс і пайшлі ў так званыя крэсавыя палкі — Наваградскі, Лідскі, Слонімскі, Віленскі і інш.[62], адкуль не вярнуліся, аддаўшы сваё жыцці. Ашуканчую нялюдскую палітыку да беларускага народа праводзілі польскія ўрады розных колераў. Аднак ні шалёны тэрор, ні астрогі, кары, подкупы не змаглі зламаць імкненне нашага Народа да самастойнага незалежнага жыцця.

Па ліквідацыі Грамады засталося ТБШ з шырака раскіданымі акруговымі ўправамі і аддзеламі па вёсках. Часта кантраляваныя паліцыяй, яны праводзілі нацыянальную працу.

Як я вышэй зазначыў, св. п. Ф. Абрантовіч пакінуў мне як бы загад — узняць жыццёвы ўзровень майго народа. Нягледзячы

на маё варожае стаўленне да ўсяго польскага, я паставіў сабе за заданне арганізаваць земляробскі гурток, які б у гаспадарчых справах мусіў быць пад даглядам павятовага гуртка земляробскага, у якім працавалі фахоўцы з Менскай губерні: Бокун, Сечка, Ф. Абрантовіч. Усе яны былі праціўнікамі палякаў і гутарылі па-беларуску.

На адным сходзе Грамады адзін чужаземец-пракамуніст з вёскі Мотча закінуў нам, што мы працуем з палякамі. Мы даказалі беспадстаўнасць ягоных закідаў, матывуючы тым, што гісторыя не знае ніводнага народа, які, не маючы сродкаў, вызваліўся з чужацкай няволі. Адным бальшавікам карысна бядота, галота, нішчыта. Агульны сход бальшынёю галасоў стаў на нашым баку.

1927 г. быў найтруднейшым годам для народа. Пасля хоць кароткага, але свабоднага дзеяння часоў Грамады пачаўся тэрор на ўсё і ўся беларускае. Амаль уся беларуская інтэлігенцыя пазашывалася, ніхто носу не паказваў нідзе. Народ застаўся сам сабою; сялянская маса не ведала, што рабіць, з кім парадзіцца. Да гэтага хто-ніхто пайшоў у паліцыю, каб помсціцца на сваіх палітычных праціўніках. З Вільні як цэнтру ніякіх вестак не было. Адзіным голасам у абарону супраць бяспраўя польскага ўрада быў голас св. п. кс. А. Станкевіча[63], а ў Сейме св. п. В. Рагулі. Усе ўра-патрыёты лікавалі, што праз 30 гадоў і пацвердзілі артыкуламі ў «Бацькаўшчыне», ганьбячы Грамаду[64].

У жніўні 1927 г. Гарадэчанская валасная рада выбрала мяне валасным старшынём, аднак, нягледзячы на маё знаёмства з павятовым старастам Грынеўскім, на дамаганне павятовага каменданта паліцыі і рэферэнта бяспечнасці Сабегнанскага (?), Грынеўскі мяне не зацвердзіў.

Пад канец 1927 г. канчалася кадэнцыя Сейма і Сената з выбараў 1922 г. Трэба было думаць аб новых выбарах — не дзеля таго, каб дабіцца ад польскага ўрада якой-колечы палёгкі, не! Бо ўжо было ўсім ведама, што польскі паўфашызм намагаецца праглынуць усіх беларусаў, каб і следу па іх не засталося. Але неабходна было паказаць палякам, што мы жывём і нас ніякая сіла не здолее знішчыць.

Як стала вядома, што новыя выбары вызначаны на 4 сакавіка ў Сейм і 11 сакавіка 1928 г. у Сенат, пачаўся рух сярод сялян-

ства, распачаліся нелегальныя паседжанні ў акруговай управе ТБШ у Наваградку, кіраўніком якой быў Анастазі Аляшкевіч[65] з мястэчка Любча, адзіны інтэлігент, які застаўся з народам.

Аднаго дня Аляшкевіч выклікаў мяне ў Наваградак. Прыехаўшы ў управу, заспеў там І. Дварчаніна з Вільні, з якім не бачыўся 13 год[66]. З управы А. Аляшкевіч, І. Дварчанін і я пайшлі ў гатэль, дзе Дварчанін паінфармаваў нас аб сітуацыі ў Вільні і будучых выбарах. Ад яго мы даведаліся, што Астроўскі, Луцкевіч і Коўш[67] парвалі з Грамадою ў астрозе і маюць складаць лісту ў Наваградскай акрузе, на якой будзе кандыдаваць і М. Чатырка. Віленская інтэлігенцыя, вылучаючы Хрысціянскую дэмакратыю, не хоча складаць лістоў. Я. Станкевіч[68] катэгарычна адмовіўся мець якую-небудзь сувязь з пазасталай нашай інтэлігенцыяй.

Абмеркаваўшы ўсе праблемы, Дварчанін запрапанаваў скласці лісту па Наваградскай акрузе, але дзе ўзяць кандыдатаў? Інтэлігенцыя слухаць не хацела; сапраўды, каму хацелася сядзець 6–8—10–12 гадоў, а можа і вечную катаргу. Гэта чакала кожнага беларуса, які не меў намеру запрадацца палякам. Сп. Дварчанін запрапанаваў мне і Аляшкевічу кандыдаваць такім парадкам: я на першае месца, Дварчанін на другое, Аляшкевіч трэці. Далейшыя кандыдатуры Дварчанін абяцаў у хуткім часе падшукаць.

Пачуваючы сябе слабым на такое адказнае становішча ды на першае месца, я, адмаўляючыся, запрапанаваў Аляшкевіча на першае. Дварчанін, выясняючы сітуацыю, звярнуў увагу, што калі Аляшкевіч адыдзе з акруговай управы ТБШ, то не знойдзецца чалавека заступіць яго там, і могуць быць дрэнныя наследкі. Акрамя таго, Дварчанін сказаў, што маё імя на Наваградчыне больш вядомае, нават сярод радыкальных урадаўцаў, якія паходзілі з мяжы польска-савецкай.

Здаючы сабе справы з наследкаў, якія чакаюць у будучыні мяне і маю сям'ю, мне было сорамна ў такі цяжкі час адмовіцца. Гэта было б раўназначна здрадзе свайму Народу. І я даў згоду кандыдаваць на першым месцы з лісты № 39 «Змаганне» па Наваградскай акрузе. З прычыны адсутнасці кандыдатаў у Сенат ліста не была складзена. Пастанавілі галасаваць на лісту № 18[69] — г. зн. св. п. В. Рагулю.

Па Наваградскай акрузе былі складзеныя наступныя лісты: Грамадаўская ліста № 40 — Тарашкевіч[70], Рак-Міхайлоўскі[71], Мятла[72], Валошын[73] і Дударэвіч[74] з вёскі Асташын каля Любчы. З гэтае лісты былі закрэсленыя акруговаю камісіяй усе чатыры быўшыя грамадаўскія паслы, якія сядзелі ў астрозе на Лукішках у Вільні.

Ліста № 39 «Змаганне»: Стагановіч, Дварчанін, Гаўрылік[75], Крынчык[76], Аляшкевіч і Лойка[77].

Ліста № 38, камуністычная: Варскі-Варшаўскі[78], Сахацкі[79] і Грыц[80] з вёскі Ваўковічы. Першыя два былі выкрасленыя з лісты.

Ліста № 41: Р. Астроўскі і М. Чатырка.

У Сенат былі лісты: № 18 — В. Рагуля, з пракамуністычнай лісты — І. Малец[81]. З польскіх лістоў была ББВР[82], ППС (Польская Партыя Сацыялістаў)[83] і «Вызваленне».

Не вымяняючы польскіх лістаў, пачалася канкурэнцыя паміж беларускімі лістамі, а таксама камуністычнымі.

Мушу адцеміць, што па Наваградскай акрузе было пару вёсак, якія былі пад уплывам хітрых абшарнікаў. Нягледзячы на тое што называлі сябе беларусамі, яны выконвалі ўсе загады абшарнікаў. Адною з такіх вёсак была вёска Вераскава Любчанскай воласці[84]. У гэтай вёсцы праводзілася агітацыя супраць лісты «Змаганне». Аднак пазней, калі польскі фашызм утварыў партыю пад назовам *OZN*, уся вёска належала да гэтага новага твору, кіраўніком якога быў абшарнік Брахоцкі. Жыхароў гэтае вёскі ад заглады* бальшавікамі ўратаваў сакратар гэтай арганізацыі. Ён працаваў у воласці і здолеў спаліць спіс сяброў *OZN*. Камуністы, бачачы, што прайгралі, пусціліся на правакацыю, друкуючы ў апошнюю перад выбарамі ноч адозвы з заклікам галасаваць за кандыдатаў № 39 «Змаганне». У гэтую ж ноч на хутары А. Мальца[85] быў арыштаваны ўвесь штаб Баранавіцкага акружкама. На падставе тае адозвы арыштавалі і мяне з Аляшкевічам. Правакацыя была на руку польскай паліцыі, якая далучыла нас да камуністаў, змайстраваўшы працэс.

Сядзелі ў Наваградскім астрозе да суда разам з В. Рагулем і Сокал-Кутылоўскім[86], арыштаваным за шпегунства. Нава-

* Заглада (ад польск. *zagłada*) — вынішчэнне.

градскі астрог быў настолькі перапоўнены, што не ставала месца на падлозе. Мне міжвольна прыпомніліся словы Юрка з п'есы «Мутэрка»[87]: хто не знае, дзе будзе спаць у наступную ноч — ці ў мяккай пасцелі на сваім ложку, ці на голых астрожных нарах, — не мае права абзавадзіцца сям'ёю. (Я моцна перапрашаю жонку[88], дзяцей за маё ўроджанае стаўленне да свае Бацькаўшчыны-Беларусі. Нават сёння, калі адною нагою стаю над магілаю.)

Я сядзеў з В. Рагулем у адной цэлі. Быў ён заўжды вясёлы, жартаўлівы, нягледзячы на тое што ўдома пакінуў двое маленькіх дзяцей і гаспадарку без апекі. Гутарылі на тэмы сённяшняга дня. Я і Аляшкевіч запэўнівалі В. Рагулю, што выбаршчыкі «Змагання» аддадуць свае галасы за яго, бо мы ў двух адозвах заклікалі народ галасаваць за тых кандыдатаў у Сенат, якія не сыдуць з нацыянальных шляхоў у абароне свайго народа.

І гэта здзейснілася 11 сакавіка 1928 г. Камуністычны кандыдат у Сенат І. Малец праваліўся, дастаўшы мінімальную лічбу галасоў[89]. За гэта сакратара Баранавіцкага акружкама Кандрацюка выкінулі з партыі і назвалі правакатарам[90]. Ліста Чатыркі — Астроўскага, якому палякі прарочылі перамогу, атрымала ўсяго 49 галасоў[91] і гэтым скампраметавалася. «Змаганне», якое з-за тэрору паліцыі не мела можнасці праводзіць агітацыю, нягледзячы на шахрайствы выбарчых камісіяў, з 6 месцаў атрымала тры. Гэта амаль 500 тысяч галасоў[92] — сведамасць нашага Народа, якая з'явілася дзякуючы папярэднім нашым прадстаўнікам, асабліва В. Рагулю і ў некаторай ступені — тэрору польскай адміністрацыі.

26 сакавіка 1928 г. на дамаганне маршалка Сейма я быў звольнены з астрогу і назаўтра паехаў у Варшаву. Па прыездзе нас спаткалі і павялі ў Сейм нашыя паслы, Каруза[93] і Стаповіч[94]. Пазнаёміўся з Юхневічам[95], Валынцам[96], Гаўрылікам, Грэцкім[97], які прайшоў у Сейм з украінскай лісты[98], але як беларус.

Пасля некалькіх паседжанняў мне, селяніну, было дзіўна: з аднаго боку, вялікія паны, з другога — чырвоныя палякі, наймiты Масквы, з сеймавай трыбуны абліваліі адзін аднаго бруднымі памыямі, а выйшаўшы ў кулуары, шпацыравалі пад ручкі.

Атрымаўшы першы раз пасольскія грошы ў суме 1306 злотых за месяц, за якія можна было купіць 6 добрых кароў ці 650 пудоў збожжа[99], прыехаў у свой родны Наваградак і адразу пайшоў на кірмаш. Мушу адцеміць: даючы згоду на кандыдаванне, я пастанавіў сабе не паляпшаць жыццёвага ўзроўню самога сябе і сям'і. Я сыходзіў з меркавання, што калі на працягу пяці год палепшу ўзровень, якога далей не змагу даць, то могуць быць для мяне і сям'і вельмі дрэнныя наследкі.

На рынку абступілі мяне знаёмыя і незнаёмыя, але ўсе шчырыя патрыёты свае радзімы; адны — з зацікаўленнем свежых навін, другія — з бядоты, якая панавала сярод малазямельнага сялянства з-за бяздарнага гаспадаравання «вызваліцеляў».

Вясна для ўсіх істот, якіх Гасподзь адарыў жыццём, была самаю вясёлаю, шчасліваю, радаснаю парою года. Для нашага селяніна яна была самаю жудаснаю, нешчасліваю, горкаю. Ён за слязьмі не бачыў, не чуў усіх і ўсяго, што славілі Госпада за дараванне ўсяму жыцця. Селянін не клапаціўся, што няма чаго есці. Ён жыў на крапіве, шчаўі, іншым зеллі. Яго клопаты вясною былі — што няма чым засеяць свой загон. Няма за што парога падвастрыць, мазі купіць, каб падмазаць воз. Адбываць паншчыну-шараварку[100], інакш адбываць кару.

Ведаючы такое жахлівае палажэнне свайго брата, ці можна было адмовіць у мінімальнай дапамозе тым, якія не з свае нядбаласці дайшлі да такога нізкага ўзроўню, а іх давялі «старэйшы брат» маскаль ды «культурны» лях з-за Бугу. Не маючы на сабе торбаў, яны не прасілі міласці, але прасілі пазычыць. Каму 10, каму 15–20 злотых. Пазычаў — каб аддалі, як багатымі будуць.

Распазычыўшы 700 злотых, пайшоў у беларускую гімназію, дзе на рукі сп. Скрабца[101] даў 500 злотых, абяцаючы ў будучым уносіць 300 злотых кожнага месяца.

Перавялікадняўшы, паехаў у Варшаву, пазычаючы 200 злотых у крамніка Бярковіча.

Гэтым разам давялося быць у Варшаве даўжэйшы час: з ініцыятывы Беларускага пасольскага клуба (Ярэміч, Юхневіч, Каруза, Стаповіч) пачаліся перамовы з пасламі «Змагання» (Дварчанінам, Гаўрылікам, Валынцом, Грэцкім і мною) з мэ-

таю злучыцца ў адзін беларускі пасольскі клуб ды прыняць Я. Станкевіча, які сядзеў у радах *B.B.W.R.*[102].

На першым паседжанні між намі не было супярэчнасцяў. Даручылі Стаповічу і Карузу перагаварыць з Станкевічам у гэтай справе. Пасля гэтага паседжання «Змаганне» мела сваю нараду, на якой Гаўрылік і Грэцкі катэгарычна адмовіліся ў злучэнні, а Валынец сказаў, што ён нічога супраць злучэння не мае, але калі Я. Станкевіч дасць згоду да агульнага клуба, дык ён, Валынец, катэгарычна адмовіцца належаць да яго.

На запытанне Дварчаніна — *«якая ў вас прычына да такога стаўлення да Я. Станкевіча?»*, Валынец, пасмыкаўшы вуснамі, сказаў: *«Перад выбарамі Я. Станкевіч прыехаў да мяне дамоў і запрапанаваў мне выставіць сваю кандыдатуру на ягонай лісце. Прызнаюся шчыра, мне хацелася кандыдаваць, але, знаючы Станкевіча і не маючы ніякіх фінансавых сродкаў, сказаў яму: "Я не маю грошай на гэта". Пасля досыць доўгае гутаркі між намі Я. Станкевіч сказаў: "Вы не турбуйцеся пра сродкі на выбары, яны ёсць. Ад вас я нічога не жадаю, толькі вашае згоды". Не даяраючы Станкевічу, я катэгарычна адмовіўся.*

*Праз некаторы час Я. Станкевіч зноў прыехаў да мяне ўгаворваць. Я і гэтым разам адмовіўся. Тады Станкевіч кажа: "Сябра Валынец, дайце мне слова гонару, што да смерці нікому не скажаце, а я вам раскажу, адкуль мы будзем мець сродкі на выбары". Прызнаюся, я даў слова гонару, якое сёння ў вашай прысутнасці парушаю. Я. Станкевіч сказаў, што грошы будуць дадзены віленскім ваяводскім начальнікам бяспечнасці Кіртыклісам*[103].

*Я і гэтым разам не мог паверыць словам Станкевіча. Пасля колькіх хвілінаў маўчання ён тады дастаў з партфеля паперку, паднёс да мяне і кажа: "Не верыце, тады прачытайце". Чытаю. Папера была афіцыйная, з штампамі, пячаткамі і подпісам Кіртыкліса. У паперы не ішло пра нейкія забавязванні з боку Я. Станкевіча; было напісана лічбамі і літарамі "65 000 злотых для Янкі Станкевіча для яго ўласнага карыстання".*

*Разважыўшы, даў згоду кандыдаваць — з намерам пасля выбараў адысці ад Станкевіча, што і зрабіў, прайшоўшы ў Сейм»*.

Гэтае апавяданне Валынца зрабіла на нас усіх вельмі вялікае ўражанне. Прызнаюся, я не верыў гэтаму, бо ці ж можна было

паверыць, што чалавек з вышэйшаю асветаю, які лічыць сябе гісторыкам[104], заўжды і ўсюды выяўляе сябе патрыётам, які не хацеў гаварыць з тымі, што не ведалі свае роднае мовы, раптам запрадаўся ворагам народа, з якога паходзіць.

(Нягледзячы на гэта, як і на займанне месца сярод сябраў *B.B.W.R.*, я заўжды размаўляў з Я. Станкевічам. Але каб чалавека пазнаць добра, трэба з ім пажыць, і гэтае жыццё, хоць не блізкае, у Амерыцы, дало мне мажлівасць пазнаць усю падна-готную Я. Станкевіча, у якога на першым месцы грошы, грошы і яшчэ раз грошы, а ад каго і за што, то не мае значання.

Маё цверджанне можа пацвердзіць Стась Станкевіч[105], хіба не захоча, бо на дзядзьку не выпадае гаварыць. Але трэба мець грамадскую адвагу і выяўляць усе злачыны, каго б ні было, нават роднага бацькі. Бесхрабетнасць, прымірэнчанскі нахіл да некаторых асоб рабіў і робіць вялікую шкоду сярод нашага грамадства. Я. Станкевіч вымагаў ад прыбываючых у Амерыку людзёў па 10–25 даляраў нібы на «Веду»[106], якая друкавалася ў друкара польскага князя Друцкага-Любецкага дармова, а сам ён бескантрольна клаў грошы ў свае кішэні. Станкевіч ні цэнта не даў на грамадскія справы. Сёння, палучыўшыся з доктарам Шчорсам[107], утварылі «звяз»[108] з мэтаю чужой дыверсіі разбіць БНР і вызвольнае змаганне самастойнага гаспадарства Беларусь.)

На наступным паяднаўчым паседжанні далі справаздачу Каруза і Стаповіч з перамоваў з Я. Станкевічам, які катэгарычна адмовіўся належаць да агульнага беларускага клуба, не падаўшы ніякіх матываў[109].

Пасля справаздачы пачалі абмяркоўваць аб аб'яднанні. На прапанову Гаўрыліка, што старшынём клуба мае быць хтось з «Змагання», Ярэміч катэгарычна не пагадзіўся.

Некалькіразовыя паяднаўчыя паседжанні не прывялі да супольнага дзеяння ўсіх беларускіх прадстаўнікоў дзякуючы Гаўрыліку, Грэцкаму, Валынцу, якія былі паслухмянымі карэспандэнта Барскага[110], праз польскі камуністычны клуб у Сейме.

Аднаго дня, вяртаючыся з Варшавы ў Навагрудак, я быў арыштаваны. Следчыя органы мелі на гэта права, бо Сейм памылкова не завесіў мае справы, а я быў арыштаваны перад выбарамі. Пасля арышту следчы з паліцыяй паехалі дамоў

і рабілі абшукі, але нічога не знайшлі. Назаўтра ў суправодзе самога ваяводы Бэчковіча[111] спераду, а старасты назадзе, пад велізарным канвоем мяне адвезлі на станцыю Наваельня, а там цягнікам у гарадзенскі астрог, дзе пасадзілі ў адзіночку. У астрозе мне было нядрэнна дзякуючы інспектару адміністрацыі Паўліку, з якім я служыў у расійскай арміі. Усё, што мне было трэба, дастаўлялася — зразумела, за мае грошы.

У другой палове лістапада 1928 г. мяне перавезлі ў Наваградак на суд, які распачаўся 28 лістапада. Найболей мяне і Аляшкевіча абыходзіла, што нас злучылі з камуністамі ў адзін працэс, але што можна было зрабіць з бяспраўнымі палякамі[112]? На судзе было сорамна ўзняць вочы перад знаёмымі, якія прыйшлі слухаць гэты трагіфарс. Мяне і Аляшкевіча баранілі аплочаныя мною адвакаты, Смяроўскі[113] з Варшавы і Свірыд[114] з Наваградка. Старшыня суда — ведамы беларусажорца Мурза-Мурзіч[115].

Першы дзень суда быў немажлівы, бо Мурза-Мурзіч не толькі абвінавачаным гаварыць не даваў, але нават і абароне. На другі дзень сітуацыя змянілася, бо прыехаўшы адвакат Смяроўскі не мог сцярпець гэтакіх адносін. Павышаным голасам, стукнуўшы па стале кулаком, сказаў: *«Цо тутай, царат чы чрэзвычайка?»**. Мурза-Мурзіч паклікаў яго да парадку, але ў сваім стаўленні да абвінавачаных змяніўся непазнавальна.

Сведкамі абвінавачвання былі тайная паліцыя і розныя адпадкі грамадства — такія, як Янкоўскі з-пад Турца, які быў сведкам на Грамаду, Пятроўскі, Светлік, які вучыўся калісь са мною і заўжды перапісваў усе заданні ад мяне. Сведач Цвірка-Гадыцкі[116], тайняк у часе сведчання на мяне, па заканчэнні выйшаў; зараз жа за ім пайшоў адвакат Гонігвіль. Гэты ж сведач, выйшаўшы ў пакой сведак, інфармаваў паліцэйскага аспіранта Крэмеса[117] (а Гонігвіль падслухаў). Як сведчыў Крэмес, то Гонігвіль задаў сведку пытанне: што яму гаварыў папярэдні сведка? Крэмес, змяшаўшыся, адказаў «ніц», на што адвакат сказаў, што да гэтага сведкі пытанняў больш не мае. Пасля гэтага ніхто Крэмесу не задаваў пытанняў. Гэта на ўсіх зрабіла вялікае ўражанне, а на суд — прыгнечанне.

* Што тут, царызм ці чрэзвычайка? (польск.).

Сведка Янкоўскі плёў на мяне, што я меў тэлефанічную сувязь з НКВД каля Радашкавіч і другія небыліцы, але як яго ўзялі ў крыжавы агонь абвінавачванне і абарона, ён папрасіў суд звольніць яго ад пытанняў, што выклікала да агульнага смеху ў зале.

З маіх сведкаў на ўвагу заслугоўвае св. пам. В. Рагуля, які, сведчачы, гутарыў па-беларуску, нягледзячы што Мурза-Мурзіч звярнуў яму ўвагу. Рагуля сказаў: *«Знаю калегу А. Стагановіча з 1905 г. Сённяшняя ягоная палітычная платформа болей радыкальная за маю, але, знаючы Стагановіча, я поўнасцю веру, што ён не быў, не ёсць і не будзе камуністам, нягледзячы на тое што суд сёння разглядае ягоную справу з арт. 102-га Расійскага Карнага Кодэксу*[118] *як камуніста, а таксама ніякія цёмныя сілы не выведуць Стагановіча з незалежніцкіх шляхоў для свае Бацькаўшчыны-Народа»*.

Зараз жа пачуліся воплескі ў зале, якія Мурза-Мурзіч прыпыніў.

Пракуратар сказаў наступнае: *«Высокі суд! Суд мае перад сваім аблічвам абвінавачваемага Стагановіча, які, паводле асобных сведкаў, з'яўляецца выбітным грамадзянінам Рэчы Паспалітай.*

*Ці суд можа паверыць такім сведкам у параўнанні з шэрагам сведкаў з ліку дзяржаўных чыноўнікаў і служачых, а таксама тых грамадзянаў Рэчы Паспалітай, якія заслугоўваюць на асаблівы давер?!*

*Нягледзячы на тое што абвінавачваемы паходзіць з вёскі і з'яўляецца селянінам, аднак жа сваёй хітрасцю ён ужо ад доўгага часу здолеў ашукаць (падмануць) некаторых дзяржаўных службоўцаў. І гэта дазволіла Стагановічу праводзіць сваю шатанскую дзейнасць, маючы на мэце адарванне "ўсходніх крэсаў" ад Рэчы Паспалітай. Да такіх абвінавачваемых суд не мае права быць паблажлівым (лагодным). Ён мусіць вынесці ім асабліва суровы прысуд, караючы па ўсёй строгасці польскіх законаў»*.

Адвакат сваю прамову пачаў наступнымі словамі: *«Замест таго, каб узнагародзіць майго мацадаўца, яму ў непрактыкаваны спосаб яўная і тайная паліцыя збудавала труну»*.

Па чарзе павінны былі гаварыць усе абвінавачаныя, але яны дамовіліся, што будзе гаварыць за ўсіх адзін А. Малец, зацяты

камуністы, не так ідэалагічна, як за грошы, бо двух яго братоў вучыліся не ў беларускай, а ў польскай гімназіі, дзе каштавала шмат даражэй. Малец пачаў прамову па камуністычным загадзе, але пасля некалькіх слоў суд яе забараніў. Тады ўсіх з залы адпусцілі; нас засталося трох: я, Аляшкевіч і Раманюк[119], упаўнаважаны нашай лісты. Чарга была за мною.

Прамоўца з мяне — пажалься Божа, але, сабраўшыся з сіламі, распачаў з наступных словаў: *«Мажліва, суду няведама, што кожны беларус, які з выбараў сваіх суродзічаў займае якое-небудзь становішча, ён зараней прыгатаваны апынуцца тут, дзе я сёння. Дзеля гэтага пры складанні лісты № 39 "Змаганне" ад Беларускага Народа я быў гатовы апынуцца тут. Гавару гэта дзеля таго, каб права, калі яно яшчэ ёсць, узяло верх над тым бяспраўем, якое творыцца над нявінным беларускім народам. Кроў застывае ў жылах, калі бачыш, як паліцыя намагаецца зрабіць мяне камуністам, і калі яны гэтага дасягнуць, то заўтра гэтая ж паліцыя зробіць камуністамі ўсе тыя амаль 500 тысяч маіх суродзічаў, якія аддалі свае галасы на маю лісту 4 сакавіка 1928 г., што не адпавядала б справядлівасці».*

Далей я не мог гутарыць. Старшыня суда Мурза-Мурзіч тры разы звяртаўся да мяне, чаго я прашу ад суда. За трэцім я ўстаў і сказаў: *«Ад свайго імя і ад імя маіх выбаршчыкаў спадзяюся ад суда справядлівасці».*

Гэтым разам хоць куртатая, але была справядлівасць. 03.12.1928 г. мяне, Аляшкевіча і Раманюка суд унявініў. На працэсе некалькі асоб з следчага, паліцыйнага і судовага персаналу скампраметаваліся і змушаны былі пазвальняцца: суддзя Паўлюць, следчы Шарэйка, паліцыйны аспірант Крэмес і іншыя.

Падчас мае адсутнасці ў Сейме мае дыхты ў 2/3 колькасці атрымоўваў Дварчанін, перасылаючы жонцы. Яны ўсе пайшлі на абарону мяне, Аляшкевіча, Раманюка. Некаторыя мае знаёмыя, якія зналі маё раскіданне грошай, гаварылі мне: *«Чаму вы, Стагановіч, маеце сваю карову, а людзі дояць?»* Я ім адказваў: *«Так, карова нібы мая, але я дастаў яе дзякуючы сведамасці майго народа, дзеля гэтага хай карыстаюцца, пакуль ёсць магчымасць. Я ж маю задавальненне і гонар, што перад зненавіджаным*

*беларусінам змушаны кланяцца шматлікія палякі, а самае галоўнае тое, што Наваградчына паказала палякам як у першых, так і ў другіх выбарах у польскі Сейм і Сенат, што нашага змагання за поўную незалежнасць Беларусі не здолеюць знявечыць Лукішкі*[120]*, Картуз-Бярозы*[121]*, ні іншыя катоўні».*

Вярнуўшыся ў Сейм, я адчуў, што адносіны Гаўрыліка і Валынца змяніліся да мяне да непазнавання. Я заўважыў, што яны стараюцца, каб я не быў з Дварчанінам сам-насам. Аднак Дварчанін паспеў мне расказаць пра сітуацыю, якая вытварылася ў маю адсутнасць, і дадаў, што, відаць, адмовіцца ад мандата. Я запярэчыў, прапанаваў, каб мы дзесь спаткаліся і абгаварылі ўсе справы. Дварчанін пагадзіўся.

З Сейма я нібы паехаў дамоў, а насамрэч паехаў у сваё памяшканне, а Дварчанін назаўтра прыехаў да мяне, і мы, абгаварыўшы ўсе праблемы, прыйшлі да згоды абодва адмовіцца ад мандатаў — я раней, Дварчанін пазней.

У красавіку 1929 г. я адаслаў свой мандат у Сейм. На маё месца ўвайшоў Крынчык з Слонімшчыны. У лютым месяцы пракурор суда заклаў апеляцыю на мяне, Аляшкевіча і Раманюка. Апошнія два спалохаліся і пайшлі ў БССР, але на мяжы іх злавілі і пасадзілі ў астрог.

На 3 чэрвеня быў вызначаны апеляцыйны суд у Вільні. 1 чэрвеня я паехаў у Вільню з намерам спаткацца з Дварчаніным. Зайшоўшы да яго, спаткаў там св. п. Саковіча[122], які хутка выйшаў. Пагутарыўшы аб справах, Дварчанін пачаў расказваць, чаму ён не змог зрачыся мандата: *«Аднаго разу ў клубе "Змаганне" я звярнуўся да ўсіх з дамаганнем, што я мушу дзеля дрэннага здароўя зрачыся пасольскага мандату. На маё дамаганне Крынчык адказаў: "На пралетарскім фронце з капіталізмам мільёны загінулі і гінуць. Вы, калега Дварчанін, ад вашага недамагання не загінеце. Калі вы адмовіцеся, дык Клуб страціць месца, бо няма каму заняць яго. Мы на гэта не можам пагадзіцца". Я адказаў, што ніякая сіла не зможа мяне затрымаць.*

*Хутка пасля гэтай гутаркі аднаго вечара чую званок. Пытаю: "Хто?" Чую голас Крынчыка. Адчыняю дзверы. Заходзяць Крынчык і Хмара*[123]*. Пытаю здзіўлена, што так позна. Крынчык адказвае: "Мы прыйшлі, калега Дварчанін, вас папярэдзіць у вашых*

*намерах. Выбірайце адно з дзвюх: працу з намі, альбо...” І паказаў рэвальвер.*

*Сябра Стагановіч,* — казаў Дварчанін, — *што я меў рабіць? Я здаю сабе справу — маё жыццё страчанае, але я не шкадую, што мы склалі лісту. Аднаго не магу дараваць сабе, што я давяраў людзям, якія падсунулі кандыдатаў Крынчыка і Гаўрыліка, якіх я зусім не знаў».*

Дварчанін не назваў асобаў, якія гэта зрабілі. Зазваніў званок, я пайшоў у яго спальню. Гэтым разам быў Грышкевіч[124], якога не было патрэбы асцерагацца. Я змушаны быў ісці ў гатэль, сціснуўшы рукі.

3 чэрвеня апеляцыйны суд у Вільні ў складзе старшыні суда Дмоўскага і пракурора Комара распачаў разгляд мае і другіх справы. На прапанову адвакатаў суд апеляваў справу на другі раз. Мой адвакат Смяроўскі ідзе ў пакой да пракурора і зараз жа выходзіць адтуль, падыходзіць да мяне, працягвае руку і кажа: *«У адносінах да пана справа выглядае вельмі прыхільна. Суд агалошвае адклад справы на другі раз».*

Адкуль узялася гэтая прыхільнасць? Сейм з выбараў 1928 г. у абсалютнай бальшыні лічыўся левым: на 444 дэпутатаў урадавая партыя *B.B.W.R.* мела 124 паслоў[125]. У гэты час міністрам справядлівасці быў Цар[126], які жорстка распраўляўся не толькі з мяншынямі, але і з апазіцыяй. На дапамогу Сейму прыйшоў Пілсудскі, звольніў Цара — адсюль і такая прыхільнасць.

Прайшло тры месяцы. 3 кастрычніка суд у складзе старшыні Бохвіца, беларусажэрца, прысудзіў мне 6 год цяжкага зняволення, пазбаўляючы ўсіх правоў на 10 год, — таму што Цар зноў заняў пост міністра справядлівасці. Пасля адчытання прысуду мой адвакат здэнервавана схопліваецца з месца, б’е кулаком у стол, на голас крычыць: *«Узята з паветра і засуджана чалавека на шэсць год, на шэсць год цяжкага зняволення!»*, потым падыходзіць да мяне, абдымае, цалуе і складае спачуванні.

Прысуд я прыняў з развагаю, што інакш быць не магло. З кайданамі на руках, пад аховаю двух паліцыянтаў адвялі мяне на Лукішкі, адчынілі астрожныя дзверы, якія на доўгія гады схавалі мяне ад майго паняволенага народа. Аформіўшы, павялі ў другі павільён, да тых, якія неслі «рай» для народаў,

памясціўшы ў цэлю, дзе быў сялянскі сын з Пастаўшчыны Ніхаёнак.

Памяшканне даволі «абшырнае», 2 на 4 ярды[127], падлога асфальтаваная; адзін вузкі, прымацаваны да сцяны ложак, два саламяныя матрасы, столік, табурэтка, ну і парашка. У гэтакім памяшканні зняволены мусіць пражыць доўгія гады.

Астрог сам па сабе не вельмі страшны, страшны астрог у астрозе, дзе камуністычныя верхаводы твораць яшчэ горшы астрог, каб гэтым трымаць у сваіх руках пераважна малапісьменную масу сялянскіх сыноў, якая кантралюецца на кожным кроку.

Выйшаўшы на прагулку, я спаткаў Ю. Сабалеўскага[128] і пазнаёміўся з М. Юшком і Пушкарскім з Міра, а таксама з некалькімі сялянамі з Лідскага павета. Некалькі хлопцаў скардзіліся мне на камуністаў, але што можна было зрабіць, калі адміністрацыя не хацела ўнікаць у нутраныя справы вязняў.

Пабыўшы пару тыдняў у такіх абставінах, я пастанавіў, што тут не маё месца, і нагаварыў Сабалеўскага перайсці на першы павільён, на што ён даў згоду. За намі перайшлі пару дзясяткаў сялянскіх сыноў, прывялі двух беларускіх студэнтаў з волі, Ханяўку[129] і Кіта[130], якіх праз пару дзён звольнілі.

Ю. Сабалеўскі лічыўся старажылам Лукішак: яго арыштавалі ў чэрвені 1928 г. падчас працэсу Грамады, ён быў засуджаны на 6 год[131]. Найвышэйшы суд разбіраў ягоную справу тры разы. За трэцім разам Віленскі апеляцыйны суд яго вызваліў. У тым заслуга Р. Астроўскага, за што Сабалеўскі, нягледзячы на варожасць да Астроўскага, супрацоўнічаў з ім да смерці. Сабалеўскі прабыў у астрозе да 15 красавіка 1930 г.

Нядоўга прыйшлося абітаць без старых знаёмых. 30 красавіка 1930 г. [132] як раба Божага прыперлі на Лукішкі сенатара В. Рагулю да адбывання двухгадовага прысуду, вынесенага Наваградскім акружным судом 27 лютага 1928 г.

Весялей праходзіла жыццё на гэтай маленькай выспе; нібы чужой, але ў сваім родным краі, куды з-за шасціметровай сцяны даляталі галасы свае роднае мілае мовы.

У гэтым часе арыштавалі паслоў з клуба «Змаганне», а таксама 10 ці 12 сакратароў[133], якіх прывялі на Лукішкі. Выглядаю

праз акно: гэтыя героі былі апранутыя з шыкам. Усе яны стаўленікі пасла Крынчыка, яго землякі з Слонімшчыны, якая была не толькі скамунізаваная, але і зрусіфікаваная: вітаючыся, гаварылі «будь готов», адказвалі «всегда готов». Нам перадавалі, што гэтыя маскоўскія наймiты ўяўлялі, быццам пачалося паўстанне дзеля вызвалення. Аднак паслы Крынчык, Гаўрылік, Валынец, Грэцкі[134], Дварчанін былі засуджаныя на 8 год[135], а сакратары на меншыя тэрміны.

У жніўні 1932 г. вышэй успомненыя паслы і грамадаўскі пасол Валошын былі замененыя з Саветамі на польскіх ксяндзоў[136], дзе пасля колькіх месяцаў побыту савецкі суд засудзіў усіх на 10 год Салаўкоў.

Вельмі характэрна, што ніводнага з сакратароў Саветы не вымянялі. З гэтага трэба меркаваць, што яны былі адказнымі работнікамі маскоўскага камунізму. Як ведама, двух з галоўнейшых з іх апынуліся на эміграцыі: гэта Хмара і Асіпчык[137], якія, прыкрываючыся патрыятызмам, праводзяць разбуральную камуністычную работу сярод беларускіх арганізацыяў.

На агульным з’ездзе моладзі ў Нью-Брансвіку ў 1954 г. [138] я паказаў пальцам на гэтых нікчэмнікаў, аднак знайшлося пару асоб, якія зрабілі незадаволеныя міны, — у тым ліку д-р Шчорс, які пазней супрацоўнічаў з імі.

Супольная нядоля на Лукішках, якая злучыла мяне і В. Рагулю, мала рознілася ад жыцця нашага народа, які перажываў жорсткі праслед ад фашыстоўскага B.B.W.R. Падчас гадзіннай прагулкі гутарылі на розныя тэмы, пра нядаўняе мінулае, якое пацяшала нас. Сапраўды, было аб чым пагаварыць, бо, нягледзячы на шматвекавую нядолю нашага народа, у вельмі хуткі час ён усведамляўся нацыянальна. Калі падчас першых выбараў, што праводзіліся больш-менш дэмакратычна па ўсёй Заходняй Беларусі, правялі ўсіх 14 прадстаўнікоў, то выбары 1928 г., якія праводзіліся пад жорсткім тэрорам польскай адміністрацыі і калі толькі ў трох акругах былі выстаўленыя беларускія лісты[139], з іх правялі 11 прадстаўнікоў[140].

Неабходна адцеміць, што пасля разгрому Грамады сялянская маса засталася сама з сабою, не з шматлікаю інтэлігенцыяй, вернай ідэі 25 Сакавіка. Другая частка здрадзіла свайму народу,

перайшла на паланафільскі шлях: Р. Астроўскі з кампаніяй, Янка Станкевіч ды іншыя[141]. Трэцяя, атрымаўшая ўрадавыя пасады, не хацела зважаць на пакуты свайго народа. Народ, застаўшыся сам з сабою, затаіў у сабе помсту, чакаючы спрыяльнага дня, каб помсціцца на сваіх прыгнятальнікаў, а сваім «братам» кінуць дакор, што яны ў цяжкі час пакінулі яго ды пайшлі будаваць сваё асабістае жыццё.

Вясною 1930 г. мяне з Лукішак перавезлі ў карны астрог Грудзёндз[142], дзе я сядзеў таксама асобна. Прабыўшы некаторы час, я пераканаўся, што польскі ўрад умысна стварыў жыццёвыя ўмовы ў некаторых карных астрогах, каб хлопцаў з нацыянальных мяншыняў зрабіць камуністамі і гэтым паказаць перад заходнім светам, што ён, польскі ўрад, выконвае забавязванне перад краінамі, данае на мірнай канферэнцыі ў Варшаве[143], вядзе змаганне не з нацыяналізмам, а з камунізмам. Маё пераконанне паўстала на наступных даных. Да 1925 г. вядомая апякунка палітвязняў Сэмпалоўская[144] штомесячна прысылала кожнаму вязню па 35 злотых, а пасля 1928 г. па 10 злотых. Беручы пад увагу, што ў Грудзёндзы чатыры дні абед быў з двух блюдаў, такога жыцця з вясковых хлопцаў мала хто меў дома. Да гэтага ў астрозе былі школы: пачатковая, сярэдняя і ўніверсітэт, у якіх выкладалі спецыялісты. Напрыклад, Тарашкевіч выкладаў у ўніверсітэце. 12 гадзін у дзень усе цэлі былі адчыненыя: камуністы 10 гадзін мелі вучобу, дзве гадзіны — на абед і прагулку. Ад 6 да 9 гадзін вечара камуністы ігралі на розных музыкальных інструментах; у астрожнай бібліятэцы былі кніжкі, якіх нідзе ў Польшчы нельга было дастаць, а калі б паліцыя ў каго знайшла такую кніжку, то суд засудзіў бы на 4–5 год астрогу.

З такіх камуністычных інкубатараў выходзілі зацятыя камуністы, якія да смерці не здрадзяць камунізму. У адным з гэткіх інкубатараў узгадаваліся Хмара, Асіпчык і іншыя, якія сёння з'яўляюцца вернымі служкамі маскоўскага камунізму, а некаторыя «свядомыя палітыкі», як д-р Шчорс, Галяк[145], Я. Станкевіч, Касяк[146], Лапіцкі[147], авантурнік Рыжы-Рыскі[148], падтрымліваюць іх і іхнай здрадніцкай працы[149].

Пасля поўнага падпарадкавання Астроўскага польскай дэфензіве ад яго вымагалі працы, г. зн. каб ён перацягнуў народ

на свой паланафільскі шлях, чаго яму ніяк не атрымлівалася зрабіць — калі не браць у рахунак мінімальную колькасць тых інтэлігентаў, якія ад палякаў атрымалі пасады, адышоўшы ад свайго народа. Ратуючы сваё становішча, Астроўскі надумаў перацягнуць грамадаўцаў на свой ганебны шлях.

У студзені ці лютым 1930 г. прывозяць Тарашкевіча з Грудзёндзу на Лукішкі нібы на ягоную судовую расправу. У сапраўднасці прыезд Тарашкевіча быў дзеля перамоваў з Астроўскім, якія адбываліся праз некалькі дзён у Лукішскім астрозе і не давялі да пажаданых Астроўскаму вынікаў.

На вясну 1930 г. трох паслоў — Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага і Мятлу, сакратара Грамады Бурсевіча[150], а таксама Акінчыца[151] — польскі ўрад, шукаючы ўціхамірання нашага народа, змушаны быў звольніць з астрогу, не падаючы ніякіх умоваў.

Зразумела, звольненыя былі звязаныя па руках і нагах. Дзеля гэтага ўсе паслы і сакратары пайшлі ў сваю Усходнюю Бацькаўшчыну, а Акінчыц — у Нямеччыну[152]. Пасля некаторага часу Тарашкевіч ехаў цягнікам у Гданьск, і на польска-нямецкай мяжы ў Тчэве[153] польская паліцыя яго арыштавала. Суд засудзіў на 15 год цяжкага зняволення. У жніўні месяцы 1932 г. Саветы выменялі Тарашкевіча на Аляхновіча[154], які ў 1926 г. у Менску быў засуджаны на 10 год Салаўкоў.

Ворагі беларускага народа гандлявалі сынамі Беларусі.

Як пазней былі весткі, агент польскай двойкі[155] Хамінскі, пасол з Партыі Хлопскай, што разам з Грамадою была ліквідаваная, уцёкшы ў СССР, выдаў Тарашкевіча, за што Саветы яго і ягоную жонку расстралялі[156].

У 1930-х гадох па Наваградчыне грасавала камуністычная банда, якая з аружжам у руках напачатку хадзіла па заможных сялянах, вымаючы золата, даляры і іншыя каштоўнасці, далей пачалі паліць сялян, цэрквы (Дольная Рута[157]), капліцы на могілках і ўсё, што пападала пад рукі: бульбу, хамуты, кавальскія інструменты.

Адзін з банды сваю пажыву схаваў у гумно суседа, які, знайшоўшы, не хацеў аддаць. За гэта «герой» застрэліў яго, але не на смерць — і гэта спрычынілася дайсці на след гэтай камуністычнай хеўры: страляўшы ўцёк у лес, дзе ў сховішчы сядзеў некалькі

тыдняў. Туды ягоныя камрады дастаўлялі яму ўсё неабходнае. Аднаго дня двух ягоных супольнікаў, навучаныя кіраўнікам усяе гэтае банды, каб пазбавіцца яго (бо як зловіць паліцыя, скампраметуе кампартыю), пераканалі перайсці з гэтага сховішча ў невялікія зараслі. Паслухаўшы нагавораў, у суправадзе гэтых жа суб'ектаў ён зрабіў так, як жадала кампартыя.

Калі ўсё было зроблена, каб жывым яго паліцыя не злавіла, гэтыя героі данеслі паліцыі, што Бохар знаходзіцца ў такім то месцы. Некалькі сот паліцыянтаў з сабакамі акружылі гэтыя невялічкія зараслі, распачалі росшукі, куст за кустом. Знаючы, што яго знойдуць, ён уцякае на чыстае поле, і тут яго раняць у нагу, ён падае. Для паліцыі ёсць сведкі, а кампартыя скампраметаваная.

Суд. Чатырох павесілі, трох пажыццёва зняволілі, пазасталыя атрымалі меншыя тэрміны з паглядаў на непаўналецце.

Я па адбыцці прысуду павярнуўся дамоў. Гаспадарка мая была запушчаная да непазнання. Але я не падаў духам. Прыйшлося пагараваць, але хутка забыў усё мінулае сваё асабістае перажыванне. Перажываў супольна з народам не толькі маральны, нацыянальны здзек ад «вызвольнікаў», але і эканамічны. Вартасць сельскагаспадарчых вытвораў у параўнанні да фабрычных вытвораў раўнялася 1 да 12. Селяніну 16 кг збожжа каштавала 2,40 злотага, а прадаваў яго за 1,80 злотага. За гэтыя 1,80 злотага можна было купіць тры васьмушкі звычайнай махоркі. Перад вайною ж за тыя самыя 16 кг куплялася 26 васьмушак махоркі.

Да ўсяго гэтага непасільныя розныя налогі: маянтковы, дахадовы, абратовы, паньствовы, драговы, гмінны, грунтавы, шарваркавы[158], страхоўка ад комінаў, ад вакон, пчол, сабак і розная трасца, якіх трудна ўспомніць[159]. За ўсё гэта беларус не меў сабе права купіць кавалак зямлі, а ў горадзе пляц на пабудаванне дома. Гэты загад быў вельмі тайны, аднак паказаў яго мне Бокун, ваяводскі рэферэнт зямельнага аддзела[160].

Год 1935 быў для беларусаў жахлівым годам, бо новая выбарчая ардынацыя пазбавіла наш народ права на выстаўленне сваіх кандыдатаў на выбары ў Сейм і Сенат[161]. Дзеля такога бяспраўя Наваградчына збайкатавала выбары.

Перад выбухам вайны паліцыя хадзіла па вёсках, вучыла, як лавіць нямецкіх шпіёнаў: біць яго па каленах, а як паваліцца —

вязаць ды цягнуць у пастарунак. Сяляне смяяліся ад гэтае вайны з шпіёнамі, цешыліся, што ляхаў болей не будзе на нашай зямельцы. Але хутка прыйшлі яшчэ горшыя збаўцы.

У памятную нядзелю 17 верасня 1939 г. а гадзіне 10-й я рана пайшоў у вёску. Па дарозе спаткаў знаёмага з вёскі Селішча, які вяртаўся з Наваградка — адвозіў збожжа, даніну «мацарствовай»* Польшчы, якая ў першы дзень вайны змусіла беларускіх сялян даваць даніну.

Затрымаўшыся, пытаю, што чуваць. Адказ: бальшавікі перайшлі расійскую мяжу. Некаторыя палякі цешацца («саветы ідуць на дапамогу нам»), другія разумеюць інакш. Ясна, кажу, сябра Ліпніцкі, яны ідуць вызваліць нас ад фашызму, але мы страцім усё, што мелі, і шматлікія з нас загінуць на далёкай поўначы ў засценках НКВД. Толькі спачатку праклятыя ляхі пазнаюць, пачом фунт ліха, можа, у будучыні не будуць сягаць на чужое.

Вёска не знала, што сталася сённяшняй раніцай, але як бы інстынктыўна адчувала велізарную небяспеку. На вуліцы не было ні жывое душы, толькі некаторыя сабакі сумна завылі, папераджаючы надыходзячую небяспеку.

Павяртаюся, іду дамоў. У канцы вуліцы здалёк бачу: ідзе мой прыяцель У. Журко. Нягледзячы на тое што ён шмат ад мяне маладзейшы, ды не беручы пад увагу ягоную камуністычную ідэалогію, між намі была сапраўдная прыязнь. Ён перада мною не ўтойваў ніякіх сакрэтаў камуністычных злачынцаў, якія яму былі ведамыя (а займаў ён у партыі адказнае становішча)[162]. Вось, думаю, даведаюся ад яго ўсе дакладнасці, але калі мы параўняліся, мой прыяцель нават не глянуў у мой бок. Я з свайго боку даў «добры дзень», на які адказу не атрымаў. Мяне як прыскам хтось абсыпаў. Думаю, што магло быць прычынаю гэтага паступання да мяне, бо я не толькі перад ім, але ні перад кім жаднай віны не меў.

Прыйшоўшы дамоў, перадумаў усё і цвёрда даў сабе слова, што б мяне і маю сям'ю ні спаткала, не ісці ні на якія кампрамісы і не пакланяцца ідалам.

Пад вечар таго самага дня на шляху са Шчорсаў у Наваградак вясковая галота з чырвонымі плакатамі спаткала 6 кавалерыстаў.

* Мацарствовы (ад польск. *mocarstwowy*) — вялікадзяржаўны.

Прывялі іх у вёску, зрабілі сход, у прэзідыуме заселі ўсе тыя, што палілі цэрквы і грабілі сялянаў.

Першым пунктам было пазбаўленне права голасу жыхароў вёскі. Я першым быў на лісце. Пазбаўленне адбывалася без галасавання: чыталіся прозвішчы пазбаўленых.

Я, звярнуўшыся да галоты, якая сядзела ў прэзідыуме, пытаю, за што мяне пазбавілі голасу. Маўчанка. Я пусціўся выходзіць. Адзін з сялян пытае ў «герояў»: скажыце, за што Стагановіча пазбавілі голасу? Я ўжо быў на вуліцы, але мне гаварылі, што і гэтым разам не адказалі пытаўшаму. Усяго голасу было пазбаўлена 36 чалавек.

Успамінаючы тую стыхію, тэрор, самаволю, дзіўлюся, якія былі здаровыя нервы, каб пражыць увесь гэты здзек над нашым народам. Хто мог быць пэўны ў надыходзячай хвіліне, што нейкі камуніст расія-азіят з янычаравай Масквы не забярэ вас у лес і там дастанеце кулю ў патыліцу, як гэта было з сотнямі тысяч нашых бацькоў, братоў, сыноў.

У такім змадэрнізаваным савецкім «раі», наагул у расійскай імперыі не было і не будзе права, этыкі, маралі, людской пашаны да народаў, якіх па традыцыі заграбалі пад сваё панаванне.

Як прыклад. Праязджаючы праз вёску, бальшавіцкі камісар з жаўнерамі крычыць сялянам, паказваючы на двор: *«Разбирайте это капиталистическое гнездо»*. Другі, наадварот, крычыць: *«Не трогайте, всё народное!»*

У панядзелак 18 верасня жыхары наваградскага наваколля змушаны былі ісці з чырвонымі плакатамі і рознымі транспарантамі, дзе былі напісаныя падзякі за «вызваленне» ад усяго, нават ад жыцця. Пайшоў і я, але адзін, асобна. Прыйшоўшы, знайшоў грамаду свае вёскі, стаў збоку і неўзначай прыглядваюся да напісанага на плакатах, а ў кожным надпісе былі граматычныя памылкі.

«Непабядзімыя» праходзілі міма. Вось каля мяне спынілася кавалерыя, і я заўважыў, якія ў іх нячышчаныя рулі, а віселі яны — у каго на вяроўцы, у каго дрот, а ў некага нават тэлефонны кабель. Коні не кутыя, відаць, ад некалькіх месяцаў, бо капыты адраслі як у грэцкага жаўнера. Падумаў, як далёка гэтая «непабядзімая» дойдзе. І сапраўды, неўзабаве ўсе дарогі былі

заваленыя коньмі, якія не маглі ісці без падкоў. Частку гэтае няшчаснае жывёліны людзі паразбіралі, пазасталыя ж аддалі свае жыцці за «шчаслівае савецкае жыццё».

У дзень «вызвалення» брук Наваградка быў заліты людскою крывёю. З вялікім задавальненнем маскоўскія барбары палявалі на людзей, якіх паказалі ім нашыя бяздушныя галотнікі. Чалавек стаяў і не верыў вачам: мо гэта кашмарны сон? Але спраўджваў сваё цела: не, так і ёсць, у сапраўднасці мардуюць сярод белага дня, на вачах тысячы жыхароў, нібы дзікую звярыну.

Думкі маланкава гойсалі па ўсім свеце і супыняліся перад Тварцом гэтага свету, стварыўшага чалавека, даўшы яму душу, розум. Але дзе ж гэты розум? Гэта ж не людзі, а велізарная галодная зграя тыграў, што вырвалася з джунгляў і на сваім шляху нішчыць усё жывое. Чаму ўсе заціхлі і не чуваць голасу ў абарону нявінных ахвяраў, якіх нішчыць бязбожны маскоўскі камунізм? Дзе ж Папа Рымскі, Патрыярхі Усяленскія, Лама будыйскі, Магамет ісламскі, Раві іудэйскі і тысячы філосафаў, гуманістаў, зямных прарокаў, якія праз стагоддзі пашыралі між народамі братэрскую любасць, пашану, згоднасць жыцця на ўсім свеце. Усё і ўся заціхла нібы перад тайфунам, што дазволіла барбарам XX стагоддзя быць яшчэ больш жорсткімі.

У гэтым самым часе ў ваяводстве на Слонімскай вуліцы адбываўся другі фарс-мітынг, у якім прымала ўдзел эліта ўсіх нацыянальнасцяў — палякаў, жыдоў, татараў, беларусаў, расейцаў. Хвалілі, дзякавалі КПСС і роднаму Сталіну за вызваленне, за апеку старэйшага брата. Адзін з «герояў» гэтага дня, Я. Лазарэвіч, які сёння ж застрэліў селяніна Даражэя, запрапанаваў мне, каб я прыняў удзел у мітынгу і сказаў прамову. Я катэгарычна адмовіўся. Мажліва, што гэтым я рабіў небяспеку для ўсяе свае сям'і, але данае сабе слова не хваліць разбойнікаў я мусіў датрымаць.

Не чакаючы агульнага разыходжання, я пайшоў дамоў. Па дарозе ехала «непабядзімая», шмат хто з іх прыглядаўся да мяне. Мажліва, у іхным зразуменні па вопратцы я выглядаў на буржуя.

Ідзем з пляменніцаю, гутарым. Яна часта ўспамінае свайго мужа, якога палякі мабілізавалі, і за кожным разам пачынае плакаць, што для мяне, лёгкага на слёзы, вельмі непрыемна,

але трэба было маладую кабету разумець, што засталася адна з двума дзецьмі на гаспадарцы. Кажу ёй, што ўсё будзе добра, што вайна кончылася, і Валодзя хутка будзе дома.

За размовамі шлях у адзінаццаць кіламетраў не здоўжыўся. Не агледзеліся, як апынуліся каля павароту з вялікага шляху на шлях, што вёў у нашую вёску. Тут якраз скрыжаванне шляхоў, а па ўсёй Беларусі з незапамятных часоў на скрыжаванні стаялі крыжы, часта вельмі прыгожыя, з распяццем Ісуса Хрыста. Мы пачалі аддаваць Яму пашану, кладучы крыжы са словамі да Таго, хто аддаў сваё жыццё за ўвесь народ: Слава Табе, Хрысце, Божа наш, Слава Табе, няхай будзе воля Твая нада мною, грэшным. Гэтыя словы ў дзень, калі ніхто не быў пэўны не толькі ў дні, але ў часіне, былі ад шчырага сэрца са слязьмі. У дні прыходу бязбожных барбараў народ моліцца ўсюды — працуючы, ідучы; хіба толькі як спаў, не маліўся. Але і ў сне соннымі думкамі быў да Бога, каб Ён адхінуў усе няшчасці, якія неспадзявана нахлынулі на яго.

Звярнуўшы ад галоўнага шляху, мы хутка апынуліся на даволі вялікім узгорку, з якога вёска, што ў даліне, была як бы на далоні. І нават нягледзячы на старадаўнія, мажліва, з часоў першага абшарніка, які закладаў Нясутыцкі двор, клёны, таполі, ліпы каля дарогі, што вяла ў Нягневічы, была відаць і мая гаспадарка, а за ёю на дарозе стаяў савецкі танк. Гэта не на жарт мяне ўстрывожыла: сапраўды, чаго ён стаіць, калі ўсе спяшаюцца ехаць на захад? Гэтага б кожны спалохаўся. Але нідзе не дзенешся, мусіш ісці дамоў. Няхай будзе воля Госпада. Галоўнае, што навокал нікога не відаць было.

Падыходжу да свайго саду. Нідзе ні душы. Іду ў дом. Сям'я ўдома. Кажуць, танк сапсаваўся, адзін паехаў у Наваградак, а двух жаўнераў у танку.

Падсілкаваўся, адпачыў, пайшоў у сад. Зараз жа байцы, угледзеўшы мяне, вылезлі і ідуць у маім напрамку. Я таксама накіраваўся да іх. Падыходзячы да мяне, сказалі: *«Здравствуйте, гражданін»*, — і не паспеў я адказаць, як яны пачалі прасіць яблык. Я гавару ім: зараз вам вынесу. А яны ў адзін голас: *«Пазней, не нужно, мы этих сорвём»*. Я гавару: *«Гэтыя яшчэ не паспелі, яны прыдатныя будуць за 4—5 тыдняў; гэта антонаўка,*

*а там, далей — ранаты, касельская і баўмана, яны яшчэ болей вымагаюць даспяваць — 7–8 тыдняў».* Я знаў, чаму яны не хочуць узяць яблыкі, якія абабраныя ляжалі. Ім убілі ў галовы, што мы палякі і можам іх атруціць.

Пазволіў нарваць антонаўкі, за што атрымаў «спасібо». Яны пайшлі да свае машыны-танка. Гэтым разам сядзелі вонкі на траве пад клянінаю, з'ядаючы недаспелую антонаўку, ад якой, як у нас кажуць, аж за вушамі пішчала.

Зайшло сонца, пачало вечарэць. З вёскі пачалі ісці главары, якія пазбавілі 36 сялян права. Рашыў я падысці паслухаць іхныя гутаркі. Падышоўшы, бачу І. Лазарэвіча, які некалькі гадзінаў таму ў Наваградку застрэліў Даражэя з суседняй вёскі Куравічы. Прызнацца, мне жутка стала, але, апанаваўшы неспакой, слухаю, чым яны хваляцца.

Людзі з усходу Нягневіцкай воласці пачалі расказваць, што пачынаючы ад вёскі Кольчыцы Карэліцкай воласці польская кавалерыя, якая была схаваўшыся ў велізарным рове — на сотні метраў глыбіні і некалькі сот метраў шырыні, рэжуць усё беларускае насельніцтва. Гэта выклікала такую паніку-страх, што людзі пакідалі ўсё на праізвол і ўцякалі — чамусьці на захад. Вельмі характэрнае: вёска на ўсходзе мела хавацца ў вёсцы, што была на захадзе. І гэтак дзеялася на працягу некалькіх тыдняў. Гаварылі, што за два тыдні гэтая стыхія дакацілася да Вільні.

Страх («рэжуць!») паўстаў у будынку Нягневіцкае воласці, дзе сабралося столькі народу, што разбілі вокны і пачалі крычаць «рэжуць рукі», а натоўп зразумеў, што ўжо хтось рэжа, а гэтым «хтось» могуць быць толькі палякі. Гэты беларускі псіхоз засвойваўся беларусамі ад 19 год панавання палякаў у Заходняй Беларусі.

Шчыра прызнаюся: гэты мамент панікі я падумаў выкарыстаць на карысць і пусціўся на хітрасць. Назіраючы за гэтаю бандаю, можна было дакладна зразумець па іхным абліччы, што яны ў гэты момант маглі б выканаць усё, абы толькі маглі схавацца ад тых, што «рэжуць». Доўга не думаючы, я пабег у сваё гумно, узяў двухраговыя жалезныя вілы і, прыбегшы да грамады, голасна крыкнуў: *«Хлопцы, бярэце, хто што, ідзем супраць польскіх бандытаў».* Пасля маіх словаў усе хутка пакінулі танкістаў і пайшлі

ў вёску. Я думаў, што яны пайшлі па аружжа, аднак ніводнага чалавека не дачакаўся, і мне з маім сынам і пляменнікам і двума жыдамі, якія купілі сады ў Гутаравіча, прыйшлося вартаваць танк, а ў ім двух танкістаў, Лявонава і Бычкоўскага.

У гэтую трагікамічную ноч людзі без крыкаў-шуму блукалі з вёскі ў вёску. Сусед-паляк, настаўнік, спаў з дзецьмі ў маім доме. Шматлікія, нягледзячы на халодную ноч, знаходзілі сабе ахрон дзесь у полі, кустах, садах, абы не ў хатах. Пасля гэтае ночы, нягледзячы на тое што народ быў у смутку і жалобе, доўгі час было смеху ды жартаў.

Танк стаіць трэці дзень, чакаючы прыходу майстроў. Сяржант павярнуўся з Наваградка, але моцна прастудзіўся. Я сказаў брату, каб той пагутарыў з сяржантам і прапанаваў начаваць у маім доме (у брата не было месца, ягоная сям'я была вялікая). Сяржант адмовіўся ісці да мяне. Тады я пайшоў да яго сам і без засцярогі сказаў, што мы не з'яўляемся забойцамі, мы — рэлігійныя, што ў такі час хіба вар'ят мог бы зрабіць грэшны злы ўчынак жаўнеру. Сяржант пагадзіўся і прыйшоў нанач.

Я не хацеў з ім гутарыць на палітычныя тэмы, таму час вячэрні праводзілі ў маіх апавяданнях з часоў Першай сусветнай вайны. На вячэру жонка прыгатавала ўсё найлепшае і напарыла малака з маслам і мёдам. Калі ўсё было пастаўлена на стол, ён ні да чаго не дакрануўся, пакуль я першы не браў. Перад сном выпіў аспірыны і пайшоў спаць. Але перад тым сказаў, што адзін малады чалавек, які тут перад домам хадзіў, гаварыў танкістам шмат дрэннага на мяне.

Гэтым маладым чалавекам быў Язэп Бужэйка, якога праз пару тыдняў паклікалі на сабранне ўсіх актывістаў, і там шматлікіх арыштавалі за супрацу з польскай дэфензіваю. Уцякаючы, палякі не паспелі знішчыць спісаў сваіх тайных працаўнікоў. За такую працу на карысць дэфензівы быў арыштаваны С. Хмара. Чаму і якімі сцежкамі яму ўдалося астацца ў жывых на эміграцыі пры наяўнасці сведкаў ягонай камуністычнай дзейнасці?

Назаўтра ўсё мая сям'я захоўвала поўную ціш, каб не пабудзіць нялюбага госця. Прыезд майстроў і з імі лейтэнанта падняў яго з пасцелі ў поўным аздараўленні. Жонка прыгатавала сняданак і запрасіла да стала абодвух, але лейтэнант адмовіўся, толькі

выказаў здзіўленне з шмат якіх патраў, дадаючы ў бок сяржанта: *«Вельмі цябе добра гасцююць»*. У гутарцы лейтэнант выказаў, што ён паходзіць з Новых Дарог Бабруйскага павета. Якраз жонка і я ў першую вайну там жылі некаторы час, асабліва жонка, і амаль усіх знала. І·калі сказала, што ўсіх ведае ў Новых Дарогах, то ён спыніў гутарку і не сказаў свайго прозвішча.

Паснедаўшы, шчыра падзякаваў, і пайшлі яны да танка, які быў ужо запраўлены, і адразу ж ад'ехалі на захад. Усе галоўныя сілы ішлі на захад, толькі сям-там засталіся тылавыя часці Чырвонае Арміі.

Як кажуць, адною бядою не абыдзешся. Мала гэтага, што прыйшлі збоі з усходу пад назовам Чырвоная Армія, ад якое нават прырода стала сумнаю, бо здавалася, што сонца не так свеціць і грэе, дык на табе яшчэ другую бяду, якую сыны прывялі на панадворак. Малыя хлапцы, якія мала разумелі, што іх бацька можа яшчэ сёння пакінуць іх сіротамі і яны апынуцца дзесь на далёкай поўначы Сібіру між чужых незнаёмых людзёў, аднаго дня з цікавасці да вайсковых пайшлі на вялікі шлях, па якім ішла савецкая «непабядзімая». Ажно бачаць: ляжыць жывы конь. Яны так пераняліся гэтым, што доўгі час стаялі над ім і рвалі траву, якою яго кармілі. Нарэшце ішло некалькі чалавек, хлопцы папрасілі іх, каб яны паднялі ім каня — яны яго павядуць дамоў. Гэтыя мужыкі паднялі каня, і сыны прывялі дамоў. Угледзеўшы, што яны вядуць каня, які ледзве ногі перастаўляе, адны косці шкураю абцягнуты, ад злосці, думаў, дастану атаку сэрца. Не таму, што мне шкода было корму і працы над ім, а таму, што я думаў, што гэтая няшчасная жывёліна сёння-заўтра выцягне капыты. Тады ў камуністычных актах абвінавачвання для мяне дабавіцца некалькі балонак за стратузгубу дзяржаўнае маёмасці СССР.

Няма рады: выкрычаў сыноў за іхны ўчынак не пытаючыся бацькоў, але прыняўся, каб адхадзіць гэтую жывёліну. Меншы сын Лёва[163], нягледзячы на маю пагрозу, пабег у гумно і прынёс каню канюшыны. З жаднасцю ад голаду конь прагна еў канюшыну і набраў столькі ў рот, што нельга было яму жаваць. Выцягнулі з роту і пачалі хлопцы з рук даваць па малой колькасці, якую ён пераважоўваў.

Я размяшаў у летняй вадзе аўсяное мукі, даў каню, і ён выпіў з вялікаю прагнасцю. У такі спосаб мне пашанцавала адхаяць яго. Злыботы, працы каля каня было шмат, асабліва як ён хварэў на залозы, якія яго прарвалі: такі смурод быў у хляве, што нельга было вытрымаць. Адкарміўшы, люба было ехаць на ім. Зімою ў Наваградак 10 кіламетраў я ехаў 45 хвілін. Конь належаў да лёгкай пароды.

Перайшоўшы мяжу, савецкая армія ўслала ўсе шляхі конь-мі — не ад хваробы, а ад голаду. Багацце краіны абмяркоўваецца ў сённяшні час, яе матарызацыя да першай вайны. Багацце краіны паказвае стан дамашняе жывёлы, нават вёска да вёскі якасцю жывёлы адрознівалася.

З маімі хлопцамі актывіст М. Гаўрош прывёў з дарогі кабылу шмат меншую, як мой конь, але ён прывёў у абшарніка сад, у якім травы ўжо не было, і беднае жывотнае ад недаядання і без вады мусіла выцягнуць ногі. За гэта яму часта на сходках рабілі папрок, успамінаючы мяне, што горшага каня адкарміў. Думаю, ад гэтага такія людзі не чырванеюць.

Было б з майго боку недараванне, каб не напісаць, што сталася са скацінаю, якая перавезена была падчас польска-нямецкае вайны з заходніх ваяводстваў на крэсы ўсходнія, як палякі называлі Заходнюю Беларусь.

З выбухам польска-нямецкае вайны з заходніх ваяводстваў прыгналі вялікую колькасць рагатае жывёліны ў двары. У двор Басін прывезлі некалькі сот кароў. Адны лічылі 400–500 штук, другія — 600–700. Да гэтага на месцы было каля 200 штук. Але справа не ў лічбе, а ў савецкіх парадках, іхняй «умелай» адміністрацыі. Мець дзве каровы — падкулачнік; больш — кулак; месца для такіх — Сібір, вечная мерзлата. Дзеля гэтага ў першых некалькі дзён, хто меў больш аднае каровы, усё даваў пад нож, увесь пагалоўна скот.

Застаўся сіратою адзін бык, які сапраўды калісь у недалёкім мінулым украшаў сваёю прыгажосцю дзесь у двары Пазнаншчыны той свой кароўі гарэм. Адзін, бядняга, швэндаўся не толькі на абшарах дворскіх, але далёка за абшарамі, куды яго прывезлі з ягонае роднае Пазнаншчыны, каб ён тут, сярод незнаёмых яму палёў, гаёў, сенажацяў, блукаў без месца супачынку і добрага дагляду ды чакаў

на лёс — такі, які спаткаў ягонае любімае кароўе стада. Сапраўды, гэта быў вартасны распладавік. Расы, да якое ён належаў, акрэсліць труднавата. Увесь ягоны склад і ўзрост выглядаў да нашага белавежскага зубра: галава, шыя, пярэднія лапаткі — як бы ён, толькі колер шэрсці не зубра. Няма ведама, з якіх меркаванняў з ім даўгі час ніхто не зрабіў як з каровамі, не зарэзаў. Трэ меркаваць, адныя баяліся да яго падступіцца, другія, мажліва, шкадавалі зводзіць са свету такога прыгожага скацячага бацьку.

Ужо парушыў снег, а ён, няшчасны, бяздомны, хадзіў, як бы шукаў свайго загубленага, дарагога яму каровяга статку. Выпаў большы снег. Мажліва, хтось злітаваўся над гэтым прыгожым, пакінутым людзьмі дзеля немагчымасці з-за савецкае ўлады, якая не дае нікому жыцця, а таксама і яму, каб не мучыўся без ежы, пазбавіў яго жыцця.

Хоць гэтага «зубра» з чорнаю шэрсцю ўсе шкадавалі і адначасна баяліся, аднак адзін невялікага ўзросту хлапец злавіў яго і вёў на паваду дамоў. На дарозе спаткала ягоная матка і пачала прасіць сына, каб ён пусціў быка: *«Юзічак, сынок, пусці яго, нашто ён табе»*, — а гэты сын паварочвае быка галавою да маткі са словамі «кусі яе». Матка са страху кінулася ўцякаць. І так некалькі разоў дразніўся з маткаю, пакуль старэйшыя на гэтага урвіча Юзіка не накрычалі. Тады ён, зняўшы шнурок, звольніў гэтага прыгажуна, які пайшоў у невядомае шукаць свайго быдлячага гарэму, якога не знайшоў у чужым яму краі, і дзесь некалькі тыдняў пазней хтось адняў яму жыццё востраю касою па горле.

З прыходам чырвоных амаль штовечара адбываліся мітынгі, на якія я спачатку быў змушаны хадзіць і чытаць на голас савецкія газеты, аднак далей перастаў наведваць іх.

З першых дзён кожная вёска адзін раз на тыдзень рыхтавала чырвоным абоз для арміі; галота вызначала, хто чаго і колькі мусіў даць. Збіралі ўсё, бо Чырвоная Армія снабжалася боепрыпасамі, і дзеля гэтага транспарт быў заняты. Але ўсім і так было ведама, што ў савецкім «раі» нічога не было з еміны, і армія жывілася коштам сялян Заходняй Беларусі.

Нягледзячы на тое што мяне пазбавілі правоў, на галасаванні дэлегатаў на народнае сабранне ў Беластоку мяне змусілі галасаваць, чаму я быў супярэчны.

На пачатку 1940 г. галота ўтварыла калгас «Шлях сацыялізму», у які са 185 двароў уступіла 35: 5 жанчын, што не мелі гаспадара, але мелі пазашлюбных дзяцей; 17 кулакоў, якія сваім уступленнем у калгас нібы забяспечылі сябе ад вывазу ў Сібір; пазасталыя — быўшыя зладзеі і гультаі, якія не хацелі працаваць на сваіх немалых гаспадарках. Мяне павядомілі, што мая гаспадарка — акрамя што займаюць будынкі — адыходзіць у калгас, а прызначылі мне зямлі за 4 км, там жа і сенажаць. На кавалку ўгноенай зямлі старшыня сельсавета засеяў ярыну. На маю скаргу аб бяспраўі ніхто нідзе не звярнуў увагі.

Напачатку калгаснікі былі вельмі задаволеныя, але вясною пачалі задзірацца з адналічнікамі, забіралі найлепшую зямлю, каб гэтым змусіць астатніх сялян уступіць у калгас. Што праўда, аднаасобнікі не давалі ім праходу, каб з іх не пасмяяцца. Паўстала вялікая варажнеча паміж калгаснікамі і аднаасобнікамі, даходзіла да частых боек. Сын Аляксандр[164] на сходзе фізкультурнікаў парваў білет фізкультурніка, кінуў яго пад ногі і сказаў вельмі неадпаведныя словы, за што 26 чэрвеня 1941 г. меўся быць суд, але «непабядзімая» ўцякла перад немцамі 22 чэрвеня.

Калгаснікі ад злосці, што канчаткова зрабілі сябе рабамі (бо аднаасобнікі карысталіся свабоднымі дзеяннямі на сваёй гасподзе), і ад таго, што бадай ніхто не ідзе ў калгас, перайшлі на даносы ў НКВД. Такі данос быў напісаны на мяне ў НКВД, адкуль яго ўкралі і перадалі мне. Гэты данос падпісалі старшыня калгаса К. Жук, мой кум, я хрысціў ягоных трох дзетак; рахункавод В. Лісоўскі, кум мае жонкі; начальнік фінаддзела Я. Валенцюкевіч і брыгадзір П. Дарашкевіч. Зацвердзіў старшыня сельсавета К. Гаўрош[165] з вёскі Куравічы.

У верасні 1940 г. заходзяць да мяне тры мужчыны і адна жанчына. Дваіх з іх былі з уездрайпрамкома і двух з калгаса. Я ў той час слухаў радыё ў слухаўках. Запрасіў сесці. Не знімаючы слухаўку з вушэй, пытаю, у якой справе завіталі да мяне. Адзін з сваіх сабачак кажа: прыйшлі, каб вы падпісалі заём. Адказваю: з вялікай прыемнасцю. Тады адзін з іх кажа: *«Вам прыпадае 1250 руб.»*. Адказваю: *«Каб я меў, з вялікаю ахвотаю даў бы, але я гэткае сумы не ў стане выканаць»*. Пытанне: *«Колькі?»* Адказваю: *«50 руб.; гэта сума таксама для мяне вялікая, але буду старацца выканаць яе»*.

Пачынаецца торг, які вывеў мяне з раўнавагі. Я павышаным голасам сказаў, што тут не жыдоўская крама, я таргавацца не ўмею. Гэтыя словы зачапілі за самае балючае месца незнаёмых, асабліва жанчыну, якая схопліваецца з месца крычаць, што я праводжу антысемітызм. Я, не ўстаючы з крэсла, кажу ёй: *«Я гавару сваёй роднаю моваю: ніколі не быў і не буду антысемітам»*. Схопліваецца мужчына ў белай шапцы, падыходзіць да мяне і, махаючы пальцам, гаворыць: *«Як вы смееце так гаварыць, вы знаеце, што гэта значыць?!»*

Мяне ахоплівае злосць. Я думаю: што мае быць — няхай цяпер збудзецца. Я схапіўся з месца і павышаным голасам: *«Вы што пазваляеце мне пагражаць у маім доме!»* На маё вялікае здзіўленне, ён адступіў ад мяне і пачаў гутарыць спакойным голасам, угаворваючы на заём. Я ўпёрся: *«50 рублёў, і толькі»*. З гэтым яны пайшлі.

Мінула пару тыдняў, мяне выклікалі ў калгас. Тады я прыбавіў 25 рублёў. 75 рублёў — гэта была мая падпіска на заём маім ворагам, каб яны нішчылі наш народ, да чаго і я цяпер спрычыніўся.

Аднаго дня, будучы ў Наваградку, шукаў, каб дастаць кусок мыла. Іду па вуліцы Скарыны. Бачу, наперадзе мяне ідзе мой найлепшы прыяцель з перадваенных часоў, які 17 верасня не захацеў гутарыць са мною. Каб з ім не спаткацца, перайшоў на другую старану вуліцы. Бачу, і ён пераходзіць на маю старану. Спаткаўшыся, ён першы вітаецца, пытае, як жывецца, як здароўе сям'і і г. д. Адначасна пытае, чаго я шукаю. Не скрываючы гавару: мыла. Прапануе ісці з ім у сельпо (ён быў загадчыкам сельпо), дзе ён дасць мне мыла. Пагаджаюся, ідзём.

Заходзім у сельпо, а там некалькі чалавек, усе старыя знаёмыя, быўшыя грамадаўцы, а сёння нікчэмныя служкі маскоўскага камунізму. Не знаю, што яны думалі, убачыўшы мяне, але вельмі ветліва падыходзілі да мяне, віталіся, некаторыя ўжывалі расійскай мовы, на што я звярнуў увагу, гаворачы, што забыліся свае мовы. Сканфужана адказвалі: не, ад прызвычаэння.

Атрымаўшы мыла, штось болей, чаго нельга было дастаць у савецкім «раі», я сышоў, пераконаны, што ўсе яны расчараваныя бальшавіцкім радасным жыццём.

Зіма 1940–1941 гг. была сумнаю, як ніколі: штосуботы сабранні. Я не хадзіў. Шмат якія з невукаў-гультаёў астылі, зрабіліся абыякавымі, але з'явіліся новыя прыслужнікі — кулакі, што не запісаліся ў калгас і не давалі нам, аднаасобнікам, праходу. А нам сапраўды не было месца, нават на сваім: па дарозе нам можна было хадзіць, а вось па сцежцы, якая праходзіла праз калгаснае поле, якое яшчэ ўчора было маёю собскасцю, забаронена, і права не знойдзеш.

У такіх абставінах як ні лавіруй, а канфлікты мусяць быць. Прыкладам, прыехаўшы з працы, неабходна каня пакарміць. У гумне нічога няма, значыць, трэба дзесь везці папасвіць — туды, дзе табе зямлю прыдзялілі, далёка. Збіраюцца хлопцы, едуць конна. Па дарозе, як толькі ўгледзяць калгаснікаў, едуць туды, і вельмі часта адбываліся бойкі. Вінаватымі за гэта былі бацькі, у першую чаргу я, бо каб я пайшоў у калгас, дык уся вёска пайшла б (так цвердзілі калгаснікі, і кіраўніцтва калгаса напірала на мяне).

У 1941 г. зімоваю пароюю вечарам заходзіць да мяне селянін з якімсь незнаёмым. Аказалася, селянін прывёў страхавога агента на ноч. Пасля вячэры я распачаў з ім гутарку аб вайне і палітыцы: якраз у гэты час немцы высадзілі ў Фінляндыі дзве дывізіі СС. На маё пытанне, дзеля чаго немцы гэта робяць, ён адказаў: *«Они посылают свои войска на помощь Японии, а до этого чтобы Финляндия не напала на СССР, как это было в 1939 г.»*.

Пачуўшы гэткі адказ, я прыпыніў з ім гутарку, прапануючы легчы спаць, на што ён пагадзіўся. Пачынаючы раздзявацца, ён пайшоў у святы кут і там скінуў галёшы, у якіх сядзеў увесь вечар. Гэта быў бальшавіцкі ўрадавец з вышэйшаю асветаю, але ў палітычным, геаграфічным, культурным кругаглядзе раўняўся з вучнем 3–4-га класа заходняга свету.

Калгас «Шлях сацыялізму» не адпавядаў свайму назову, бо 1/3 рабочае сілы былі цівунамі, сядзелі ў халадку, распіваючы водку. Пазасталая рабочая сіла, бачачы ўсё гэта, сядзела ў цяні, нічога не зрабіўшы. Каб падняць працаздольнасць калгаснікаў, рабілі ўдарнікаў, апублікаваўшы ў абласной газеце, прыкладам, што дзве калгасніцы апалолі гектар лёну. Гэта не адпавядала праўдзе, і замест падняцця працаздольнасці калгаснікі яшчэ болей былі абураныя за такое адносіны да народа.

Нельга ўявіць такога калгаснага гаспадаравання. Вясновыя пасевы так спознілі, што аднаасобнікі пачыналі жніво, а калгас яшчэ сеяў. З уборкаю ўраджаю было яшчэ горай: не пастаўленае ў мэндлі збожжа парасло, сенажаць засталася няскошанаю, бульбу капалі і ссыпалі ў горбы, не прыкрывалі, і 6½ га замерзла на полі; яе потым развезлі калгаснікам насупраць іхным жаданням, высыпаючы на панадворках у снег.

Калгаснікі мелі надзею, што добра заробяць, бо апрача свайго калгаса яны забралі збожжа з двух двароў. Аднак пры разрахунку кожны калгаснік дастаў на трудадзень 180 грамаў збожжа і мёрзлую бульбу.

Аднаго дня заходзяць да мяне двух актывістаў і даручаюць паперку ад тымчасовага кіраўніцтва вёскі — даць для савецкае арміі тону бульбы. Зразумела, адмовіцца — значыць загнаць самога сябе, у найлепшым выпадку, туды, адкуль ніхто не вяртаўся. Добра, кажу, дам, толькі прашу заўтра зранку прывезці дзве вялікія скрыні або мяшкі, бо мая скрыня занятая будзе, я буду выбіраць бульбу. Назаўтра прывезлі скрыні. Я папрасіў знаёмых жанчын, каб да полудня дапоўнілі скрыні, бо нанімаць работніка сувора забаранілі.

Наладавалі бульбаю скрыні, самаю адборнаю, каб жаўнеры з «раю» паглядзелі, якую беларускі селянін вырошчвае. Сапраўды, бульба вельмі добра радзіла, рэдка можна было знайсці меншую з мужчынскі кулак; былі вагою і 1 кг, сорту «сілезія», дастаў яе ад графа Храптовіча-Бутэнёва з двара Шчорсы.

Па палудні актыў арганізаваў абоз для Чырвонае Арміі пад назовам «чырвоны абоз». Абоз складаўся з некалькі дзясяткаў аднаконных фурманак. Вязлі ўсё: авёс, сена, салому, бульбу, капусту, буракі, моркаў, бручку, цыбулю, часнок, пятрушку, кроп, гуркі, яблыкі, грушы, слівы, жывых кормных парсюкоў, нядойных кароў, яйкі, сала, масла ды іншае. Такія абозы вёска мусіла высылаць два разы на месяц у суправадзе шайкі актывістаў, кожны з якіх нёс паперадзе партрэты «дарагіх любімых» разам з бацькам Сталіным ды чырвоным сцягам. На адлегласці выглядала нібы шматлюдныя рэлігійныя паховіны.

Вяртаючыся з захаду па ўсіх шляхох днём і ноччу, Чырвоная Армія спрычынілася да розных плётак: Гітлер даў ультыма-

тум Сталіну, каб ён адвёў армію на мяжу Рыжскага дагавору паміж Польшчаю і Саветамі. Гэтым плёткам не суджана было здзейсніцца. Праз некалькі дзён Крэмль падаў да ведама насельніцтву СССР, што люты вораг, фінскі фашызм, *«напаў на нашую Родзіну — адзінае гасударства ў міры рабочых і сялян»*.

У кастрычніку 1939 г. прэса, радыё гукалі на ўвесь свет, што беларусы з заходніх ваяводстваў, якія занятыя Чырвонай Арміяй, звярнуліся да СССР, каб іх прынялі ў сям'ю ўсіх народаў Савецкага Саюза.

У сапраўднасці адбывалася гэта так, як і ўсё робіцца пад бальшавіцкаю тыраніяй. Былі вызначаныя выбары дэлегатаў на грамадзянскі сход у Беластоку[166], на якім дэлегаты мелі пастанавіць аб далучэнні Заходняй Беларусі да Савецкага Саюза. Дэлегатам ад Наваградчыны быў усім папярэдне добра ведамы сваймі загадамі, што адсылалі на той свет у раве Карсаціны, А. Малец[167] з вёскі Мольнічы.

Як адбывалася галасаванне. Усім тым 36 чалавекам, у тым ліку і мне, якія 17 верасня былі пазбаўлены права голасу, было загадана ісці падаць свой голас. Хто мог у той час не толькі адмовіцца, але выказаць крыўду за мінулае?! Кожны быў цішэй вады, ніжэй травы. Інакш — цябе няма, а сям'я — на загібель з рассрочкаю на некалькі гадоў.

Сумнае, цяжкае, немагчымае настала жыццё. Недарма такія разумныя тварэнні, як сабакі, пару месяцаў перад прыходам чырвоных па ўсёй вёсцы і суседніх вёсках кожны амаль вечар, узіраючыся на ўсход, сумна завадзілі сваімі рознаякімі галасамі. Сапраўды, гэты вой наводзіў на насельніцтва жах. Шмат якія гутарылі, што будзе нешта нядобрае, і яно сталася. Можна смела сказаць, што прыход чырвоных быў страшней смерці.

Аднак трэба жыць, не так для сябе, як дзеля нашчадкаў, асабліва сярэдняга сына, які вучыўся ў Наваградку ў сямігодцы і жыў у бурсе*. Яго неабходна было ўладкаваць. Еду ў Наваградак, заходжу ў бурсу. А там Садом і Гамора: хлопцы па 18–19 год ходзяць па сталох і пяюць бальшавіцкія песні. Мне і сыну ўзяло жуць ад гэткага дзікага захавання нашай небальшавіцкай моладзі. Але выйсця няма.

* Тут: у інтэрнаце.

Прашу сына Льва застацца пакуль што тут; буду шукаць кватэру або паеду ў Любчу. Пагадзіўся, але ненадоўга. Праз некалькі дзён захварэў, штось сталася з вухам. Змушаны быў пакінуць вучобу. Хвароба працягнулася некалькі тыдняў. Пасля лячэння не захацеў ехаць у Наваградак прадаўжаць вучобу. Яму вельмі не падабалася бальшавіцкае разгульдзяйства ў школе і бурсе. Да гэтага з яго рабілі розныя кпіны, што ён не належаў да піянераў і не насіў чырвонага шматка, які быў для яго найбольшы праціўны на свеце, на шыі. Бацькам хацелася, каб дзеці вучыліся, але вельмі шкодны для дзіцяці прымус да тае рэчы, якую яно ненавідзіць да слёз, просячы бацькоў зразумець і пашкадаваць яго. У такіх справах бацькі мусяць зразумець дзіцё і не змушаць да такіх спраў, якія дзіцяці нічога добрага не дадуць, а маюць зрабіць яго няздольным да грамадскага жыцця на ўсё жыццё.

Нічога не парадзіш — еду ў Любчу, там ёсць мае знаёмыя — В. Рагуля, М. Чатырка і А. Аляшкевіч. У супольнай гутарцы з імі пастанаўляем, што нам няма ніякай мажлівасці ўладкаваць сына ў Любчы. Тым часам ужо Каляда на носе. За гэты прамяжутак часу сын перадумаў і па Калядах пагадзіўся ісці вучыцца ў Наваградак, што аблягчала бацьком іхныя клопаты аб вучобе дзяцей. Кожную суботу я прывозіў яго дамоў, а ў панядзелак на 8 раніцы адвозіў у Наваградак на тым кані, якога ён прывёў з дарогі.

На 1940–1941 гг. адчынілася 10-летка за 5–6 км ад нас. Там Лёва распачаў вучобу, якая яму прыйшлася да густу. Усе настаўнікі былі з мясцовых; да світанку я яго і другіх дзяцей адвозіў, а вечарам ехаў па іх.

З прыходам чырвоных азіятаў, якія прынеслі з сабою паўночна-азіяцкую лютую зіму, марозы даходзілі да 45° па Цэльсію, а ў адну ноч праз кароткі час мароз быў настолькі вялікі, што вельмі шмат памерзла авец, свіней, малых цялят, амаль уся садавіна вымерзла, нават гарэшнік вымерз.

І вось у такую непагадзь, калі людзі сабак не выганялі на двор, гэтыя барбары з усходу пачалі вывозіць у першую чаргу ўсіх лясных працаўнікоў і польскіх асаднікаў, ды ў самую поўнач, пазваляючы на збор, каб ехаць у невядомае, адну гадзіну часу. Дазвалялі забіраць з сабою толькі тое, што мог чалавек на

сябе апрануць. Пасля такіх транспартаў усе дарогі былі ўсланы замёрзлымі людскімі целамі, пераважна старых і маленькіх дзетак. Мужчын аддзялялі ад жанчын ды дзетак і везлі ў невядомае, а жанчын з дзецьмі прывозілі ў чыстае поле каля лесу, загадвалі выгружацца і дадавалі: *«Вот это всё ваше, делайте, что хотите»*. А там па пояс снегу, і нічога няма, каб ссеч якое дрэва, распаліць агонь, абагрэцца, растапіць снегу, напіцца гарачай вады.

За два дні перад вайною бальшавікі пачалі вываз насельніцтва. Я быў прыгатаваны на гэта, але бальшавікі вывезці не змаглі, бо нямецкае лятунства збамбардавала чыгункі, і цягнікі не маглі ісці. Гэта змусіла бальшавікоў затрымаць высылку нашага народа.

З Наваградскага бугра ноччу жутка было глядзець навокал у далечыню: зарава пажараў выглядала, як бы ўвесь свет гарыць. Здавалася, што гэтым разам будзе канец свету ад агня. Да ўсяе гэтае стыхіі 2/3 жыдоўскага насельніцтва Наваградка, пакінуўшы ўсё, пайшлі ў вёскі і лясы, шукаючы сховішча перад надыходзячай вялікай небяспекай.

Сям'я Ліса прыехала да мяне, прабыла дзве нядзелі і павярнула ў Наваградак, бо першыя нямецкія вайсковыя аддзелы абходзіліся з жыдамі вельмі добра. Месяц пазней на загад ортскаменданта[168] была расстраляна на рынку сярод белага дня ўся нацыянальная жыдоўская рада ў ліку 12 чалавек. Зараз жа па гэтым нялюдскім акце жыды былі змушаныя змываць кроў сваіх бацькоў, братоў, сыноў. Гэты нечалавечы барбарскі акт над жыдамі на беларускае насельніцтва зрабіў вельмі жахлівае ўражанне, што выклікала нянавісць да немцаў.

На другі дзень нямецка-савецкай вайны на рассвеце мяне пабудзілі крыкі людзей. Выбег на двор і вачам сваім не веру: калгаснікі міжсобку б'юцца каламі, нібы цапамі ў гумне малоцяць. Бойка вынікла з-за дзялёжкі ўсяго снараддзя, бо за год без дагляду палова яго была знішчана, а другая злучана. Гэта значыць, што калі ў адным возе быў папсуты перадок, а ў другім зад, то з першага зад, а з другога перадок былі злучаны, і пры разборцы дужэйшыя забіралі лепшае снасцё. Слабейшыя згаварыліся, пабралі калы і такім спосабам адбівалі сваю ўласнасць.

У ліпені месяцы ў быўшы сельсавет у вёску Куравічы прыехалі П. Свірыд і В. Пляскач[169], запрасіўшы перад гэтым некалькі чала-

век з вёскі, у тым ліку і мяне. Сабралася чалавек 40. Пасля кароткае інфармацыі, дзеля чаго запрасілі нас на гэты сход — бо нямецкая ўлада дазволіла беларусам ствараць свой самаўрад на месцы, — яны запрапанавалі выбраць старшыню воласці. Былі запрапанаваны дзве кандыдатуры, мая і селяніна Кушаля з вёскі Басін. Я быў абраны амаль аднагалосна. З гэтага дня я заняў становішча валаснога старшыні Куравіцкай воласці, у якую ўлучаліся наступныя вёскі — Нясутычы, Селішча, пасёлак Вініца, Куравічы, два маёнткі — Басін, Нідашавічы — і адзін фальварак Нясутычы. Я запрасіў на сакратара М. Даражэя, маладога недасведчанага хлопца, бацьку якога ў першы дзень застрэлілі халуі бальшавізму.

Абавязкам старшыні было арганізаваць паліцыю і ўрухоміць школы, што пры абставінах таго часу было вельмі трудна. Аднак у хуткім часе мне ўдалося з усім гэтым справіцца вельмі добра, нягледзячы на тое што Наваградак у бальшыні быў апанаваны палякамі, галоўна паліцыя. На камандуючага паліцыяй прыслалі апалячанага беларуса Бубноўскага, з якім я меў цяжкасці. Але хутка з прыездам гебітскамісарыята[170] верх узялі беларусы, і справы пайшлі нармальнымі шляхамі ваеннага часу.

Кожнага месяца ў павятовай управе пад старшынствам павятовага старшыні сп. Панько адбываліся нарады, на якіх прысутным быў хтось з гебітскамісарыята, што даваў загады валасным старшыням да выканання.

Аднаго разу мы, старшыні, змовіліся паставіць пытанне перад гебітскамісарам, здаецца, Вольфмаерам[171], у якім палажэнні знаходзіцца наш народ, які выконвае ўсе павіннасці: ці як акупіраваны, ці мае незалежнасць ваеннага часу. Гэтыя словы я выказаў з даручэння ўсіх старшыняў воласці.

Кароткая ціша, пасля стараста Панько сказаў: і так, і не, і адначасна запрапанаваў мне, каб я не дамагаўся перакладу немцу, бо небяспечна. Я катэгарычна вымагаў перакласці, што было зроблена.

Хвіліна маўчанкі. Немец устаў і кажа: мы на вашай зямлі знаходзімся ад некалькіх месяцаў; магу заверыць вас, што Беларусь будзе мець аднолькавае месца сярод усіх народаў Еўропы. Гэтыя словы выклікалі воплескі, а спадар Панько пасля нарады даў абед у рэстаране.

У верасні месяцы немцы вызначылі мабілізацыю коней у мястэчку Уселюб. Здавалася б, што культурныя немцы будуць рабіць па-культурнаму. Аднак, сагнаўшы масу людзей, СС з пугамі паставіў усіх у дзве шарэнгі, і, загадаўшы весці коней, білі не толькі коней, але і людзей, раздзіраючы скуру на твары і целе, а пасля гэтага загналі жыдоў у рэчку, загадалі, каб яны ішлі па рэчцы, а СС іх сцёбаў пугаю.

Гэты зверскі ўчынак над людзьмі выклікаў у кожнага лютую варожасць да немцаў. І як жыды гаварылі *«пачакайце, намі расчыняць, а вамі будуць мясіць»*, так яно і сталася. Дзякуючы перакладачам з НТС[172] і палякам немцы не нішчылі камуністаў, а нацыянальна сведамых беларусаў, адданых патрыётаў свае бацькаўшчыны. У вёсцы Асташкава па даносе палякаў арыштавалі 28 сялян антыкамуністаў, завязлі іх у Нягневічы. Там у пустым гумне спалілі жыўцом. Найболей загінула такім спосабам верных свайму народу сялян на Лідчыне і Дзятлаўшчыне.

У 1942 г. наваградскі павятовы стараста Панько настолькі разгуляўся, што з адпаведнымі людзьмі раз'язджаў па горадзе, спяваючы камуністычныя песні, што кампраметавала беларусаў, і на просьбу беларускіх установаў яго вывезлі ў Беласток з сям'ёю.

У гэтым годзе пачала дзеіць расійская партызанка, якая складалася з палонных, што жылі па вёсках. Я змушаны быў пераехаць у Навагрудак.

Аднаго дня А. Орса[173], які быў на гебітскамісарыяце школьным інспектарам і адначасна намеснікам Менскага[174], запрапанаваў мне прыняць становішча павятовага старасты, ад чаго я дзеля нязнання нямецкае мовы адмовіўся. Наваградскім старастам менавалі івянецкага старасту М. Буляка[175], які паходзіў з мястэчка Любча. Гэта быў энергічны, здольны чалавек, пакуль не ажаніўся з пападзячкаю Тарбацавічанкаю, якая лічыла сябе расейкаю. Тады яна яго перайначыла на свой капыл.

У хуткім часе Буляк запрапанаваў мне становішча інспектара самаўрада, якое я прыняў. Да гэтага часу становішча гэта не было абсаджана, на чым цярпела сялянства, здаючы розныя пастаўкі немцам. Іх моцна ашуквалі розныя прайдзісветы, палякі і прапольскі элемент, што працавалі ў немцаў.

З абняццем гэтага становішча стараста Буляк пакінуў мне павятовае старацтва БСП, у веданні якога былі два даволі вялікія дзіцячыя прытулкі і гарадская сталовая.

Акруговым старшынём БСП быў даволі энергічны, здольны, толькі зусім невядомы ў Наваградчыне, прыехаўшы з Беластоку спадар Якуцэвіч[176]. Займаць два становішчы ў ваенны час для мяне была справа нялёгкая. Да гэтага адносіны некаторай нашай інтэлігенцыі, якая стала называць сябе беларускаю дзякуючы вайне, былі да мяне абыякавымі, але калі ў каго была якая асабістая патрэба, то знаў, што Стагановіч зможа зрабіць. Тады абыякавасць замянялася на ветлівае адносіны.

У 1943 г. Якуцэвіч заняў становішча інспектара беларускіх збройных сілаў у Менску. Ад тады ён перадаў старшынства БСП мне.

Горад Наваградак не меў гарадское ўправы, а падлягаў павятовай управе, і з усіх гарадскіх прадпрыемстваў немцы пакінулі гораду толькі шпіталь. Прычынаю велізарных выдаткаванняў была неадпаведная гаспадарчая адміністрацыя. Як прыклад: шпіталь за год забіў 16 свіней вагою не меней 150 кг кожная. Хворыя нічагусенькі не даставалі; усё гэта пажырала адміністрацыя і частыя балі. Персанал шпіталю складаўся амаль з сотні асобаў. Загадчык (прозвішча не памятаю), дзесь з мястэчка Турца, пакінуў жонку і чацвёра дзяцей, жыў з старшаю сястрою шпіталя, палячкаю Камінскай. Быў яшчэ Караткевіч — дастаўца лекаў, галоўнае спірту, шэсць лекараў з былой савецкай арміі, бухгалтар паляк Цыбуля, жонка — кладоўшчык, некалькі дзясяткаў сясцёр і санітарак, чатыры дрывасекі. Штодзённая ежа і два разы ў тыдзень балі, спірт, свінні, квашаная капуста.

Павятовая ўправа не магла сцярпець усяго гэтага, і Буляк назначыў мяне загадчыкам гаспадарчага аддзела. Не паведамляючы дырэктару шпіталя доктару Мазуркевічу аб назначэнні мяне адміністратарам, я пайшоў у шпіталь перад абедам. На кухні на пліце стаялі тры вялікія бляхі насмажанага мяса. Пытаю ў кухаркі: гэта хворым? Адказвае: не, гэта адміністрацыі шпіталя, за выняткам доктара Мазуркевіча, які не харчуецца тут.

Я пайшоў да доктара Мазуркевіча, даў яму паперу аб маім прызначэнні і папрасіў яго пайсці са мною разам на кухню, дзе паказаў яму ўсё прыгатаванае. Ён жахнуўся ад такіх парадкаў.

Я расказаў доктару аб маіх планах гаспадарствавання. Доктар пагадзіўся і падзякаваў мне.

Я даў загад кухарцы зараз жа парэзаць усё смажанае мяса на маленькія кавалкі і ўсыпаць у агульны кацёл, што было зроблена ў маёй прысутнасці.

Звольніўшы некалькіх работнікаў, якія фікцыйна былі ў спісках, і перамяніўшы пару асоб на становішчах, распачаў новае жыццё шпіталя — такое, якое павінна быць.

Мабілізацыя ў БКА пазбавіла мяне ўсіх становішчаў у павятовай управе, толькі акруговай БСП я змушаны быў кіраваць да апошняга дня майго ад'езду ў невядомае, адначасна будучы камандзірам 2-й кампаніі БКА ў Наваградку.

У 1943 г. камендантам наваградскай паліцыі быў перанесены з Любчы Куніцкі, з якім я быў знаёмы з 1941 г., будучы валасным старшынём.

Сітуацыя з партызаншчынаю з кожным днём пагаршалася. Людзі ўцякалі ў лясы, ратуючы жыцці ад зверскіх наступстваў нямецкага СС і СД, якія бязлітасна нішчылі цэлымі вёскамі ўсё насельніцтва. Але паколькі ў савецкіх партызанаў не было аружжа і баявых патронаў, то савецкія партызаны не прымалі без аружжа. Дзеля гэтага, хоцькі-няхоцькі, насельніцтва, прыкрываючыся нібы ўцёкамі ад партызанаў, ішло ў паліцыю, дзе два-тры дні прабыўшы — ішлі ў лес з аружжам і амуніцыяй.

У гэтай справе я амаль штодзённа папярэджваў каменданта Куніцкага, аднак Куніцкі маіх перасцярогаў не паслухаў, а рабіў так, як яму хацелася. Ці можна было не мець даверу да каменданта, які лічыўся патрыётам? Аднак калі шматлікія [людзі] змушаны былі ўцякаць перад бальшавіцкаю навалаю і былі каля Ліды, то Куніцкі з адным незнаёмым нямецкім жаўнерам на матацыкле нагналі нас і намагаліся нас усіх нагаварыць, каб вярталіся ў Наваградак, гаворачы: *«Немцы высадзілі 38 тысяч парашутыстаў на Магілёўшчыне, і бальшавікі ўцякаюць на зламанне карку»*. Тут ужо мог кожны зразумець, што гэта ёсць бальшавіцкая правакацыя. Што праўда, некалькі дзясяткаў асоб паверылі і павярнуліся.

Свядома ці несвядома рабіў тое камендант палкоўнік Куніцкі? На маю думку, свядома. Ён вельмі добра разумеў сітуацыю ваенных дзеянняў, баявую здольнасць нямецкай арміі ў той час, калі фронт быў на рэчцы Нёман.

У Наваградку вынік канфлікт між вярхоў за тое, што Астроўскі звольніў аднаго, прызначаючы другога. Дзеля палагаднення прыехаў самалётам Астроўскі і зрабіў сход для працаўнікоў, на якім з высокадыктатарскім голасам сказаў: *«Ён пастаўлены мною, і вы яго мусіце слухаць!»* На гэта не знайшлося ні аднаго, каб яму запярэчыў у ягоных глупых выказваннях[177].

Што зрабіла нашая інтэлігенцыя за гады нямецкай акупацыі нашай Бацькаўшчыны для свайго народа ў параўнанні з яе колькасцю? Зроблена даволі шмат, бо нельга лічыць усіх патрыётамі, якія пачалі называць сябе беларусамі з прыходам немцаў. Карысць была мінімальная, зачастую шкодная. Частка беларускіх патрыётаў, якая ахвяравала сваё жыццё за вольную незалежную Беларусь, знішчана бальшавікамі, другая — немцамі, трэцяя — дзякуючы нямецкаму намінату Астроўскаму, які за два месяцы перад прыходам бальшавікоў утварыў абаронныя вёскі і мястэчкі, раздаючы пад карай смерці аружжа насельніцтву, якое з прыходам бальшавікоў змушана было ісці ў лясы, дзе і загінула[178].

Перагляніце мінулае, прылажыце руку да сэрца, скажыце: *«Так, мы не пайшлі ў народ, а пазаймалі цёпленькія месцы, забіраючы да сябе сваіх сваякоў і знаёмых, сядзелі, а народ пакінулі валасным старшыням, якія зачастую былі малапісьменнымі»*. Ні адзін інтэлігент не паехаў на вёску, каб сялянам прачытаць рэферат на патрыятычную тэму.

Народ сам шукаў гэтых шляхоў, у часе мабілізацыі з жаўнерскімі песнямі ішоў на зборныя пункты, аднак і тут не найшлося чалавека прачытаць рэферат аб сучасным палажэнні. Не адзін прахвост Астроўскі вінаваты. Да яго была цэлая зграя Ермачэнкаў[179], Касякоў[180], Ясюкоў[181], Лапіцкіх, Шчорсаў[182], Ігнатовічаў[183], Русакоў[184], Абрамавых[185] і вялікая колькасць малога калібру вырадкаў беларускага народа[186]. Адныя зналі адказваць «яволь», каб не страціць ласкі сваіх гаспадароў, другія абмяркоўвалі шатанскія планы знішчэння адданых сыноў народа Гадлеўскага[187], Іваноўскага[188], Аляхновіча, Казлоўскага[189] і іншых, трэція праводзілі на загад НТС расійскую работу. Былі і ўра-патрыёты, як Я. Станкевіч: шкадуючы польскіх камуністаў, апекаваўся імі, шукаў ім працу, дзе яны праводзілі камуністычную дзейнасць, а сваім братам-сёстрам адмаўляў толькі дзеля таго, што сказаў ці сказала «да», а не «але». Чаму не

знайшлося людзёў, каб у зародку зламаць хрыбет гэтым выродкам? Ці гэта недагляд, ці страх? На гэтае пытанне ў будучыні хтось адкажа. Я не бяруся адказаць. Я быў далёка ад цэнтра; падругое, як раней зазначыў, я не належаў да вярхоў.

У аднаўленні ў 1942 годзе Беларускай аўтакефальнае царквы яны, «тоже белорусы», абсадзілі вышэйшую іерархію БАПЦ расійскімі епіскапамі[190], як архіепіскап Панцеляймон[191], епіскап Венядзікт[192], якога хіраганізаваў маскоўскі патрыярх, епіскап Сцяпан[193], русафіл, епіскапы Філафей[194] і Апанас[195], якія, прыехаўшы ў Нямеччыну, адразу ж прылучыліся да Расійскай зарубежнае царквы[196]. І гэты ганебны акт мітрапаліта Панцеляймона з сваймі епіскапамі спрабавалі выдаць за правільны паступак БАПЦ[197]. Шматлікія патрыятычна ўзгадаваныя беларусы гостра асудзілі здрадніцкі паступак быўшых іерархаў БАПЦ і наважыліся аднавіць сваю Царкву з дапамогаю Украінскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы[198] ў Нямеччыне.

На пачатку 1944 г. немцы аддалі Наваградчыну казакам (ген. Навуменка[199]) у поўнае іхнае карыстанне да часу, пакуль немцы не пакончаць бальшавікоў. Прыехаўшы з сем'ямі, казакі распачалі вывозіць беларусаў цэлымі вёскамі ў Нямеччыну. Вываз распачаўся з-пад рэчкі Сэрвачы, і калі жыхары некалькіх вёсак апынулася на станцыі ў Баранавічах у цягніках, савецкія летакі ноччу збамбардавалі гэтае скупішча цягнікоў, спасярод якіх быў цягнік з нямецкаю амуніцыяй, што спрычыніла да загубы некалькіх тысяч асоб.

У тым жа годзе казакі дагаварыліся з гарадэчанскай паліцыяй і БКА зрабіць на партызанаў аблаву ў раёне Валяўка. Дагаворанасць была — прыехаўшы, выпусціць тры зялёныя ракеты. Так было выказана праз Гарадышчанскі штаб. Аднак казакі чамусь не зрабілі гэтага. Гарадышчанскі штаб прыняў казакаў за партызанаў, адкрыў па іх агонь. У выніку быў забіты палкоўнік Паўлаў[200], камандзір казацкіх войск у Наваградчыне.

Нягледзячы на тое што казакі былі вінаватыя ў гэтым, яны, як мы пазней даведаліся, меркавалі зрабіць пагром на беларусаў у Наваградку. Аднак штось іх паўстрымала ад гэтага зверскага чыну. Трэба меркаваць, што яны ўзялі пад увагу Рагулеўскі швадрон[201] і БКА, які быў у трох кіламетрах ад Наваградка.

1944 год быў для Наваградчыны жудасным, бо ў гэтым жа годзе немцы падаравалі расійскаму генералу Камінскаму[202], які належаў да НТС, усю Дзятлаўшчыну, дзе ён з сваёю дывізіяй знішчыў усіх свядомых беларусаў, а з пазасталых, застрашаных, утварыў НТС-ячэйкі, у якіх дзень і ноч праз мітынгі і расійскую прэсу рабілі маскоўскіх янычараў.

В. Рагуля ў апошнюю хвіліну ўцёк праз вакно — нягледзячы на тое што ён быў дзятлаўскім павятовым старшынём — і тым ўратаваў сваё жыццё.

Не хочацца верыць усяму перажытаму, але так было: НТС мела голас у гітлераўскай Нямеччыне, а сёння розныя Парэмскія[203], Самарыны[204] пралезлі ў амерыканскія важнейшыя ўстановы і, як відаць, маюць сваіх прыхільнікаў.

Думкамі сягаючы ў мінулае, задаеш сабе пытанне: дзеля чаго, на якое ліха сядзеў у Менску так званы прэзідэнт БЦР Р. Астроўскі? Адно з двух: альбо Астроўскі падпісваў гэтым ганебныя загады над нашым народам, або яго не пыталі. У абодвух выпадках Р. Астроўскі нясе поўную адказнасць, нават калі яго не пыталі, бо яго святым абавязкам было адмовіцца ад гэтай ганебнай фікцыі, якая прыкрывала ўсе зверскія ўчынкі нямецкіх культурных разбойнікаў. За гэта Р. Астроўскаму не даруе ні гісторыя, ні Беларускі Народ[205].

Якась у сярэдзіне чэрвеня 1944 г. я, як вайсковы камандзір 2-й кампаніі БКА, заходжу ў павятовую ўправу ў аддзел кадраў да свайго старога знаёмага жыхара Наваградка, які вельмі добра знаў усіх жыхароў гарадка і ўсю іхнюю паднаготную, — сп. Дзяковіча. З ім міла было падзяліцца сваімі думкамі, уражаннямі, намерамі, навінамі, усім тым, што наганяла сум. А ён да мяне: *«А, добры дзень, добра, што завіталі. Ёсць для вас пакліканне ехаць у Менск на кангрэс БЦР, які адбудзецца ў канцы гэтага месяца»*.

*«Як жа гэта сталася так, мяне ніхто не пытаў і не прапаноўваў, дайце спакой»*, — кажу Дзяковічу. Тады стараста павета М. Буляк паклікаў мяне ў свой пакой і кажа: *«Нам патрэбна паслаць 24 чалавекі ў Менск на кангрэс, які склікае Р. Астроўскі»*. Я яму гавару: *«Гэта выходзіць па-дыктатарску»*, — а Буляк адказвае: *«Іншай Рады ў нас няма»*. І сапраўды, што можна было зрабіць. Стараста падпісаў мандат на кангрэс, які мусіў

зацвердзіць Астроўскага прэзідэнтам БЦР. Кажу я: *«Сп. Дзяковіч, мандат я вазьму, не хачу рабіць вам клопатаў, але на гэты кангрэс я не паеду. Гэта будзе пасмешышчам над народам. Нямецкі генерал назначыў, а народ мусіць зацвердзіць. Не, гэтага не павінна быць. На маю думку, сп. Дзяковіч, Астроўскі добра ведае, што вайна заканчваецца, і яму, Астроўскаму, патрэбна засведчанне кангрэсу на тое, каб ён, выехаўшы на Захад, мог афішавацца перад заходнімі краінамі як праўна выбраны прэзідэнт Беларускай Рэспублікі і гэтым шкодзіць рэпрэзентатарам БНР»*[206].

У канцы чэрвеня ўсё нагадвала, нават сама прырода, што надыходзіць штось нядобрае, але афіцыйных звестак аб чымсь злым не было. 2–3 ліпеня стала вядома праз грохат гарматы, калі ўсю ноч звінелі шыбы ў вокнах.

Нядзеля. Зранку здавалася, што ўсё спакойна, нішто не пагражае пайсці ў царкву выслухаць Божую службу, а пасля спаткацца з знаёмымі, падзяліцца ўсімі навінамі, якія адбыліся на працягу апошніх двух дзён. Мяне цікавіла даведацца аб адбыўшым у Менску кангрэсе. А тут яшчэ інспектар збройных войск БКА сп. Якуцэвіч, спаткаўшы мяне каля царквы, запрапанаваў мне на другую гадзіну спаткацца ў рэстаране на замку.

З царквы, прыйшоўшы дадому і паабедаўшы, неабходна было пайсці за дачкою Тамараю[207], якая была за дзесяць кіламетраў у майго брата. Жонка не хацела пагадзіцца, каб я пайшоў, бо партызанаў баялася, і пайшла сама. А я, пакінуўшы Лёву, каб даглядаў двухгадавалага Юрку, а другой гадзіне накіраваўся на замак, дзе ўжо быў маёр Якуцэвіч і двух інспектараў, прозвішчаў якіх я не помню.

У рэстаране мы прабылі даволі даўгі час, пад самы вечар пайшлі дадому і пабачылі на ўсходзе, што па шляху Напалеона з Карэліч на Наваградак маса народа, і мы пусціліся ісці ў горад. Падыходзячы да Карэліцкае вуліцы, пабачылі, як на ўсю шырыню вуліцы ехалі казакі з сваймі сем'ямі, што стаялі на ўсход і захад ад Карэліч.

Гэта нас вельмі занепакоіла. Трэба было ўцякаць, але — на чым?

На шчасце, дзіцячыя прытулкі, якія былі ў маім даглядзе, мелі двое коней. Я, прыйшоўшы дамоў, пайшоў да зачыненага прытулку і сказаў там, што маю дзвюх свіней кормных па

130 кг. Дык вось, бярыце тых свіней, а я вазьму коней, бо мушу ўцякаць ад бальшавікоў.

Так і зрабіў. Запрог і, амаль нічога не забраўшы з рэчаў — бо мусіла ехаць 9 асобаў з дзвюх сем'яў, з-пад дому 17 па Слонімскай вуліцы, — рушылі ў невядомае. Першы крок у невядомае [зрабілі], перахрысціўшыся, са словамі «Госпадзі Ісусе Хрысце». 4 ліпеня 1944 г., пушчаючыся ў невядомы шлях, без жадных сродкаў з сям'ёю, быў самым цяжкім момантам у маім жыцці, але што можна было прыдумаць іншае перад надыходзячымі азіяцкімі ардамі з усходу.

Мінуўшы акраіну горада, мы змушаны былі затрымацца, бо далей маглі спаткацца з партызанамі, якія не пашкадавалі б куляў для ўсіх. Распрэглі кабылу, прынеслі ёй бярэмя канюшыны, каб наелася ў дарозе; малодшыя ўлегліся спаць, а старэйшыя сталі на ахове. Дачакаўшыся раніцы, сп. Якуцэвіч пайшоў пяшком у горад, але хутка вярнуўся, інфармуючы мяне, што шмат якія зараз будуць ехаць. Мы, не чакаючы, пусціліся ў падарожжа.

Каля паўдня нас нагнала даволі шмат знаёмых з Наваградка. У Бярозаўцы затрымаліся падсілкавацца, а праз пару гадзін рушылі далей і, пераехаўшы Нёман, на ноч затрымаліся каля вёскі на выгане начаваць. Тут сабралася даволі вялікая грамада. У гэтай вёсцы стаяў вялікі паліцэйскі пост. Вечарам яны пачалі на выгане паліць розныя рэчы, якія перад гэтым рэквізавалі ў мясцовага насельніцтва. Бліжэй да ночы прыехаў і затрымаўся швадрон Рагулі, які вяртаўся з Глыбокага, дзе яны ліквідоўвалі партызаншчыну[208]. Мы, пераначаваўшы, рана вырушылі дамоў.

Я яшчэ сёння не магу сабе дараваць, чаму ў той час не знайшлося ў мяне мужнасці, бацькоўскага сэрца, хрысціянскай душы запрапанаваць [ехаць з намі] дзяўчыне-семінарыстцы з Лідчыны, якая вучылася ў Наваградскай семінарыі з нашым сынам Лёвам. Яны абое былі аднагодкі і пакахалі адно аднаго. Гэтая дзяўчынка Глафіра разам з намі ішла да свае маці ў Ліду, ейнага бацьку замардавалі польскія партызаны як беларускага патрыёта. Мажліва, я не правы ў сваіх нараканнях, седзячы сёння ў сваёй хаце, у поўным дастатку, але тады, калі свая сям'я з пяці душ без граша ў кішэні, [думалася інакш]. Галоўнае — ніхто не знаў, што спаткаеш на шляху ў невядомым, цяжка было ў той час

зрабіць чужому дзіцяці такую прапанову. І, праехаўшы некалькі кіламетраў, дзе дарога разыходзілася на Ліду і Беліцу, сірата развіталася з намі і пайшла дадому. Я разумеў іх абаіх, іх жаль і горыч, але я не мог узяць адказнасць на сябе за чужое дзіцё.

Па дарозе было відаць, хто з якім дабыткам выехаў у падарожжа. Я з сям'ёю — пяць асобаў — і Якуцэвіч — 4 асобы — на адным возе, які быў пусты: голыя драбіны. За Лідаю Якуцэвіча казакі ўзялі на трак, што дало можнасць маёй сям'і крыху лепей карыстацца з воза аж да Граева[209], дзе, здаўшы фурманкі немцам, селі ў таварныя адкрытыя вагоны для перавозкі вугля і ад'ехалі ў невядомае падарожжа. Пазней я даведаўся, што яго [Якуцэвіча] з Лінцу разам з казакамі вывезлі ў СССР; прывёзшы ў Наваградак, у жалезнай клетцы вазілі па вуліцах гарадка. Пасля катавання яго павесілі.

Як не міла ехаць такім «прыгожым» цягнікам, але голад вымагае свае дані; пусты жывот не дае спакою. Нешта трэба рабіць, але як? Трэба чакаць нагоды, каб цягнік затрымаўся, а тады можа штосьці удасца.

Хутка нагода прыйшла: цягнік затрымаўся на запасной лініі, і жанчыны з ваеннымі кацялкамі вынырнулі з вагонаў, каб хоць начарпаць вады. Некаторым спрытнейшым такое сняданне ўдалося выканаць, а некаторыя не паспелі, бо цягнік, не даўшы сігналу, рушыў у ход. Праўда, наш «экспрэс» рушыў з такой хуткасцю, як калісь за часоў прыгону наш селянін да пана на працу спяшаўся. Так што нашыя жанчыны паспелі на задніх вагонах пачапляцца.

Чалавек такое стварэнне, што да ўсяго прывыкае, і мы хутка прывыклі да гэтых «фешэнебельных» вагонаў: проста раскоша — бачыш усё наваколле, ніхто не перашкаджае; галоўнае, краіну, якую ўпершыню праязджаеш, бачыш.

Мы ехалі двое сутак па Усходняй Прусіі, затрымаўшыся ў Кёнігсбергу. Тут нам дапамог атрымаць закрытыя таварныя вагоны Б. Н. Камітэт[210]. Адтуль паехалі на захад у Кюстрын-над-Одрай. Пастаяўшы там некалькі дзён, пачалася рассылка каго куды.

Чатыры сям'і вайскоўцаў — я, Родзька[211], Норык[212], Русак[213] — і адзінокі Мазура[214] адаслалі ў Берлін, дзе нас прыдзялілі ў пажарнікі, на што мы гостра запратэставалі, дамагаючыся, каб нас адаслалі ў беларускія аддзелы. Тое самае мы паўтарылі

і камендanту Берліна, што як афіцэры беларускіх вайсковых адзінак просім адаслаць нас у беларускія вайсковыя фармацыі, бо не можам выконваць абавязкі пажарнікаў.

Назаўтра прыходзіць жандар, выклікае ўсіх нас і вядзе на вакзал, садзіць на цягнік, які адыходзіць на Кёнігсберг, і дае нам заклееную капэрту — аддаць там, куды мы павінны з'явіцца.

Прыязджаем у Кёнігсберг, ідзем у Беларускі Нацыянальны Камітэт, дзе нас сустракае сп. Бартуль[215], распытвае, чаго прыехалі. Ён забірае капэрту і расклейвае яе. Аказваецца, нас накіравалі ў паліцыю горада. Бартуль кажа, што ў паліцыю мы не пойдзем, бо Камітэт накіроўвае нас у лагер Дальвіц[216] у беларускі парашутны аддзел. Мы былі вельмі ўзрадаваныя гэтым і адразу ж ад'ехалі цягнікам у Дальвіц.

У Дальвіц прыехалі пад вечар. Там знаходзілася даволі вялікая колькасць нашых наваградчан — Васіль, Барыс і Міхась Рагулі[217], Родзька-сын[218], М. Даражэй, дзве сястры Мазура[219], Я. Сажыч[220], К. Мерляк[221] ды іншыя. Яны нам расказалі, як учора недалёка ад лагера апынуліся бальшавіцкія парашутысты, 13 жаўнераў і адна дзяўчына-радыст. З гэтай групы ўсяго адзін капітан уцёк, некалькіх злавілі жыўцом і некалькіх забілі. Дзяўчына вельмі плакала, яна баялася, каб немцы не расстралялі. Яна расказвала, што іх прывезлі на лётнішча ў Маладзечна і не сказалі, куды палятуць. Ува ўсіх былі амерыканскія кансервы з надпісам па-руску «Американская свиная тушонка».

Прабыўшы ў лагеры некалькі дзён, немцы далі загад, што тых, хто не пагаджаецца быць у парашутным аддзеле, мусяць адпусціць у лагер. Нас, чатырох старэйшых, немцы адмовіліся прыняць у аддзел, і мы мусілі былі выехаць. З намі выехалі Мерляк, Сажыч і Мазура. Мая сям'я засталася ў Берліне, а [сем'і] Родзькі, Русака і Норыка выехалі ў Дэсаў. Я паехаў да сваёй сям'і. Прыехаўшы, пачаў рабіць старанні выехаць у Цвітаў[222], што мне з цяжкасцямі ўдалося здзейсніць пры дапамозе Ю. Сабалеўскага. З дапамогаю Я. Жамойціна[223], якога я прыпадкова спаткаў, удалося дастаць месца ў цягніку, хоць і на калідоры.

Апушчаючы Берлін, сям'я свабодна ўздыхнула, што ўдалося выехаць з гэтага пекла, дзе дзень і ноч валіліся велізарныя бомбы, знішчаючы ўсё. Прыехалі ў Мёрш-Трыбаў, дзе быў арбайтс-

штат, і зайшлі туды з сям'ёю. Кіраўнік яго запрасіў усіх нас у свой кабінет, распытаў усё дакладна. Ён запытаў мяне, ці знаю я спадара Сабалеўскага. На мой адказ «так» кіраўнік сказаў, што ён нядаўна быў кіраўніком арбайтсштату ў Баранавічах і добра знае Сабалеўскага. Гэтае знаёмства спрыяла мне, бо ён запытаўся, што я хачу ад яго, і я сказаў, што маю знаёмых у Аўстрыі і прашу накіраваць мяне туды, што ён ахвотна і зрабіў, даючы ўсёй сям'і бясплатны праезд.

Прыехалі да знаёмых, якія працавалі ў баўэра. Нас вельмі добра прынялі іх гаспадары. У арбайтсштаце мяне і майго сына прызначылі ў суседнюю вёску да аднаго нацыста на працу ў гаспадарцы — 13-га вінаградніку, дзе мы працавалі праз усю зіму. На пачатку красавіка гаспадар зліквідаваў мяне, сказаўшы: я заўтра ад'язджаю, бальшавікі прыйдуць сюды, але не раней двух тыдняў, то я прашу вас: застаньцеся на тыдзень абрэзаць вінаград, а тады мой упраўляючы дасць вам каня і яміны* на дарогу. На гэтым мы пагадзіліся, і за тыдзень ад'ехалі на Захад.

Напрамак нашага падарожжа быў у Тыроль, аднак не даязджаючы Зальцбурга на дарозе патруль не пусціў у Тыроль, а направіў у Баварыю. Прыехалі ў Браўнаў[224], дзе трэба было пераязджаць рэчку Ін, і там нас затрымаў эсэсаўскі патруль, бо фармальна мы не мелі дакументаў у Баварыю. Аднак на нашыя высненні жандар нас прапусціў, і мы паехалі ў напрамку Дахаў, дзе быў зняволены на вечнасць сын Аляксандр[225]. Прымусовая змена маршруту была для нас карыснаю ў адшуканні сына.

Апошнімі перад капітуляцыяй днямі было небяспечна ехаць далей, бо амерыканскае лятунства без перапынку абстрэльвала ўдзень усе шляхі, і мы, не даехаўшы 60 км да Мюнхена, змушаны былі затрымацца ў адным двары, які належаў графу Прайснеру.

Аднаго дня затрымаліся канцэнтроўцы[226] на ноч, размясціўшыся ў аўчарні. Іх гналі ў горы, дзе гітлераўцы мелі ўсіх канцэнтроўцаў перастраляць. Канвой мала звяртаў увагі на іх, бо ўжо вядома было, што сёння-заўтра будзе канец вайне. Назаўтра сын Лёва пайшоў у аўчарню, а там у саломе схавалася чалавек дваццаць розных нацыянальнасцей, адзін хворы на бязумку. Вялікая небяспека, але трэба было людзей накарміць і ўратаваць

* Яміна (дыялект.) — ежа.

ад эсэсаўцаў, якія прасавалі як блудныя авечкі. Жонка сваймі сродкамі лячыла хворага; Лёва расказаў гаспадыні-немцы пра канцэнтроўцаў, з пагрозаю, што калі яна скажа, то яе з сям'ёю і нас усіх немцы расстраляюць. Мушу зазначыць, што за маё падарожжа па Нямеччыне і Аўстрыі ўпершыню спаткаў такую жанчыну. Гэта было нешта асаблівае. Мажліва, як яна расказвала, яе мужык быў на фронце ў нас і, калі прыязджаў у адпачынак, сказаў ёй: *«Я пабачыў народ, які сам бедны, а дзеліцца апошнім; глядзі, нікому не адмаўляй, не пытай, хто ён, кожнага накармі і абагрэй»*. Гэтая жанчына не шкадавала нічагусенькі, з яе каморы сілкаваліся чатыры дні болей як 23 асобы, за што пасля капітуляцыі ёй шматлікія адудзячыліся.

Распаўсюджваныя весткі наконт канцэнтроўцаў з Дахаў не давалі супакою, але ехаць у пошукі не было ніякай мажлівасці дзеля забароны амерыканскімі вайскоўцамі ўсялякага руху на шляхох.

Пасля некаторага часу я з дачкою паехаў фурманкаю ў Дахаў. Няведанне ангельскай мовы і адсутнасць пропуску стварылі вялікія цяжкасці, але, на шчасце, па дарозе выручыў стары польскі *«dowód osobisty»**, які неспадзявана быў у кішэні каптана. Праязджаючы каля вясковага патруля, я смела даставаў гэты «довад», на той час зусім не актуальны, падаючы яго вартаўніку, які, паглядзеўшы на велізарную пячатку з курыцаю[227], вяртаючы, гаварыў «ОК», і мы далей пускаліся ў вызначанае месца.

Пад'язджаючы да канцэнтрацыйнага лагера, я заўважыў уводдаль на бараку польскі нацыянальны сцяг. Заехалі ў гэты барак, дзе было чалавек 12 палякаў з інтэлігенцыі, якія кіравалі працамі на агародах канцэнтрацыйнага лагера (а работнікамі былі немцы з г. Дахаў). Прадставіўшыся як беларус, я расказаў, у якой справе да іх завітаў. На маё вялікае здзіўленне, усе яны вельмі ветліва прынялі нас і запрапанавалі знайсці сына, бо ў лагер цывільных не пускалі. Адзін з іх зараз жа пайшоў у лагер, але дзеля таго, што гэта была нядзеля, ён не змог паміж некалькіх дзясяткаў тысяч зняволеных знайсці сына, не знаючы ягонага нумару.

Назаўтра пайшоў другі, які дазнаўся пра сына, што ён працуе ў шпіталі, але з ім, дзеля ягонай адсутнасці ў шпіталі, не бачыўся; пакінуў яму адрас, дзе на яго чакаюць бацька і сястра.

---

* Dowód osobisty (польск.) — пашпарт, пасведчанне асобы (пол.).

Надчэкваючы сына, хвіліны здаваліся гадамі. Наканец на заходзе здалёку дачка ўбачыла: ішоў сын, якога не бачылі з 1941 г. Прывітаўшыся, сын пытае, дзе мама. Я ў такой радасці сказаў «удома», а сыну падумалася, што ў сваім доме на бацькаўшчыне. Спахапіўшыся, я расказаў, дзе знаходзіцца пазасталая сям'я — у якіх 60 км адгэтуль. На пытанне сына, што цяпер будзе, я сказаў, што паедзем да сям'і, але сын сказаў: *«Тата, вы не ўяўляеце, што тут у лагеры дзеецца»* — і пачаў распавядаць.

Навонкі стаялі амерыканскія войскі, а ўнутры лагера ўся ўлада была ў руках НКВД, на чале якой стаяў ген. Вішнеўскі, які сёння ўзначальвае камітэт па «Возвращению на Родину» ў Берліне. З даведчання я знаў, што кожнае зняволенне не так было б страшна, калі б не было яшчэ большага зняволення сярод зняволеных, асабліва сярод камуністаў. Ад апавядання сына ў мяне валасы дыбам сталі, бо склады з вопраткаю абстаўлены былі НКВДоўцамі і кожны клунак правяраўся, і калі знаходзілі якую пісульку, пісаную супроць камуністаў, ці фотку з якімсь жаўнерам, ці штось наагул малазначнае, дык такіх уладальнікаў, нявынішчаных гітлераўцамі, тысячамі мардавалі НКВДысты.

Аднак, нягледзячы на страх, сына мы ўгаварылі, і назаўтра ён прыйшоў да нас, і мы паехалі. Мушу адцеміць, што сын не з'яўляўся трусам, але камуністы нагналі яму такога страху, што ён, прыйшоўшы да фурманкі, хоць і была яна далекаватая ад лагера, не сеў на воз, а пайшоў наперадзе, і толькі ад'ехаўшы з мілю, сеў на воз.

Па дарозе з Дахаў у Шлясгайм[228] сын здалёка ўбачыў камандзіра свайго батальёна. Сын папрасіў мяне падагнаць каня. Нагналі камандзіра, які прывітаўся і запытаў, куды мы едзем. Сын адказаў, што ў Шлясгайм. На гэтым развіталіся. Сын пачаў пазбаўляцца страху, нагнанага камуністамі. Апавяданне сына пра дзейнасць НКВД у Дахаў, якая ноччу нішчыла, задушваючы, усіх тых, што хоць адно слова выказвалі супроць камунізму, уражвала нават на фоне гітлерызму. Каму можна было расказаць, у каго прасіць паратунку, калі чалавек не быў пэўны ў чалавеку, у кожным бачыў камуніста. Няма дзіву, што сын быў вельмі перастрашаны.

Як прыехалі да сям'і, страх хутка мінуў, нягледзячы на тое што ў мястэчку быў камуністычны лагер, а на будынку вісела чырвоная плахта. У гэтым мястэчку стаяла амерыканская пяхота, у якой бальшыня была польскага паходжання. Гутарылі яны па-польску. З гутарак вынікала, што яны супраць камунізму, што яны тут гаспадары. Я сказаў, што чырвоная плахта падрывае давер насельніцтва да іх. Яны згадзіліся і пайшлі да камандзіра, які з імі поўнасцю пагадзіўся, даючы загад зняць тую камуністычную плахту.

У мясцовасці, дзе я жыў, на некалькі кіламетраў навокал не было ніводнага беларуса. У павятовым гарадку за 9 км былі ўкраінскі, польскі, эстонскі, латышскі, летувіскі ды аўстрыйскія камітэты. Украінскі ды польскі камітэты дапамаглі мне выехаць у Аўгсбург, куды я ехаў дзеля вучобы дзяцей — там была ўкраінская гімназія. У гімназіі мы спаткаліся з М. Гарошкам[229], які неўзабаве наведаў мяне і даў адрас беларускага лагера ў Рэгенсбургу.

У канцы 1945 г. і на пачатку 1946 г. пачалася рэгістрацыя УНРА[230] ўсіх, што не хацелі вяртацца на свае бацькаўшчыны. Пры рэгістрацыі УНРА вымагала нямецкую працоўную картку. Чалавека, што такой карткі не меў, лічылі за вайскоўца, і яму пагражаў лагер ваеннапалонных. Каб ратаваць суродзічаў, было неабходна знайсці друкарню, якая б рызыкнула надрукаваць гэтыя карткі. Сын Аляксандр знайшоў у Аўгсбургу друкарню, гаспадар якой падчас Першай сусветнай вайны служыў у расійскай арміі. Але мала таго, трэба было, каб на кожнай картцы была пячатка павета ці акругі. І гэта не стала перашкодаю. Сын Аляксандр, седзячы цэлымі днямі ў хаце, па-мастацку выконваў гэтую скамплікаваную* працу. Тады маім абавязкам было адвезці ў Шлясгайм, хаваючы паперы ў шкарпэтках. Некалькі разоў прыязджалі па карткі Кажан[231] і Бортнік[232]. Так прыходзілася ратаваць людзей.

Сёння не згадаю, гэта быў 1945 ці 1946 г., калі атрымаў ліст ад А. Орсы, у якім ён прасіў мяне прыехаць у Рэгенсбург у вельмі пільнаважнай справе. Не адкладаючы, еду да А. Орсы, які паінфармаваў мяне, што згодна сп. Прэзідэнта спадара М. Абрамчыка[233] неабходна ўтварыць урад БНР, і я павінен узначаліць адно

* Скамплікаваны (польск.) — складаны.

з міністэрстваў. На маю адмову, што я не адпавядаю на такое высокае становішча, А. Орса адказаў: *«Рабіць вы нічога не будзеце, урад неабходны для вонкава-дэмакратычнага заходняга свету»*. Калі гэта патрэбна дзеля Бацькаўшчыны-Народа, я, не зважаючы, які б мяне і маю сям'ю спаткаў лёс, даў згоду.

Дзеля знаёмства з А. Орсам я не пасмеў запытацца ў яго, а дзе ж наша эліта, якая на Бацькаўшчыне была на важнейшых пасадах і на такіх становішчах глядзела звысока.

У той час падзелу яшчэ не было, людзей з вышэйшай адукацыяй хапіла б утварыць некалькі ўрадаў, але ў той час яно было небяспечна: а ну ж бальшавікі дазнаюцца і запатрабуюць выдачы, што ў той час магло быць. Дзеля гэтага шукалі «Стагановічаў»: няхай яны гінуць, а мы, навучаныя, павінны застацца працаваць так, як мы хочам.

Далейшае жыццё на эміграцыі пачало ўскладняцца. Да гэтага спрычыніўся епіскапат БАПЦ з мітрапалітам Панцеляймонам, быўшым царскім афіцэрам[234], які прыслаў у Рэгенсбург двух епіскапаў-беларусаў[235], каб даведацца, які пагляд у беларускай эміграцыі на прылучэнне БАПЦ да Расійскай зарубежнай царквы.

У 1946 г. у Рэгенсбургу на з'ездзе ў гэтай справе беларуская эміграцыя[236] выявіла моцны супраціў прылучэнню да расейцаў, аднак ворагі беларускага народа зрабілі сваё, і ў Мюнхене быў падпісаны акт ліквідацыі БАПЦ арх. Філафеем і Апанасам. Гэты злочын абурыў бальшыню адданых свайму народу эмігрантаў, аднак частка беларускіх «дзеячоў», якія з прыходам немцаў сталі называць сябе беларусамі, падтрымала гэты шкодны акт расійскіх шавіністаў у сутанах[237]. Адгэтуль пачаўся не толькі разлом, але вялікая варожасць, якую паглыбіў Я. Станкевіч з сваім праектам замены назову Беларусь на Крывію[238].

Адказным людзям, г. зн. Прэзідэнту і БНР, неабходна было аднавіць БАПЦ з адпаведнымі іерархамі, якія служылі б Богу і свайму народу. На адным пленуме, абмяркоўваючы кандыдатаў — Бортніка і Тамашчыка[239], трэцім сам пагадзіўся Дзямідаў[240], які сказаў, што ён возме разлуку з жонкай. Аднак пленум не мог пагадзіцца з прапановаю Дзямідава і перайшоў да парадку дзённага. Катэгарычная адмова Бортніка заняць гэтае адказнае становішча змусіла пленум прасіць Тамашчыка прыняць гэтае вялікае становішча. Пасля даўгіх нагавораў Тамашчык даў згоду.

Даведаўшыся пра гэта, прарасійская кліка, якая атрымала назоў «зарубежніцтва», пачала дзеіць на ўсіх адцінках фронту, каб перашкодзіць у хіратанізацыі Тамашчыка на епіскапа. Тысяча брудных даносаў ува ўсе амерыканскія ўстановы і арганізацыі і ў Украінскую аўтакефальную царкву, яе мітрапаліту Палікарпу. Аднак нічога не памагло: у снежні 1949 г. Тамашчык быў хіратанізаваны епіскапам УАПЦ. БАПЦ аднавілася епіскапам Васілём.

Мінула 10 гадоў. Ворагі беларускага народа яшчэ сёння рознымі спосабамі і метадамі намагаюцца знявечыць усё беларускае, асабліва БАПЦ. Лідары «зарубежжа», як д-р Шчорс, не саромяцца гаварыць, што толькі пад аховаю штыкоў можна завезці Тамашчыка на вольную незалежную Беларусь. Але трэба запытаць усіх шкоднікаў з зарубежжа, ці маюць яны права павярнуцца на Бацькаўшчыну, якой здрадзілі і здраджваюць. Беларускі Народ такіх ворагаў не прыме, такім там месца не будзе.

Беларускія скітальцы на Захадзе былі нязнаныя, асабліва амерыканцам. У гэтым няма дзіва, бо нашыя ворагі праз стагоддзі фальшавалі гісторыю нашага мінулага гаспадарства Вялікага Княства Літоўскага. У такім палажэнні нельга было заставацца. Дэлегацыям было неабходна ездзіць у розныя вайсковыя і УНРРАўскія ўстановы, каб хоць гэтым дабіцца ад амерыканцаў прызнання беларусаў як апрычонай нацыі-народа.

У першую дэлегацыю ў галоўную гасподу амерыканскай арміі ў Франкфурце ездзілі Калодка[241], Я. Станкевіч і я. У Франкфурце, прайшоўшы некалькі кантрольных пунктаў, мы апынуліся ў галоўнай управе, дзе нас прыняў афіцэр амерыканскай арміі. Прыймо адбывалася на калідоры. З гэтага было відаць, што мы нічагусенькі не зможам дастаць для беларусаў. У часе спатканьня на калідоры Я. Станкевіч замест таго, каб высвятляць маёру, які нас прыняў, чаго мы просім, пачаў абвінавачваць расейцаў. На нашую заўвагу яму ён не спыніў свае беспадстаўныя гутаркі.

Наступная дэлегацыя адведала Гальдэнберг[242] без ніякіх вынікаў. Трэцяя ездзіла ў галоўную гасподу УНРРА, таксама без вынікаў.

Прайшло пару год, калі беларускую эміграцыю амерыканцы прызналі як асобную нацыю-народ. У амерыканскай зоне акупаванай Нямеччыны паўсталі розныя палітычныя арганізацыі з народаў, належачых да Савецкай Расіі. Асаблівую палітычную

дзейнасць праяўляла АБН[243], у якой рэй вялі бандэраўцы, якія не карысталіся пашанаю дзеля свае падтрымкі ў злочынах супраць народаў, асабліва супраць жыдоў. Паўстала думка стварыць на дэмакратычных падставах палітычную арганізацыю-процівагу АБН, што ў нядоўгім часе было здзейснена пад назовам «Інтэрнацыянальная Свабода»[244].

На арганізацыйным сходзе ад украінцаў былі генерал (прозвішча не памятаю), Сабачынскі, др. Майнік, ад казакоў інж. Глоскаў, ад беларусаў я, Гарошка і Тулейка[245], ад паўночных каўказцаў якісь князь, ад армянаў і грузінаў — прозвішчаў не памятаю. У далейшым этапе да «Інтэрнацыянальнай Свабоды» прыйшлі славакі і румыны.

Напачатку здавалася, што арганізацыя будзе сапраўды інтэрнацыянальнаю, аднак у далейшай працы ўкраінцы выявілі сябе як самыя крайнія шавіністы-вялікадзяржаўнікі, што марылі пра Украіну ад Балтыйскага да Чорнага і Каспійскага мораў з Паўночным Каўказам і Кракавам, Славакіяй, Малдавіяй і часткаю Румыніі. На гэта ніхто з сяброў арганізацыі не мог пагадзіцца. Акрамя гэтага, украінцы друкавалі мапы і распаўсюджвалі па ўсім свеце. Да ўсяго гэтага ўкраінская газета «Неділя»[246] змясціла фота казакаў, якія з Варшавы пасля бунту палякаў давалі ў падарунак нямецкаму генералу казацкую папаху. Усе гэтыя правакацыйныя дзеянні з боку ўкраінцаў знеахвоцілі сяброў «Інтэрнацыянальнай Свабоды» да канструктыўнай працы. Штомесяц на паседжаннях вяліся зацятыя спрэчкі з украінцамі, асабліва з Сабачынскім, які зацята бараніў хваравітыя імкненні вялікадзяржаўніцкай нацыі. Дзякуючы ўсяму гэтаму за два гады «Інтэрнацыянальная Свабода» выдала толькі адзін нумар журнала.

Як вышэй зазначана, беларусаў прадстаўлялі трое, але чамусь мне, жывучы за 100 км ад Мюнхена, прыходзілася ездзіць на паседжанні, тады як Гарошка жыў у Шлясгайме. З Мюнхена заўсёды быў Тамашчык.

У Мюнхене зарганізаваўся міжнацыянальны камітэт, да якога належалі ўсе нацыянальнасці, паняволеныя бальшавізмам. На штомесячныя паседжанні гэтай арганізацыі зноў мне прыходзілася прыязджаць. Не раз мне прыходзілася разважаць гэ-

тую справу, але я пераконваў сябе, што нашы людзі не маюць часу, бо працуюць навукова. Аднак, як пазней стала мне ведама, адзінкі працавалі ў грамадскіх справах; бальшыня занята была сваймі справамі, справамі свайго жывата і найхутчэйшага выезду ў Амерыку. З выездам за акіян я не меў ніякай сувязі з арганізацыяй.

Народная пагаворка кажа: каб чалавека пазнаць, неабходна з ім пажыць. Пазнаў некаторых і я. Вельмі мала тых, якія кіруюцца ідэямі сваіх папярэднікаў, свайго народа. Нягледзячы на мой век і пройдзены жыццёвы шлях, я меў наіўнасць верыць людзям, што яны, як я, шчыра адданы свайму Народу-Бацькаўшчыне, і моцна падтрымліваў іхныя імкненні.

Першым маім расчараваннем стаў Янка Станкевіч, калі выдаў «Крывіцкі песеннік»[247], які друкаваў у Аўгсбургу. Мне і двум другім каштавала не толькі працы, але і сродкаў перавезці яго дамоў, а з дому ў Рэгенсбург. Я думаў, што гэта будзе грамадская справа, але тое было асабістае прагненне набіць кішэню. Гэты плагіятны песеннік не толькі [не] меў збыт, але яшчэ болей павялічыў закалот у беларускім грамадстве[248].

Хвароба двух сыноў у 1948 г. паставіла мяне ў безвыходнае становішча, што змусіла мяне пайсці ў лагер ДП[249], куды я не хацеў дзеля незалежніцкага майго характару — каб не быць на ласцы ў каго б то ні было, а самастойна даваць сабе раду ў жыцці.

На маю просьбу адаслаць мяне ў беларускі лагер не было ніякіх вынікаў дзеля таго, што ў акрузе не было беларускага лагера. Я змушаны быў ехаць у Мітэнвальд[250]. Па прыездзе я пазнаёміўся з а. У. Салаўём[251], які абслугоўваў духовыя патрэбы балтаў і вугорцаў. Дзякуючы нацыянальнай сведамасці а. Салавей дамогся ад сваіх духовых вернікаў дазволу на служэнне Божае службы ва ўсходнім абрадзе: а. Салавей пісаў спачатку да Ватыкана з просьбаю даць яму дазвол служыць сваім праваслаўным братам-беларусам, і Ватыкан адмовіў. Тады а. Салавей звярнуўся да мюнхенскага біскупа, і той даў дазвол. Патрыятызм а. Салаўя выявіўся пры хіратанізацыі епіскапа Васіля, дзе ён, магчыма, першы ў гісторыі Цэркваў Рымска-каталіцкай і Праваслаўнай прыняў благаслаўленне ад епіскапа Васіля, што выклікала ў прысутных беларусаў слёзы.

*IRO*[252] змусіла мяне эміграваць у Амерыку, чаго я не хацеў. Мой намер быў эміграваць у Францыю, якая была мне ведамая з Першае светавое вайны, дзе я прабыў некалькі год і якую лічыў сваёю другою бацькаўшчынаю і дзе пражыў два з паловаю гады. Я верыў, што дэмакратыя хутка пакончыць з злом людства — маскоўскім камунізмам, і з Францыі пехатою можна будзе павярнуцца на сваю родную мілую Беларусь, да свайго народа, з якім на працягу дзесяцігоддзяў вёў змаганне з акупантамі розных колераў. А да гэтага маім жаданнем было, каб дзеці вучыліся на Лювенскім універсітэце[253], які ўзгадоўвае ў дэмакратычных маральна-хрысціянскіх якасцях сваіх студэнтаў. Аднак мае намеры не здзейсніліся: я змушаны быў ехаць у Амерыку.

Апушчаючы Еўропу, я перажываў найбольшы жаль у сваім жыцці. Я лічыў сябе дэзертырам свайго народа, які пакінуў яго ў найтруднейшых абставінах нішчання маскоўскім камунізмам, абліваючы крывёю і ўсцілаючы касьцьмі шляхі з Беларусі на далёкую Поўнач, Сібір, Казахстан ды іншыя бойні-лагеры смерці.

Невялікі прамень пацехі тады-сяды маланкава пралятаў, як у думках марыў, што з прыездам у Амерыку я змагу поўнасцю ўтрымаць епіскапа Васіля і хоць гэтым адудзячу свой правін перад народам і Бацькаўшчынаю. Аднак мае меркаванні не здзейсніліся, бо з прыездам амерыканская прырода жорстка паздзеквалася над усёю маёю сям'ёю: захварэла жонка-матка. І замест жыць з сваймі суродзічамі, змушаны быў ад'ехаць да чужых ды часта варожых людзей за 180 км ад Нью-Ёрка. Я сёння думаю: чаму не знайшлося чалавека ў Саўт-Рыверы ці Нью-Брансвіку[254], каб запрапанаваць мне пераехаць да сваіх, што было б меншым злом у нашых перажываннях?

Я мусіў ехаць да чужых і нават варожых людзей у Кагос, НЁ[255]. Знаходзячыся ўдалечыні ад Нью-Ёрка, я адзін раз у год мог дазволіць сабе на прыезд у горад. Гэта — 25 Сакавіка. З перапіскі, якую я вёў з А. Орсам, вынікала, што між людзьмі, адказнымі перад Бацькаўшчынаю, штось папсавалася, бо адныя другіх называюць Палітбюро.

# ШЭСЦЬДЗЕСЯТ ГОД ТАМУ. У АДЗНАЧЭННЕ НАШАНІЎСКАГА ГОДА

Сёлета спаўняецца 60-годдзе ад выхаду беларускай газеты «Наша Ніва» ў Вільні. «Наша Ніва», што пачала выходзіць 23 лістапада 1906 года, будучы папярэджанай кароткатрывалай газетай «Наша Доля», першы нумар якой выйшаў 14 верасня таго ж 1906 года, — гэта першая беларуская легальная газета пасля скасавання ў 1905 годзе забароны беларускага друку.

Гэта была пара, калі ўся царская імперыя была ахопленая рэвалюцыйным рухам. У сувязі з гэтым цар змушаны быў пайсці на некаторыя палёгкі для народаў сваёй імперыі.

Для мяне, чытача «Нашай Нівы» з 1906 года, цяжка напісаць успаміны, каб мелі яны гістарычную вартасць. Я быў тады малалетнім вясковым юнаком. А пасля смерці бацькі я змушаны быў памагаць матцы не толькі ў гаспадарцы, але і прызарабіць вонках 15–20 капеек у дзень, каб пражыць усёй сям'і і аплаціць усе падаткі.

Я разумею, што знойдуцца сёння і такія, у якіх зародзіцца сумнеў: як жа гэта магло стацца, каб вясковы юнак без адукацыі ды захапіўся чытаннем беларускай газеты? Каб развеяць падобныя сумневы, неабходна вярнуцца да 1905 года. Аднаго летняга дня, калі я быў на працы ў двары, прыйшлі да работнікаў два дарослыя вучні гарадскога вучылішча ў Наваградку Пётра Булыга з вёскі Селішча і Гірш Ражанскі з вёскі Куравічы і пачалі агітаваць, каб кінулі працу, бо працоўныя ўзбагачаюць адно абшарнікаў. Малая колькасць работнікаў, у тым ліку і я, спынілі працу.

Ад гэнага часу Пётра Булыга пачаў часта наведваць мяне і даваць мне дробныя даручэнні, якія я і выконваў. Мне няведама, ці звяртаўся ён таксама і да іншых, што пакінулі работу. Але можна меркаваць, што ён яшчэ двух нагаварыў, старэйшых за мяне А. Барыса і У. Дарашэвіча. Мы ўтрох раскідвалі начамі адозвы і запальвалі змочаныя ў газу анучы на высокіх тычках, пастаўленых намі на ўзгорках. Гэтым наводзілі страх на мясцовых сялян, бо ўсе

тады гаварылі, што бунтаўшчыкі спаляць вёску, калі ейныя жыхары будуць хадзіць на працу да абшарніка. Я нагэтулькі ўвайшоў у давер Пятра Булыгі, што ён мяне запрасіў на іхнае паседжанне, якое адбывалася ў старым, запушчаным на аднаселлі млыне. Там я пазнаў Васіля Рагулю і даведаўся, што гэта гурток эсэраў, пра якіх я ў той час не меў нават зялёнага паняцця.

Пасля некалькіх месяцаў я трохі раскумекаў пра гэта, і ў мяне паўстала пытанне, як жа я паступлю ў выпадку, калі яны запрапануюць мне стацца сябрам іхнага гуртка. Сёння не магу прыпомніць, ці я дзесьці чытаў, ці ад кагосьці чуў, а мо гэта былі мае собскія меркаванні, што партыя эсэраў мае тэрарыстычныя тройкі, якія, паводле лёсавання, мусяць кагосьці застрэліць. Гэтая вось справа мяне і палохала: хацелася быць рэвалюцыянерам, але і шкадаваў свайго юнацкага жыцця.

6 жніўня 1906 года (ст. ст.) у Наваградку адбываўся вялікі кірмаш. У гэты ж дзень на 25-кіламетровай даўжыні тракту з Любчы ў Наваградак В. Рагуля, П. Булыга, Г. Ражанскі і я на тэлеграфічных слупах расклейвалі «Выбаргскую адозву», і пры гэтай рабоце ўсіх нас арыштавалі. В. Рагулю і П. Булыгу выслалі на паўтара года ў Адэскі павет. Г. Ражанскі ўцёк з-пад арышту і выехаў у Амерыку, мяне ж як нялетку адсцёбалі бізунамі па мяккім месцы.

Пад восень таго ж 1906 года мой сусед Юзік Гаўраш, заможных бацькоў сынок, шукаючы сабе жонкі, хадзіў на фэсты на далёкія адлегласці, пераважна ў Віленскую губерню. Аднаго дня, спаткаўшы мяне, даў мне беларускую газету, кажучы: «На, чытай, калі зможаш». Гэта была «Наша Ніва». Калі я пачаў чытаць, спачатку сапраўды было вельмі цяжка, асабліва не мог даваць сабе рады са злучэннямі літараў «дз», «дж», «ць», «цё», «ццё» і г. д. Я пачаў прыслухоўвацца, як сам гавару і нашыя людзі, і тады я хутка ўжо ўсвоіў сваё роднае друкаванае слова. Калі я чытаў сялянам «Нашу Ніву», яны гаварылі: «Мо цяпер паны будуць шанаваць і нашую мужыцкую мову». Нашае роднае друкаванае слова зрабіла на мяне вялікае ўражанне. Я ведаў, што я беларус, што аж шэсць губерняў належыць да Беларусі: Смаленская, Віцебская, Магілёўская, Менская, Горадзенская і Віленская. Гэта было ў расійскай кніжцы «Родное слово» ці «Родной край», добра не памятаю[1].

Прайшло некалькі тыдняў, і мой сусед не прыносіў мне газеты. Гэтыя тыдні здаваліся мне вечнасцю. Аднаго дня я папрасіў

у маткі дазволу пайсці пехатой у Менск. Чаму ў Менск, а не ў Вільню, дзе выдавалася газета? Перш-наперш, я не звярнуў быў увагі на месца друку газеты. Па-другое, я быў фанатычна рэлігійны і, дзякуючы расійскім святарам, вельмі варожа ставіўся да каталікоў, якіх уважаў за палякаў.

Не зважаючы на мой малады век, матка ў нічым мне не адмаўляла, яна дазволіла таксама пайсці і ў Менск. Выходзячы з хаты, я ўяўляў сябе найшчаслівейшым у свеце. На сваім шляху прыйшлося два дні папрацаваць, каб папоўніць свой дарожны капітал. Прыйшоўшы ў Менск, я абышоў увесь горад і нічога не надыбаў, чаго шукаў. Не агледзеўся, як стала цёмна. Я мусіў недзе пераначаваць і зайшоў у гатэль «Еўропа». Там на мяне глядзелі, як на нейкае дзіва, але на маю ветлівую просьбу мне далі пакойчык на падстрэшшы за 50 капеек. Назаўтра, зыходзячы па сходах, набіў сабе гуз на лобе аб люстраную сцяну. Раніцай яшчэ раз абышоў горад і, не знайшоўшы, чаго шукаў, паплёўся дамоў.

У познюю восень таго ж года надарылася нагода пабываць і ў Вільні. Адзін дзядзька наняўся быў загнаць у Вільню дзесяць кароў, а для помачы ўзяў ён мяне. Мне хацелася хоць здалёку паглядзець на тых людзей, што выдавалі «Нашу Ніву». Я іх уяўляў нейкімі незвычайнымі. Прыбыўшы ў Вільню, мы адразу адправіліся на рынак, дзе прастаялі ўвесь дзень, а пад вечар, з'еўшы гарачай капусты за 5 капеек, змушаныя былі вяртацца дамоў. Дык і гэтым разам не пашанцавала беспасярэдне сутыкнуцца з «Нашай Нівай». Я быў злы на ўсіх і на ўсё, галоўнае ж — на гэтага дзядзьку.

Пасля гэтай няўдачы ў маіх пошуках я звярнуўся да таго суседа, які мне даваў раней газету. Але гэта быў пачатак зімы, і фэсты нідзе не адбываліся. Дык ён мне сказаў, што раней Калядаў не зможа мне дастаць газету. Між Калядаў я дастаў ад яго дзве газеты, пазней ён мне іх прыносіў нерэгулярна, зімой вельмі рэдка, улетку часцей. Гэтак было да канца 1911 года.

У пачатку 1912 года я пераехаў на працу ў земскі сельскагаспадарчы склад у Баранавічы. Там я апынуўся сярод беларускай інтэлігенцыі. Гэта былі: Я. Мурашка, павятовы аграном, сацыял-дэмакрат, меншавік з вёскі Ябланоўшчына каля Міра; Ф. Ігнаценка, павятовы лугавод са Смаленшчыны; Маеўскі,

студэнт-практыкант з Бельшчыны; Ф. Мазалевіч, загадчык складу. Усе яны былі са мною? як браты. Я. Мурашка адбыў трохгадовую ссылку, будучы гімназістам, штотыдня ездзіў у Менск і прывозіў «Нашу Ніву». Ад таго часу я чытаў «Нашу Ніву» рэгулярна аж да выбуху Першай сусветнай вайны.

У дзень пачатку вайны я быў у Фінляндыі на сельскагаспадарчай экскурсіі, арганізаванай Менскім губернскім земствам. Не закончыўшы экскурсіі, змушаныя былі вяртацца дамоў. З усёй нашай групы застаўся ў Баранавічах толькі Ф. Ігнаценка. Я. Мурашку як палітычна ненадзейнага выслалі ў Гарадзею, бо ў Баранавічах знаходзіўся штаб галоўнага камандуючага. Ф. Мазалевіча мабілізавалі ў армію. Маеўскі выехаў дамоў.

Праз месяц і мяне забралі ў маскалі. А праз год немцы забаранілі выдаваць «Нашу Ніву»[2], якая за дзевяць год свайго існавання збудзіла ад безнадзейнага сну мільёны сыноў і дачок беларускага народа. Для мяне асабіста «Наша Ніва» была школай у поўным значэнні гэтага слова. Пад ейным уплывам я даў сабе слова служыць свайму народу і Бацькаўшчыне.

Не будзь «Нашай Нівы» — не было б Першай, Другой і Трэцяй Устаўных Граматаў, не было б БНР. Не было б 14 прадстаўнікоў у польскім Сейме і Сенаце з выбараў 1922 года. Не было б Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Я асабіста, калі б не чытаў «Нашай Нівы», напэўна, не згадзіўся б кандыдаваць у польскі парламент, бо быць беларускім паслом азначала пазбавіць сябе волі і сесці на доўгія гады за краты. Будучы паслом, падчас маёй сямімесячнай «адсутнасці» (сядзеў у астрозе) мае сябры з Клуба «Змаганне» Валынец і Грэцкі, а такжа Варскі, Сахацкі і карэспандэнт Барскі былі паклікалі мяне ў свой клуб і запрапанавалі перайсці да кампартыі. Я катэгарычна сказаў: «не» — і выйшаў, бразнуўшы дзвярыма.

З чатырох закладчыкаў «Нашай Нівы» толькі Іван Луцкевіч[3] памёр сваёй смерцю. Антон Луцкевіч, Вацлаў Іваноўскі і Аляксандр Уласаў[4] замардаваныя камуністамі[5]. Слава, Гонар і вечная памяць ім.

# ПРАЎДА АБ ГРАМАДЗЕ І «ЗМАГАННІ»

Да гэтага часу ў газеце «Бацькаўшчына» было надрукавана некалькі артыкулаў аб Грамадзе і «Змаганні»[1]. Мне няма ведама, чым кіраваліся аўтары артыкулаў аб Грамадзе і «Змаганні», уводзячы гэтым, асабліва малодшых, у блуд і дэзарыентацыю. Мне, старому чалавеку, гонар не пазволіў, каб не напісаць праўды аб тых далёкіх часах змагання нашага народа за сваё незалежнае жыццё.

Каб ляпей было зразумелым, асабліва тым, якія памятаюць, што і як было трыццаць год таму, трэба закрануць і прыпомніць, што дзеялася на тэрыторыі пазнейшай Заходняй Беларусі падчас польска-бальшавіцкай вайны, у часы Рыжскага трактата і пасля вайны.

Міжвольна ўспамінаюцца наступныя моманты: дзікія ўчынкі польскай арміі над нашым сялянствам, дзе за адну знойдзеную каля вёскі шынэль чырвонаармейца ўся вёска была нішчаная; Рыжскі трактат, на якім не быў выслуханы голас нашага народа; раздача дворскай зямлі польскаму вайсковаму асадніцтву; закрыццё нашых нацыянальных школаў; пазбаўленне права карыстацца роднаю моваю ў судовых і адміністрацыйных установах; нялюдскае абыходжанне з нашым народам і шмат іншага. Гэтыя злачынствы выклікалі ў адпаведную часіну помсту нашага сялянства.

Трэба адцеміць, што ў той час у Менску будаваўся «беларускі дом», як гаварылі ўсе і як пісалі польскія газеты (напрыклад, «Кур'ер віленскі»[2]). Гэта нямала дзейнічала на псіхіку нашага народа, які ўвесь час імкнуўся да свайго незалежніцкага жыцця.

Першай магчымасцю выказаць свае адносіны да польскай улады былі выбары 5 лістапада 1922 года, калі беларускае насельніцтва аддало свае галасы за сваіх прадстаўнікоў у польскі Сейм і Сенат у ліку 14. Польскі ўрад ніяк не мог пагадзіцца з гэ-

тым фактам і пастанавіў знішчыць нацыянальную сведамасць нашага народа ўсімі спосабамі.

Неабходна адцеміць, што з 14 нашых паслоў і сенатараў толькі 4–5 чалавек павялі адкрытае змаганне супраць польскага ўрада за правы, прызнаныя Версальскім трактатам. Дзякуючы апатычнаму становішчу бальшыні нашых прадстаўнікоў у нацыянальных справах пачаў шырыцца камуністычны падпольны рух, які пагражаў нашым прадстаўнікам страціць пашану і ўплывы ў нашым народзе.

У пачатку 1923 года з ініцыятывы Рак-Міхайлоўскага адбыліся чатыры паседжанні Пасольскага клуба, на якіх абмяркоўвалася пытанне: што зрабіць, каб пайсці ў народ і не дапусціць да пашырэння камуністычных уплываў на шырокія масы.

Хто знаў увесь склад Пасольскага клуба, у таго не было ніякага сумлеву, што ў беларускі воз не могуць упрагчыся ўсе 14 прадстаўнікоў. Так яно і сталася, бо толькі шэсць асоб пагадзіліся энергічна бараніць свой народ ад усіх здзекаў і спакусаў.

Самымі энергічнымі абароннікамі былі: Рагуля, Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Тарашкевіч і Уласаў[3]. Тарашкевіч як трыбун узяўся змагацца з польшчынай і палякамі з сеймавай трыбуны, а іншыя — ісці ў народ, каб падтрымаць ягоныя імкненні да здзяйснення ідэі 25 Сакавіка. З усіх паслоў найвялікшую пашану ў народзе здабыў Васіль Рагуля. Ён сваімі рэвалюцыйнымі прамовамі на частых мітынгах вельмі моцна падымаў рэвалюцыйны дух сялян. Запраўды, такія да народа словы, як «Грамадзяне, бярэце косы, вілы, сякеры і цапы і ганеце гэтую заразу вон з нашае зямелькі! Няхай ляхі ідуць туды, скуль прыйшлі!», імпанавалі нашаму сялянству, і яно спадзявалася, што вось-вось надыдзе часіна расплаты.

Гэткі стан трываў да травеньскага перавароту Пілсудскага. Пасля перавароту Пілсудскі захацеў паказаць сябе дэмакратам і дазволіў тварыць розныя партыі[4].

Гэтым разам на паседжанні Пасольскага клуба Тарашкевіч і Рак-Міхайлоўскі паставілі на парадак дня стварэнне Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Пасля доўгіх дыскусіяў з дзесяці паслоў і сенатараў (да гэтага часу Баран[5], Якавюк[6] і Аўсянік[7] зракліся пасольскіх мандатаў[8]) пяцёра згадзіліся ства-

рыць Грамаду. Гэта былі: Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Валошын і Сабалеўскі[9]. Хрысціянская дэмакратыя адмовілася ўвайсці як партыя ў партыю. Рагулю не адпавядаў назоў. Ён дамагаўся выкінуць слова «работніцкая», але аканчальна не адмовіўся, зазначаючы, што ён пабачыць. Гэткія самыя засцярогі меў сенатар Уласаў. Што ж датычыць сенатараў Назарэўскага[10] і Багдановіча[11], дык першаму абсалютна не абходзіла беларуская справа, а другому беларуская справа абходзіла настолькі, паколькі ён атрымоўваў вялікія грошы дзякуючы беларускім галасам. Ён як спецыяліст па тэалогіі выкладаў у расійскай духоўнай семінарыі, дзе быў целам і душою[12].

Было б недакладным і несправядлівым апусціць вельмі важны фактар пры ўтварэнні Грамады. Гэтым фактарам, нібы светлымі праменнямі, было ў савецкай Беларусі «Узвышша», якое ў той час рыхтавала грунт да паўстання супраць бальшавікоў.

Пасля поўнага ўкамплектавання Грамады Рагуля аканчальна адмовіўся ўвайсці ў Грамаду, матывуючы сваю адмову тым, што да Цэнтральнага камітэта Грамады належыць Астроўскі, якога ён увесь час называў небяспечным для беларускага вызвольнага руху. Пасля адмовы Рагулі а. А. Станкевіч часта яму дапякаў: «Як жа так? Вы з'яўляецеся хросным бацькам Грамады, а да яе не належыце!» Рагуля ўсім выясняў свае негатыўныя адносіны да Грамады прысутнасцю ў ёй Астроўскага[13].

Тым, якія хочуць маляваць дзейнасць Грамады, а гэтым і ўвесь свой народ у чорных фарбах, варта прыгадаць, што Францішак Аляхновіч паехаў быў у Менск, каб улажыць сваю цаглінку ў «беларускі дом». Што сталася не так, а інакш, не ягоная віна. Але хіба ніхто не закіне Францішку Аляхновічу сімпатыі да камунізму. Мы не можам знайсці ў гісторыі не толькі нашага народа, але і іншых народаў такога ўздыму да самастойнага жыцця, які быў падчас існавання Грамады. Грамада пацягнула за сабою амаль усё маладое пакаленне, бо 85 % сяброў і сябровак мела не больш як 30 год. Яны не мелі амаль ніякага паняцця аб расейцах і не адчувалі ніякай цягі да «традыцыйнага праваслаўя».

Грамадаўскаму руху спрыялі іншыя нацыянальнасці, асабліва жыды, а ў Наваградскім ваяводстве нават віцэ-ваявода

Серафімовіч (швагер Трэпкі[14]) і старшыня акруговага суда адкрыта падтрымоўвалі імкненні Грамады. Сведамасць і ахвярнасць сяброў Грамады да выканання грамадскіх абавязкаў паглыблялі народную культуру. Адчыняліся школы, ладзіліся пастаноўкі, чыталіся рэфераты і іншае. Амаль не было вёскі, у якой не было б гуртка Грамады. А кожны гурток меў свой народны дом, дзе была і бібліятэка. Усё гэта было набыта сваімі собскімі сіламі. Каб знайсці гэтыя сродкі, сябры гуртка ішлі талакою на працу — у лес шуркі[15] ставіць або ў двор да пана, часта праз увесь тыдзень — і ўвесь заработак аддавалі на ўспомненыя мэты.

Хіба не знойдзецца ніводнага чалавека, які запярэчыць, што 25 сакавіка бывае толькі 25 сакавіка, а 1 траўня — 1 траўня. Аднак аўтар артыкула «Святло і цені Грамады»[16] гэтыя даты перасунуў на іншае месца, толькі не напісаў на якое. Кажнаму ведама, што Грамада паўстала пасля 12 траўня 1926 года, а зліквідавана 27 студзеня 1927 года старога стылю[17]. Як маглі грамадаўцы святкаваць 1 Траўня ці не святкаваць 25 Сакавіка ў гэтыя месяцы свайго існавання, думаю, аднаму сп. Лаўрыновічу[18] ведама! Адно мяне дзівіць: чаму патрыёты з віленскай кузні, якім абыходзіла (?) святкаванне 25 Сакавіка, не пайшлі на Палессе пасля зліквідавання Грамады, каб выратаваць палешукоў ад зграі ППС, якая накінулася, як шакалы на дабычу?[19] Яны аб гэтым і не думалі, бо ім вельмі ўтульна было сядзець на Віленскай, № 7[20], дзе разам з імі сядзеў галоўны рэдактар паланафільска-астроўскага «Беларускага слова»[21] Сіняўскі[22], якога НКВД выслала на дапамогу Астроўскаму, каб зліквідаваць аканчальна беларускі незалежніцкі рух. Гэтак было, сп. Лаўрыновіч, а не так, як вам захацелася.

Надзвычайны рост Грамады (бо ў канцы кастрычніка Грамада мела амаль 200 тысяч сяброў і сябровак[23]) моцна занепакоіў як палякаў, так і Крэмль. Як адны, так і другія баяліся, што могуць страціць панаванне над нашым народам. Ад пачатку існавання Грамады камуністы пастараліся паслаць у яе сваіх агентаў. Не адстала і Польшча, пасылаючы сваіх гурынаў[24]. Але як адны, так і другія не мелі на грамадаўцаў ніякага ўплыву[25]. Можна меркаваць, што калі б не было ў той час ва Усходняй

Беларусі «Узвышша», якое праводзіла рэвалюцыйную дзейнасць, для Масквы не было б ніякага страху ад Грамады. Але нацягнутыя адносіны з Польшчай у той час змушалі камуністаў меркаваць, што Грамада і «Узвышша» з дапамогаю Польшчы могуць прагнаць бальшавікоў з Беларусі. Польскі ўрад баяўся, што Грамада з дапамогаю бальшавікоў прагоніць палякаў за Буг. Дзякуючы страху як адных, так і другіх, можна меркаваць (як нават і некаторыя нашыя дзеячы ў той час гаварылі), што між Масквою і Варшаваю была зроблена ўмова аб зліквідаванні Грамады. Для пацверджання гэтага меркавання вельмі важным ёсць факт наплыву камуністычных правакатараў у Грамаду, якія стараліся заклікаць да збройнага паўстання, што мела месца ў вельмі малых выпадках, і то толькі пры Рыжскай мяжы[26]. Але і гэтага хапала польскай адміністрацыі, каб паказаць свету на злачынны акт Грамады. Неабходна падаць усю праўду аб Грамадзе і грамадаўцах у форме пытанняў і адказаў.

Хто з беларускіх паслоў належаў да Грамады? — Належалі: Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Сабалеўскі і Валошын.

З якіх асобаў складаўся галоўны партыйны апарат? — Ён складаўся з усіх вышэй менаваных паслоў і з Астроўскага, Луцкевіча[27], а. Каўша, Акінчыца і Бурсевіча.

Хто з іх быў камуністам? — Толькі пасол Валошын. Р. Астроўскага шмат якія сябры лічылі камуністам, аднак, дзякуючы ягонай хітрасці, сцвердзіць гэтага дакладна не давялося[28].

Калі адбыліся арышты грамадаўцаў? — Яны адбыліся ўночы з 14 на 15 студзеня 1927 года, на праваслаўны Новы год[29].

Які лік грамадаўцаў быў арыштаваны ў тую наканаваную ноч? — На ўсёй Заходняй Беларусі ў трагічную для беларускага народа ноч было арыштавана 3584 асобы.

Хто з паслоў Грамады быў арыштаваны? — Былі арыштаваныя: Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла і Валошын. Сабалеўскі, даведаўшыся аб арыштах, завязаўшы галаву бінтамі, наняў рамізніка з Вільні ў Ландварава[30], там сеў на цягнік і махнуў у Гданьск, дзе праседзеў да адкрыцця польскага Сейма, і тады прыехаў у Сейм і зложыў дэкларацыю, што ён парваў поўнасцю з Грамадою ды ўвайшоў у Сялянскі саюз[31].

А хто з цэнтра Грамады быў арыштаваны? — З цэнтра арыштаваныя: Луцкевіч, Астроўскі, Акінчыц, а. Коўш і Бурсевіч.

З ліку ўсіх 3584 асоб колькі былі пацягнутыя да адказнасці? — Усяго 36 чалавек[32]!

Як гэта можна паясніць, што з такой вялікай колькасці арыштаваных усяго толькі 36 асобам прышлося адказваць? — Гэта сведчыць, што Грамада ў цэлым не была камуністычнай, як гэта хочуць некаторыя зрабіць. Бо польскі ўрад не пашкадаваў бы беларусаў, і астрогаў таксама хапіла б у Польшчы.

На які тэрмін былі засуджаныя паслы і іншыя працаўнікі цэнтра? — Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла і Валошын — на 12 гадоў цяжкай турмы: Акінчыц, юрысконсульт Грамады, — на 6 год цяжкай турмы; Бурсевіч, сакратар Грамады, — на 8 год цяжкай турмы.

Каго польскі суд апраўдаў? — Луцкевіча, Астроўскага і а. Каўша.

Як зрэагавала беларускае грамадства на такі прысуд? — Беларускі народ увесь быў у жалобе праз доўгія гады. Што ж да апраўданых, дык не толькі беларускае грамадства, але і жыды ды частка палякаў праз доўгія гады пры сустрэчы не віталіся з імі, лічылі нягодным учынкам, асабліва ў дачыненні да Астроўскага. Як факт, жонка аднаго з іх не магла перажыць гэтае ганьбы і адабрала сабе жыццё[33].

Ці засуджаны цэнтр Грамады адбыў прысуд? — Не. У студзені 1930 года польская прэса пісала, што Тарашкевіча з Грудзёндзскага астрога прывезлі ў Вільню на суд. Але гэта была мана. Ніякага суда не было. Тарашкевіча перавезлі на Лукішкі на жаданне Астроўскага, які меў надзею, што ён, Астроўскі, перацягне Тарашкевіча на свой шлях — шлях службы палякам. Пасля некалькідзённых перамоваў Тарашкевіч катэгарычна адмовіўся ад усіх ганебных прапановаў Астроўскага. Аднак польскі ўрад, каб выправіць сваю памылку ў адносінах да Грамады і ўсяго беларускага народа, нягледзячы на няўдачную місію Астроўскага, пастанавіў звольніць цэнтр Грамады з астрогу.

Увесну 1930 года былі звольненыя Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Акінчыц і Бурсевіч. Не быў звольнены пасол

Валошын[34]. Усе вышэй менаваныя, апрача Акінчыца, зараз жа пасля звальнення перайшлі ў Савецкую Беларусь.

Я не магу знайсці прычыны, чаму некаторым хочацца зрабіць правадыроў Грамады ў вачох нашага маладога пакалення і ўсяго свету камуністамі. Сёння ёсць жывыя сведкі, якія прабылі з Тарашкевічам і Мятлою ў Грудзёндзскім астрозе і якія цвердзяць, што ані Тарашкевіч, ані Мятла не толькі не належалі да ЦК КПЗБ, але нават ніколі не былі запрошаныя на паседжанні ЦК як госці.

Закранаючы справы партыі «Стронніцтво Хлопске»[35], я маю на мэце выясніць вялікія недакладнасці ў папярэдніх артыкулах, змешчаных у «Бацькаўшчыне». У той самы час, як адбываліся арышты грамадаўцаў, адбыліся арышты і лідараў «Стронніцтва Хлопскего». На жаль, толькі двух лідараў памятаю прозвішчы: Хамінскі[36] і Галавач. Хамінскі ўцёк у СССР, нават з жонкай, а Галавача, якога я знаў з 1922 года, арыштавалі[37]. Цверджанне сп. Лаўрыновіча, што Галавач быў віцэ-старшынём Грамады, узятае з паветра[38].

У канцы 1930 года Тарашкевіч ехаў з Менска ў Гданьск праз Усходнюю Прусію. На польска-нямецкай мяжы, у Тчэве, яго арыштавала польская паліцыя. Адбылося следства, і суд пакараў Тарашкевіча 15 гадамі цяжкой турмы. За гэтую справу ў СССР арыштавалі Хамінскага з ягонай жонкай, закідаючы ім, што яны былі агентамі польскага ўрада. Іх абаіх расстралялі. Але і гэтым разам Тарашкевічу не давялося доўга быць на астрожным пайку, бо ў 1932 годзе бальшавікі выменялі яго на другога беларуса — Францішка Аляхновіча, які з 1926 года быў высланы на Салаўкі на 10 год.

Нельга абмінуць несправядлівасці пра а. Абрантовіча (прафесарам ён ніколі не быў)[39]. Ён быў патрыётам сваёй Бацькаўшчыны, і дзеля гэтага польскі ўрад, каб пазбавіцца яго, дамогся ў Рыме, каб яго выслалі місіянерам. Рым згадзіўся, і ў 1924 годзе а. Абрантовіча хіратанізавалі ў епіскапа ды накіравалі ў Харбін (Манчжурыю)[40]. У 1939 годзе а. Абрантовіч прыехаў у сваю бацькаўшчыну ў Наваградак і за два дні перад прыходам бальшавікоў ад'ехаў у Львоў, дзе ён меўся адведаць мітрапаліта Шаптыцкага. Далейшы ягоны лёс няведамы. Праўдападобна,

бальшавікі арыштавалі яго ў Львове. Гэтак загінуў вялікі сын нашага народа.

1927 год быў вельмі цяжкі. Засталася шэрая маса, без правадыроў, пыталася сама ў сябе: што далей? Бо тая эліта, якая засталася ў Вільні, ды тыя, што вярнуліся з Прагі з дыпломамі ў кішані, немаведама чаму не пайшлі да народа, не перанялі ўсіх добрых здабыткаў, прыдбаных перад і ў часы Грамады.

Можна назваць эстэтамі, беларучкамі каго хочаш. Але не трэба быць самому ў некалькі разоў горшым.

Калі Тарашкевіч быў эстэтам, дык ён быў толькі для сваіх. Палякам ён не толькі наступаў на мазоль, але нават на горла. Аднак некаторыя «героі» праз усё сваё жыццё наступалі толькі сваім братам у Вільні і па-за ёю.

1927 год быў, магчыма, найсумнейшым годам. Да гэтага падыходзілі выбары ў польскі Сейм, якія вымагалі кансалідацыі ад усяго народа, а яе не было. Бо ў канцы 1927 года выявіў сваё аблічча камуністычны актыў. А да гэтага дайшла з-за кратаў Лукішак астроўшчына, якая мела мінімальны працэнт сваіх прыхільнікаў.

На 4 сакавіка 1928 года былі назначаны выбары ў польскі Сейм, а на 11 сакавіка — у Сенат. Няможна моўчкі прайсці ля факта, што не знайшлося людзей, якія маглі б злажыць дзяржаўнага выбарнага спіска[41]. Дзеля гэтага пачалі ўкладаць лакальныя спіскі.

І так, на частцы Віленшчыны склалі выбарныя спіскі Сялянскі саюз і Хрысціянская дэмакратыя[42]; па Лідскай акрузе кандыдавалі Я. Станкевіч з Валынцом; па Наваградскай акрузе — «Змаганне» № 39 і «Грамада» № 40. На грамадаўскім спіску былі ўсе чатыры паслы, якія сядзелі на Лукішках пад следствам і якіх наваградская выбарная камісія не зацвердзіла. Спісак № 41 складаўся з Астроўскага і Чатыркі. Трэба адцеміць, што Астроўскі таксама сядзеў на Лукішках, аднак камісія яго зацвердзіла[43]. Яшчэ быў спісак камуністычны, і нават у Сенат. Сялянскі саюз злажыў спісак толькі ў Сенат[44]. Кандыдатам быў св. пам. В. Рагуля, які быў засуджаны наваградскім судом на 2 гады цяжкага астрога і сядзеў у Наваградку.

Вынік галасавання ў Сейм 4 сакавіка для палякаў быў неспадзяваным. Яны чакалі, што з ліквідацыяй Грамады ўсё, што

завецца беларускім, занікне, а рэшта перакінецца на палана-фільскую астроўшчыну. Нягледзячы на розныя махінацыі, «Змаганне» атрымала каля 400 тысяч галасоў[45], і гэтым было выбрана трох паслоў: Стагановіч, Дварчанін і Гаўрылік. Вялікім правалам для камуністаў было галасаванне ў Сенат, дзе ўсе свае галасы змаганцы аддалі на кандыдата Сялянскага саюза св. пам. сенатара В. Рагулю. Камуністычны кандыдат у Сенат атрымаў смешную колькасць галасоў. За гэтую паразу камуністаў быў зняты з пасады сакратара КПЗБ Баранавіцкай акругі нейкі Кандрацюк, якога бальшавікі хітра выдалі польскай паліцыі.

Трэба моцна шкадаваць і глядзець літасцівымі вачыма на тых людцоў, якія, абсалютна не знаючы справы, стараюцца ачарніць не толькі адзінкі, але і ўвесь народ. Чым яны кіруюцца, будучыня нам скажа.

Каб было зразумелым для ўсіх, я пастараюся дакладна гэтак высветліць справу. Трэба адрозніваць паслоў «Змагання» ад пасольскага клуба «Змаганне», бо гэта асобныя дзейнікі. З трох паслоў «Змагання» Гаўрыліка я мала знаў, бо толькі ў канцы 1927 года пазнаўся з ім. На мяне ён зрабіў уражанне патаемнага чалавека. З Дварчаніным я служыў у царскай арміі ў часе Першай сусветнай вайны. Гэты чалавек быў адданы целам і душою свайму народу. Стагановіча знаю ад 1905 года, калі я, як дарослы юнак, з ім, хлапцом, пад кіраўніцтвам В. Рагулі праводзілі рэвалюцыйную дзейнасць на Наваградчыне. Я яго лічыў і лічу адным з самых сумленных старых змагароў за свой народ. Гэты чалавек перажыў царскія нагайкі, бальшавіцкую ЧК, польскую дэфензіву, астрогі, зноў НКВД, і ён не паддаўся нашым ворагам, а застаўся палымяным абароннікам таго, што так дарагое нашаму народу, — БНР.

У канцы сакавіка 1928 года адкрыўся пленум новага польскага Сейма. Амаль з першага дня пачаліся перамовы бадай усіх беларускіх паслоў аб злучэнні ў адзін клуб. У гэтых перамовах прымалі ўдзел: «Змаганне», Сялянскі саюз і Хрысціянская дэмакратыя. У гэтых перамовах амаль не было вялікіх супярэчнасцяў. Здавалася, што яны хутка дойдуць да пазітыўнага выніку. Што праўда, Гаўрылік са «Змагання» часта не з'яўляўся на паседжанні. Пазней выявілася, што

ён вёў перамовы з Валынцом, які прайшоў па спіску разам з Я. Станкевічам, і Грэцкім. Гэты апошні прайшоў на Пінскай акрузе па спіску ўкраінскім[46]. Іхныя скрытныя гутаркі і пастановы не прылучацца да агульнага клуба знявечылі ўсе перамовы аб задзіночанні. Уваход Валынца і Грэцкага ў клуб «Змаганне» не прынёс клубу нічога добрага, а грызню і сваркі. Як пазней сталася ведама ад пасла Ярэміча, камуністычная фракцыя і карэспандэнт ТАСС[47] нейкі Барскі сказалі Гаўрыліку, Валынцу і Грэцкаму за ўсякую цэну не дапусціць да задзіночання. Чым гэта ўсё скончылася б, калі б не арыштавалі Стагановіча, цяжка сказаць. Досыць таго, што Валынец і Грэцкі выяўлялі сваё задавальненне з гэтага факта. Астаўшыся адзінокім, Дварчанін вельмі рэдка наведваў паседжанні Сейма. Сядзеў у Вільні ды займаўся навуковай працай[48]. Адсутнасць Дварчаніна і Стагановіча на тэрэне Сейма дала магчымасць іншым тром, г. зн. Валынцу, Гаўрыліку і Грэцкаму, поўнасцю падпарадкавацца камуністычнай фракцыі і выконваць ейныя дырэктывы.

Пасля 7-месячнай адсутнасці Стагановічу, што вярнуўся на тэрэн Сейма, дзе ўжо поўнасцю панавала здрадніцкая атмасфера, цяжка было пеpажыць гэта, і ён, абмеркаваўшы з Дварчанінам тагачасны стан, зрокся пасольскага мандата. Месца Стагановіча заняў Крынчык са Слонімшчыны, кандыдат са спіска «Змаганне» № 39, які ў кароткім часе паклікаў сваіх «герояў» на сакратароў пасольскіх клубаў у гарадах і мястэчках Заходняй Беларусі. Дварчаніну, застаўшыся аднаму, не вельмі прыемна было супрацоўнічаць са сваімі ворагамі (гэтак ён іх часта называў), і ён хутка пасля Стагановіча меўся зрачыся пасольскага мандата, але ягоны намер не здзейсніўся, бо, даведаўшыся аб тым, Крынчык выклікаў у Вільню двух адданых сакратароў (Асіпчыка з Берасця і Сіняка-Хмару з Пінска), пайшоў з імі на памяшканне Дварчаніна, і там пад пагрозаю пісталетаў змусілі Дварчаніна застацца на месцы, г. зн. паслом. Чытач можа папытацца: нашто гэта было рабіць? Бо калі б Дварчанін зрокся мандата, то на спіску «Змагання» не было б кандыдата, і такім чынам клуб «Змаганне» страціў бы аднаго пасла. Тут неабходна адцеміць, што пазней, на працэсе паслоў «Змагання» ў Менску ў 1933 годзе ў актах абвінавачвання Двар-

чаніну быў закід, што ён ухіляўся ад дырэктываў камуністычнага цэнтра, але яго змусілі іх выконваць. Гэта азначала, што ён, Дварчанін, нібы працаваў з немцамі, за што дастаў 10 год Салаўкоў.

Польскі Сейм з выбараў 1928 года лічыўся левым сеймам, бо на 444 паслоў ББСУ мела 124 паслоў. Пілсудскаму, які з сацыяліста стаўся фашыстам, такі склад Сейма быў косткай у горле, і ён увесну 1930 года распусціў Сейм ды паарыштоўваў шмат паслоў, у тым ліку ўвесь клуб «Змаганне», г. зн. Дварчаніна, Гаўрыліка, Валынца, Крынчыка і Грэцкага, а таксама ўсіх сакратароў пасольскіх клубаў па гарадах, якія фактычна былі вокам КПЗБ і мелі нагляд нават над паслом Дварчаніным ды кіравалі ўсёю камуністычнаю работай. Віленскі суд засудзіў усіх 5 паслоў на 8 год кожнага: сакратароў — на меншыя тэрміны.

У жніўні 1932 года польскі ўрад пагадзіўся замяняцца вязнямі з бальшавікамі. Гэтак Польшча аддала бальшавікам Гаўрыліка, Дварчаніна, Валынца, Крынчыка, Грэцкага і пасла Грамады Валошына, які сядзеў у Ракавецкім астрозе[49]. Бальшавікі выдалі палякам такую ж колькасць ксяндзоў. Як ведама, пасля 13-месячнага пабыту ў БССР усе паслы былі засуджаныя на 10 гадоў Салаўкоў.

Ёсць у нашага народа прыказка: хто не шануе чужога, не будзе мець свайго. Гэта праўда. Калі я не буду шанаваць іншую асобу, як я магу мець сам пашану ад другіх?

Нам можа паслужыць за прыклад Паўдзённая Амерыка, дзе адбываюцца перманентныя рэвалюцыі і збройныя паўстанні толькі дзеля таго, што там няма пашаны адзін да аднаго. А з другога боку, возьмем французаў: колькі гора, бяды і слёз прынёс Напалеон свайму народу! А спрабуйце сказаць французу штось нядобрае пра яго, будзеце мець сабе найгоршага ворага.

Усім ведама, што Грамада рабіла памылкі, але ў параўнанні да таго, што зроблена было добрага, тыя памылкі нязначныя, і іх не варта ўспамінаць. На маю думку, вялікаю памылкаю грамадаўскіх паслоў было тое, што пакінулі свой народ і пайшлі ў няведамае, аддаўшы яго на ласку розных прайдзісветаў. Прагракаваць, што было б, каб яны засталіся з народам, — цяжка. Адно можна пэўна сказаць, што рознага колеру «лідарам» не

было б месца, а ўвесь народ пайшоў бы шчыльнымі радамі да мэты, вызначанай 25 Сакавіка, — БНР.

Ніяк нельга абысці моўчкі злосную і несправядлівую дапіску ў «Бацькаўшчыну» Янкі Станкевіча аб змаганцах. Вышэй я падаў дакладна, хто быў з спіска «Змагання» пасламі, а хто быў у пасольскім клубе «Змаганне». Мне няведамы намеры Я. Станкевіча, чаму ён замест Валынца, з якім у 1928 годзе па тым самым спіску прайшоў у Сейм, напісаў якогась Верамея. Ды наогул, у Сейм ад беларусаў такога прозвішча ніколі не было[50]. Трэ меркаваць, што гэта зроблена сумысля, бо, закідаючы ўсім змаганцам амаральнасць, не выпадала пісаць прозвішча таго, з кім у 1928 годзе кумаваўся ў часе выбарнай кампаніі[51]. Калі ўдумацца ў Я. Станкевіча дапіску ў «Бацькаўшчыне», то насоўваецца думка, які няшчасны наш народ — нават на сваіх прадстаўнікоў не здолеў выбраць маральных людзёў, а нейкіх зладзеяў-ашуканцаў і прыблудаў. Божа мяне барані: я не збіраюся бараніць Я. Станкевічага кампрата па спіску, якога Я. Станкевіч знаў вельмі добра перад 1929 годам як ворагакамуніста, аднак маральнасць Я. Станкевіча дазволіла яму сядзець за адным сталом і абмяркоўваць выбарныя справы. Бараню таго, каго знаю ад шмат гадоў як вернага сына свайго народа і прадстаўніка БНР з 1918 года. Не памылюся, калі аддам пахвалу Дварчаніну за ягоную працу, карысную народу.

Калі пісаць, дык трэба пісаць праўду, а не тое, што асабіста карыснае, бо перакручваць гістарычныя факты, як гэта было ў «Бацькаўшчыне» ў артыкулах «Святло і цені Грамады» і «Праўда аб Грамадзе», даюць карысць толькі нашым адвечным ворагам.

# ЯКОЮ МЕРКАЮ МЕРАЕШ, ТАКОЮ ТАБЕ АДМЕРАЮЦЬ!

Артыкул Я. Станкевіча «На бакох "Успамінаў" В. Рагулі», што друкаваўся аж у трох нумарох «Бацькаўшчыны» ў траўні г. г.[1], выклікаў у нашым грамадстве вялікае абурэнне, а нашым ворагам даў матэрыял біць па нашым вызвольным руху. Так разумее гэта кожны беларус.

Не ведаю, чым кіраваўся гісторык Я. Станкевіч, пішучы гэты «гістарычны», ні на чым не апёрты, не згодны з праўдаю артыкул. Адносна ягоных закідаў у бок «Успамінаў» і асобы св. пам. В. Рагулі ўжо забіралі і яшчэ пэўна забяруць голас тыя, што знапі пройдзены ў карысць нашага народа жыццёвы шлях сенатара.

Я тут хачу спыніцца на той частцы артыкула, дзе Я. Станкевіч паказвае сябе як героя часоў, калі на ягоных уласных плячох ззялі залатыя пагоны афіцэра царскай арміі, а на шапцы — трохкаляровы расійскі сцяг. Як былы жаўнер, не афіцэр, я хачу тут здэмаскаваць хворыя выдумкі Я. Станкевіча.

Перадусім неабходна адцеміць: згодна з вайсковым уставам старой царскай арміі, кажны ваеннаабавязаны пасля 24-гадзіннай адсутнасці лічыўся дэзертырам і падлягаў палявому суду.

У «На бакох "Успамінаў" В. Рагулі» Я. Станкевіч кажа, што ў маі — чэрвені 1917 г. ён самадумам пакінуў свой полк у Казані і на месяц з гакам прыехаў на Беларусь, каб прачытаць рэферат у Магілёўскай брыгадзе ў Менску. Якраз у той час у Менску адбываўся вучыцельскі з'езд, на які, на прапанову Я. Станкевіча, брыгада выбрала дэлегацыю, каб прывітаць з'езд. У дэлегацыю быў выбраны і ён сам. На з'ездзе, паводле Я. Станкевіча, былі не толькі вучыцялі, але афіцэры і вайсковыя ўрадаўцы. Быў прысутны вайсковы ўрадавец В. Рагуля з выпіскаю Літоўскага Статута 1588 г.

Што Я. Станкевіч мог як афіцэр прыехаць з Казані ў Менск, гэтаму можна паверыць, бо ў напрамку фронту цягнікі не былі

кантраляваныя, усе ж цягнікі, што ішлі з фронту на ўсход, па прычыне шматлікага дэзертырства былі дакладна кантраляваныя спецыяльнымі вайсковымі аддзеламі, падпарадкаванымі камандаванню контрразведкі. Нават цягнікі Чырвонага Крыжа з параненымі і тыя падлягалі сувораму кантролю.

Аднак, нягледзячы на ўсе гэтыя вялікія перашкоды, Я. Станкевіч свабодна раз'язджаў на тысячы кіламетраў. Яшчэ больш дзіўна, што Я. Станкевіча пасля месячнага з гакам дэзертырства не пацягнулі да адказнасці ваеннага часу, а ўсяго толькі выклікалі ў жаўнерскі палкавы камітэт (дый тое, як Я. Станкевіч цвердзіць, толькі па прычыне даносу на яго з боку В. Рагулі). На гэтым выкліканні ўся справа і скончылася.

Я. Станкевіч думае, што ўжо няма людзёў з таго часу, дык можна выдумляць усё, але я напомню Я. Станкевічу, што да вайсковых жаўнерскіх камітэтаў належалі ўсяго толькі справы нутранога парадку, але ніяк не справы дэзертырства ці, яшчэ большае, абвінавачвання ў дзяржаўнай здрадзе.

Трэба толькі ўявіць, якія моцныя плечы меў Станкевіч у царскай арміі, калі яму як афіцэру расійскай арміі за такую даўгую дэзерцыю нават волас з галавы не ўпаў, у той час як іншых за тое самае расстрэльвалі, а ў найлепшым выпадку засуджалі на 12–15 год дысцыплінарнага батальёна[2].

Далей: што магло быць супольнага паміж вучыцельскім з'ездам і вайсковымі аддзеламі, ды яшчэ ў франтавой зоне. Да таго брыгады не мелі назоваў (Я. Станкевіч гаворыць аб Магілёўскай брыгадзе ў Менску), а толькі нумары.

У траўні месяцы 1917 г. ні адзін камандзір не меў права дазволіць няведамаму афіцэру чытаць рэферат пра Беларусь. У гэткае Я. Станкевічава геройства паверацы толькі дзеці, бо для іх гэта хіба і пісана: глядзеце, як той казаў, які я герой — не пабаяўся расстрэлу, а прыехаў у Менск не толькі ўсведамляць суродзічаў, а БНР тварыць, толькі вось мне ў гэтым В. Рагуля перашкодзіў.

На гэтым месцы неабходна запытаць Я. Станкевіча як афіцэра з вайсковым досведам, чаму затаіў свой вайсковы тытул на Бацькаўшчыне ў Другую сусветную вайну і не пайшоў служыць свайму народу ў Беларускую краёвую абарону, а пралез

у Беларускую самапомач? Бо там можна было за кошт галодных мінчукоў добра пажывіцца.

Неабходна адцеміць: адкуль вучыцельскі з'езд меў адрас Я. Станкевіча, калі Я. Станкевіч рэпрэзэнтаваў не Казанскі полк, а Магілёўскую брыгаду ў Менску?

Кажны чалавек не можа памятаць усё пражытае, але чамусьці Я. Станкевіч памятае толькі тое, што яму карысна. Старшыню палкавога жаўнерскага камітэта, нягледзячы на тое што Я. Станкевіч бачыўся з ім амаль штодзённа ў беларускай сям'і, ён не прыпамінае. Ад сябе дадам, што Я. Станкевіч штовечара мусіў сустракацца са старшынёю ў афіцэрскім клубе, і таму напэўна памятае прозвішча, але, відаць, ёсць прычына, толькі Я. Станкевічу ведамая, каб не памятаць.

Няведама, з якою мэтаю Я. Станкевіч, пішучы злосную выдумку пра св. пам. В. Рагулю, уваткнуў ген. Сандэцкага[3].

Усё ад пачатку да канца злая хлусня. Як усяму, так і гэтаму мушу запярэчыць. Ген. Сандэцкага я знаю з 1914 г., калі ён камандаваў Маскоўскай ваеннай акругай. Гэта не дзівак у адносінах да прапаршчыкаў, як кажа Я. Станкевіч, гэта кат, якіх мала, і то не да прапаршчыкаў, а ў адносінах да «ніжніх чінов», жаўнераў і падафіцэраў. Прыехаўшы на перагляд палка, ён найменш 10–12 падафіцэраў «разжаловал» — пазбавіў звання. У гор. Серпухаве ён шашкаю адсек жаўнеру галаву, але я не чуў, каб афіцэры цярпелі здзекі ад яго. За ягоныя зверствы ў адносінах да жаўнераў яго перавялі камандуючым Казанскай вайсковай акругі, дзе ў першых днях Лютаўскай рэвалюцыі жаўнеры вывелі яго ў бялізне, босага на рэчку Каму і на лёдзе замучылі на смерць[4]. Так было, а не як кажа Я. Станкевіч, што ген. Сандэцкі пісаў у прэсу, што ён не паляк і, нягледзячы на гэта, яго як паляка замучылі. Ува ўсіх рэвалюцыях, акрамя бальшавіцкай, першыя 2–3 дні адбываюцца самасуды, далей арышты і суды.

Цяпер бы я хацеў сказаць аб дзіўным раздваенні асобы Я. Станкевіча ў перыяд 1916–1917 г. У артыкуле «На бакох "Успамінаў" В. Рагулі», як мы бачылі вышэй, Я. Станкевіч апісвае сваю героіку на расійскім баку расійска-нямецкага фронту. У кнізе ж Я. Найдзюка «Беларусь учора і сяння»[5] ў апісанні

палажэння на нямецкім баку гэтага самага фронту ў гэтым часе, на бачыне 161 чытаем: *«16.1.1916 г. нямецкі фельдмаршал Гіндэнбург выдаў загад аб тым, што беларуская мова мае аднолькавыя правы з іншымі краёвымі мовамі як у публічным, грамадскім жыцці, так і ў жыцці культурным ды асветным»*. Далей, тамсама на бач. 162: *«Найвыдатнейшымі беларускімі дзеячамі ў тую пару ў Вільні былі браты Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі, др. інж. Вацлаў Іваноўскі, кс. Ул. Талочка і Я. Станкевіч. Яны дбалі аб беларускай працы ў Вільні і Заходняй Беларусі і выступалі за межамі. Так, прыкладам, беларуская дэлегацыя з Вільні брала ўдзел у красавіку месяцы 1916 г. у канферэнцыі народаў Расіі ў Стакгольме»*.

Я думаю, што не ўсім Бог мазгі пераараў, усе памятаюць, як у пачатку верасня месяца 1915 г. нямецкая армія заняла ўсю Заходнюю Беларусь і фронт устабілізаваўся аж да заканчэння вайны. Якім цудам мог быць у ліку беларускіх дзеячаў у Вільні ў 1916 годзе Я. Станкевіч, калі ў гэтым самым годзе Я. Станкевіч — афіцэр царскай арміі, з залатымі пагонамі, на словах вучыў жаўнераў, як бараніць дом Раманавых і Расійскую імперыю?

Справа простая. Як відаць з прадмовы сп. Я. Найдзюка да кнігі «Беларусь учора і сяння», гэтую інфармацыю аб самім сабе падаў аўтару кнігі не хто іншы, як сам Я. Станкевіч. Як той казаў, калі не праз пярэднія дзверы, дык хоць ад кухні, але ў гісторыю ўлез. Герой па абаіх баках таго самага фронту[6].

Для Я. Станкевіча не існуе агульнаграмадская праўда, гэтак як не існуюць, не існавалі сыны нашага народа, якія не шкадавалі свайго жыцця для вызвалення свайго народа з няволі. У яго не было і няма панад яго самаго аўтарытэтаў, толькі таго ён паважае, хто ідзе на яго павадку і яму не пярэчыць.

Нельга не ўспомніць пра Крывіцкае навуковае таварыства імя Ф. Скарыны[7] і выдаванне Я. Станкевічам «Веды». Я. Станкевіч дазнаўся, што ў Нью-Ёрку ёсцека друкарня, уласнік якой польскі князь Друцкі-Любецкі за якоесьці абяцанне з боку Я. Станкевіча дарма згадзіўся друкаваць «Веду», а Я. Станкевіч са сваіх суродзічаў, якія прыязджалі ў Амерыку, тут жа ў порце пабіраў па 10, 15, 20, 25 даляраў на тую самую «Веду», за тое, што данай асобе быў высланы Беларуска-Амерыканскім

Згуртаваннем у ЗША[8] (да якога належаў і Я. Станкевіч) ашуранс*. За ўвесь час існавання Крывіцкага навуковага таварыства імя Ф. Скарыны ў Нью-Ёрку не было падана да грамадскага ведама праз прэсу аб ягоным фінансавым стане. Калі б нехта, акрамя Я. Станкевіча, звярнуўся да польскага князя з якою-колечы просьбаю, Я. Станкевіч ачарніў бы яго так, як ачарніў В. Рагулю за ягоных некалькі словаў горкай праўды аб Я. Станкевічу ў «Успамінах». Гэтакая праўда, мараль, справядлівасць Я. Станкевіча.

Тыя, што чыталі артыкул Я. Станкевіча «На бакох "Успамінаў" В. Рагулі», пытаюцца, чаму дагэтуль Я. Станкевіч маўчаў і не вылазіў са сваімі закідамі супраць В. Рагулі: была ж не адна нагода палажыць на лапаткі як палітычнага дзеяча В. Рагулю? Калі б гэта была праўда, Я. Станкевіч, напэўна, не маўчаў бы ўжо даўно.

Цяперака, раззлошчаны тым, што В. Рагуля здэмаскаваў ягоную сувязь з палякамі (у прыватнасці, з Кіртыклісам) у часе другіх выбараў у польскі Сейм у Заходняй Беларусі, Я. Станкевіч ужыў усе сродкі, каб памёршаму ў магілу ўбіць асінавы кол, намочаны ў дзёгаць. Пры гэтым ён засмуродзіў увесь наш вызвольны рух 1920–1939 гадоў у Заходняй Беларусі.

Гэта называецца мараль прафесара, доктара Я. Станкевіча.

* Ашуранс (ад франц. *assurance*) — страхоўка.

# У АБАРОНУ «УСПАМІНАЎ» В. РАГУЛІ

Нельга пакінуць без адказу артыкул Янкі Станкевіча «На баках "Успамінаў" В. Рагулі» («Бацькаўшчына», № 18 (404) 4 траўня 1958 г., № 19 (405) 11 траўня 1958 г., № 20 (406) 18 траўня 1958 г.).

Адказ мусіць быць даны дзеля таго, што, хочучы быццам выявіць праўдзівую гісторыю і ведаючы, што мёртвыя яму не запярэчаць, Я. Станкевіч у сваёй крытыцы «Успамінаў» св. пам. Васіля Рагулі — былога беларускага пасла і сенатара — несумленна перакручвае здарэнні, падтасоўвае вытрымкі з «Успамінаў», не могучы запярэчыць — замоўчвае карысныя для В. Рагулі факты, а ўсё гэта з мэтаю ачарніць памяць аўтара «Успамінаў».

З Васілём Рагулем я пазнаёміўся ўлетку 1905 г. Мне было 15 год. Пасля гэтага нашыя шляхі часта зыходзіліся. У 1922 г. я прымаў удзел у зацверджанні кандыдатуры В. Рагулі на пасла. У 1928 г., будучы паслом польскага Сейма, я ізноў спатыкаўся з сенатарам В. Рагулем. І ўрэшце, у 1930 г. мы спаткаліся з ім у віленскай турме на Лукішках.

Ведаю яго як справядлівага, сумленнага чалавека, які, раз стаўшы на беларускі грунт, не заламаўся, не здрадзіў і, калі прыйшлося, пайшоў за сваю нацыянальную дзейнасць у турму. Знаю я і Янку Станкевіча з ягонай дзейнасцю і таму бяру голас у гэтай справе.

Я не буду шмат спыняцца над апісаннем Я. Станкевічам падзеяў перад 1922 г. Ён тут проста ломіцца ў адчыненыя дзверы, даказваючы, якім «истинно русским» і «русіфікатарам» быў В. Рагуля. Тым часам у «Успамінах» В. Рагуля сам кажа, што быў русафілам да 1922 г. Скажу адно, што, крыжуючы В. Рагулю за гэта, Я. Станкевіч для іншых знаходзіць поўнае вытлумачэнне, бо, апісваючы вучыцельскі з'езд у 1917 г., кажа: *«Удзельнікі з'езда*

*за малымі вынняткамі былі беларусы. Іхнае варожае дачыненне да справы свайго народа выясняецца іхным маскоўскім узгадаваннем. Найменей тры гады хлопца або дзяўчо русіфікавалі, ды без ніякага супроцьдзеяння, у пачатнай школе, пасьлей чатыры гады ўзмоцнена русіфікавалі ў Вучыцельскім семінару, дзе вучні былі ў бурсе, а хто лучыў, як В. Рагуля, у Вучыцельскі інстытут, дык і там. Ды і з невялічкімі выняткамі беларускае (з пахаджэння) вучыцельства як звычайных пачатных школаў, так і вышшых пачатных школаў, было абмаскалена; гэта былі запраўдныя янычары. Але, з другога боку, вучыцялі ўсіх пачатных школаў у Беларусі былі беспасярэднімі расткамі беларускага этнаграфічнага карэння, каторым было галоўна сялянства; дзеля таго пры далейшым развою руху ім адчыняліся вочы, і яны, узноў з малымі выняткамі, усвядоміліся»* («Бацькаўшчына», № 18 (404)).

Дык вось, усвядоміўся пасля 1922 г. і В. Рагуля, і ў гэтым «беларускім этнаграфічным карэнні» ўбачыў бы Я. Станкевіч прычыну прыходу В. Рагулі ў беларускі рух, калі б запраўды шукаў праўды, а не імкнуўся апэцкаць чалавека.

Я. Станкевіч кажа, што, *«вучачы да 1920 г. у школах Беларусі, ён (В. Рагуля) быў русіфікатарам»*. А хто з настаўнікаў таго часу, працуючы па прафесіі, не быў мімавольным «русіфікатарам»? Ці былі беларускія школы? Дый сам Я. Станкевіч выступаў тады, як сам кажа, як прыхільнік «тэрытарыяльнай аўтаноміі». Чаму Я. Станкевіч, які сцвярджае, што ў войску было шмат беларусаў, не зарганізаваў беларускіх вайсковых аддзелаў, як гэта зрабілі Рак-Міхайлоўскі, І. Дварчанін, кап. Ярушэвіч[1] і інш.?

*«Ён (В. Рагуля) 24 гады свайго жыцця аддаў на русіфікацыю Беларусі»*, — кажа Я. Станкевіч. Да 1922 г. В. Рагуля працаваў настаўнікам не 24, а 13 год (гл. «Успаміны»).

Няпраўдай з'яўляецца, што з матэрыялістычных меркаванняў, як цвердзіць Я. Станкевіч, В. Рагуля выставіў сваю кандыдатуру на пасла ў 1922 годзе. Я прымаў удзел у паседжанні Наваградскага камітэта, якое адбылося ў памяшканні Друцкага-Падбярэскага (пры Троіцкай вуліцы ў Наваградку, што пры паляках была перайменавана ў вуліцу Міцкевіча). На гэтым паседжанні В. Рагуля быў канчаткова зацверджаны як кандыдат. Беларуская інтэлігенцыя Наваградчыны верыла

В. Рагулю і не ашукалася. Пасольскі мандат В. Рагулі не быў нейкім незаслужаным падарункам яму з боку беларускага руху. Дзякуючы актыўнай агітацыі В. Рагуля атрымаў для беларусаў у Наваградчыне 4 мандаты[2].

*«Але русафілам Рагуля заставаўся і паслей»*, — цвердзіць Я. Станкевіч. Доказы ягоныя смеху варты:

1. *«Не выступаў супроць расейцаў»*. Зусім зразумела, бо для Заходняй Беларусі ў той час галоўным ворагам былі акупанты-палякі, а расейцы сядзелі як мыш пад мятлою, баючыся, што іх, як эмігрантаў, палякі выкінуць на ўсход.

2. *«У прамове 25 чырвеня 1925 г. В. Рагуля 7 разоў успомніў расейцаў»*. Усе сем разоў расейцы былі ўспомненыя пры пераліку нацыянальных мяншыняў у Польшчы[3].

3. «...*Прызнаецца, што, будучы беларускім паслом, ён быў прыхільнікам Усходу»*. Несумленна выхапленая вытрымка, бо далей В. Рагуля піша: *«Здавалася, што там будуецца "Беларускі дом". Пакуль бальшавікі былі слабыя, беларусы чуліся гаспадарамі на сваёй тэрыторыі»* («Успаміны», балонкі 54–55), і далей: *«У тое, што на ўсходзе арганізуецца запраўды беларуская дзяржава, у якой самы беларусы будуць гаспадарамі, верыў не толькі адзін Тарашкевіч і ягоныя сябры. У гэта паверылі нават некаторыя сябры Урада Беларускай Народнай Рэспублікі на эміграцыі, у Чэхіі. Частка з іх даверліва пераехала ў БССР, дзе ўсе яны пагінулі ў засценках ГПУ, або ШИЗО (Штрафной изолятор) у канцлагерох»* («Успаміны», балонка 59)[4].

Калі б Я. Станкевіч з мэтаю ўстанаўлення праўды чытаў прамову В. Рагулі з 25 чырвеня 1925 г., ён знайшоў бы там не толькі 7 разоў успомненых расейцаў, але і нацыянальна-незалежніцкае становішча В. Рагулі; ён убачыў бы, што прамова гэтая з'яўляецца сфармуляваннем праграмы Грамады ў сялянскім пытанні ў пачатковы перыяд яе тварэння, і, можа, не называў маніяй велічча цверджанне В. Рагулі аб тым, што ён (В. Рагуля) падрыхтаваў грунт для буйнага росту Грамады сваёю перадвыбарчай і пасольскай агітацыяй. Я скажу, і кожны жыхар Наваградчыны, які памятае тыя часы, пацвердзіць гэта. Так! В. Рагуля падрыхтаваў гэты грунт сваімі вострымі прамовамі на мітынгах, кажучы: *«Бярэце косы і вілы, ганеце ляхаў за Буг*

*і забірайце сваю зямлю»*[5]. За гэтыя якраз прамовы 27 лютага 1928 г. В. Рагуля атрымаў ад польскага суда 2 гады цяжкай турмы (а Я. Станкевіч пасля паславання атрымаў ад польскага ўрада працу ў Варшаўскім універсітэце).

Тое, што В. Рагуля ў «Успамінах» не піша шмат аб дзейнасці Сялянскага саюза, служыць за падставу Я. Станкевічу называць гэтую арганізацыю «блізу супоўнай фікцыяй». Гэтая арганізацыя, аднак, выдавала газету «Сялянская ніва»[6]. Ведаю, што ад імя беларускага сялянства Сялянскі саюз складаў мемарыялы ў Лігу Нацыяў у справе беларускай нацыянальнай меншыні ў Польшчы[7], а таксама прымаў удзел у выдаванні «Natio»[8] — інфармацыйнага бюлетэня, што выходзіў у ангельскай, французскай і нямецкай мовах з мэтаю інфармавання заходняга свету аб палажэнні нацыянальных меншыняў у Польшчы.

*«Чытаючы Рагулевы "Успаміны" пра самога сябе, у людзей можа зрабіцца даймо, калі не пра дзеяльнасць ягоную, дык прынамся пра дзейнасць»,* — піша Я. Станкевіч.

У «Успамінах» знойдзем якраз шмат фактаў з дзейнасці В. Рагулі: перадвыбарчая агітацыя ў 1922 г. з паданнем мясцовасцяў, дзе ён выступаў, сеймавыя выступленні (18 прамоваў у абароне беларускіх інтарэсаў), удзел ад Беларускага пасольскага клуба ў працы зямельнай камісіі ў Сейме, старшынства ў Клубе (хіба бяздзейнага Клуб не выбраў бы за старшыню?), змаганне з гаспадарчымі непарадкамі ў Наваградскім польскім самаўрадзе і г. д. Усё гэта, сп. Я. Станкевіч, факты, а факты — рэч упартая. Іх можна замоўчваць, як гэта вы робіце, але іх немагчыма запярэчыць. З усяго гэтага Я. Станкевіч прызнае толькі, што ў перадвыбарчай агітацыі ў 1922 г. В. Рагуля *«карысна выдзяляецца сярод бальшыні іншых кандыдатаў, але ў гэтым не гэтулькі ягоная заслуга, колькі віна гэтае бальшыні»*. Добрае ж пасведчанне выстаўляе Я. Станкевіч беларускаму адраджэнскаму руху, аб якім так крыкліва дэкламуе ён у пачатку свайго артыкула.

Пішучы свае «Успаміны» 30 год пазней і толькі з памяці, не маючы архіўных матэрыялаў, В. Рагуля мог памыліцца, адносячы арышты грамадоўцаў на Каляды 1925 г., але і Я. Станкевіч не дакладны, калі кажа, што яны адбыліся Калядамі 1926 г.

У сапраўднасці арышты грамадоўцаў адбыліся 14 студзеня 1927 г., г. зн. у тыдзень пасля праваслаўных і ў 3 тыдні пасля каталіцкіх Калядаў.

Адносна Вайсковай камісіі, якую В. Рагуля памылкова называе Найвышэйшаю Вайсковаю радаю, у «Успамінах» гаворыцца: *«Частка Урада БНР пераехала спачатку ў Вільню, адтуль у Коўню, а потым у Чэскую Прагу, дзе і прабывала да канца Другой сусветнай вайны. Другая частка, на чале з А. Луцкевічам, зрабіла ўгоду з палякамі ды пад іх крыльцам арганізавала ў Лодзі Найвышэйшую Вайсковую Раду. Яна праіснавала да канца польска-савецкай вайны»* («Успаміны», бал. 12).

Нападаючы на В. Рагулю за недакладнасці ў назове і месцы арганізавання Камісіі, Я. Станкевіч, аднак, не можа запярэчыць галоўнага — паланафільскасці гэтае арганізацыі, бо, як ён сам кажа, *«пачала яна арганізавацца ў Вільні і скончыла ў Менску ў 1919 г. З наступленнем бальшавікоў у ліпні 1920 г. Камісія пераехала ў Лодзь»* («Бацькаўшчына», 19 (405), 11 траўня 1958 г.). Я дадам, што наступалі бальшавікі супроць палякаў, якія былі ў Менску ў час арганізавання Камісіі (дзіўнае супадзенне, ці не праўда?), якая і выехала ў легіянерскім абозе ў Лодзь. Можа, А. Луцкевіч да вышэйменаванай Камісіі афіцыйна і не належаў, але хіба Я. Станкевічу не ведама, што А. Луцкевіч у гэтым часе рэпрэзентаваў паланафільскую плынь ува Урадзе БНР? Значыць, небеспадстаўны закід В. Рагулі, што А. Луцкевіч у гэтым часе быў паланафілам[9].

Непрыхільныя выказванні В. Рагулі ў «Успамінах» аб захоўванні А. Луцкевіча ў Заходняй Беларусі Я. Станкевіч адносіць на рахунак «асабістай крыўды Рагулевай» да А. Луцкевіча.

Тым часам сам Я. Станкевіч удзел А. Луцкевіча ў Грамадзе называе абмылкай. Адносна пераходу А. Луцкевіча ад Грамады да польскай угоды ў перыяд працэсу Грамады Я. Станкевіч кажа: *«Ані ў часе суду, ані пасля яго ніякіх пазнакаў гэтага* (пераходу да польскай угоды. — *А. С.) у А. Луцкевіча не было відаць»*. Гэтак піша Я. Станкевіч «На бакох "Успамінаў" В. Рагулі» ў 1958 г. Але 19 жніўня 1956 г. у № 34 (316) «Бацькаўшчыны» ён пісаў інакш: *«Астроўскі, Луцкевіч і Коўш дзеля таго былі апраўданыя польскім судом, што ў турме далі згоду на супрацу*

*з польскім урадам»*. Пытанне: калі Я. Станкевіч піша праўду — часам ці ніколі?

Далей. У № 49 (331) «Бацькаўшчыны» з дня 2 снежня 1956 г., гаворачы аб апраўданых у працэсе Грамады, Тарас Струг[10] піша: *«Што ж да апраўданых, дык не толькі беларускае грамадства, але жыды ды нават частка палякаў праз доўгія гады пры сустрэчы не віталіся з імі, лічылі нягодным учынкам, асабліва для Астроўскага. Як факт, жонка аднаго з іх не магла перажыць гэтае ганьбы і адабрала сабе жыццё»*.

Як ведама, у той час пазбавіла сябе жыцця жонка А. Луцкевіча.

Адносна Цэнтрасаюза, які В. Рагуля ў «Успамінах» акрэсліў як урадовую арганізацыю, Я. Станкевіч піша: *«Не Луцкевіч, але Р. Астроўскі пайшоў на польскую работу па ліквідацыі Грамады. Шкода, што А. Луцкевіч не адразу разабраўся ў Астроўскім, будучы з ім у Цэнтрасаюзе* (Ізноў абмыліўся Луцкевіч? Ці, можа, якраз выконваў данае палякам у турме забавязанне? — *А. С.*), *але ўсё ж такі разабраўся і разам з некаторымі іншымі арганізаваў грамадскі суд над Астроўскім»* («Бацькаўшчына», № 19 (405), 11 траўня 1958 г.).

Такім чынам, бачым, што ацэнка В. Рагулі ў гэтай справе супадае са становішчам іншых, а ў тым ліку і Я. Станкевіча, хоць ён і стараецца вачавідныя факты прыкрыць рознымі «абмыліўся» ды «не разабраўся». Дык хоць няма чаго звужаць справу да «асабістае крыўды Рагулевай». Калі шукаць праўду, дык робем гэта сумленна.

Цяпер апошняе, але не найменшае вагі: роля самога Я. Станкевіча ў беларускім нацыянальным руху Заходняй Беларусі.

Прыехаўшы з Прагі ў 1926 г., Я. Станкевіч ні да воднай з беларускіх групоўкаў не далучыўся. Гэты факт ён тлумачыць проста: не было да каго далучацца («Бацькаўшчына», № 20 (406), 18 траўня 1958 г.). Не верыце, дык прачытайце яшчэ раз «На бакох "Успамінаў" В. Рагулі». Вось гэта ўжо дык сапраўды манія вялічча. Паводле Я. Станкевіча, бачыце, грамадаўцы рабілі і нацыянальную работу, былі пракамуністы. Іншыя, калі верыць яму, нічога не рабілі. Ну, пэўне ж, *«не было відаць і работы Рагулевай»* («Бацькаўшчына», № 20

(406), 18 траўня 1958 г.). Грэх было б яе заўважыць, хіба што яна была б расійская.

Нават стрыечны брат кс. Адам Станкевіч — ідэйны беларус, добры хрысціянін і наагул чалавек высокіх маральных якасцяў, аб якім і В. Рагуля ў «Успамінах» прыхільна гаворыць як аб беларусе-незалежніку, — не мае аўтарытэту ў вачох Я. Станкевіча. Бачыце: «...*кс. Адам Станкевіч выбраў абмыльную дарогу ў арганізаванню працы. Замест знаходзіць людзей з розумам, энергіяй, воляю, ён падбіраў супрацаўнёў без гэтых якасцяў*» («Бацькаўшчына», № 20 (406), 18 траўня 1958 г.). І таму Я. Станкевіч, як чалавек, пэўна, абдораны ўсімі гэтымі якасцямі, з кс. Адамам Станкевічам разышоўся.

У перадвыбарчай кампаніі замест уліцца ў нацыянальную групоўку (калі не ў грамадоўскую), Я. Станкевіч складае сваю паланафільскую лісту і гэтым разбівае беларускія галасы на выбарах. Хочучы сёе-тое перахапіць і з грамадоўскіх галасоў, лісту сваю Я. Станкевіч падмацоўвае грамадоўцам Валынцом, які, прайшоўшы ў Сейм, пакідае Я. Станкевіча і далучаецца да «Змагання».

Вось таму В. Рагуля ва «Успамінах» і не мае нічога супроць Валынца, бо лічыць ягонае далучэнне да «Змагання», якое ўсё ж было беларускаю плынню, больш сумленным за Я. Станкевічава паланафільства.

Той факт, што ў выбарах 1928 г. былыя грамадоўцы аддаюць свае галасы неграмадоўцу В. Рагулю (але не паланафілам), сведчыць аб тым, што нават пры змене ў ідэалагічным настаўленні беларускіх масаў В. Рагуля дзякуючы сваім індывідуальным якасцям захаваў папулярнасць у народзе.

Я. Станкевіч кажа, што матэрыяльнай карысці з паславання не меў, але фальварак, нябось, у Ашмяншчыне купіў[11].

На закід В. Рагулі, што «Я. Станкевіч застаўся дзікім і не ўвайшоў ні ў адну беларускую групоўку» («Успаміны», с. 89), Я. Станкевіч адказвае дзіўна. Выглядае, што паколькі «арганістыя»[12], паслушныя кс. А. Станкевічу да выбараў, перасталі яго слухацца, калі сталіся самастойнымі па выбарах («Бацькаўшчына», № 20 (406), 18 траўня 1958 г.), дык яму, Я. Станкевічу, як той казаў, сам Бог вялеў тое самае зрабіць.

У Сейме замест сесці, як беларус, з беларускімі пасламі Я. Станкевіч прыладзіўся ў радох польскай санацыі BBWR (Bezpartyjny Blok Współpracy z Rzadem). Гэткае палажэнне вельмі выгаднае таму, хто, не хочучы падпарадкавацца дысцыпліне сваёй нацыянальнай групы, мае замер гандляваць сваім голасам.

Дарэчы, у «Бацькаўшчыне», № 34 (316) ад 19 жніўня 1956 г., Я. Станкевіч, пералічваючы паслоў «Змагання», не ўспамінае Крынчыка, але затое залічвае да змаганцаў нейкага Верамея. Вось жа і тут Я. Станкевічу дазволена блытаць. Ніякага Верамея ніколі не было паслом ад беларускага народа. Хіба ў радох BBWR, дзе сядзеў Я. Станкевіч, бо там было некалькі янычараў беларускага паходжання, якіх я двух знаў — гэта з-пад Нясвіжа Чарноцкі (ці Чарнецкі)[13] і з Лідчыны Шчэрба[14].

Я. Станкевіч цвердзіць, што гэта ён, а не Ф. Ярэміч, правёў у Сейме асігнаванне на будову будынка Наваградскай беларускай гімназіі. Ён, мусіць, забыўся, што справы на пленум Сейма ставіць адпаведная камісія. Як «дзікі», ён не мог належаць да камісіі, бо туды клубы дэлегуюць прадстаўнікоў[15]. У найлепшым выпадку Я. Станкевіч мог у прамове падтрымаць прапанову (хоць я гэтага не прыпамінаю сабе). Асігнаванне правёў Ф. Ярэміч, бо ён меў закулісныя сувязі з эндэкамі[16] і моцную падтрымку ўкраінскіх паслоў, якіх было 44[17].

Я. Станкевіч, які вінаваціць усіх у бяздзеянні, за час ад 1930 да 1939 г. можа пахваліцца ўсяго толькі заснаваннем Беларускага гаспадарскага звяза[18] (чатыры беларускія кнігарні). Ці не замала, як на такога энергічнага дзеяча?[19]

А калі ў польскім паходзе супроць усяго беларускага «*2.12.1936 г. было закрыта Таварыства беларускай школы, 4.12.1936 г. Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры, 20.08.1937 г. Саюз беларускіх настаўнікаў і нават паланафільскае Таварыства беларускае асветы, а 16.4.1938 г. Беларускі гаспадарскі звяз*» (Я. Найдзюк. Беларусь учора і сяння. Балонка 202), амаль 10 месяцаў даўжэй існаваў Звяз Я. Станкевіча за Таварыства беларускае асветы Астроўскага — Луцкевіча. Відаць, не шмат перашкаджаў ён палякам, калі цярпелі яны яго так доўга[20].

На гэтым можна было б скончыць мой адказ Я. Станкевічу на ягоную несумленную крытыку «Успамінаў» Васіля Рагулі.

Каб, аднак, хоць крыху астудзіць пракурорскі запал Я. Станкевіча, што ні ў кога не бачыць нічога добрага, я прыпомню яму хоць некалькі ягоных учынкаў, якія зрабілі шкоду нашаму нацыянальнаму руху:

Першае: Менск у часе Другой сусветнай вайны, калі галодныя людзі прыходзілі да катла Беларускай самапомачы, каб дастаць літр зупы, а ім адмаўлялі за тое, што яны нядобра гутарылі па-беларуску[21].

Другое: Заходняя Нямеччына — Выданне «Крывіцкага (беларускага) спеўніка», як плагіята, які выклікаў ва ўсіх вялікае абурэнне[22].

Трэцяе: Нью-Ёрк — Друкарская супалка, за якую даверлівыя плоцяць яшчэ і сёння, а ў грамадстве паўстаў недавер да інтэлігенцыі.

Чацвёртае: Нью-Ёрк — Выданне брашуры для радных БНР[23]. Гэты пасквіль зрабіў вялікую шкоду нашаму вызвольнаму руху. Нягледзячы на назоў, амаль ніхто з радных БНР амерыканскага сектара не атрымаў яе, даводзілася даставаць ад зарубежнікаў.

Пятае: Ува ўсіх артыкулах Я. Станкевіча, пісаных не толькі сёння, але і раней, нельга знайсці ніводнага чалавека, якога Я. Станкевіч лічыў ці лічыць за адпаведнага ў нашым грамадскім жыцці. А як наконт ягонай уласнай адпаведнасці ў нашым жыцці?

# МОЙ АДКАЗ Я. СТАНКЕВІЧУ

*«В. Рагулю з перад 1922 г. сп. А. Стагановіч хоча схаваць у агульнай масе беларусаў, што вучылі ў расійскіх школах у Беларусі»*, — кажа Я. Станкевіч у артыкуле «Колькі зацемкаў да Стагановічавай абароны *"Успамінаў"* В. Рагулі («Бацькаўшчына», № 35 (421) з дня 14 верасня 1958 г.)[1].

Не хаваю, але кажу, што настаўніцкая маса такою і была, вылучаючы адзінкі, ды і то пасля 1905–1906 гг. Шмат пазней, бо ў 1910–1911 гг. у Наваградак і ваколіцы прыехалі настаўнікі выпуску 1910 г. Нясвіжскай семінарыі, з якімі я пазнаёміўся і часта сустракаўся. Хоць я, як цвердзіць Я. Станкевіч, не разбіраўся, аднак ніякай розніцы між імі і св. пам. Васілём Рагулем я не бачыў, хіба толькі тую, што В. Рагуля меў рэвалюцыйныя імкненні, а яны іх не мелі.

Аднак, калі выбухла паўстанне супроць бальшавікоў на Случчыне, яны амаль усе прынялі ўдзел, і бальшыня з іх аддалі сваё жыццё за Бацькаўшчыну. Гэтыя звесткі пераказаў мне мой сваяк Ю. Лістапад, які пасля паўстання жыў у мяне і ў другіх сваякоў даўжэйшы час.

В. Рагуля пазней, бо ў 1922 г. у змененых абставінах прыйшоў у беларускі рух, але істотна не тое, хто калі прыйшоў, а тое, што ён рабіў у гэтым руху. Можна быць адраджэнцам ад пялёнкаў, ды так у гэтых пялёнках і вылысець.

Дыскусія аб тым, які быў В. Рагуля перад 1922 г., сёння не мае ніякага сэнсу. Беларуская інтэлігенцыя ведала ўсю мінуўшчыну В. Рагулі, калі пасылала яго ў 1922 г. у польскі Сейм бараніць беларускую справу. Сёння мы можам дыскутаваць толькі аб тым, які быў В. Рагуля як беларускі пасол, сенатар і наагул беларускі дзяяч з маменту, калі ён, у патрэбную часіну, на заклік беларускага руху стаў пад беларускі сцяг.

Што тычыцца гэтага перыяду, Я. Станкевічу, паміма моцнага жадання, не ўдалося ані высунуць супроць В. Рагулі, ані тым болей абгрунтаваць ніводнага паважнага закіду. Магчымасці

ж яму былі дадзеныя надзвычайныя, бо з ягоных пісанняў у гэтай справе ўжо, бадай, можна зрабіць кніжку, большую за «Успаміны» св. пам. В. Рагулі.

Каб падмацаваць свае довады русафільскасці В. Рагулі як беларускага пасла, Я. Станкевіч у «Зацемках» успамінае Праваслаўную духоўную семінарыю ў Вільні, у якой беларусаў русіфікавалі, і ставіць В. Рагулю ў віну, што ён з ёю «ня ходаўся». Я дадам, што ў Вільні была нават расейская гімназія, і хацеў бы пачуць, як жа іншыя беларускія паслы і дзеячы, улучна з Я. Станкевічам, што складалі сабою віленскі беларускі цэнтр, цярпелі ў сябе пад носам русіфікацыю ды «ня хадаліся» з ёю? Мажа, Я. Станкевіч, які ў пытанні Грамады так старанна абмяжоўвае ролю В. Рагулі да Наваградчыны, будзе паслядоўны і не стане звальваць віну на В. Рагулю за «няходанне» з русіфікацыяй у Вільні? У Навагрудку не было ніякіх расійскіх ані школаў, ані арганізацыяў, затое была беларуская гімназія, якой дапамагаў В. Рагуля.

Не трэба было вялікага патрыятызму, ані палітычнай адвагі, каб змагацца з расейцамі ў Заходняй Беларусі. Гэта было нават выгадна такім, як Я. Станкевіч: беларускі патрыятызм дэманстраваць, нічым не рызыкуючы.

Іншая рэч — палітычная мэтазгоднасць гэтага змагання ў перыяд, калі ўсе нацыянальныя меншыні ў Польшчы тварылі супольны фронт для супраціву паланізацыі. Расейцы да Блока нацыянальных меншыняў не належалі, але і супроць не выступалі, бо наагул палітычнай актыўнасці не выяўлялі[2]. Вострыя меры супроць зрусіфікаванага праваслаўнага духавенства пры наяўнасці камуністычнага бязбожніцкага наступу толькі ўзмоцнілі б аўтарытэт гэтага духавенства ў масах, актывізуючы яго палітычна. Беларусізацыя нашага духоўнага жыцця — справа нялёгкая. Гэта яшчэ і сёння, 35 гадоў пасля, мы бачым.

Я. Станкевіч прыкідваецца, што не разумее, што я меў на ўвеце, калі, на прызнанне самім Я. Станкевічам, што ў перадвыбарчай агітацыі 1922 г. В. Рагуля *«карысна выдзяляецца сярод бальшыні кандыдатаў»*, адказаў: *«Добрае ж пасведчанне выстаўляе Я. Станкевіч беларускаму адраджэнскаму руху»*.

Вось жа, калі В. Рагуля як адзін з актыўнейшых кандыдатаў беларускага адраджэнскага руху ў 1922 г., пасля беларускі пасол,

старшыня Беларускага пасольскага клуба і, урэшце, сенатар у «Успамінах» гаворыць аб заганах гэтага руху, дык выклікана гэта жаданнем перасцерагчы *«сучасных і будучых палітычных і грамадскіх дзеячоў ад паўтарэння памылкі іх бацькоў»*, як сам ён кажа ў прадмове да «Успамінаў».

Янка ж Станкевіч, апэцкаўшы ўсімі магчымымі спосабамі В. Рагулю, а з ім і шмат каго іншага з беларускіх паслоў, змушаны ўсё ж прызнаць, што В. Рагуля *«карысна выдзяляецца сярод бальшыні іншых кандыдатаў, але ў гэтым не гэтулькі ягоная заслуга, колькі віна гэтае бальшыні»*.

У чытача, зразумела, узнікае пытанне: што ж гэта за адраджэнскі рух, у якім бальшыня кандыдатаў не рухаецца, а «русіфікатар» В. Рагуля сваёю агітацыяй праводзіць аж трох кандыдатаў беларускага руху па сваёй акрузе[3]. Далей: як, не прыносячы шкоды беларускаму адраджэнскаму руху, Я. Станкевіч выясніць факт, што гэты самы В. Рагуля як пасол ачольвае Беларускі пасольскі клуб, выступае найбольш актыўным у абароне нацыянальнага шляху?

Стагановіча ў сваіх «Зацемках» Я. Станкевіч колькі разоў прадстаўляе як чалавека, што не разбіраецца, неадукаванага. Запраўды, лепей крыху здаровага глузду, чымся адукаванае бязглуздзе...

Калі я пісаў, што св. пам. В. Рагуля ў Наваградку на Замкавай гары гаварыў: *«Бярэце косы і вілы, ганеце ляхаў за Буг і забірайце сваю зямлю»*, Я. Станкевіч кажа, што гэта можа сказаць чысты дурань або правакатар, бо якое магло быць паўстанне ў мірны час. Вось жа, В. Рагуля дурнем і правакатарам не быў, а гэта гаварыў. Гэта было, калі ён заклікаў беларускае сялянства да супраціву польскаму асадніцтву, і за гэтае выступленне польскі суд засудзіў В. Рагулю на 2 гады турмы[4]. А час быў зусім не мірны. Закалоты паўстанцкага характару ўзнікалі то тут, то там бесперапынна на ўсёй Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне[5].

Што да А. Луцкевіча. На маё пытанне, у каторым са сваіх супярэчных цвярджанняў аб захоўванні А. Луцкевіча ў Заходняй Беларусі Я. Станкевіч піша праўду, ён цвердзіць у «Зацемках», што ў абодвух, бо, як кажа, *«даць згоду на штось, не значна ўжо і зрабіць тое. Можна, напрыклад, даць згоду на куплю хаты, а по-*

*тым пабачыць, што не варта купляць, і не купіць».* Вельмі трапнае параўнанне, запраўды Я. Станкевічава. Калі нехта адмовіцца ад куплі хаты, даўшы згоду купіць, ані хата, ані собснік на гэтым не будуць мець шкоды. А дадзенае Р. Астроўскім і А. Луцкевічам польскаму ўраду слова ў такі крытычны час зрабіла вялікую шкоду ўсяму беларускаму нацыянальнаму ўздыму і ім самім. Сотні вучняў беларускіх гімназіяў апынуліся за астрожнымі кратамі, дзе з іх зрабілі маскоўска-камуністычных янычараў, тысячы шукалі ратунку ў БССР і блізу ўсе загінулі ў засценках НКВД ці ў канцлагерох далёкай поўначы[6].

Далей Я. Станкевіч кажа: *«Я перакананы, што А. Луцкевіч, будучы ў турме, даў згоду на супрацу з польскім урадам. Найпраўпадобней, згода была няшчырая. Ці ляпей было б, каб А. Луцкевіч быў засуджаны, памяняны з бальшавікамі і зліквідаваны на Салаўках, як гэта сталася з С. Рак-Міхайлоўскім і іншымі?»*

Шчырая ці няшчырая, але згода была дадзеная. Калі мерыць паводле вынікаў яе, аб якіх я казаў вышэй, яна была, хутчэй, шчырая. А. Луцкевічу як лідару, ідэолагу нельга даравацъ гэтага. Перад тым як узначаліць Грамаду, А. Луцкевіч павінен быў абмеркаваць, спадзявацца на найгоршае і цягнуць цягло, як усе іншыя. Калі б засудзілі, меў бы ў сваім народзе вечную пашану. Прымусова ў Савецкі Саюз палякі нікога не выдавалі. А. Луцкевіч мог застацца, як гэта зрабіў Ф. Акінчыц[7].

Так, сп. Я. Станкевіч, больш чымся ганьба нашага часу — бараніць людзей, якія не ішлі простым шляхам з народам, а шукалі крутых вымашчаных сцежачак, не прадбачваючы, што яны вядуць да прорвы. Французскі маршал Петэн[8] узначаліў урад не дзеля таго, каб з Гітлерам супрацаваць, а каб бараніць свой народ ад знішчэння, аднак французскі суд засудзіў яго на вечнае зняволенне. Імрэ Надзь[9] зацяты камуніст, з яго загаду мадзяры сваіх братоў катавалі, аднак у станоўкі мамент, здрадзіўшы камуністычную партыю і пайшоўшы з народам, не толькі прабачэнне свайго мадзярскага народа, але і прызнанне ўсяго дэмакратычнага свету заслужыў.

Што да «Стагановічавага капыта»[10], дык, сп. Я. Станкевіч, мы людзі рознага складу. Праз усё сваё жыццё нідзе ні перад кім я не выракаўся свайго сялянскага паходжання, сваім капытом

мерыў народны шлях са сваім народам, не шукаючы польскіх лякеркаў, не блукаючы па чужых сцежачках, дзе гладзенька і лёгка ісці.

На мой закід, што за сваё пасланванне ў сейме Я. Станкевіч атрымаў працу ад польскага ўрада ў Варшаўскім універсітэце, ён адказвае, што польскі ўрад не прызначаў на ўніверсітэты, бо яны былі аўтаномныя. Паводле Канстытуцыі, фармальна — так, але няхай Я. Станкевіч мяне не пераконвае, што прыняцце яго на працу ў універсітэт адбылося без ведама і згоды палітычнага аддзела, калі сам ён кажа, што на інтэрвенцыю гэтага аддзела пасля ён быў пазбаўлены права дармовага праезду ў Варшаву на лекцыі. Палітычны аддзел даў працу — палітычны аддзел і пастараўся адабраць яе, стварыўшы немагчымыя абставіны для выконвання яе, калі ўважыў гэта за патрэбнае.

Я. Станкевіч называе маною маё цверджанне, што ягоная ліста ў выбарах 1928 г. у Сейм была паланафільская, як таксама і тое, што ён сядзеў у радох польскай санацыі. Так схарактарызаваў лісту Я. Станкевіча В. Рагуля ў «Успамінах», і я з гэтым згодзен. На эміграцыі ёсць людзі, што памятаюць тыя часы і могуць таксама гэта пацвердзіць. Калі Я. Станкевіч не сядзеў у радах польскай санацыі разам з колькімі беларускімі рэнегатамі, чаму не піша, з кім сядзеў: з польскаю лявіцаю, з украінцамі, жыдамі ці дзе яшчэ?

Што да асігнавання 250 тыс. злотых на заканчэнне будынка беларускай бурсы, бо так афіцыйна зваўся будынак (Я. Станкевічу, калі ён цвердзіць, што правёў асігнаванне, належала б гэта ведаць і паправіць мяне, калі я ў папярэднім артыкуле назваў яе будынкам беларускай гімназіі), мне ведама, што просьба будаўлянага камітэта з Наваградка была перасланая на рукі Ф. Ярэміча як тагачаснага старшыні Беларускага нацыянальнага клуба, а не Я. Станкевічу. Ведама таксама, што Ф. Ярэміч меў вялікія магчымасці гэта зрабіць, бо меў моцныя сувязі як сярод польскіх, так і няпольскіх паслоў.

Я. Станкевіч заклікае мяне, каб я давёў факт належання Ф. Ярэміча да асветнай камісіі і тое, што Ф. Ярэміч правёў асігнаванне. А ці не карацей было б, сп. Я. Станкевіч, вам заміж цягнуць цяганіну, зараз жа ў вашых «Зацемках» і давесці,

што вы гэта зрабілі, бо вось у такі і такі дзень паставілі справу на асветнай камісіі, тады і тады выступілі з сеймавай трыбуны ў справе асігнавання, а ў такі і такі дзень адбылося галасаванне? У Публічнай бібліятэцы ў Нью-Ёрку вы, напэўна, бываеце. Там ёсць справаздачы з сеймавых паседжанняў, бо ж адтуль узятыя прамовы В. Рагулі, надрукаваныя ў «Успамінах». Як гэта не выкарыстаць гэткую магчымасць, а замірж гэтага займацца пустаслоўнымі выкрутасамі?

*«Стагановіч цвердзіць, што я хвальварак, нябось, у Ашмяншчыне купіў»*, — кажа Я. Станкевіч у «Зацемках». Але, усё ж такі купіў, хоць дзірваноў і хоць у супалцы з іншымі. Дарэчы, пра Я. Станкевічавы супалкі сёе-тое ведае беларуская грамадскасць. *«Аказалася, адылі, што менаваная зямля была прызнана з гледзішча стратэгічнага "абаронным лесам" і яе забаронена было рабіць. А раты ў банк і падаткі плаціць вымагалі. А каб секвестратар не забраў вопратку і мэбляў, дык у Вільні я быў замэльдаваўшыся не там, дзе жыў, а на Літоўцы, у свайго галетнага знаёмага»* (Я. Станкевіч. «Колькі зацемкаў да Стагановічавае абароны "Успамінаў" В. Рагулі»).

Ці ж не слёзная гісторыя? Але затое які праўдзівы партрэт Я. Станкевіча, распісаны ягонаю собскаю рукою? Беларускі пасол, беларускі дзяяч, чалавек з вышэйшаю асветаю хаваецца па нелегальных кутках не за палітычную дзейнасць, але каб ухіліцца ад аплаты доўгу і падаткаў за купленую зямлю. Ён не хваліцца, ці ягоныя супольнікі таксама схаваліся, ці плацілі і за яго, і за сябе?

Гэтай гісторыяй Я. Станкевіч цалкам выявіў сябе: не саромячыся кружляў, як прадстаўнік беларускага народа ў польскім Сейме, такімі блытанымі сцежачкамі, якіх, па звычцы, не выракся нават тут, у Амерыцы, у сваіх нацыянальных арганізацыях. Быў ён *«дзікім паслом, застаўся дзікім дзеячом»*.

Прыкра, што вось такія спадары ўважаюць за магчымае для сябе апранацца ў тогу суддзяў і судзіць тых, што стаялі пад кожным паглядам вышэй за іх.

# АДКАЗ С. ПРЫТЫЦКАМУ

Беластоцкая «Ніва» пачынаючы ад 12 кастрычніка 1958 г. праз дзевяць нумароў друкавала ўспаміны Сяргея Прытыцкага[1] пад загалоўкам «У імя будучыні»[2]. Той, хто ведае мінуўшчыну і чытаў гэты «твор» Прытыцкага, бачыў, колькі нахабнага перакручвання, хлусні і падладжвання да сваіх валадароў у гэтага здрадніка беларускага народа.

Ад пачатку да канца С. Прытыцкі ўсё супрацьдзеянне беларускага народа былой Заходняй Беларусі польскаму бяспраўю прыпісвае Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). У сувязі з гэтым паўстае пытанне: як жа беларускі народ у 1922 годзе правёў у польскі Сейм і Сенат 14 сваіх прадстаўнікоў, калі КПЗБ утварылі толькі ў 1923 годзе, а камсамол — у 1924 г.? Аб гэтым Прытыцкі нічагусенькі не ўспамінае.

Прытыцкі ў успамінах піша: *«Кампартыя і камсамол Заходняй Беларусі вялі гераічную барацьбу. Пад іх лозунгам неаднойчы праходзілі стачкі і дэманстрацыі. Вось адзін са шматлікіх прыкладаў. Вясною 1933 г. на ініцыятыву камуністаў пачалася забастоўка тэкстыльшчыкаў у Беластоку»* («Ніва», 12.10.58). Гэтак, ініцыятарам КПЗБ і камсамолу трэба было аж 10 гадоў, каб арганізаваць забастоўку. А што ж рабілі праз гэты даўжэйшы час усе прафесіянальныя «рэвалюцыянеры» тыпу Прытыцкага? На працягу 10 гадоў яны выконвалі загад Масквы зрабіць усіх беларусаў камуністамі, не перабіраючы ані ў сродках, ані ў тактыцы. Акцыя была скіраваная асабліва на моладзь. Адных бралі за грошы, іншых угаворвалі, але ў бальшыні выпадкаў дзеялі правакацыйным спосабам. Падкідаючы камуністычную літаратуру, друкаваную ў Менску, бальшавіцкія агенты адначасна даносілі польскай паліцыі, якая без цяжкасцяў арыштоўвала пераважна малапісьменных вясковых хлопцаў. Іх польскія суды засуджвалі на 4–5—6–8 гадоў турмы. У астрозе з вясковых хлапцоў камуністычныя агенты, якія часта былі сумысля закінутыя Масквою ў польскія тур-

мы, без цяжкасцяў рабілі маскоўска-камуністычных янычараў. Аднак, перажыўшы па колькі гадоў у астрозе, не толькі былыя вязні, але і сотні вясковай інтэлігенцыі на волі зразумелі, да чаго і якімі метадамі імкнецца маскоўскі камунізм. Апынуўшыся на волі, ахвяры правакацыі пачалі мсціцца камуністам, выдаючы іх польскай тайнай паліцыі.

*«Становішча бастуючых тэкстыльшчыкаў... з кажным днём пагаршалася. Тады на дапамогу ім пад кіраўніцтвам камуністаў і камсамольцаў прыйшлі сяляне Беластоцкага і Гарадзенскага паветаў. Камуністы, камсамольцы і спачуваючыя на фурманках з чырвонымі стужкамі на дугах аб'язджалі вёскі і збіралі прадукты бастуючым тэкстыльшчыкам,»* — гэтак піша С. Прытыцкі («Ніва», 12.10.58).

Прытыцкі, пішучы пра гераізм камуністаў і камсамольцаў у Польшчы ў 1933 г., ведаў, што ягоныя выдуманыя гісторыі будуць чытаць у краі, дзе небяспечна пярэчыць узаконенай хлусні. Але калі б у нармальных абставінах аўтар звярнуўся з гэткім самахвальствам да старэйшага чалавека былой Заходняй Беларусі, дык яму адказалі б, што гэта фантазія хворай галавы. У 1933 г. польская паліцыя не толькі не дазваляла чырвоных стужак на дугах, але зрывала на вясельных урачыстасцях у маладых і дружкаў чырвоныя гірлянды, калі моладзь чапляла іх на сябе. Дапамога бастуючым была, але не ад камуністаў і камсамольцаў, а ад сваякоў і знаёмых работнікаў, што блізу ўсе паходзілі з вёсак Беласточчыны. Нечуваная жорсткасць польскай паліцыі да беларускага народа была выкліканая, з аднаго боку, польскім паўфашызмам, а з другога — маскоўскімі агентамі тыпу Прытыцкага, што сваімі правакацыйнымі дзеяннямі сведама выклікалі гэтую жорсткасць.

Прытыцкі піша, што гэта былі гэткія вёскі, куды *«прыязджалі ад 50 да 100 паліцыянтаў і размяшчаліся па хатах на 1–2 месяцы. У вёсцы абвяшчалі асаднае становішча. Сялянам забаранялі выходзіць з хатаў, ніхто не меў права выходзіць з вёскі і заходзіць у яе, а хто парушаў гэтае распараджэнне, у таго стралялі без папярэджання»* («Ніва», 12.10.58).

Гэткай прымітыўнай выдумцы былога правакатара не павераць нават ягоныя крамлёўскія гаспадары.

Прытыцкі піша — гэтым разам пра супраціў выконванню дзяржаўных павіннасцяў і супраціў камасацыі[3], — што інспіратарамі супраціву былі камуністы і камсамольцы.

Ёсць народная прыказка: дзе каня куюць, там жаба нагу падстаўляе. Гэтак і тут. Беларускае сялянства бунтавалася не таму, што камуністам так хацелася, а таму, што яго рабавалі, што сельскагаспадарчыя прадукты супраць фабрычных былі празмерна бязвартаснымі. Прыкладам, у Польшчы за адну скрыначку сярнікоў селянін траціў 5–7 яек, тым часам як у Амерыцы, скажам, за паўтара яйкі дастанеш дзесяць скрыначак. Апрача гэтага, у варожасці да польскага рэжыму з ягоным тэрорам выразна выяўлялася нацыянальная сведамасць сялянаў.

Што да камасацыі, дык тут таксама камуністы не мелі ніякага голасу, бо, калі б камасацыя праводзілася згодна з правам, дык сяляне не толькі не мелі б нічога супраць, але дзякавалі б за гэта. Аднак заміж пабольшання надзелаў зямлі камасавалі толькі тыя мізэрныя шматкі, што сяляне мелі да камасацыі, дый то пры гэтым часта вырэзвалі кавалкі абшарнікам з гэтак званых сервітутаў[4], якімі раней карысталіся сяляне. Гэта вось і была прычына супраціву сялянаў камасацыі.

*«Нацыянальна-вызвольная барацьба працоўных Заходняй Беларусі, узначаленая КПЗБ, не спынялася ні на адну хвіліну з моманту акупацыі Заходняе Беларусі і аж да моманту яе вызвалення»*, — кажа Прытыцкі («Ніва», 9. 10.58).

Тут Прытыцкі выказаў праўду, бо акупацыя Заходняй Беларусі пачалася ў 1919 годзе, а правакатараў Масква пачала засылаць на Заходнюю Беларусь у канцы 1923 года[5]. Да таго часу беларускі народ Заходняй Беларусі меў 514 пачатковых школаў, 7 гімназіяў, 2 настаўніцкія семінарыі, 14 прадстаўнікоў у польскім Сейме і Сенаце. Са з'яўленнем маскоўскіх агентаў бадай усё гэта, здабытае сваімі нацыянальнымі сіламі, было страчана. *«Асабліва разгорнутая і вострая была гэта барацьба ў 1926–1927 гадах, калі кампартыі ўдалося стварыць легальную арганізацыю — Беларускую Сялянска-Работніцкую Грамаду»*, — піша Прытыцкі (тамсама).

Нельга знайсці ніводнай дзялянкі дзейнасці беларускага народа ў змаганні з польскім паўфашызмам, каб «прафесіянальны

рэвалюцыянер» Прытыцкі не прыпісаў яе КПЗБ, камсамольцам, нават піянерам. У сапраўднасці ж утварэнне БСР Грамады адбылося ў чэрвені 1924 года, а сваю дзейнасць яна разгарнула ў канцы 1925 г. [6]. З прыходам да ўлады Пілсудскага ў траўні 1926 г. Грамадзе быў дадзены дазвол на легальную дзейнасць за тое, што Беларускі пасольскі клуб галасаваў у Сейме за пераварот, арганізаваны Пілсудскім. Што ж да дзейнасці Грамады ў 1927 годзе, дык такое не магло быць, бо з 14 на 15 студзеня 1927 года грамадаўскія паслы Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла і Валынец[7] былі арыштаваныя, а Сабалеўскі ўцёк у Гданьск. Паарыштоўвалі тады ўсіх і з галоўнай гасподы Грамады. Гэтае начы ў Заходняй Беларусі было арыштавана 3854 асобы. З гэтага ўсяго ліку польская пракуратура аддала пад суд 56 асобаў, а польскі суд прызнаў вінаватымі за дзейнасць у Грамадзе 37 асобаў.

Гэта агульна сцверджаны гістарычны факт, што дзейнасць Грамады ў Заходняй Беларусі з адначаснаю дзейнасцю і велізарнаю папулярнасцю літаратурнай арганізацыі «Узвышша» ў Усходняй Беларусі гэтак напалохалі Маскву, што апошняя звярнулася да польскага ўрада з прапановаю, каб супольна зліквідаваць небяспеку, што пагражала ад беларускага вызвольнага руху ў абедзвюх частках акупаванай Беларусі. На гэтую прапанову Польшча дала сваю згоду. З ведама Варшавы Масква пачала спешна высылаць у Заходнюю Беларусь сваіх правакатараў, што павялі падрыўную дзейнасць у гуртках Грамады, асабліва ўздоўж польска-савецкай мяжы, падбухторваючы сяброў Грамады на збройныя напады на польскія пагранічныя пасты. Гэткім спосабам Масква памагала Польшчы займець прычыны да здушэння росквіту Грамады, а сваіх янычараў тыпу Прытыцкага ўзнагародзіла цяпер у БССР цёплымі пасадамі, каб нішчыць далей усе праявы нацыянальна-вызвольнага імкнення беларускага народа.

Сёння ўвесь свет пераканаўся ў тым, што што ні камуністы, то брахун, што хлусня — гэта дэвіз камунізму, што без яго маскоўскі дэспатызм не праіснаваў бы 40 год. І калі Прытыцкі ілжэ не падсяючы, у гэтым дзіва няма. Але чаму ж Прытыцкі, пішучы сваё «У імя будучыні», не заікнуўся пра змаганне

беларускага народа ў 1926 г. супроць польскіх намаганняў увесці ў Праваслаўнай царкве новы стыль з мэтай далейшай паланізацыі?[8] У гэтым супраціве камуністы ніякага ўдзелу не бралі, а акцыя польскага ўрада, як ведама, поўнасцю праваліласяся. Дык хто ж тут змагаўся? Ці, можа, Прытыцкі яшчэ дапіша пра гэта?

Далей Прытыцкі піша: *«Неўзабаве пасля разгрому Грамады была створаная таксама легальная арганізацыя Беларускі Работніцка-Сялянскі Клуб "Змаганне"»* («Ніва», 19.10.58).

Перш-наперш, клуб не быў арганізацыяй. Два паслы Сейма твораць клуб, адзін не можа — ён завецца тады «дзікім». Клуб існуе датуль, пакуль не скончыцца пасольская кадэнцыя. Кадэнцыя скончылася — клубы не існуюць[9]. Клуб «Змаганне» быў створаны не неўзабаве пасля разгрому Грамады, як гэта піша Прытыцкі, а за 2 гады і 5 месяцаў пасля разгрому[10]. Да стварэння ж яго спрычыніўся акрэдытываны ў Варшаве маскоўскі карэспандэнт Барскі з дапамогаю сеймавага пасла ад камуністычнай партыі Польшчы Варскага-Варшаўскага. Стварыўся клуб яшчэ і таму, што Крынчык, які пераняў пасольскі мандат па Стагановічу, быў найвярнейшы служка Крамля. Прайшоўшы ў Сейм, Крынчык меў на сваім баку паслоў Валошына[11], Грэцкага, часткова Гаўрыліка. На загад Барскага Крынчык у 12 большых местах Заходняй Беларусі паадчыняў сакратарыяты пасольскага клуба «Змаганне», паклікаючы за клубавых сакратароў сваіх верных паплечнікаў са Слонімшчыны і Косаўшчыны: Зіняка-Хмару, Асіповіча-Асіпчыка, Міська, Барысёнка і васьмёх іншых, якіх прозвішчы цяжка сёння прыпомніць. Усім гэтым тыпам выдаваліся з савецкага пасольства ў Варшаве велізарныя грошы для праводжання камуністычнай агітацыі і пасольскіх мітынгаў. Найспрытнейшым з усіх сакратароў выявіўся С. Хмара. Будучы сакратаром клуба ў Пінску, ён поўнасцю падпарадкаваў сабе малапісьменнага Грэцкага, змушаючы яго блізу штонядзелі рабіць мітынгі і чытаць на іх камуністычныя прамовы, напісаныя Хмарам.

Прытыцкі цягне далей: *«Працоўныя Заходняй Беларусі пад кіраўніцтвам кампартыі з гордасцю адзначалі ўсе рэвалюцыйныя святы»*.

Але ж, камуністы адзначалі святы, але дзе? У глушы пушчаў далёка ад вока людскога развешваннем там чырвоных плахтаў. А дэманстрацыі адбываліся хіба ва ўяве Прытыцкага, які стараецца на свой камуністычны рахунак запісаць польскіх сацыялістаў і першамайскія святкаванні.

Прытыцкі хваліцца далей: *«Паспяхова ажыццяўляўся байкот выбараў (у 1935 годзе)»* («Ніва», 26.10.58).

Але, быў час, калі частка беларускай інтэлігенцыі глядзела на БССР як на сваю будучую незалежную дзяржаву. Аднак 30-я гады паказалі на чорную каланіяльную рэчаіснасць: тады якраз было ліквідаванае «Узвышша»[12] і іншыя нацыянальныя арганізацыі ды ўстановы, а крыху пасля — былыя паслы Грамады ды «Змагання». Сімпатыя ператварылася ў варожасць, і ў байкоце выбараў у Сейм і Сенат камуністы ніякага ўплыву не мелі. Беларусы байкатавалі выбары дзеля таго, што, паводле новага выбарчага закону, беларусы практычна не мелі права складаць сваіх спіскаў кандыдатаў[13]. Гэта і толькі гэта змусіла беларускі народ выказаць сваю варожасць да польскага бяспраўя.

Чаго толькі не вярзе Прытыцкі! У адной мясціне ён цвердзіць, што польская паліцыя страляла без папярэджання ў «падазроных» грамадзянаў («Ніва», 26.10.58). У іншых жа месцах хваліцца, што камуністы арганізоўвалі дэманстрацыі, у часе якіх забівалі войтаў і паліцыянтаў. Як жа разумець тады Прытыцкага? Паліцыя мела права страляць у кожнага грамадзяніна без папярэджання, але вось калі камуністы рабілі дэманстрацыі, забіваючы войтаў і паліцыянтаў, дык паліцыя не страляла ў камуністаў. Выходзіць, што камуністы ў Польшчы мелі асаблівыя правы — магчыма, гэта была ўзнагарода за нішчэнне беларускага вызвольнага руху?

Прытыцкі кажа далей: *«Цяжка апісаць усе жахі засценкаў польскай дэфензівы. Наўрад ці магла якая-небудзь ахранка ўва ўсім свеце, за выключэннем гітлераўскай, зраўняцца з ёю ў выдасканаленні і садызме катаванняў... Нездарма вышэйшыя польскія чыны ездзілі на вывучку да Гімлера*[14] *і Герынга*[15]*»* («Ніва», 26.10.58).

Я далёкі, каб бараніць зверствы польскай дэфензівы, якія сам перанёс у дваццатых і трыццатых гадах. Тады ў Нямеччыне

яшчэ не было Гітлера, а спосабы і метады катаванняў польская дэфензіва ўжо тарнавала, бо пераняла іх ад бальшавіцкага ЧК–ГПУ. Прытыцкаму, пэўна ж, ведама, як ведама цэламу свету, што за ўвесь час існавання камунізму ў СССР на дзясяткі мільёнаў засуджаных не знайшлося ніводнага чалавека, каб не прызнаўся вінаватым у злачынствах, якія ніколі не рабіў, а да якіх арыштаванага змушалі прызнацца ўдасканаленымі спосабамі фізічнага і маральнага катавання. Сваім часам Сталін сказаў, што ляпей расстраляць сто бязвінных, чымся выпусціць аднаго вінаватага.

Камунізм, толькі камунізм парадзіў спосабы і метады нішчэння дзясяткаў мільёнаў сваіх і чужых грамадзянаў. Першыя прозвішчы ў гісторыі генацыду 20-га стагоддзя: Ленін, Дзяржынскі, Сталін ды іхныя спадкаемцы Ягода, Яжоў і Хрушчоў[16].

Прытыцкі піша: *«У мяне, калі я пішу гэтыя радкі, перад вачыма паўсталі светлыя вобразы многіх таварышаў, якія аддалі свае маладыя жыцці за шчасце народа»*.

Прытыцкі ўсяго-наўсенькага называе чатырох таварышаў, па якіх пралівае слёзы. Калі б ён быў сумленным чалавекам, ён крывёй плакаў бы за свой замучаны бальшавікамі народ. Ён сказаў бы: у мяне паўстаюць сумныя вобразы тысячаў сыноў і дачок мае Бацькаўшчыны — дзяржаўных мужоў, пісьменнікаў, кампазітараў, артыстаў, журналістаў, навукоўцаў, святароў, настаўнікаў, работнікаў, сялянаў, якім забралі жыцці і здароўе на высылках і ў падвалах ЧК–ГПУ–НКВД–МВД–КГБ. Каб Прытыцкаму быў зразумелы ягоны ўдзел у нішчэнні свайго народа, варта прывесці яму дэмаграфічную статыстыку.

У 1897 годзе на Беларусі было 10 300 000 жыхароў. Пры ўласцівым Беларусі натуральным прыросце, калі б не было войнаў, у 1959 г. на Беларусі павінна было б быць 25 720 000 жыхароў. Адлічыўшы ад гэтага страты дзвюх войнаў і жыхарства тэрыторыяў, прысабечаных Расеяй або раздадзеных суседзям у парадку палітычных каншахтаў (Смаленшчына, Браншчына, Дзвіншчына), ды адлічыўшы таксама эміграцыю — беручы ўсё разам як страту 12 150 000 жыхароў, — на тэрыторыі сённяшняй савецкай Беларусі павінна было б налічвацца

13 570 000 жыхароў. Тым часам перапіс 1959 года даў сумны і жахлівы вынік... 8 мільёнаў. Дзе ж падзеліся больш за пяць з паловаю мільёнаў асобаў? Пра гэта ў Савецкай Беларусі ніхто не адважваецца ні пытацца, ні гаварыць, але пра гэта ведама цэламу вольнаму свету.

Прытыцкі, сам правакатар, стараючыся выклікаць у чытача абурэнне, наракае: *«Апроч катаванняў, дэфензіва шырака практыкавала засылку ў рады кампартыі правакатараў»*.

Бясспрэчна, паліцыя, як кажная паліцыя на свеце, старалася практыкаваць і гэты спосаб. Рабіла яна гэтак, аднак, не на пачатку існавання кампартыі, але пасля, калі ашуканыя агентамі Масквы маладыя хлопцы, адседзеўшы ў астрогах, паварочваліся дамоў, дык польскай паліцыі не лішне і трэба было засылаць правакатараў. Былыя ахвяры камуністычнага дурману самі выдавалі ў рукі паліцыі маскоўскіх агентаў, каб зліквідаваць іхную пагрозу.

На довад свайго цверджання я прывяду прыклад Наваградскага раёна, што мне больш ведамы, ды, напэўна, ведамы і Прытыцкаму, бо ён заве Наваградскі раён скамунізаваным. Падам таксама ведамыя яму прозвішчы тых, што працавалі ў польскай паліцыі, будучы ў кампартыі, ды тых, што парвалі з ёю і сталіся інфарматарамі польскай дэфензівы. Вось першая група з іх: Заіка-Моніч, Бушэйка, Гаўрош, Пронька-сын, Фурса, Любчанскі, Коршун; гэткую самую дзейнасць праводзіў і Зіняк-Хмара. Усе яны з прыходам бальшавікоў былі арыштаваныя (апрача Фурсы, што быў забіты ў лесе ўлетку 1939 г.). Усе яны немаведама дзе дзеліся, за выняткам Зіняка-Хмары, што нейкай цаной вытаргаваў сабе волю. Да другое групы да тых, што парвалі з камунізмам ды пайшлі на працу да польскай паліцыі, належалі: Дударэвіч, Раманюк, Грамыка, Яцкевіч і Турок. Да трэцяе групы належалі гадунцы кампартыі, што хадзілі са зброяй у руках па сваіх суседзях ды вымагалі золата ды амерыканскіх даляраў. Калі абрабавалі сялянаў і не было за што гуляць, дык пачалі красці ўсё і ўсюды: бульбу, хамуты, кавальскае прыладдзе, палячы адначасна цэрквы (Дальняя Рута[17]) і капліцы на могілках, а таксама будынкі сялянаў. Параніўшы аднаго селяніна, гадунцы кампартыі з пярэпалаху

павыдавалі адзін аднаго. З ліку 16 чатырох было засуджана на-смерць: Малец, Стасевіч, Гаўрош і Бахар; трох было засуджана на пажыццёвае зняволенне; рэшта атрымала ад двух да чатырох гадоў турмы. Вось да чаго даводзіла ўзгадавальніца кампартыя нясведамых вясковых юнакоў. Але ці можа забойца ўзгадаваць кагосьці іншага? Забойца ўзгадуе толькі забойцу — гэтак было ад пачатку камунізму і будзе аж да ягонага скону.

Чытаючы ўспаміны Прытыцкага, малодшы чытач (бо старэйшыя, бадай, усе выгубленыя на Беларусі) можа падумаць: вось якія цуды вырабляла КПЗБ на Заходняй Беларусі; без камуністаў палякі, напэўна, усіх беларусаў парабілі б палякамі, і не было б ніякага беларускага вызвольнага руху.

У сапраўднасці ж КПЗБ толькі разбіла беларускае вызвольнае змаганне. Нацыянальную сведамасць ды імкненне да незалежнага жыцця беларускі народ выказаў ужо ў 1917 г., на Усебеларускім кангрэсе, і 25 сакавіка 1918 г. абвешчаннем Беларускай Народнай Рэспублікі. Тое самае было таксама прадэманстравана ў Заходняй Беларусі ў часе выбараў у польскі Сейм у 1922 г. Затое ў выбарах 1928 г. заміж 14 сваіх прадстаўнікоў беларусы правялі толькі 11 якраз дзякуючы падкопным махінацыям КПЗБ. У акругах, дзе кампартыя мела найбольш уплыву, як піша Прытыцкі, — на Беласточчыне і Піншчыне — беларускія лісты кандыдатаў не былі нават і выстаўленыя[18]. Найяскравей, аднак, «папулярнасць» камуністаў сярод беларускага народа выявілася ў Наваградскай выбарчай акрузе, дзе ў сенат быў выстаўлены пракамуністычны спіс (кандыдат Іван Малец) і спіс Сялянскага саюза (кандыдат св. пам. Васіль Рагуля, што адбываў гэным часам двугадовы прысуд цяжкага зняволення). Зразумела, што пры такой сітуацыі Сялянскі саюз не праводзіў за свайго кандыдата ніякай агітацыі, а за Івана Мальца ўсе аркашы, роберты, дзёмкі, міцькі, веры кінулі ўсё: грошы, угаворы, а найбольш пагрозы. Ніштο, аднак, не магло збіць беларускіх сялянаў з нацыянальна-вызвольнага шляху. Яны аддалі ўсе свае галасы за таго, хто нага ў нагу ішоў разам з імі. Васіль Рагуля, на жаданне беларускага народа, пайшоў бараніць ягоныя правы з астрогу ў Сенат. Пракамуністычны кандыдат І. Малец, а разам з ім уся КПЗБ панеслі поўную пара-

зу, бо Малец атрымаў усяго-наўсенькага 259 галасоў. У выніку гэтай паразы верхаводы з КПЗБ выдалі ў рукі польскай паліцыі сакратара Баранавіцкага акруговага камітэта партыі нейкага Кандрацюка-Нікіцюка і, ахрысціўшы яго правакатарам, звалілі на яго ўсю няўдачу на выбарах[19].

На заканчэнне Прытыцкі зварачаецца да моладзі і кажа: *«Калі хочаце ведаць сучаснае, вывучайце мінулае. Цаніце цудоўнае жыццё, створанае вам камуністычнай партыяй і савецкай уладай. Памятайце, што яно дасталося нялёгка. За яго шмат праліта крыві, аддадзена нямала чалавечых жыццяў. Не разменьвайце ваша жыццё на дробязь. Яно даецца толькі адзін раз, і яго трэба пражыць сумленна, з максімальнай карысцю для сваёй радзімы, свайго народа. Не важна, кім хто з вас будзе, дзе яму давядзецца жыць, на поўдні краіны ці на далёкай поўначы, быць шахцёрам, аграномам, лётчыкам, мараком ці прафесарам, — скрозь і ўсюды сумленна выконвайце свой абавязак перад радзімай і народам, і яны скажуць вам дзякуй»*.

Усе народы свету, вывучаючы мінуўшчыну свайго краю, тварылі і твораць свае незалежныя гаспадарствы. Жыды, вывучаючы сваю гісторыю, пасля двух тысячагоддзяў стварылі сваю самастойную дзяржаву. Усе сыны і дочкі нашага народа, што вывучылі гісторыю сваёй бацькаўшчыны — Вялікага Княства Літоўскага — і прыйшлі да таго ж самага пераканання патрэбы аднаўлення сваёй страчанай дзяржаўнасці, — былі пазбаўленыя жыцця расійскімі акупантамі, на службе якіх Прытыцкі пражывае свой век.

*«Цаніце цудоўнае жыццё, створанае вам камуністычнай партыяй і савецкай уладай»*. А што ж было створана? Гібенне за Палярным кругам, на Варкуце, Салаўках, Ігарцы, у бязводным дзікім Казахстане і безлічы канцлагераў, куды, разлучыўшы з сем'ямі і адарваўшы ад прадзедаўскіх кутоў, паразвозілі вас крамлёўскія каланіялісты.

Але ж жыццё даецца чалавеку толькі адзін раз. Якім жа правам кампартыя пазбавіла жыцця мільёны сыноў і дачок беларускага народа? Гэтыя грамадзяне жылі сумленна для свайго народа, і за гэта, пры дапамозе гэткіх братапрадаўцаў, як Прытыцкі, маскоўскія акупанты паўсцілалі іхнымі касцямі дарогі ад Бе-

ларусі па далёкую дзікую Поўнач ды іншыя камуністычныя лагеры смерці.

Але дарма. Беларускі народ прайшоў саракагадовы шлях змагання з камуністычнымі народагубцамі і не сагнуў сваёй галавы перад дэспатамі дваццатага стагоддзя. Наш народ вёў і будзе весці змаганне, пакуль не адбудуе сваю вольную дзяржаву — тады ўсе здраднікі змушаныя будуць стаць перад народным правасуддзем.

# КАМЕНТАРЫ

## Успаміны пасла

Друкуюцца паводле публікацыі: Стагановіч, Аляксандар. Успаміны пасла // Запісы Беларускага інстытуту навукі і мастацтва. Вып. 32. Нью-Ёрк — Менск, 2009. С. 225–330.

[1] Вёска **Нясутычы** сёння знаходзіцца ў Наваградскім раёне Гродзенскай вобласці.

[2] **Васіль Рагуля** (1879–1955), беларускі палітык і грамадскі дзеяч, педагог. Да рэвалюцыі працаваў настаўнікам, быў перакананым працiўнікам беларускага руху. У 1922 г. яго абралі паслом у польскі Сейм як беларускага кандыдата. Пасольскія абавязкі выконваў у 1922–1927 гг., у 1928–1930 гг. — сенатар. Сябра Беларускага пасольскага клуба. Адзін з лідараў Беларускага сялянскага саюза. Падчас Другой сусветнай вайны быў бурмістрам у Дзятлаве. Пасля вайны — на эміграцыі: спачатку ў Бельгіі, пасля ў ЗША.

[3] **Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў** (эсэраў) — палітычная партыя, якая ўзнікла ў Расіі ў канцы 1901 — пачатку 1902 г. Ставіла за мэту экспрапрыяцыю капіталістычнай уласнасці, рэарганізацыю вытворчасці і ўсяго грамадскага ладу на сацыялістычных прынцыпах. Яе сябры лічылі галоўнай сілай рэвалюцыі сялянства, выступалі за сацыялізацыю зямлі.

[4] **Выбарская (Выбаргаўская) адозва** — адозва групы дэпутатаў 1-й Дзяржаўнай думы да грамадзянаў Расіі, выдадзеная 10 ліпеня 1906 г. Утрымлівала заклік адмовіцца ад выплаты падаткаў і службы ў войску на знак пратэсту супраць роспуску Думы. Дэпутатаў, якія падпісалі адозву, аддалі пад суд.

[5] Сам Рагуля пра сваю высылку ў Адэскі павет ніколі не згадваў. У біяграфічнай зацемцы, змешчанай у газеце «Сялянская ніва» ў 1926 г., пра гэты перыяд ягонай дзейнасці пісалася такім чынам: *«Будучы ў інстытуце* (Віленскім настаўніцкім. — *А. П.*) *і па сканчэнні яго прымаў удзел у рэвалюцыйным руху, за што і быў арыштаваны і пасаджаны ў Наваградскую турму ў 1907 годзе. Па выхадзе з турмы адзін*

*год не меў права быць вучыцелем і дзеля гэтага сядзеў дома на гаспадарцы»* (Сялянская ніва. № 1. 3 студзеня 1926. С. 2).

[6] **Вясковая грамада** (*сельское общество*) — найніжэйшая грамадска-адміністрацыйная адзінка ў дарэвалюцыйнай Расіі. Складалася з аднаго або некалькіх дробных паселішчаў, якія сумесна карысталіся пашамі і сенажацямі. Некалькі вясковых грамадаў складалі воласць. Вясковая грамада мела грамадскае кіраванне, якое складалася з вясковага сходу і вясковага старасты.

[7] **Меншавікі** — прадстаўнікі палітычнай плыні (фракцыі) у Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП) у 1903–1917 гг., з 1917 г. — асобнай палітычнай партыі. Былі супраціўнікамі бальшавізму, не прынялі кастрычніцкага перавароту 1917 г., мяркуючы, што Расія яшчэ не даспела для сацыялізму.

[8] **Спаскія казармы** — будынак у Яраслаўлі, прыстасаваны пад казармы ў 1886 г. з будынка XVIII ст., у якім раней месцілася мужчынская гімназія. Гісторыка-архітэктурны помнік сучаснага Яраслаўля.

[9] **Ігнат Дварчанін** (1895–1937), беларускі грамадска-палітычны і культурны дзеяч. У 1921–1925 гг. вучыўся ў Карлавым універсітэце ў Празе. З 1928 да 1930 г. быў паслом у польскі Сейм, уваходзіў у склад Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клуба «Змаганне». У жніўні 1930 г. польскія ўлады арыштавалі яго, а ў верасні 1932 г. пасля абмену вязнямі Дварчанін выехаў у БССР. Рэпрэсаваны бальшавікамі і расстраляны.

[10] ОЗОН — маецца на ўвазе **Лагер нацыянальнага аб'яднання** (*Obóz Zjednoczenia Narodowego*) — палітычная арганізацыя, якая ў прастамоўі называлася OZON. Афіцыйна паўстаў у лютым 1937 г. на даручэнне дыктатара Польшчы маршала Э. Рыдз-Сміглага (*Rydz-Śmigły*). Асноўнай мэтай, якая ставілася пры заснаванні лагера, было павелічэнне абароназдольнасці дзяржавы. У партыйнай прапагандзе ўзвышалася роля арміі і яе галоўнакамандуючага Рыдза-Сміглага. У дзейнасці арганізацыі прасочваліся таксама фашысцкія і антысеміцкія тэндэнцыі.

[11] **Вятка** — сёння горад Кіраў у рэгіёне Сярэдняе Паволжа (Расія).

[12] **Брэст** (*Brest*) — горад і порт на паўночным захадзе Францыі, на паўвостраве Брэтань.

[13] Грэцкім горад Салонікі стаў толькі ў 1923 г., калі яго адваявалі ў Асманскай імперыі ў выніку Балканскай вайны. У Салоніках (*Selanik* па-турэцку) нарадзіўся Кемаль Атацюрк.

[14] Маецца на ўвазе **Бізерта** — горад і порт на поўначы Туніса.

[15] **Вільгельм II Гогенцолерн** (*Wilhelm II*, Hohenzollern, 1859–1941), германскі імператар у 1888–1918 гг.

[16] Тагачасны кароль Грэцыі **Канстанцін I** (*Constantinus I*, 1868–1923, кароль у 1913–1917, 1920–1922), што паходзіў з дацкай дынастыі Глюксбургаў, быў жанаты з сястрою Вільгельма II Сафіяй. Апроч таго, ён скончыў вайсковую акадэмію ў Берліне, а ў 1913 г. атрымаў ад кайзера Вільгельма званне генерал-фельдмаршала нямецкай арміі.

Падчас Першай сусветнай вайны Канстанцін I стараўся трымацца нейтралітэту, хоць ягоныя сімпатыі былі на баку Нямеччыны і Аўстра-Венгрыі. Апазіцыю ў дзяржаве ўзначаліў прэм'ер-міністр Венізелас (*Βενιζέλος*), які выступаў за далучэнне Грэцыі да Антанты. Менавіта са згоды Венізеласа кааліцыйныя войскі ўвосень 1915 г. пачалі высаджвацца ў ваколіцах Салонікаў. Канстанцін I загадаў Венізеласу падаць у адстаўку, але той адмовіўся і сфармаваў у Салоніках Часовы ўрад нацыянальнай абароны, які дэ-факта прызналі краіны Антанты. У чэрвені 1917 г. Канстанцін I пад націскам дзяржаваў Антанты першы раз адрокся ад трона.

[17] **Аляксандр Керанскі** (1881–1970), расійскі палітычны дзеяч. У ліпені — кастрычніку 1917 г. — міністр-старшыня Часовага ўрада Расіі. Ад 1940 г. жыў збольшага ў Нью-Ёрку. У 1949 г. быў адным са стваральнікаў Лігі барацьбы за свабоду народаў СССР, якая ў 1951 г. далучылася да створанага пры ўдзеле ДзяржДэпартамента ЗША Саюза вызвалення народаў Расіі (СВНР). У верасні 1951 г. Керанскі вёў перамовы з прэзідэнтам Рады БНР Міколам Абрамчыкам і пераканаў яго ў тым, каб Рада БНР шчыльна супрацоўнічала з СВНР. Гэта, дарэчы, прывяло да першага крызісу ў Радзе БНР і адтоку шэрагу дзеячаў. Стагановіч у гэты час уваходзіў у кіраўніцтва Рады БНР і падтрымаў ініцыятыву Абрамчыка.

[18] Маюцца на ўвазе **Ахрыдскае возера** і **возера Прэсба**, размешчаныя сёння на сумежжы Албаніі, былой югаслаўскай рэспублікі Македонія і Грэцыі.

[19] **«Гоман»** — беларуская газета, якая выдавалася ў Вільні лацінкай і кірыліцай з лютага 1916 г. да канца 1918 г. Яе рэдактарамі былі Вацлаў Ластоўскі і Язэп Салавей (з сярэдзіны 1917 г.).

[20] Маецца на ўвазе грэцкі востраў **Керкіра** (*Κέρκυρα*) у групе Іянічных астравоў (заходняе ўзбярэжжа), які па-італьянску завецца Корфу (*Corfu*).

[21] Сантым — дробная манета, якая хадзіла ў Францыі да ўвядзення еўра ў 2002 г. 100 сантымаў складалі 1 франк.

[22] **Мікалай Лахвіцкі** (1867 (ці 1868) — 1933), расійскі вайсковы дзеяч, генерал-лейтэнант. Ад 21 студзеня 1916 г. — камандзір 1-й Асобнай пяхотнай брыгады, накіраванай на французскі тэатр вайсковых дзеянняў. Ад чэрвеня 1917 г. — начальнік Асобнай пяхотнай дывізіі, у якую ўвайшлі ўсе расійскія войскі ў Францыі (1-я і 3-я Асобныя пяхотныя брыгады). Да ліпеня 1918 г. быў камандзірам расійскай вайсковай базы ў Лавалі, актыўна займаўся стварэннем расійскага легіёна ў Францыі. Удзельнічаў у Грамадзянскай вайне ў Расіі на баку Белай Гвардыі, пасля паразы белых эміграваў у Парыж.

[23] Маецца на ўвазе вайсковы лагер **Ля-Куртэн** непадалёк ад французскага горада Лімож (Цэнтральная Францыя), ад якога да іспанскай мяжы досыць далёка.

[24] Магчыма, маецца на ўвазе **Іван Бяляеў** (1875–1957), расійскі вайсковы дзеяч, генерал-маёр. Удзельнічаў у Брусілаўскім прарыве, быў камандзірам артылерыйскай брыгады на Каўказскім фронце. З пачатку 1918 г. уступіў у Добраахвотніцкую армію, пасля паразы якой эміграваў у Балгарыю, пасля перабраўся ў Аргенціну і Парагвай. У Лацінскай Амерыцы займаўся вывучэннем культуры і мовы мясцовых індзейцаў.

[25] Маецца на ўвазе галоўнакамандуючы македонскім фронтам у Першую сусветную вайну.

[26] Відаць, маецца на ўвазе газета **«Последние новости»**, якая была адным з найгалоўнейшых органаў расійскай эміграцыі ў міжваенны час. Аднак жа гэтая газета стала выходзіць у Парыжы толькі ад 1920 г. (і выходзіла да 1940 г.), і, такім чынам, у 1919 г. А. Стагановіч аніяк не мог яе чытаць.

[27] Вёска **Скрыбава** цяпер знаходзіцца ў складзе Ваўкавыскага раёна, з-за вялікай адлегласці ў склад Сноўскай воласці (вёска Сноў уваходзіць у сучасны Нясвіжскі раён) уваходзіць не магла.

[28] Відаць, ідзецца пра горны масіў **Вагезы** (*les Vosges*) — нізкагор'е на паўночным усходзе Францыі, што выцягнулася ўздоўж мяжы з Нямеччынай.

[29] **Антон Луцкевіч** (1884–1942), беларускі нацыянальны дзеяч, адзін з галоўных ідэолагаў беларускага нацыянальнага руху. У 1918–1919 гг. быў прэм'ерам БНР. У міжваеннай Польшчы некаторы час быў нефармальным лідарам беларускага руху.

[30] **Канстанцін Езавітаў** (1893–1946), беларускі грамадска-палітычны і культурны дзеяч. Адзін з актыўных дзеячаў БНР, пасля 1921 г. адзін з кіраўнікоў беларускага руху ў Латвіі.

[31] **Яўген Ладноў** (? — пасля 1932), беларускі грамадска-палітычны дзеяч. У 1918 г. — ваенны міністр ва ўрадзе БНР, з снежня 1919 г. — міністр замежных спраў. У лютым 1919 г. урад БНР прызначыў яго сябрам, пазней старшынёй беларускай дэлегацыі на Парыжскую мірную канферэнцыю. Супрацоўнічаў з II аддзелам Генеральнага штаба Войска Польскага. Ініцыятар стварэння Беларускага дзяржаўнага камітэта вясной 1921 г. у Вільні. 10 траўня 1923 г. беларускае прэс-бюро распаўсюдзіла інфармацыю аб тым, што Я. Ладноў — правакатар, і рэкамендавала ўсім беларускім арганізацыям і дзеячам *«пазбягаць блізкага знаёмства з ім»*. У 1932 г. жыў у Францыі. Далейшы лёс невядомы.

[32] **Мікалай Юдзеніч** (1862–1933), расійскі генерал, адзін з кіраўнікоў белагвардзейскага руху на паўночным захадзе Расіі. Кіраваў няўдалым наступленнем 1919 г. белагвардзейскіх войскаў на Петраград.

[33] Польская марка — польская грашовая адзінка ад 1917 да 1924 г., да правядзення манетарнай рэформы і ўвядзення злотага.

[34] Пасля гэтыя Лядкі (цяпер у Карэліцкім раёне) сталі адным з цэнтраў камуністычнага руху на Наваградчыне. Інфармацыя пра наяўнасць там камуністычнай і камсамольскай ячэек і ажыццяўленне камуністычных акцыяў рэгулярна адлюстроўвалася ў справаздачах мясцовых паліцэйскіх органаў цягам усяго міжваеннага перыяду.

[35] **Фабіян Абрантовіч** (1884–1946), беларускі рэлігійны і культурна-грамадскі дзеяч, адзін з заснавальнікаў і лідараў Хрысціянскай дэма-

кратычнай злучнасці. У пачатку 1920-х гг. жыў у Наваградку, выкладаючы ў часова эвакуяванай у гэты горад Мінскай духоўнай каталіцкай семінарыі.

[36] **Андрэй Шаптыцкі** (1865–1944), выдатны дзеяч Грэка-каталіцкай царквы, мітрапаліт галіцкі і арцыбіскуп львоўскі ў 1901–1944 гг.

[37] Сёння вядома, што ў канцы верасня 1939 г. кс. Фабіяна Абрантовіча арыштавалі савецкія органы бяспекі, і больш за 5 гадоў ён правёў у вязніцах. Памёр ад катаванняў 2 студзеня 1946 г. у Бутырскай турме (Масква).

[38] **Юрка Лістапад** (1897–1938), беларускі нацыянальны дзеяч. Ад восені 1919 г. быў школьным інструктарам на Случчыне, ствараў беларускія школы, удзельнічаў у працы беларускіх нацыянальных арганізацыяў. Удзельнік Слуцкага паўстання 1920 г. Пасля ўцёк у Польшчу, у 1922 г. нелегальна вярнуўся ў Слуцк, працаваў настаўнікам, стыль-рэдактарам у Дзяржвыдавецтве БССР. Ад 1925 г. савецкія ўлады неаднаразова арыштоўвалі яго, быў расстраляны.

[39] Юрка Лістапад у 1933 г. перасяліўся ў Ржэў, у студзені 1934 г. у справе т. зв. Беларускага нацыянальнага цэнтра засуджаны на 8 гадоў, пакаранне адбываў у Бамлагу. 31 сакавіка 1938 г. яго прысудзілі да найвышэйшай меры пакарання, прысуд выканалі 5 чэрвеня 1938 г.

[40] № 16 на парламенцкіх выбарах 1922 г. меў выбарчы спіс Блока нацыянальных меншасцяў Польскай Рэспублікі, у які ўвайшлі асноўныя арганізацыі беларускай, украінскай, габрэйскай, нямецкай і расійскай нацыянальных меншасцяў.

[41] **Баляслаў Друцкі-Падбярэскі** (1894–1940 (?)), беларускі літаратар і лексіколаг, які паходзіў з княжацкага роду. У пачатку 1920-х гг. быў сябрам Віленскага БНК. У 1920-я гг. друкаваўся ў часопісах «Беларуская культура», «Беларускі радны», «Беларуская хата», газетах «Беларускае слова», «Беларускі дзень». Супрацоўнічаў з шэрагам паланафільскіх арганізацыяў. Падрыхтаваў і выдаў пад рэдакцыяй В. Грышкевіча першы беларуска-польскі слоўнік. У 1939 г. органы НКУС арыштавалі яго, загінуў без вестак.

[42] У лістападзе 1922 г. пасламі польскага Сейма абралі беларусаў Антона Аўсяніка, Сяргея Барана (Баранава), Уладзіміра Каліноўскага, Міхала Кахановіча, Васіля Рагулю, Сымона Рака-Міхайлоўскага,

Пятра Мятлу, кс. Адама Станкевіча, Браніслава Тарашкевіча, Сымона Якавюка, Фабіяна Ярэміча, сенатарамі — Вячаслава Багдановіча, Аляксея Назарэўскага і Аляксандра Уласава. Праз паўгода Уладзіміра Каліноўскага, пазбаўленага мандата за адсутнасць польскага грамадзянства, замяніў Павел Валошын. У 1923 г. Сяргея Барана арыштавалі за ўдзел у антыпольскай партызанскай дзейнасці, а Сымон Якавюк, каб пазбегнуць такога самага лёсу, уцёк у Літву. Мандаты двух апошніх паслоў так і засталіся для беларусаў страчанымі.

[43] **Радаслаў Астроўскі** (1887–1976), беларускі грамадска-палітычны дзеяч. У 1924–1936 гг. — дырэктар Віленскай беларускай гімназіі. Віцэ-старшыня Беларускай сялянска-работніцкай грамады ў 1925–1927 гг., дырэктар Беларускага кааператыўнага банка. У 1928–1936 гг. — актыўны прапагандыст супрацы заходнебеларускага нацыянальнага руху з польскімі санацыйнымі ўладамі. Падчас Другой сусветнай вайны актыўна супрацоўнічаў з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, у снежні 1943 г. — абраны прэзідэнтам Беларускай Цэнтральнай Рады. У верасні 1945 г. прыпыніў дзейнасць БЦР, але ў сакавіку 1948 г. на просьбу Міколы Шылы, Юрыя Сабалеўскага, Мікалая Сцяпанава і Васіля Рагулі аднавіў БЦР, што, як і Рада БНР (у якую ўваходзіў Аляксандр Стагановіч), лічыла сябе адзіным прадстаўніцтвам беларускага народа на эміграцыі. Ідэйны апанент Стагановіча на эміграцыі. Пасля вайны Р. Астроўскі жыў у Заходняй Германіі, Швейцарыі, Аргенціне, Брытаніі, ад 1962 г. — у ЗША. Пахаваны на Беларускіх могілках у Саўт-Рыверы згодна з тастаментам.

[44] **Беларуская сялянска-работніцкая грамада** (БСРГ) — масавая левая партыя, якая дзеяла ў Заходняй Беларусі ў 1925–1927 гг. Колькасць яе сябраў дасягала больш за 100 тыс. чалавек. У 1927 г. польскія ўлады ліквідавалі БСРГ.

[45] Маецца на ўвазе **Беларускі сялянскі саюз** (БСС) — заходнебеларуская партыя, створаная ў лістападзе 1925 г., кіраўнікі якой падкрэслівалі супярэчнасць інтарэсаў сялянства і гарадскога пралетарыяту. Фактычна спыніла сваё існаванне ў 1928–1929 гг., але афіцыйна не ліквідоўвалася, і нават у 1930-я гг. былыя лідары часам выкарыстоўвалі яе шыльду.

[46] **Беларуская хрысціянская дэмакратыя** — беларуская нацыянал-дэмакратычная партыя, паўстала ў 1917 г. як Беларуская хрысціянска-

дэмакратычная злучнасць. Яе заснавальнікамі і ідэолагамі былі беларускія каталіцкія ксяндзы. Пад назвай Беларуская хрысціянская дэмакратыя існавала з 1926 г. да 1936 г., калі рэарганізавалася ў Беларускае нацыянальнае аб'яднанне.

[47] Насамрэч 24 чэрвеня 1925 г. адбыўся афіцыйны падзел Беларускага пасольскага клуба на 2 часткі: Беларускі пасольскі клуб (паслы А. Аўсянік (у 1926 г. з клуба выйшаў), В. Рагуля, кс. А. Станкевіч і Ф. Ярэміч, сенатары В. Багдановіч, А. Назарэўскі і А. Уласаў) і Пасольскі клуб Беларускай сялянска-работніцкай грамады (паслы П. Валошын, П. Мятла, С. Рак-Міхайлоўскі і Б. Тарашкевіч). На прыхільнікаў Беларускага сялянскага саюза (В. Рагуля і Ф. Ярэміч) і Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (кс. А. Станкевіч) неафіцыйна падзяляўся ўжо новы Беларускі пасольскі клуб, але фармальнага афармлення ў выглядзе заснавання асобных фракцыяў гэта ніколі не набыло, тым больш што гэтыя дзве партыі ўзгоднена дзеялі не толькі на парламенцкім грунце, але і падчас правядзення пазапарламенцкай працы.

[48] Гэтае сцверджанне Аляксандра Стагановіча не зусім дакладнае. Беларускія парламентарыі сапраўды адразу пасля травеньскага перавароту 1926 г. пэўны час вагаліся, падтрымаць ім дзеянні Пілсудскага ці не, але ўрэшце, не атрымаўшы ад апошняга ніякіх канкрэтных абяцанняў, паслы абедзвюх беларускіх фракцыяў вырашылі ўстрымацца ад галасавання за кандыдатуру Пілсудскага на пасаду прэзідэнта Польшчы. Таксама ўсе беларускія паслы адзінагалосна выступілі супраць унясення зменаў у Канстытуцыю, якія пашыралі ўладу ўрада і прэзідэнта Польшчы і адначасова абмяжоўвалі паўнамоцтвы парламента.

[49] **Польская народная партыя** (ПСЛ) **«Вызваленне»** (*Polskie Stronnictwo Ludowe (PSL) «Wyzwolenie»*) — польская сялянская партыя левацэнтрысцкай арыентацыі, якая дзеяла ў 1915–1931 гг. Мела даволі ліберальную праграму ў нацыянальным пытанні, выказвалася за забеспячэнне нацыянальным меншасцям у Польшчы асноўных нацыянальных правоў.

[50] Маецца на ўвазе **Незалежная сялянская партыя** (НПХ) (*Niezależna Partja Chłopska*) — радыкальная сялянская арганізацыя, якая дзеяла ў Польшчы ў 1924–1927 гг. Фактычна яна была аналагам Беларускай сялянска-работніцкай грамады на этнічна польскіх землях.

[51] **Сільвестр Ваявудскі** (*Wojewódzki*) (1892–1938), польскі грамадска-палітычны дзеяч. Меў маёнтак на Лідчыне. У 1919–1921 гг. штатны афіцэр II аддзела Галоўнага камандавання Войска Польскага. У 1922–1927 гг. пасол Сейма Польшчы, выбраны з спіса Польскай народнай партыі «Вызваленне». Адзін з стваральнікаў і лідараў Незалежнай сялянскай партыі. З 1928 г. жыў у Гданьску. Удзельнік Еўрапейскага сялянскага кангрэса 1930 г. у Берліне. З 1930 г. — у Менску. У 1931 г. яго арыштавалі, у 1933 г. — асудзілі на 10 гадоў лагераў. У 1936 г. адбылося дадатковае расследаванне. 25 красавіка 1938 г. Ваявудскага асудзілі да найвышэйшай меры пакарання. Расстраляны.

[52] **Людвік Хамінскі** (*Chomiński*) (1890–1958), польскі грамадска-палітычны дзеяч, прыхільнік краёвай ідэі. Жыў у Вільні. У 1922–1927 гг. быў пасломм Сейма Польшчы, у 1922–1925 гг. уваходзіў у Пасольскі клуб ПСЛ «Вызваленне», у 1925–1927 гг. — у Клуб працы. Выступаў на працэсе над лідарамі БСРГ вясной 1928 г. у якасці сведкі. Згадваецца Аляксандрам Стагановічам у ліку заснавальнікаў Незалежнай сялянскай партыі абсалютна памылкова: Хамінскі ніколі не быў сябрам гэтай арганізацыі і нават не быў да яе блізкі.

[53] **Станіслаў Балін** (*Ballin*) (1897–1937), польска-беларускі грамадска-палітычны дзеяч. У 1916–1917 гг. — сябра БСГ, з 1917 г. — сябра ПСЛ «Вызваленне». Заўсёды падкрэсліваў сваё беларускае паходжанне. З 1922 да 1927 г. быў пасломм польскага Сейма, першапачаткова ўваходзіў у Пасольскі клуб ПСЛ «Вызваленне», пасля з яго выйшаў і стаў адным з заснавальнікаў і лідараў Незалежнай сялянскай партыі. Па яе роспуску выехаў у Гданьск і ўступіў у Камуністычную партыю Польшчы (КПП). У 1928 г. быў у Нямеччыне, Бельгіі і Францыі, дзе арганізоўваў кампанію ў абарону БСРГ. З 1929 г. — у СССР, вучыўся ў Міжнароднай ленінскай школе ў Маскве. Арыштаваны ў 1934 г. Расстраляны.

[54] **Уладзімір Шакун** (*Szakun*) (1883–1944), польска-беларускі грамадска-палітычны дзеяч. Залічваў сябе да беларускай нацыянальнасці. З 1922 да 1927 г. — пасол польскага Сейма, прайшоў у яго ў Наваградскай акрузе паводле спіса ПСЛ «Вызваленне». З 1924 г. — адзін з лідараў НПХ. У 1927 г. — адзін з арганізатараў Радыкальнай сялянскай партыі беларускіх земляў. У верасні 1927 г. разам з Антонам Шапелем падаваў заяву на ўступленне ў Беларускі пасольскі клуб, але яго не прынялі.

Па сканчэнні пасольскіх паўнамоцтваў яго арыштавалі, пасля вызвалення з турмы пакінуў палітыку. Жыў за межамі Заходняй Беларусі. Падчас Другой сусветнай вайны загінуў у канцэнтрацыйным лагеры Штудгоф.

[55] **Антон Шапель** (*Szapiel*) (1891–1944 (?)), польска-беларускі грамадска-палітычны дзеяч. Залічваў сябе да беларускай нацыянальнасці. З 1922 да 1927 г. быў паслом польскага Сейма, прайшоў у яго ў Свянцянскай акрузе паводле спіса ПСЛ «Вызваленне». З 1924 г. — адзін з лідараў НПХ. У 1927 г. — адзін з арганізатараў Радыкальнай сялянскай партыі беларускіх земляў. Арыштоўваўся польскімі ўладамі. Падчас вайны жыў у Варшаве, пасля выехаў у родныя мясціны. Далейшы лёс невядомы.

[56] **Фелікс Галавач** (*Hołowacz*) (1886–1972), беларуска-польскі грамадска-палітычны дзеяч. Паходзіў з Валожыншчыны. У 1917 г. быў сябрам БСГ. У 1922–1927 гг. быў паслом у польскі Сейм, прайшоў у яго ў Лідскай акрузе паводле спісу ПСЛ «Вызваленне». Падкрэсліваў сваё беларускае паходжанне. У 1924 г. — адзін з стваральнікаў і лідараў Незалежнай сялянскай партыі. У студзені 1927 г. яго разам з пасламі ад БСРГ арыштавалі. Вызвалілі праз 18 месяцаў без суда. У 1939 г. — арыштаваны савецкімі ўладамі, вывезены ў Казахстан. Падаваў заяву на ўступленне ў Армію Андэрса, аднак яе не задаволілі. Пасля вайны жыў на захадзе Польшчы, займаўся арганізацыяй там дзяржаўнай адміністрацыі і харчовай прамысловасці.

[57] **Альфрэд Фідэркевіч** (*Fiderkiewicz*) (1886–1972), польскі грамадска-палітычны дзеяч, лекар. З 1922 да 1927 г. — пасол польскага Сейма, да 1924 г. — сябра Пасольскага клуба ПСЛ «Вызваленне», пасля — НПХ. Меў шчыльную сувязь з КПП і блізкімі да яе арганізацыямі. Падчас вайны дзеяў у падполлі, неаднаразова арыштоўваўся немцамі. У 1943 г. яго змясцілі ў канцэнтрацыйны лагер у Асвенцім, быў лекарам у бараках для сухотнікаў. У 1945 г. — сябра Краёвай рады нарадовай (КРН), прэзідэнт г. Кракава.

[58] **«Узвышша»** — літаратурна-мастацкае згуртаванне беларускіх пісьменнікаў, якое існавала ў Менску з 1926 да 1931 г. Як і Інбелкульт, успрымалася польскімі афіцыйнымі ўладамі як закамуфляваная рэвалюцыйная арганізацыя, пад шыльдай якой бальшавікі рыхтуюць антыпольскія правакацыі. Такое ўспрыманне культурна-асветных установаў Савецкай Беларусі знайшло адлюстраванне

ў патаемных дакументах польскіх паліцыі і выведкі ды паказвала іх схільнасць да трактавання ўсяго беларускага руху як з'явы, абсалютна штучна і беспадстаўна створанай бальшавікамі дзеля сваіх мэтаў. Можна прыпусціць, што пытанні пра сувязі з «Узвышшам» задавалі Стагановічу польскія следчыя падчас ягоных арыштаў, з-за чаго і ў яго склалася ўражанне, што такая антыпольская дыверсійная арганізацыя сапраўды існавала. Між тым дакументальных пацверджанняў гэтаму факту пакуль не выявілі.

[59] **Міхал Чатырка** (1883 —?), беларускі грамадска-палітычны і культурны дзеяч. У 1924—1934 гг. выкладаў у Наваградскай беларускай гімназіі фізіку і матэматыку. Быў старшынёй Наваградскай павятовай управы ТБШ. У 1927 г. абраны дэпутатам і сябрам управы Наваградскага павятовага сейміка. Пасля ліквідацыі гімназіі ў 1934 г. польскія ўлады выслалі Чатырку ў заходнюю Польшчу (Цехануў). Увосень 1939 г. вярнуўся ў Любчу, у якой нарадзіўся. Тут саветы арыштавалі яго і выслалі ў Ачынскія лагеры (Краснаярскі край), дзе ён і памёр.

[60] **Чорная сотня** — у Расіі ў 1905—1917 гг. абагульненая назва некалькіх крайне правых арганізацыяў, якія выступалі пад лозунгамі манархізму, вялікадзяржаўнага шавінізму і антысемітызму.

[61] Лозунг «За нашу і вашу волю» *(«O wolność naszą i waszą»)* быў вельмі папулярны ў 1919 г. падчас наступлення польскіх войскаў на ўсход на першым этапе польска-савецкай вайны. Яго выкарыстоўвалі ў прапагандзе для прыцягнення на свой бок беларускіх, літоўскіх і ўкраінскіх нацыянальных элітаў дзеячы, блізкія да Юзафа Пілсудскага, які ў той час быў прыхільнікам т. зв. федэрацыйнай канцэпцыі пабудовы польскай дзяржаўнасці.

[62] Аляксандр Стагановіч мае на ўвазе палкі 1-й і 2-й Літоўска-беларускіх пяхотных дывізіяў, якія шляхам набору добраахвотнікаў палякі сфармавалі ў 1919—1920 гг. Акрамя пералічаных аўтарам існавалі таксама Гродзенскі, Ковенскі, Менскі, Беластоцкі, Слуцкі, Сувалкаўскі палкі.

[63] **Адам Станкевіч** (1891—1949), беларускі грамадска-палітычны, рэлігійны і культурны дзеяч, адзін з заснавальнікаў і лідараў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. На працягу ўсёй сваёй святарскай дзейнасці звяртаўся да вернікаў з казанямі на беларускай мове. У 1922—1927 гг. быў паслом польскага Сейма.

[64] Стагановіч, відаць, мае на ўвазе артыкулы Янкі Станкевіча, у якіх ён спачатку крытыкаваў толькі што выдадзеныя ўспаміны Васіля Рагулі, а пасля адказваў сваім апанентам, якія выступілі ў абарону Рагулі, — А. Негнявіцкаму (Аляксандру Орсу) і Аляксандру Стагановічу: Станкевіч, Я. На бакох «Успамінаў» В. Рагулі // Бацькаўшчына. № 18 (404). 4 траўня 1958. С. 2–3; № 19 (405). 11 траўня 1958. С. 2–3; № 20 (406). 18 траўня 1958. С. 3–4; Станкевіч, Я. Чыя тэндэнцыя? // Бацькаўшчына. № 34 (420). 7 верасня 1958. С. 3–4; Станкевіч, Я. Колькі зацемкаў да Стагановічавае абароны «Ўспамінаў» В. Рагулі // Бацькаўшчына. № 35 (421). 14 верасня 1958. С. 4.

[65] Пра **Анастаса Аляшкевіча** дадаткова пакуль вядома толькі тое, што нарадзіўся ён прыблізна ў 1893 (ці 1897) г. у Любчы, у 1928 г. працаваў настаўнікам у Наваградку і жыў на Замкавай вуліцы, 7. Фігураваў у якасці аднаго з абвінавачаных на працэсе ў Наваградку ў лістападзе — снежні 1928 г., быў апраўданы, але 3 кастрычніка 1929 г. апеляцыйным судом у Вільні асуджаны на 4 гады цяжкой турмы. Ва ўспамінах адной з актывістак КПЗБ і ў кнізе «Памяць» гэты дзеяч увогуле фігуруе як «Анастасія Аляшкевіч» (Михалевская, В. Д. В деревнях Новогрудчины // Годы испытаний и мужества / сост. Н. С. Орехво, Н. С. Сташкевич. Минск, 1973. С. 134; Памяць: Гістор.-дакум. хроніка Навагрудскага раёна. Мінск, 1996. С. 257, 266).

[66] Ігнат Дварчанін вярнуўся ў Вільню ў 1926 г. пасля заканчэння навучання ў Карлавым універсітэце ў Празе.

[67] **Аляксандр Коўш** (1890–1943), беларускі грамадска-палітычны і рэлігійны дзеяч, праваслаўны святар, адзін з лідараў БСРГ і бухгалтар Беларускага кааператыўнага банка.

[68] **Ян (Янка) Станкевіч** (1891–1976), беларускі грамадска-палітычны дзеяч, мовазнавец, доктар славянскай філалогіі і гісторыі. Скончыў Пражскі ўніверсітэт. У 1928–1930 гг. быў паслом польскага Сейма. Пасля Другой сусветнай вайны жыў на эміграцыі.

[69] № 18 на парламенцкіх выбарах 1928 г. меў выбарчы спіс Блока нацыянальных меншасцяў, які ўтварылі прадстаўнікі часткі беларускіх (Беларускі сялянскі саюз, Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларускае праваслаўнае дэмакратычнае аб'яднанне), украінскіх, нямецкіх і габрэйскіх нацыянальных арганізацыяў.

[70] **Браніслаў Тарашкевіч** (1892–1938), беларускі грамадска-палітычны і культурна-асветны дзеяч, аўтар «Беларускай граматыкі для школ». У 1922–1927 гг. — пасол польскага Сейма, у 1925–1927 гг. — старшыня Беларускай сялянска-работніцкай грамады.

[71] **Сымон Рак-Міхайлоўскі** (1885–1938), заходнебеларускі дзеяч, пасол польскага Сейма (1922–1927), адзін з лідараў Беларускай сялянска-работніцкай грамады. У 1927 г. яго арыштавалі. У 1930 г. — датэрмінова вызвалілі. Выехаў у БССР, дзе падпаў пад рэпрэсіі.

[72] **Пятро Мятла** (1890–1936), беларускі грамадска-палітычны і культурны дзеяч. У 1922–1927 гг. — дэпутат польскага Сейма. Адзін з стваральнікаў і лідараў Беларускай сялянска-работніцкай грамады. У 1927 г. яго арыштавалі. У 1930 г. — датэрмінова вызвалілі. Выехаў у БССР, дзе падпаў пад рэпрэсіі.

[73] **Павел Валошын** (1891–1937), беларускі палітычны дзеяч. У 1923–1927 гг. — пасол польскага Сейма, адзін з стваральнікаў БСРГ. З 1927 да 1932 г. — зняволены ў польскай турме. З 1932 г. — у Менску. Рэпрэсаваны.

[74] **Іван Дударэвіч** (1896 —?) — селянін з вёскі Асташын Наваградскага павета. На працэсе ў Наваградку ў лістападзе — снежні 1928 г. быў асуджаны на 4 гады турмы.

[75] **Язэп Гаўрылік** (1893–1937), беларускі грамадска-палітычны дзеяч, педагог. У 1922–1928 гг. выкладаў у Радашковіцкай беларускай гімназіі беларускую мову і спевы. З 1928 да 1930 г. — пасол польскага Сейма, старшыня Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клуба «Змаганне».

[76] **Павел Крынчык** (1898–1975), беларускі грамадска-палітычны дзеяч. У 1920-я гг. — актыўны ўдзельнік Таварыства беларускай школы, з 1927 г. — віцэ-старшыня Слонімскай акруговай управы ТБШ, з траўня 1929 г. — сябра Галоўнай управы ТБШ. У 1929 г. замяніў Аляксандра Стагановіча ў Сейме, уваходзіў у Беларускі сялянска-работніцкі пасольскі клуб. У 1930 г. польскія ўлады арыштавалі і асудзілі яго на 10 гадоў турмы. З верасня 1932 г. у выніку абмену палітвязнямі — у СССР, працаваў на гаспадарчай працы. У 1935 г. НКУС БССР арыштаваў, асудзіў яго на 5 гадоў лагераў. Пасля вызвалення жыў у Слоніме.

[77] **Аляксандр Лойка**, селянін з вёскі Вялікая Слабада Ярэміцкай гміны Стаўпецкага павета (цяпер Турэцкі сельсавет Карэліцкага раёна).

[78] **Адольф Варскі-Варшаўскі** (*Warski-Warszawski*) (1868–1937), польскі рэвалюцыйны дзеяч, адзін з лідараў Камуністычнай партыі Польшчы. У 1926–1927 гг. быў паслом ад камуністаў у польскім Сейме, у 1928 г. выбраны ў Сейм паўторна. Пасля яго абвінавацілі ў «правых» адхіленнях, вызвалілі ад кіраўніцтва партыяй, і ён выехаў у Маскву, дзе працаваў у Інстытуце Маркса — Энгельса — Леніна. У 1937 г. — арыштаваны і расстраляны.

[79] **Ежы Сахацкі** (*Sochacki*) (Чашэйка-Сахацкі) (1892–1933), польскі камуністычны дзеяч. Да пачатку 1920-х гг. быў адным з лідараў ППС, з 1921 г. сябра КПП і ЦК КПП. У 1924–1927 і 1928 гг. — пасол польскага Сейма, уваходзіў у Камуністычную пасольскую фракцыю. У 1928 г. быў пазбаўлены пасольскай недатыкальнасці, эміграваў у СССР, дзе падпаў пад рэпрэсіі.

[80] **Уладзімір Грыц** (1892 (паводле іншых звестак 1895) —?), селянін з вёскі Ваўковічы Наваградскага павета, сябра мясцовай гміннай рады. Адначасова быў сябрам і адным з кіраўнікоў Баранавіцкага райкама КПЗБ. У ноч на 2 сакавіка 1928 г. быў разам з Н. Кандрацюком і А. Мальцам арыштаваны паліцыяй на хутары Мольнічы падчас друку ўлётак камуністычнага зместу. На працэсе ў Наваградку ў лістападзе — снежні 1928 г. быў асуджаны на 8 гадоў турмы.

[81] **Іван Малец** (1875 (?) —?), рымар з вёскі Мольнічы Наваградскага павета. Сябра Баранавіцкага райкама КПЗБ. Паводле ўспамінаў аднапартыйцаў, менавіта ў ягонай хаце звычайна адбываліся паседжанні райкама.

[82] **Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам** (ББСУ) — праўрадавая партыя ў Польшчы, створаная ў канцы 1927 г. перад выбарамі ў парламент. Складалася з разнародных элементаў, якія ўвогуле не мелі нейкай акрэсленай палітычнай праграмы, але заўсёды падтрымлівалі ўсе дзеянні Юзафа Пілсудскага. У Сейме ІІ склікання ББСУ меў самую вялікую фракцыю, але безумоўнай большасцю не валодаў.

[83] **Польская сацыялістычная партыя** (ППС) (*Polska Partia Socjalistyczna — PPS*) — левая палітычная партыя ў Польшчы, заснаваная ў 1893 г. Да 1918 г. дзеяла ў асноўным на тэрыторыі Каралеўства Польскага. Адным з яе лідараў быў Юзаф Пілсудскі. У міжваенны

час дзеяла на ўсёй тэрыторыі Польшчы і заўсёды мела даволі значны ўплыў.

[84] Сёння вёска **Вераскава** — цэнтр сельсавета ў Наваградскім раёне.

[85] **Аляксандр Малец**, селянін з Наваградскага павета. На працэсе ў Наваградку ў лістападзе — снежні 1928 г. за друк у ягонай хаце камуністычных адозваў быў асуджаны на 4 гады турмы.

[86] **Антон Сокал-Кутылоўскі** (1892–1983), беларускі нацыянальны дзеяч, вайсковец. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Слуцкага збройнага чыну. У снежні 1920 г. — камандзір 1-й Слуцкай брыгады. У міжваенны перыяд быў праваслаўным святаром на Лунінеччыне.

[87] **«Мутэрка»** («Настаўнік Мутэрка») — драматычны абразок Максіма Гарэцкага, які ў 1920-я гг. шырока ставіўся беларускай мастацкай самадзейнасцю.

[88] Аляксандр Стагановіч ажаніўся з **Марыяй Карпуцэвіч-Борыс** у 1922 г. Як вынікае з успамінаў ягонай дачкі Тамары Стагановіч, з сям'ёй Карпуцэвічаў-Борыс Аляксандр Стагановіч быў знаёмы яшчэ з 1906 г. (Стагановіч, Т. Пра маіх бацькоў // Адзінец, А. Паваенная эміграцыя: Скрыжаваньні лёсаў. Менск, 2007. С. 388–413). У Стагановічаў было чацвёра дзяцей: Аляксандр (Шура), Леў (Лёва), Юры і Тамара.

[89] Насамрэч камуністычны сенацкі спіс (як і аналагічны спіс «Змагання») выбарчая камісія анулявала яшчэ да галасавання, таму галасамі, аддадзенымі за яго, можна ўмоўна лічыць толькі 10 195 галасоў, прызнаных несапраўднымі. Ва ўсялякім выпадку так сцвярджаў сакратар Баранавіцкага акруговага камітэта КПЗБ «Макар» (Фелікс Кантар) у сваёй паслявыбарчай справаздачы: *«У Сенат мы атрымалі — 10 350 галасоў. Галасавалі дэманстратыўна на № 13. Адносна малая колькасць галасоў тлумачыцца, па-першае, тым, што акруга была ўжо разбітая і большая частка раёнаў не мела сувязі, па-другое, і самае галоўнае — тое, што нумаркоў не было, і тыя, хто хацелі галасаваць, павінны былі самі напісаць № або лозунг (які скажа А[кругові] К[амітэт])»* (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ). Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 54. Арк. 32).

[90] Маецца на ўвазе **Назар Кандрацюк** (1895 (?) —?), ураджэнец вёскі Малыя Шчытнікі Берасцейскага павета, які, паводле звестак поль-

скай паліцыі, дзейнічаў спачатку як член акруговага камітэта КПЗБ у Берасці, а ў 1927 г. быў накіраваны ў Баранавічы як сакратар мясцовага акруговага камітэта КПЗБ. Асноўнай пастаўленай перад ім на новай пасадзе задачай была арганізацыя пракамуністычнай выбарчай кампаніі ў Сейм і Сенат. Праз ягоныя рукі праходзілі грошы, выдзеленыя камуністамі на выбарчую кампанію. Кандрацюк дзейнічаў на Наваградчыне як Міхаіл Альшэўскі, а ўвогуле меў партыйны псеўданім Янак. У ноч на 2 сакавіка 1928 г., за 3 дні да галасавання ў Сейм, Альшэўскі друкаваў разам з Антонам Мальцам і Уладзімірам Грыцам падпольныя камуністычныя адозвы на беларускай мове, *«дзе ўтрымліваліся заклікі супраць фашысцкага тэрору, дыктатуры Пілсудскага, хай жыве рабоча-сялянскі ўрад, хай жыве КПЗБ, усе працоўныя і прыгнечаныя галасуйце 4 сакавіка за спіс № 39»*. Падчас працы ўсе трое былі захопленыя проста на месцы злачынства паліцыяй, што стала непасрэднай падставай для наступнага правядзення шырокамаштабных арыштаў змаганскіх актывістаў на Наваградчыне, у тым ліку і Аляксандра Стагановіча. Падчас асабістагаператрусу Кандрацюка-Альшэўскага ў яго была знойдзена грашовая сума велічынёй у 1505 злотых і 12 даляраў, а таксама нататнік, у якім адзначаліся сумы, выдаткаваныя на партыйныя мэты. Пасля на звестках з гэтага нататніка грунтавалася абвінавачанне супраць некаторых іншых падсудных.

Улічваючы тое, што ў той час, калі адбываліся выбары ў Сенат, Н. Кандрацюк ужо сядзеў у турме, наўрад ці згаданыя А. Стагановічам рэпрэсіі супраць яго з боку камуністычнай партыі (калі Стагановіч нічога не блытае і яны сапраўды былі) маглі мець з гэтымі выбарамі нейкую сувязь (тым больш што, як ужо згадвалася вышэй, камуністычны спіс быў яшчэ да выбараў ануляваны ўладамі). Больш верагодна, што Кандрацюк мог пацярпець за свае паводзіны падчас следства і суда, бо ён разам з некаторымі іншымі членамі КПЗБ прызнаўся ў сваёй прыналежнасці да камуністычнай партыі і ў выкананні адпаведных функцый у яе шэрагах, чым, як канстатавалася ў абвінаваўчым акце Наваградскага акруговага суда, дадзеныя асобы *«ўскладнілі становішча астатніх арыштаваных»*, у тым ліку і Аляксандра Стагановіча, нягледзячы на тое што апошнія *«не прызналі сябе вінаватымі»*. Праўда, самому Кандрацюку гэтае супрацоўніцтва са следствам, як выглядае, дапамагло мала, бо ўрэшце суд прысудзіў яго да максімальнага тэрміну, прадугледжанага артыкулам, паводле якога ён судзіўся: 8 гадоў цяжкай турмы.

[91] Выбарчая кампанія Міхала Чатыркі ў Наваградскай акрузе сапраўды не ўдалася, аднак яе вынікі былі ўсё ж не настолькі слабымі, як сцвярджае Стагановіч. Ва ўсёй акрузе за чатыркаўскі спіс № 41 у Наваградскай акрузе прагаласавалі 3167 выбарнікаў, з іх 519 — у Наваградскім павеце, 292 — у Стаўпецкім, 2349 — у Нясвіжскім (змаганцы тут атрымалі 3321 голас), 7 — у Баранавіцкім. Толькі ў Слонімскім павеце за Чатырку не прагаласаваў аніводзін чалавек.

[92] Тут Аляксандр Стагановіч свядома ці несвядома значна перабольшыў поспехі свайго выбарчага спіса на выбарах 1928 г. Насамрэч за выбарчы спіс «Змаганне за інтарэсы сялян і работнікаў» у Наваградскай акрузе (дзе ён толькі і выстаўляўся) прагаласавалі 71 706 выбарнікаў (а ўсяго галасавалі 175 176 чалавек пры зарэгістраваных 281 295 асобах з правам голасу).

[93] **Павел Каруза** (1900 (паводле іншых звестак 1906) — 1988), беларускі грамадска-палітычны і культурны дзеяч. У 1927 г. старшыня ЦК Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай партыі (БХД) і галоўны рэдактар перыядычнага органа БХД — газеты «Biełaruskaja Krynica». У 1928–1930 гг. пасол польскага Сейма. У 1933 г. яго вывезлі ў СССР, дзе арыштавалі і саслалі на Салаўкі. Карузу вызвалілі ў 1947 г., у 1949 г. паўторна арыштавалі і выслалі ў Сібір. Пасля вызвалення ў 1955 г. жыў у Вільні.

[94] **Альбін Стаповіч** (1894–1934), беларускі грамадска-палітычны і рэлігійны свецкі дзеяч, актыўны сябра Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. У 1928–1930 гг. — пасол Сейма, сябра Беларускага пасольскага клуба. У пачатку 1930-х без асаблівага поспеху спрабаваў стварыць уласную палітычную Партыю беларускіх незалежных радыкалаў.

[95] **Канстанцін Юхневіч** (1896–1971), беларускі грамадска-палітычны дзеяч, публіцыст. Займаўся каапературыяй, у 1920-я гг. уваходзіў у кіраўніцтва Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. З 1926 г. — у кіраўніцтве Беларускага сялянскага саюза. Супрацоўнічаў з газетай «Сялянская ніва», выступаў на яе старонках як публіцыст. У 1928–1930 гг. быў паслом польскага Сейма. У сярэдзіне 1930-х быў намеснікам старшыні Беларускай нацыянал-сацыялістычнай партыі. Рэпрэсаваны савецкімі ўладамі. Пасля вяртання з канцлагераў жыў у Слоніме. Загінуў у аўтамабільнай катастрофе.

[96] **Флягонт Валынец** (1879–1937), беларускі грамадска-палітычны дзеяч. Быў настаўнікам Радашковіцкай беларускай гімназіі, адным з найактыўнейшых дзеячаў ТБШ. У 1928 г. — пасол польскага Сейма, уваходзіў у склад Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клуба «Змаганне». У 1930 г. польскія ўлады арыштавалі яго, у 1932 г. — выехаў у СССР. Арыштаваны, загінуў на Салаўках.

[97] **Іван Грэцкі** (1898–1937 (?), беларускі нацыянальны дзеяч, у 1924–1927 гг. — сакратар падпольнага райкама КПЗБ у Палескім ваяводстве. У 1928–1930 гг. — пасол польскага Сейма, сябра Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клуба «Змаганне». У 1930 г., пасля роспуску Сейма, пазбег арышту і перабраўся ў Менск. У 1933 г. арыштаваны і высланы ў сібірскі лагер, дзе і загінуў.

[98] Іван Грэцкі прайшоў у Сейм па Берасцейскай выбарчай акрузе, дзе быў пастаўлены на спіс левай украінскай партыі «Сельроб-лявіца», якая атрымала падчас выбараў № 19.

[99] Пра вялікія заробкі парламентарыяў у Польшчы засталіся ўспаміны і іншага беларускага пасла гэтага самага склікання — Паўла Карузы. Ён, у прыватнасці, сцвярджаў: *«Мы мелі 1300 злотых, што для таго часу было шмат, бо сярэдні звычайны заробак быў якіх 250 злотых, і гэта лічылася ўжо няблага, 300 — ужо добра, а калі 400 нехта зарабляў — то гэта ўжо зусім лічылася як надзвычай добрае месца»* (Biblioteka Sejmowa. Archiwum Sejmu. Kolekcja materiałów archiwalnych posłów i senatorów II Rzeczypospolitej (1919–1939). Materiały Pawła Karuzo).

[100] Маецца на ўвазе **шарварак** — накладзеная на сялянаў павіннасць будаўніцтва мастоў, дарог, грэбляў і г. д.

[101] **Пятро Скрабец** (1882–1963), беларускі грамадска-культурны дзеяч. У 1920–1940-я гг. настаўнічаў на Наваградчыне, быў дырэктарам Наваградскай беларускай гімназіі. У 1945 г. савецкія ўлады арыштавалі і выслалі яго на 8 гадоў у Магадан, пасля адбыцця тэрміну вярнуўся ў Навагрудак.

[102] Насамрэч Янка Станкевіч быў у Сейме т. зв. дзікім паслом, г. зн. не ўваходзіў у склад аніводнага клуба. Аднак пры гэтым ён у 1928–1930 гг., несумненна, карыстаўся некаторай, у тым ліку і матэрыяльнай, падтрымкай з боку дзяржаўных уладаў, якія ў той час імкнуліся праводзіць больш гнуткую ў параўнанні з ранейшай нацыянальную палітыку.

[103] **Стэфан Севярын Кіртыкліс** (*Kirtiklis*) (1890–1951), польскі дзяржаўны дзеяч, у другой палове 1920-х гг. узначальваў аддзел бяспекі Віленскай ваяводскай управы. У 1930–1931 гг. быў віленскім, у 1931–1936 — паморскім, у 1936–1937 — беластоцкім ваяводам.

[104] Янка Станкевіч паводле адукацыі быў доктарам славянскай філалогіі і гісторыі.

[105] **Станіслаў Станкевіч** (1907–1980), беларускі культурна-асветніцкі і грамадска-палітычны дзеяч, доктар філасофіі. Перад вайной удзельнічаў у беларускім студэнцкім руху ў Вільні, выкладаў у Віленскім універсітэце. Падчас Другой сусветнай вайны быў бурмістрам Барысаўскай акругі, акруговым намеснікам Беларускай Цэнтральнай Рады ў Баранавічах. З 1944 г. — на эміграцыі, спачатку ў Нямеччыне, з 1962 г. у ЗША. Працаваў у беларускай рэдакцыі радыё «Свабода», Інстытуце вывучэння СССР (Мюнхен), быў старшынёй Беларуска-амерыканскага задзіночання і рэдактарам газет «Бацькаўшчына» (1948–1961) і «Беларус» (1962–1980).

[106] **«Веда»** — навукова-літаратурны часопіс, які выдаваўся Янкам Станкевічам ад імя Крывіцкага (Беларускага) навуковага таварыства Пранціша Скарыны ў 1951–1954, 1973 і 1975 гг.

[107] **Мікола Шчорс** (1913–1995), беларускі дзеяч, выпускнік медыцынскага факультэта Віленскага ўніверсітэта. У 1935–1937 гг. — старшыня Беларускага студэнцкага саюза. З 1940 г. — старшыня Беларускага камітэта ў Варшаве. Кіраўнік г. зв. групоўкі Шчорса, якая супрацоўнічала з абверам і разглядала падзеі будучай акупацыі як магчымасць стварыць беларускую дзяржаву. 19 чэрвеня 1941 г. Міколу Шчорса абралі старшынёй Беларускага нацыянальнага цэнтра. Аднак у ліпені 1941 г. пасля наведання Беларусі адмовіўся ад палітычнай дзейнасці. Вярнуўся ў Варшаву. З восені 1944 г. — у Нямеччыне. У 1946–1947 гг. узначальваў Беларускае праваслаўнае аб'яднанне, падтрымаў аднаўленне БЦР. З 1949 г. жыў у ЗША (Нью-Ёрк). У 1950–1951 гг. узначальваў Злучаны беларуска-амерыканскі дапамаговы камітэт, ініцыятар стварэння Беларускага кангрэсавага камітэта Амерыкі, яго першы старшыня (1951–1955). У 1955 г. падаў у адстаўку з пасады старшыні, разам з Юрыем Сабалеўскім, Міколам Паньковым, Іванам Касяком, Віктарам Чабатарэвічам, Лявонам Савёнкам, Леанідам Галяком стварыў Камітэт незалежнай Беларусі. У 1958 г. — адзін са ства-

ральнікаў Беларуска-амерыканскага звязу. У канцы 1950-х адышоў ад актыўнай грамадскай дзейнасці, з'ехаў у Пляцбург (штат Нью-Ёрк), дзе меў клініку, з'яўляўся віцэ-прэзідэнтам Амерыканскай асацыяцыі хірургаў.

[108] У 1957 г. Янка Станкевіч выйшаў з Рады БНР (у гэтым жа годзе Аляксандр Стагановіч стаў намеснікам старшыні Рады БНР). Мікалай Шчорс і Янка Станкевіч у 1958 г. паспрабавалі стварыць «надграмадскую» — не прыхільнікаў БНР і БЦР — арганізацыю: Беларуска-амерыканскі звяз. Шчорс стаў старшынёй арганізацыі, Станкевіч — віцэ-старшынёй. Уваходзілі таксама Леанід Галяк, Міхась Бахар, Лангіна Брылеўская.

[109] Янка Станкевіч сапраўды фактычна адразу пасля пачатку працы Сейма засведчыў немагчымасць сваёй супрацы з клубам «Змаганне», адмовіўшыся падпісаць складзеную яго сябрамі прапанову спыніць судовую справу супраць паслоў БСРПК І. Грэцкага і А. Стагановіча. Сваю пазіцыю ён, аднак, аргументаваў, заявіўшы, што прапанова складзеная ў відавочна правакацыйным тоне і ў такім выглядзе можа толькі пагоршыць становішча арыштаваных.

[110] Магчыма, тут маецца на ўвазе Адольф Варскі-Варшаўскі.

[111] **Зыгмунт Казімір Бэчковіч** (*Beczkowicz*) (1887–1985), польскі палітык і дзяржаўны дзеяч, у 1926–1931 — навагрудскі, у 1931–1933 гг. — віленскі ваявода. Выступаў за правядзенне больш гнуткай дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да беларусаў.

[112] Так у арыгінале. Тут, відавочна, слова «бяспраўныя» трэба разумець як «тыя, якія не трымаюцца прававых нормаў».

[113] **Яўген Смяроўскі** (*Śmiarowski*) (1878–1932), польскі юрыст і палітычны дзеяч. Ад 1920 г. быў абаронцам у палітычных працэсах (найбольш вядомы — Брэсцкі працэс 1931–1933 гг. над 11 былымі апазіцыйнымі пасламі Сейма). Быў вядомы як выдатны судовы прамоўца.

[114] **Павел Свірыд** (1886–1948), навагрудскі адвакат, удзельнік беларускага нацыянальнага руху. З сялянскай беднай сям'і. Скончыў Пецярбургскі ўніверсітэт (юрыст). Удзельнік Першай сусветнай вайны (афіцэр). У 1920–1930-я гг. — адвакат у Навагрудку. У ліпені 1941 г. стварыў і ўзначаліў Беларускі камітэт у Навагрудку. Потым галоўны

суддзя на Заходнюю Беларусь. У 1943 — пачатку 1944 г. — суддзя Акруговага суда ў Баранавічах. Браў удзел у правядзенні Усебеларускага Праваслаўнага Сабору ў 1942 г., быў прыхільнікам аўтакефаліі Праваслаўнай царквы ў Беларусі. У 1944 г. — радны Беларускай Цэнтральнай Рады. Ад 1944 г. — на эміграцыі ў Нямеччыне.

[115] **Аляксандр Мурза-Мурзіч** (*Murza-Murzicz*), наваградскі суддзя. У 1928 г. быў пастаўлены на 4-м месцы Сеймавага выбарчага спіса Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам у Наваградскай акрузе, аднак паслом стаць не здолеў з-за выбарчага поспеху ў гэтай акрузе стагановіцкага «Змагання».

[116] Дадзены сведка, **Цвірка-Гадыцкі**, займаў тады пасаду старэйшага паліцыянта следчага аддзела ў Наваградку.

[117] **Станіслаў Крэмес**, аспірант следчага аддзела паліцыі ў Наваградку.

[118] Артыкул 102 Крымінальнага кодэксу Расійскай імперыі, які ў 1928 г. яшчэ дзеяў у Польшчы на тэрыторыі былога т. зв. расійскага забору, прадугледжваў адказнасць за ўдзел у змове, створанай для замаху на дзяржаўны лад Польшчы альбо на цэласнасць яе дзяржаўнай тэрыторыі, — 8 гадоў цяжкай турмы (катаргі). 110-ы артыкул гэтага самага Кодэксу прадугледжваў для польскіх грамадзянаў, вінаватых у 1) падбухторванні іншаземнага ўрада да ваенных ці іншых варожых у дачыненні Польшчы дзеянняў, або да разрыву мірных дамоўленасцяў, або да ўхілення ад такіх дамоўленасцяў; 2) абяцанні іншаземнаму ўраду перад абʼяўленнем вайны ад сябе ці ад іншых асобаў спрыяць яго вайсковым аперацыям супраць Польшчы — ад 4 да 15 гадоў цяжкай турмы.

[119] **Іван Раманюк** (каля 1900 —?) — жыхар вёскі Неўда на Наваградчыне. Быў актыўным сябрам ТБШ. Падчас парламенцкіх выбараў 1928 г. быў упаўнаважаным змаганскага выбарчага спіса (№ 39) у Наваградскай выбарчай акрузе. На наваградскім працэсе яму закідалася перш за ўсё замова ў друкарні пазней канфіскаваных змаганскіх адозваў «камуністычнага зместу». Абвінавачванне ж у прыналежнасці Раманюка да камуністычнай партыі, як і ў выпадку з А. Стагановічам, грунтавалася выключна на паказаннях сумнеўных сведак, у той час як фактычных неаспрэчных доказаў яго віны суду прадстаўлена не было.

[120] **Лукішкі** — галоўная турма ў Вільні, у якой у міжваенны час былі зняволеныя шматлікія беларускія нацыянальныя дзеячы.

[121] **Картуз-Бяроза** — канцэнтрацыйны лагер з строгім рэжымам, які дзеяў у 1934–1939 гг. і ў якім утрымліваліся палітычныя зняволеныя.

[122] **Юльян Саковіч** (1906–1943), беларускі нацыянальны дзеяч, выпускнік Віленскай беларускай гімназіі, затым вучыўся ў Віленскім універсітэце. Сябра Беларускага студэнцкага саюза, Таварыства беларускай школы, КПЗБ. Арыштоўваўся польскімі, а пасля савецкімі ўладамі. У перыяд нямецкай акупацыі быў начальнікам адміністрацыйнага аддзела Беларускай народнай самапомачы і акруговым старшынёй БНС у Лідзе. Забіты польскімі падпольшчыкамі.

[123] **Сяргей Хмара** (сапр. Сіняк/Зіняк) (1905–1992), беларускі нацыянальны дзеяч. У міжваенны перыяд удзельнічаў у працы Часовай беларускай рады, Беларускай сялянска-работніцкай грамады, Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клуба «Змаганне», Таварыства беларускай школы. Падчас нямецкай акупацыі працаваў на радыё ў Слоніме, быў галоўным рэдактарам газеты «Слонімскі кур'ер». Пасля Другой сусветнай вайны жыў на эміграцыі ў Канадзе, выдаваў газету «Беларускі голас», дзе рэзка крытыкаваў і Раду БНР, і БЦР. Адзін з некалькіх дзеячаў, якія імкнуліся стварыць г. зв. трэцюю сілу на эміграцыі, не звязаную з абедзвюма радамі.

[124] Магчыма, маецца на ўвазе **Вінцэнт Жук-Грышкевіч** (1903–1989), беларускі грамадска-палітычны і культурны дзеяч, выпускнік факультэта славянскай філалогіі і гісторыі Пражскага ўніверсітэта. У канцы 1920-х гг. ён вярнуўся з Прагі ў Вільню і займаўся выкладчыцкай дзейнасцю ў розных навучальных установах. Падчас Другой сусветнай вайны — у Арміі Андэрса, пасля сканчэння Другой сусветнай вайны жыў на эміграцыі ў Англіі (быў першым старшынёй Згуртавання беларусаў Вялікабрытаніі), Канадзе (з 1950 г.), першы кіраўнік Беларускай службы радыё «Вызваленне» (1954–1956), у 1970–1982 гг. быў старшынёй Рады БНР.

[125] Насамрэч у склад пасольскага клуба Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам адразу пасля выбараў уваходзілі не 124, а 122 паслы.

[126] **Станіслаў Цар** (*Car*) (1882–1938), польскі юрыст і палітык, адзін з найбліжэйшых паплечнікаў Юзафа Пілсудскага. У 1928–1930 гг. —

міністр юстыцыі Польшчы, у 1930–1938 гг. — пасол Сейма, у 1935–1938 гг. яго маршалак. Адзін з аўтараў Канстытуцыі Польшчы 1935 г.

[127] Ярд — адзінка даўжыні ў сістэме англійскіх і амерыканскіх мераў, роўная 0,9144 м.

[128] **Юры Сабалеўскі** (1889–1957), беларускі нацыянальны дзеяч. У 1926–1927 гг. быў дэпутатам польскага Сейма, уваходзіў у пасольскі клуб БСРГ, затым у Беларускі пасольскі клуб. Падчас нямецкай акупацыі быў шчыльна заангажаваны ў справу стварэння беларускай адміністрацыі, быў старшынёй Беларускай самапомачы і віцэ-прэзідэнтам БЦР. Пасля вайны жыў на эміграцыі ў ЗША і Нямеччыне. Адзін з кіраўнікоў БЦР.

[129] **Часлаў Ханяўка** (1909–1988), беларускі нацыянальны дзеяч, выпускнік агранамічнага факультэта Віленскага ўніверсітэта. Падчас навучання быў актыўным сябрам Беларускага студэнцкага саюза. Падчас Другой сусветнай вайны працаваў у камітэце Беларускай самапомачы ў Берліне, Беларускім камітэце ў Варшаве. Займаўся вызваленнем беларусаў, што трапілі ў нямецкі палон. У пасляваеннай Нямеччыне займаўся арганізацыяй беларускага школьніцтва. У 1950-я гг. выехаў у ЗША. Як і Аляксандр Стагановіч, пахаваны на беларускім могільніку ў Іст-Брансуіку.

[130] **Барыс Кіт** (нар. 1910), беларускі навуковец і грамадскі дзеяч. Скончыў фізіка-матэматычны факультэт Віленскага ўніверсітэта, польскія ўлады двойчы арыштоўвалі яго. Быў выкладчыкам і дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі, падчас нямецкай акупацыі арганізоўваў беларускія школы. З 1948 г. жыў у ЗША, адзін з заснавальнікаў Злучанага беларуска-амерыканскага дапамаговага камітэта, у 1972 г. пераехаў у Нямеччыну.

[131] Насамрэч Юрыя Сабалеўскага арыштавалі трохі раней, чым згадвае Стагановіч, — 8 траўня 1928 г. Прысуд жа яму (6 гадоў цяжкой турмы з залічэннем 2 гадоў і 1 месяца прэвентыўнага арышту, частку якога ён адседзеў яшчэ перад атрыманнем пасольскага мандата) вынеслі толькі ў верасні 1929 г.

[132] Тут Аляксандр Стагановіч падаў не зусім дакладную дату. Васіля Рагулю арыштавалі толькі пасля датэрміновага роспуску Юзафам Пілсудскім парламента II склікання, які адбыўся 30 жніўня 1930 г. Адразу пасля гэтай падзеі былі выдадзеныя загады аб арышце ўсіх

камуністычных паслоў, лідараў апазіцыйных партыяў т. зв. Цэнтралеву, а таксама тых былых паслоў, дзейнасць якіх стварала прычыны для ўмяшальніцтва права, і толькі пасольская недатыкальнасць ахоўвала іх да гэтага перад адказнасцю.

[133] Клуб «Змаганне» ствараў у найбольш значных населеных пунктах Заходняй Беларусі мясцовыя арганізацыйныя структуры, якія зваліся сакратарыятамі. Гэтыя структуры ўзначальваліся сакратарамі.

[134] З пералічаных паслоў Івана Грэцкага польскія ўлады, насуперак агульнапрынятаму ў беларускай гістарыяграфіі меркаванню, не арыштоўвалі. Падчас правядзення арыштаў камуністычных і блізкіх да камунізму паслоў яму ўдалося схавацца і таемна перабрацца ў СССР. Ужо ў лістападзе 1930 г. у Заходняй Беларусі распаўсюджвалася ад ягонага імя адмысловая ўлётка, у якой Грэцкі выказваў пратэст супраць прызначанага на 18 лістапада судовага працэсу *«супроць паслоў Беларускага Сялянска-Работніцкага Пасольскага Клуба "Змаганне" т.т. Гаўрыліка, Дварчаніна, Крынчыка і Валынца»* (НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 156. Арк. 87). А ў сакавіку 1931 г. у справаздачы аддзела бяспекі польскага МУС адзначалася, што *«атрымана вартая даверу інфармацыя, што ў канцы студзеня г. г. у Маскве знаходзіўся былы пасол польскага Сейма Грэцкі. З Масквы ён намерваўся скіравацца на лячэнне на Каўказ або ў Крым. У лістах да сям'і Грэцкі рэкамендуе сваёй жонцы легальна выехаць у Расію»* (Archiwum Akt Nowych (AAN) w Warszawie. Ministerstwo Spraw Wewnętrznych 1918–1939. Sygn. 1202. S. 1).

[135] Паслы «Змагання» ўрэшце атрымалі неаднолькавыя тэрміны зняволення ў сувязі з тым, што кожнага з іх судзілі па крымінальных справах, заведзеных рознымі тэрытарыяльнымі судамі за канкрэтныя індывідуальныя парушэнні польскага заканадаўства раней, яшчэ падчас выканання пасольскіх абавязкаў (на кожнага пасла завялі па некалькі такіх спраў). Так, 4 лістапада на судзе ў Горадні П. Крынчык атрымаў па адной са спраў 1 год турмы, 12 лістапада ў той жа Горадні І. Дварчанін і Ф. Валынец — па 6 гадоў турмы і г. д. Такім чынам, пасля разгляду ўсіх спраў з удзелам паслоў П. Крынчыку «набегла» 10 гадоў турмы, Я. Гаўрыліку — 9,5 года, І. Дварчаніну — 8 гадоў.

[136] У спісе для абмену вязняў з 40 чалавек, падрыхтаваным польскім бокам і зацверджаным двухбаковым пратаколам ад 3 жніўня 1932 г., былі не адныя толькі ксяндзы: апошніх было толькі 18 чалавек.

[137] **Аляксандр Асіпчык** (1909–1990), беларускі грамадска-палітычны і рэлігійны дзеяч. Паходзіў са Слоніма. У гады Другой сусветнай вайны дзеяў у кірунку беларусізацыі Праваслаўнай царквы. З лета 1944 г. — на эміграцыі. Напачатку шчыльна супрацоўнічаў з беларускімі епіскапамі, пасля іхнага пераходу ў склад Рускай зарубежнай праваслаўнай царквы выступіў супраць іх. У 1947 г. заснаваў у Нямеччыне Беларускае праваслаўнае таварыства Жыровіцкай Божай Маці.

[138] Малаверагодна, што ў Нью-Брансуіку, які быў вотчынаю прыхільнікаў БНР, у 1954 г. прайшоў агульны (зн. надпалітычны) з'езд моладзі. Найхутчэй, гаворка пра сход Беларускага студэнцкага згуртавання ў жніўні 1954 г., якое падтрымлівала платформу Рады БНР.

[139] У 1928 г. беларускія нацыянальныя спісы выстаўляліся ў Наваградскай, Лідскай, Свянцянскай, Віленскай, Берасцейскай, Беластоцкай і Гарадзенскай акругах (агульным лікам, такім чынам, у сямі). Іншая справа, што поспеху ў выглядзе праведзеных паслоў беларусам розных палітычных арыентацыяў удалося дабіцца сапраўды толькі ў трох акругах: Наваградскай (3 паслы-змаганцы), Свянцянскай (3 паслы са спіса Блока нацыянальных меншасцяў) і ў Лідскай (2 паслы са спіса Янкі Станкевіча). Будучы пасол-змаганец Іван Грэцкі прайшоў у Сейм з украінскага спіса ў Берасцейскай акрузе, а будучы старшыня Беларускага пасольскага клуба Фабіян Ярэміч — з так званага дзяржаўнага спіса Блока нацыянальных меншасцяў.

[140] Насамрэч у 1928 г. у польскі парламент з усіх спісаў прайшлі не 11, а 12 беларусаў: 10 паслоў (Флягонт Валынец, Язэп Гаўрылік, Іван Грэцкі, Ігнат Дварчанін, Павел Каруза, Аляксандр Стагановіч, Янка Станкевіч, Альбін Стаповіч, Канстанцін Юхневіч, Фабіян Ярэміч) і 2 сенатары (Вячаслаў Багдановіч і Васіль Рагуля). Несупадзенне лічбаў тлумачыцца, відаць, тым, што Стагановіч вырашыў не залічваць да беларускіх прадстаўнікоў у парламенце свайго пастаяннага палітычнага апанента Янку Станкевіча.

[141] Маецца на ўвазе стварэнне беларускіх арганізацыяў, лідары якіх, выказваючы рашучасць дабівацца ад уладаў забеспячэння ўсіх нацыянальных і сацыяльных правоў беларускага насельніцтва ў Польшчы, адначасова заяўлялі пра сваю поўную лаяльнасць да польскай дзяржаўнасці. Да такіх належалі створаная Янкам Станкевічам у 1927 г. Беларуская сялянская партыя і заснаваны ў 1930 г. Радаславам

Астроўскім і Антонам Луцкевічам Цэнтральны саюз беларускіх культурна-асветніцкіх арганізацыяў і інстытуцыяў (Цэнтрасаюз).

[142] Маецца на ўвазе турма, якая знаходзілася ў мурах былога рэфармацкага кляштара ў горадзе Грудзёндз на Памор'і (тэрыторыя былога прускага «забору»).

[143] Так у арыгінале. Відаць, маецца на ўвазе Версальская мірная канферэнцыя 1919 г.

[144] **Стэфанія Сэмпалоўская** (1870–1944), польская грамадска-асветная дзяячка, з 1919 г. прадстаўляла ў Польшчы савецкае Таварыства Чырвонага Крыжа.

[145] **Леанід Галяк** (1910–1980), беларускі грамадскі дзеяч. Скончыў юрыдычны факультэт Віленскага ўніверсітэта. Падчас нямецкай акупацыі працаваў юрыстам у Менску. З лета 1944 г. — на эміграцыі. Спачатку жыў у англійскай зоне акупацыі Нямеччыны, у 1949 г. пераехаў у ЗША.

[146] **Іван Касяк** (1909–1989), беларускі грамадскі дзеяч. Падчас вайны ўваходзіў у склад Цэнтралі БНС, быў актыўным прыхільнікам аўтакефаліі БПЦ. У 1944 г. — намеснік прэзідэнта БЦР на Глыбоцкую акругу. З лета 1944 г. — на эміграцыі. У траўні 1948 г. узяў удзел у аднаўленчым Пленуме БЦР, у 1948–1951 гг. узначальваў Сакратарыят БЦР. У ЗША з 1949 г. Спачатку жыў у Нью-Ёрку, затым з 1978 г. — у Рывер-Форэсце (Ілінойс). У 1957–1989 гг. — старшыня БККА. З'яўляўся сябрам Беларускага вызвольнага фронту, браў удзел у антыкамуністычных канферэнцыях у розных краінах свету, куды ездзіў за свой кошт. Аўтар кніг «З гісторыі Праваслаўнай Царквы беларускага народа» (1956), «Byelorussia: historical outline...» (1989).

[147] **Мікалай Лапіцкі** (1907–1976), беларускі грамадска-рэлігійны дзеяч. Высвячаны ў святары ў 1934 г., працаваў у прыходах у Ашмянах, Стэфанпалі (Дзісненскі павет). З 1942 г. — у Менску, актыўны прыхільнік БАПЦ. З лета 1944 г. — на эміграцыі, настаяцель першай беларускай царквы на Захадзе — царквы Св. Еўфрасінні Полацкай у Рэгенсбургу. З 1950 г. — у ЗША. Ініцыятар стварэння беларускіх прыходаў у юрысдыкцыі Канстанцінопальскага (сусветнага) патрыярхату. Арганізаваў беларускую праваслаўную парафію ў Саўт-Рыверы, яе настаяцель у 1950–1976 гг. Спрычыніўся таксама да арганізацыі парафіяў у юрысдыкцыі Канстанцінопальскага патрыярхату ў Чыкага (у 1958 г.),

аказваў падтрымку ў стварэнні аналагічных парафіяў у Рычманд-Гіле (Нью-Ёрк, Св. Кірылы Тураўскага) і Лондане (Св. Еўфрасінні Полацкай). Узначальваў Царкоўную Раду беларускіх праваслаўных парафіяў у Паўночнай Амерыцы.

[148] **Уладзіслаў Рыжы-Рыскі** (1925 (?) — 1978), беларускі каталіцкі святар. У гады Другой сусветнай вайны — дзеяч Беларускай народнай самапомачы ў Глыбоцкай акрузе, сакратар аддзела моладзі БЦР. З 1944 г. — на эміграцыі. Жыў у Нямеччыне, Бельгіі, Італіі, Іспаніі, ЗША. Са студзеня 1960 г. усклаў на сябе абавязкі апостальскага візітатара для беларусаў-каталікоў. Выдавец шэрагу беларускіх друкаў.

[149] Усе вышэйпералічаныя асобы, за выняткам хіба Я. Станкевіча, рэзка адмоўна паставіліся да аднаўлення аўтакефаліі Беларускай праваслаўнай царквы ў 1948 г. пры пасярэдніцтве Рады БНР (а Стагановіч быў сярод тых, хто браў удзел у саборыку БАПЦ у Канстанцы). Цягам некалькіх дзесяцігоддзяў Радзе БНР закідалі тое, што яна мае ўплыў на БАПЦ.

[150] **Максім Бурсевіч** (1890–1937), заходнебеларускі грамадска-палітычны дзеяч. Быў кіраўніком сакратарыята БСРГ. У 1927 г. польскія ўлады арыштавалі яго па справе Грамады, асудзілі на 8 гадоў зняволення, у 1930 г. — вызвалілі на распараджэнне прэзідэнта Польшчы. Выехаў у БССР, дзе ў 1933 г. падпаў пад рэпрэсіі. Расстраляны.

[151] **Фабіян Акінчыц** (1886–1943), беларускі грамадска-палітычны дзеяч, працаваў у БСРГ у якасці юрыста, сябра Галоўнай управы ТБШ. У 1927 г. польскія ўлады арыштавалі яго ў справе Грамады, асудзілі на 8 гадоў зняволення, у 1930 г. вызвалілі на распараджэнне прэзідэнта Польшчы. Адзін са стваральнікаў і лідараў Цэнтрасаюза, ініцыятар стварэння і старшыня Беларускай нацыянал-сацыялістычнай партыі. З 1939 г. — у Берліне, кіраўнік беларускага бюро прапаганды пры Міністэрстве прапаганды Нямеччыны. У лютым 1942 г. прыехаў у Менск, працаваў па лініі Міністэрства прапаганды Нямеччыны. Забіты партызанамі ў Менску.

[152] Сымон Рак-Міхайлоўскі, Пятро Мятла і Максім Бурсевіч сапраўды амаль адразу ж пасля свайго вызвалення выехалі ў СССР, а Браніслаў Тарашкевіч апынуўся тамсама праз 2 гады, трапіўшы перад гэтым яшчэ на 1,5 года ў польскую турму, гэтым разам ужо за выразна камуністычную дзейнасць. У той жа час Фабіян Акінчыц выправіўся

ў Нямеччыну толькі вясной 1939 г., а перад гэтым ён заставаўся ў Польшчы, спачатку беручы ўдзел у працы астроўска-луцкевіцкага Цэнтрасаюза, а затым без асаблівага поспеху намагаючыся разгарнуць дзейнасць заснаванай у 1933 г. Беларускай нацыянал-сацыялістычнай партыі.

[153] **Тчэў** (*Tczew*) — горад на поўначы Польшчы, цяпер уваходзіць у склад Паморскага ваяводства. У міжваенны перыяд чыгуначная станцыя ў Тчэве была першай пасля ўезду ў Польшчу з тэрыторыі вольнага горада Гданьска.

[154] **Францішак Аляхновіч** (1883–1944), беларускі драматург, грамадскі і культурны дзеяч.

[155] Маецца на ўвазе Другі аддзел Генеральнага штаба Войска Польскага, супрацоўнікі якога займаліся выведкаю.

[156] Тут Людвік Хамінскі відавочна пераблытаны з Сільвестрам Ваявудскім

[157] Сёння вёска **Дольная Рута** ўваходзіць у склад Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

[158] Аляксандр Стагановіч прыводзіць польскамоўную тэрміналогію розных падаткаў, якіх у міжваеннай Польшчы сапраўды было вельмі шмат. На сучасную беларускую мову іх можна перакласці прыблізна гэтак: падатак на маёмасць, падатак на прыбытак, падатак з гандлёвага абароту, дзяржаўны падатак, дарожны падатак, гмінны (самаўрадавы) падатак, зямельны падатак, шарваркавы падатак.

[159] Польскія мясцовыя ўлады часта выкарыстоўвалі пагрозу накладання разнастайных штрафаў і выплатаў дзеля таго, каб трымаць беларускіх сялянаў у падпарадкаванні сабе. Так, падчас парламенцкай выбарчай кампаніі адзін з актывістаў з Піншчыны пісаў, якім чынам у гэтай мясцовасці дасягалася яўка на выбары і галасаванне за ўрадавы спіс: *«Паліцыя пачала... штрафаваць сялян за што папала. За багры па 25 злотых, за коміны, за брамы... Калі не было да чаго прычапіцца, то за тое, што куры сядзелі пад печчу, а ў нас то ў кожнай гаспадарцы куры пад печчу. У час выбараў штрафы сыпаліся за тое, што дзіця адзін дзень да школы не пойдзе — па 10 злотых... То ўсё за тое, што не галасавалі за № 1»* (НА РБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 106. Арк. 150).

[160] Такая з'ява сапраўды ў той час мела месца, пра што сведчыў сярод іншых кс. Адам Станкевіч, запісаўшы ў сваім асабістым дзённіку

ў верасні 1938 г.: *«Інж. А. Клімовіча пазбавілі зямлі. Яго родная матка жадала перапісаць зямлю (6 дзесяцін, бацькаўшчына) на сына. Польскія ўлады не дазволілі, бо беларус. Бацька Я. Пазняка, б. рэдактара "Беларускай крыніцы", купіў 10 дзесяцін зямлі. Зрабіць купчую польскія ўлады не дазволілі, бо беларус: бацька і сын. Гэткіх і ім падобных фактаў адносінаў палякаў да беларусаў многа»* (Станкевіч А. З Богам да Беларусі. Вільня, 2008. С. 841).

[161] 8 ліпеня 1935 г. польскі Сейм прыняў новы выбарчы закон, паводле якога фармаванне выбарчых спісаў і размяшчэнне кандыдатаў у іх урад фактычна паставіў пад поўны кантроль. У выніку любая апазіцыйная партыя ці арганізацыя проста не магла балатавацца ў парламент, не дасягнуўшы папярэдняй згоды з уладамі. Тыя ж гатовыя былі рабіць пэўныя крокі насустрач толькі вельмі моцным і ўплывовым партыям, як, напрыклад, Украінскаму народна-дэмакратычнаму аб'яднанню (УНДА) ва Усходняй Галіччыне. У беларусаў жа ніводнай партыі ці арганізацыі, думкі якой польскія ўлады не маглі сабе дазволіць ігнараваць, не было. Да таго ж сярод беларускай грамады ў Польшчы не было адзінства, у выніку чаго выпрацаваць агульную пазіцыю ў дачыненні ўдзелу ці няўдзелу ў выбарчай кампаніі было проста немагчыма. У выніку ўсе беларускія арганізацыі выбары прабайкатавалі, фактычна не ўзгадняючы такую сваю тактыку паміжсобку.

[162] **Уладзімір Журко** (каля 1895 —?) быў адным з галоўных дзеячаў КПЗБ у Нясутычах і ў 1928 г. праходзіў на працэсе ў Наваградку па адной справе з А. Стагановічам. У адрозненне ад Стагановіча ён падчас следства асабіста прызнаў, што *«быў членам райкама г. Наваградак, меў псеўданім "Апанас"; удзельнічаў у 4-х раённых канферэнцыях, якія адбыліся: восенню 1927 года ў кустах каля хутара Мольнічы, у лістападзе 1927 года на кватэры Мальца, дзе старшынявала "Шурка"* [Ванда Міхалеўская], *у снежні 1927 года ў вёсцы Навошыне, а таксама ў студзені 1928 года ў доме Івана Мальца; што трохразова ездзіў у Баранавічы ў Акруговы камітэт па справах партыі; што яго прызначылі сябрам Акруговага камітэта Саюза камуністычнай моладзі; што ў пачатку 1928 года быў у Баранавічах на канферэнцыі Акруговага камітэта, дзе абмяркоўваліся справы партыі, а таксама перадвыбарчая сітуацыя, прывёз камуністычныя адозвы з Баранавічаў у Наваградак»*. Адначасова з тым ён даў польскаму суду сведчанне і супраць свайго земляка Стагановіча, сцвярджаючы, *«што калі яму Антон Малец прапанаваў*

*стварыць ячэйку ў Нясутычах, то тады ён назваў Стагановіча Аляксандра як надзейнага чалавека, які пасадзейнічае яму ў арганізацыі ячэйкі»*. Урэшце У. Журко быў тады прысуджаны судом да 4 гадоў цяжкой турмы.

[163] **Леў Стагановіч** (1926–2008), сын Аляксандра Стагановіча. Падчас Другой сусветнай вайны быў у Саюзе беларускай моладзі, вучыўся ў настаўніцкай семінарыі. З 1944 г. разам з бацькамі — на эміграцыі, скончыў 2 курсы медыцынскага факультэта Марбургскага ўніверсітэта. З 1950 г. у ЗША, працаваў крэсляром у фірме. Актыўна ўдзельнічаў у беларускім праваслаўным жыцці ў Амерыцы.

[164] **Аляксандр Стагановіч** (1921–1974), старэйшы сын Аляксандра Стагановіча.

[165] **Канстанцін Гаўрош** (Гаўраш) (1914 —?), нарадзіўся ў вёсцы Куравічы, меў пачатковую адукацыю. У 1921–1936 гг. быў пастухом і парабкам, у 1936–1938 гг. служыў у польскім войску. У 1932 г. уступіў у КПЗБ, узначальваў партыйную ячэйку вёскі Куравічы. Знявольваўся польскімі ўладамі ў баранавіцкай турме. З верасня 1939 г. займаў пасаду намесніка старшыні Куравіцкага валаснога сялянскага камітэта, пасля быў старшынёй мясцовага сельскага савета. Падчас нямецка-савецкай вайны ваяваў, быў паранены. У 1944 г. вярнуўся дахаты, зноў узначальваў сельскі савет, а пасля працаваў у Навагрудку загадчыкам камунальнай гаспадаркі, загадчыкам дарожнага аддзела і дырэктарам мясцовага вадаправоду. З 1970 г. — на пенсіі.

[166] Маецца на ўвазе Народны сход Заходняй Беларусі, які адбыўся 28–30 кастрычніка 1939 г. у Беластоку і на якім прынялі рашэнне Заходняй Беларусі ўвайсці ў склад БССР. «Выбары» дэлегатаў на гэты сход праходзілі 22 кастрычніка 1939 г.

[167] **Антон Малец** (партыйны псеўданім Стась) (1903–1945), актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, сябра КПЗБ з 1924 г. З'яўляўся сакратаром Навагрудскага райкама КПЗБ. У 1928 г. выбіраўся і ў Навагрудскую акруговую ўправу ТБШ, якое ў той час знаходзілася пад моцным уплывам камуністаў. За рэвалюцыйную дзейнасць 9 гадоў сядзеў у турме, у тым ліку паўтара года ў канцлагеры Картуз-Бяроза. У 1939–1941 гг. працаваў старшынёй Навагрудскага райвыканкама. Прапаў без вестак на фронце падчас нямецка-савецкай вайны.

[168] Ортскамендант — начальнік ортскамендатуры (мясцовай камендатуры), вайскова-адміністрацыйнага органа на акупаваных нямецкімі войскамі тэрыторыях, задачамі якога было падтрымліваць парадак, забяспечваць армію і вырашаць гаспадарчыя праблемы, рэгуляваць жыццё цывільнага насельніцтва, працаваць з ваеннапалоннымі і задушваць магчымы сабатаж ды супрацiў.

[169] **Васіль Пляскач** (1916–2006). Нарадзіўся ў Наваградку. Скончыў Віленскі ўніверсітэт імя Стафана Баторыя з дыпломам юрыста. Падчас нямецкай акупацыі працаваў міравым суддзёй у Наваградку. З лета 1944 г. — на эміграцыі. Жыў з сям'ёй у Швейцарыі, потым у Нямеччыне. З 1949 г. у ЗША. Жыў напачатку ў штаце Масачусетс, потым перабраўся ў штат Мічыган (Дэтройт). Працаваў на заводах «Джэнерал Моторз» у аддзеле дызайну. Браў актыўны ўдзел у беларускім грамадскім жыцці ў ЗША, стварэнні структураў Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы (БАПЦ).

[170] Гебітскамісарыят — кіроўны орган нямецкай адміністрацыі, улада якога распаўсюджвалася на пэўную акругу (гебіт).

[171] У жніўні 1942 г. партызаны застрэлілі Вольфмаера ў Налібоцкай пушчы.

[172] **Народна-працоўны саюз расійскіх салідарыстаў** (Народно-трудовой союз российских солидаристов — НТС) — грамадска-палітычная арганізацыя, створаная маладым пакаленнем расійскай эміграцыі ў 1930 г. у Бялградзе (Югаславія). Яе сябры імкнуліся па-новаму змагацца за вызваленне Расіі ад бальшавізму — не зброяй, а ідэямі і выхаваннем уласнага характару. Камуністычным ідэям НТС супрацьпастаўляў ідэі салідарызму, заснаваныя на расійскай рэлігійнай філасофіі пачатку XX ст. Арганізацыя існуе і цяпер.

[173] **Аляксандр Орса** (1896–1959), беларускі грамадска-палітычны і культурны дзеяч. У 1923–1928 гг. вучыўся ў Карлавым універсітэце ў Празе, а пасля вяртання ў Заходнюю Беларусь выкладаў у Наваградскай беларускай гімназіі, затым у польскіх школах. У часе вайны быў школьным інспектарам Наваградскай акругі. У 1944 г. выехаў у Нямеччыну, быў дырэктарам Беларускай гімназіі імя Янкі Купалы ў Рэгенсбургу (Міхельсдорфе). У 1949 г. выехаў у ЗША. Браў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці: у працы Беларуска-амерыканскага задзіночання, БІНІМа.



*Аляксандр Стагановіч у царскай арміі.*
*Першая сусветная вайна*



*Аляксандр Стагановіч (першы злева) абраны ў сельскую ўправу*



*Аляксандр Стагановіч (ляжыць, трэці злева) у царскай арміі*



*Аляксандр Стагановіч (сядзіць, першы злева) у Салуні (Салоніках). 15.11.1916*



*Аляксандр Стагановіч на Балканскім фронце, у Македоніі (ляжыць, першы злева)*



*Аляксандр Стагановіч
у часы Першай сусветнай вайны*



*Жонка Марыя Стагановіч.
1926 г.*



*Аляксандр Стагановіч —*
*пасол польскага Сейма. 1928 г.*




*Арыштаваны польскімі ўладамі.*
*1928 г.*



*Дзеці Аляксандра Стагановіча
пасля прыходу амерыканскай арміі. 1945 г.*



*Марыя і Аляксандр Стагановічы з сынам Юркам.
Баварыя. Другая палова 1940-х гг.*



*Філарэт Родзька і Аляксандр Стагановіч. 1970-я гг.*



*У царкве Жыровіцкай Божай Маці. Злева направа: Аляксандр Стагановіч, айцец Васіль Кендыш, Філарэт Родзька. Пачатак 1970-х гг.*



*Аляксандр і Марыя Стагановічы з сынам Лёвам, жаўнерам амерыканскай арміі*



*Аляксандр Стагановіч з дачкой Тамарай, выпускніцай Western College, Оксфард, Агаё*

[174] Тут маецца на ўвазе Менскае намесніцтва, створанае ў ліпені 1941 г., якое ахоплівала 21 раён Беларусі (старшыня Радаслаў Астроўскі). Пасля ўсталявання ў Беларусі цывільнай адміністрацыі, стварэння Генеральнай акругі Беларусь і падзелу яе на паветы да канца 1941 г. пасады ў Менскім намесніцтве скасавалі. Таму, відаць, Аляксандр Стагановіч нешта блытае храналагічна.

[175] **Мікола Буляк** (1915 —?), беларускі дзеяч, паводле адукацыі адвакат. Падчас нямецкай акупацыі — старшыня павета ў Наваградку. У студзені 1944 г. Р. Астроўскі запрасіў яго ў радныя БЦР. З лета 1944 г. — на эміграцыі. З 1946 г. жыў у Вялікабрытаніі, быў адным з кіраўнікоў Згуртавання беларусаў у Вялікай Брытаніі (ЗБВБ) у 1947 г. Пасля стварыў Хрысціянскае аб'яднанне беларускіх работнікаў, сябры якога ў траўні 1948 г. афіцыйна выйшлі з ЗБВБ. Пасля 1948 г. захварэў на манію пераследу, доўгі час правёў у лякарнях.

[176] **Павел Якуцэвіч** (1893–1945), беларускі дзеяч. Паводле ўласнай аўтабіяграфіі, сярэднюю адукацыю атрымаў у 1913 г. у Сувалках і Кіеве, пасля скончыў вайсковую юнкерскую школу ў Кіеве. У 1914 г. быў прызваны на вайсковую службу. З 1918 да 1922 г. быў у якасці добраахвотніка ў Белай Арміі, з якой адступіў у Галіполі і пасля ў Балгарыю. Быў пяць разоў паранены, меў вайсковае званне капітана. У 1922 г. прыехаў у Польшчу, з 1922 г. да 1924 г. працаваў у дрэваапрацоўчай прамысловасці. З 1925 г. да 1939 г. працаваў у польскай фінансавай адміністрацыі ў Горадні ў якасці намесніка кіраўніка. Пасля прыходу Чырвонай Арміі на кароткі час арыштаваны камуністамі, пасля вызвалення працаваў інспектарам у фінансавай адміністрацыі. У снежні 1940 г. зноў арыштаваны. Пасля прыходу немцаў восенню 1941 г. арганізаваў у Горадні мясцовую беларускую паліцыю. З другой паловы лістапада 1941 г. — старшыня Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэта. Пасля кіраваў Самапамаччу на Наваградчыне, у 1944 г. быў інспектарам Беларускай краёвай абароны (БКА), працаваў у Менску. Павешаны бальшавікамі ў Наваградку.

[177] 7 лютага 1944 г. Астроўскі прызначыў намеснікам прэзідэнта БЦР на Наваградскую акругу Барыса Рагулю, ён жа (Рагуля) 25 лютага 1944 г. стаў акруговым намеснікам БКА. Праўда, у траўні — чэрвені 1944 г. адначасова функцыі Акруговага начальніка БКА ў Наваградку выконвалі і Барыс Рагуля, і Філарэт Родзька.

[178] Цікава, што ў траўні 1944 г. Радаслаў Астроўскі выступіў з рэзкай крытыкай слуцкага гебітскамісара, які ствараў у акрузе «абаронныя вёскі», тым самым падстаўляючы мірнае насельніцтва. Прэзідэнт БЦР звяртаў увагу на тое, што гэтыя войскі слаба ўзброеныя, і настойваў на тым, каб туды далучылі фармаванні БКА і паліцыі.

[179] **Іван Ермачэнка** (1894–1970), беларускі грамадска-палітычны дзеяч. У Грамадзянскую вайну ў Расіі быў ад'ютантам генерала П. Урангеля. У 1921 г. — прадстаўнік урада БНР у Канстанцінопалі і генеральны консул на Балканах, заснаваў консульскія аддзелы БНР у Югаславіі і Балгарыі. У міжваенны перыяд жыў у Празе. Падчас Другой сусветнай вайны ўзначальваў Беларускую народную самапомач. У красавіку 1943 г. выдалены пад нагляд гестапа ў Прагу. Пасля капітуляцыі Нямеччыны працаваў у структурах ЮНРРА. Пры канцы 1947 г. — на пачатку 1948 г. пераехаў у Нью-Ёрк. Заснаваў Злучаны беларуска-амерыканскі дапамаговы камітэт (1948), у тым жа годзе быў прызначаны паўнамоцным паслом БЦР у ЗША. Падтрымліваў прыхільнікаў Радаслава Астроўскага, у сярэдзіне 1950-х адышоў ад актыўнай грамадскай працы з прафесійных прычынаў (быў прызначаны кіраўніком шпіталя ў Бінгемптане, штат Нью-Ёрк), тым не менш браў сталы ўдзел у беларускіх святкаваннях і беларускіх форумах прыхільнікаў БККА і БЦР.

[180] Апроч згаданага вышэй (зноска 146) Івана Касяка, былі яшчэ **Кастусь Касяк**, які падчас вайны ўзначальваў адміністрацыю ў Вілейцы (павешаны саветамі ў 1944 г.), і **Лявон Касяк** (1920–2008), што ўзначальваў Маладзечанскую павятовую паліцыю. З лета 1944 г. — на эміграцыі. Змяніў прозвішча на Касоўскі. Ажаніўся з дачкой а. Мікалая Лапіцкага Лёляй. Актыўнага ўдзелу ў беларускім грамадскім жыцці не браў.

[181] **Эмануіл Ясюк** (1906–1977), беларускі грамадскі дзеяч, паводле адукацыі інжынер. У 1930-х скончыў універсітэт Льежа (Бельгія). Падчас нямецкай акупацыі — старшыня Стаўпецкага раёна, удзельнічаў ва Усебеларускім Царкоўным Саборы (жнівень 1942 г.) і II Усебеларускім кангрэсе. З лета 1944 г. — на эміграцыі. Ад пачатку 1950-х гг. жыў у Пасэйку (Нью-Джэрсі, ЗША), суўладальнік кампаніі «Крыс Электронікс». Адзін з кіраўнікоў арганізацыі «Амерыканскія прыхільнікі БЦР», віцэ-прэзідэнт БККА, адзін з фундатараў будоўлі царквы Св. Еўфрасінні Полацкай у Саўт-Рыверы.

[182] Апроч доктара **Мікалая Шчорса** (гл. зноску 107) Стагановіч мае на ўвазе ягоных братоў, што таксама належалі на эміграцыі да лагера прыхільнікаў БЦР і БККА. **Барыс Шчорс** (1916–1975) быў камендантам беларускага лагера ў Міхельсдорфе. З 1949 г. — у ЗША, Саўт-Рывер. У 1951 г. узначаліў Беларускае выдавецкае таварыства пры ЗБАДК, а потым пры БККА. Уваходзіў у склад рэдакцыі «Беларускай думкі», у кіроўчыя органы БККА. Ініцыятар пабудовы Беларускага грамадскага цэнтра ў Саўт-Рыверы. **Ігар Шчорс** (1918–1992), падчас нямецкай акупацыі начальнік менскай крымінальнай паліцыі, у 1944 г. — камандзір 27-га батальёна БКА. З лета 1944 г. — на эміграцыі. Ад 1949 г. — у ЗША, Саўт-Рывер. Браў актыўны ўдзел у жыцці парафіі і грамадска-культурных арганізацыяў. Належаў да БККА, удзельнік пленумаў БЦР, у тым ліку апошняга, у 1988 г.

[183] Відаць, гаворка пра **Міхаіла Ігнатовіча**. Нарадзіўся ў сям'і святара ў Глыбокім. У паваеннай Нямеччыне — камендант Беларускага лагера ў Міхельсдорфе, калі ў ім пераняў кіраўніцтва прыхільнікі Радаслава Астроўскага. У 1948 г. пераехаў у ЗША, пасяліўся ў Пасэйку (Нью-Джэрсі), адзін з заснавальнікаў Злучанага беларуска-амерыканскага дапамаговага камітэта, на эміграцыі падтрымліваў БЦР.

[184] **Аляксандр Русак** (1907–1957), беларускі грамадска-палітычны дзеяч. Скончыў Познанскі ўніверсітэт (1934), інжынер. У 1939–1941 гг. — старшыня Беларускага камітэта ў Познані, улетку 1941 г. — арганізатар Беларускага камітэта ў Горадні, у 1942 г. у Баранавічах заснаваў Адміністрацыйна-гандлёвую школу. У 1943 г. — бурмістр Баранавічаў. У паваеннай Нямеччыне — арганізатар Беларускага лагера ў Рэгенсбургу. Спрычыніўся да арганізаванага выезду беларусаў у ЗША і стварэння беларускага асяродку ў Саўт-Рыверы. З 1948 г. — старшыня Галоўнай управы Цэнтральнага прадстаўніцтва беларускай эміграцыі (якое мелася замяніць БЦР), удзельнік аднаўленчага пленума БЦР у траўні 1948 г., у першым урадзе БЦР — міністр замежных спраў і аддзела фінансаў БЦР, з 1952 г. — кіраўнік Выканаўчага органа БЦР (аналаг урада БНР). Адзін з ініцыятараў стварэння Беларускага кангрэсавага камітэта.

[185] **Надзея Абрамава** (Тэадаровіч) (1907–1979), беларуская дзяячка, галоўная кіраўніца юначак СБМ, сябра Рады даверу, удзельніца II Усебеларускага кангрэса. Летам 1944 г. эвакуявалася ў Нямеччыну.

Пасля вайны працавала ў мюнхенскім Інстытуце вывучэння СССР, займалася пытаннямі рэлігіі і атэізму, выдавала часопіс «Рэлігія і атэізм у СССР». Належала да прыхільнікаў БЦР (удзельніца аднаўленчага пленума БЦР), уваходзіла ў Дэлегатуру БЦР у Нямеччыне.

[186] Адметна, што сярод «вырадкаў беларускага народа» Стагановіч пералічвае выключна сваіх палітычных супрацоўнікаў на эміграцыі: тых, хто падтрымліваў арганізацыі, прыхільныя БЦР і БККА ў ЗША. Між тым аналагічныя пасады падчас вайны займалі і далейшыя дзеячы Рады БНР на эміграцыі: Станіслаў Станкевіч, Барыс Рагуля, Язэп Малецкі, Васіль Кендыш, якіх аўтар успамінаў не крытыкуе. Зрэшты, сяброўскія адносіны на эміграцыі ён захаваў толькі з адным прыхільнікам БЦР — сваім калегам па Беларускім пасольскім клубе Васілём Рагулем.

[187] **Вінцэнт Гадлеўскі** (1898–1942), беларускі каталіцкі святар і палітык, адзін з лідараў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Падчас вайны супрацоўнічаў з акупацыйнымі ўладамі, у канцы 1942 г. гестапа арыштавала яго і забіла.

[188] **Вацлаў Іваноўскі** (1880–1943), беларускі нацыянальны дзеяч, адзін з галоўных стваральнікаў і ідэолагаў беларускага нацыянальнага руху. Падчас Другой сусветнай вайны — бурмістр Менска. Забіты пры не высветленых да канца варунках.

[189] **Уладзіслаў Казлоўскі** (1896–1943), беларускі дзеяч, у 1934–1937 гг. адзін з заснавальнікаў і лідараў Беларускай нацыянал-сацыялістычнай партыі, рэдактар газеты «Новы шлях». У 1942–1943 гг. рэдактар «Беларускай газеты». Забіты савецкімі партызанамі.

[190] Галоўная праблема палягала ў тым, што іншых епіскапаў не было, а пералічаныя епіскапы або паходзілі з Беларусі, або ў 1930-х пражывалі на беларускіх землях, кіруючы структурнымі адзінкамі.

[191] **Панцеляймон** (у свецкім жыцці — Павел Ражноўскі) (1867–1950), праваслаўны святар, царкоўны і грамадскі дзеяч. Епіскап Пінскі, выступаў супраць аўтакефаліі Праваслаўнай царквы ў Польшчы, з-за чаго з 1922 г. знаходзіўся пад адміністрацыйным наглядам, а з 1931 г. — у ссылцы ў Жыровіцкім манастыры. У гады Другой сусветнай вайны браў удзел у арганізацыі царкоўна-рэлігійнага жыцця на акупаванай нямецкімі войскамі тэрыторыі Беларусі. З набліжэннем нямецка-савецкага фронту ў чэрвені 1944 г. выехаў у Нямеччыну.

У 1946 г. з іерархамі епіскапату БАПЦ перайшоў у Рускую зарубежную праваслаўную царкву. Пасля далучэння БАПЦ да РЗПЦ узначаліў Беларускую мітраполію ў складзе Рускай зарубежнай праваслаўнай царквы.

[192] **Венядзікт** (у свецкім жыцці Васіль Бабкоўскі) (1876–1951), рэлігійны дзеяч, з 1918 г. — святар кафедральнага сабора ў Наваградку, з 1937 г. — настаяцель Успенскага Жыровіцкага манастыра. Падчас нямецкай акупацыі быў епіскапам Берасцейскім, архіепіскапам Гарадзенскім і Беластоцкім, экзархам Усходняй Прусіі. Праціўнік абвешчання аўтакефаліі БАПЦ. У 1944 г. эвакуяваўся ў Нямеччыну і ўвайшоў у склад клеру Рускай зарубежнай праваслаўнай царквы. Быў архіепіскапам Берлінскім і Германскім.

[193] **Сцяпан** (у свецкім жыцці Сямён Сеўба) (1872–1965), беларускі рэлігійны дзеяч. У міжваенны час служыў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, быў зацятым праціўнікам аўтакефаліі Польскай праваслаўнай царквы. У 1942 г. пастрыжаны ў манаства, пазней узведзены ў сан епіскапа Бранскага і Смаленскага. З лета 1944 г. — на эміграцыі, перайшоў у РЗПЦ, быў вызначаны епіскапам Венскім і Зальцбургскім.

[194] **Філафей** (у свецкім жыцці Уладзімір Нарко) (1905–1986), беларускі праваслаўны дзеяч. У 1941 г. высвячаны на епіскапа. У гады Другой сусветнай вайны ўдзельнічаў у аднаўленні і фармаванні царкоўнага кіраўніцтва БАПЦ, прызначаны епіскапам Магілёўскім і Мсціслаўскім. З 1944 г. — на эміграцыі. Разам з трыма іншымі іерархамі епіскапату БАПЦ у 1946 г. перайшоў у Рускую зарубежную праваслаўную царкву. З канца 1940-х гг. стала жыў у Нямеччыне. У 1950–1960-х Радаслаў Астроўскі, Мікалай Лапіцкі і Іван Касяк вялі з ім перамовы, каб узначаліў Беларускую царкву ў складзе Канстанцінопальскага патрыярхату. Неаднаразова на іхнае запрашэнне наведваў ЗША.

[195] **Апанас** (у свецкім жыцці Антон Мартас) (1904–1984), беларускі рэлігійны дзеяч. У сакавіку 1942 г. у Менску высвячаны на епіскапа Віцебскага і Полацкага. З лета 1944 г. — на эміграцыі. У душпастырскай працы паслугоўваўся беларускай мовай, выкладаў рэлігію ў беларускай гімназіі ў Рэгенсбургу, супрацоўнічаў з беларускай праваслаўнай прэсай, выдаў падручнік Старога Запавету на беларускай мове. З канца 1950-х гг. жыў у Буэнас-Айрэсе (Аргенціна), потым

у Сіднеі (Аўстралія), потым зноў у Буэнас-Айрэсе, дзе ўзначальваў епіскапствы РЗПЦ. У 1950–1960-х Радаслаў Астроўскі, Мікалай Лапіцкі і Іван Касяк некалькі разоў вялі з ім інтэнсіўныя перамовы (апошні раз у 1973 г.), каб узначаліў Беларускую царкву ў складзе Канстанцінопальскага патрыярхату.

[196] **Рускую зарубежную праваслаўную царкву** (Рускую праваслаўную царкву за мяжой) стварылі ў 1921 г. прадстаўнікі расійскай царкоўнай эміграцыі. Узначальваў мітрапаліт з рэзідэнцыяй у амерыканскім горадзе Джорданвіль (штат Нью-Ёрк). Афіцыйна не прызнавалася аўтакефальнымі праваслаўнымі цэрквамі. У траўні 2007 г. аб'ядналася з Рускай праваслаўнай царквой, але захавала самакіраванне.

[197] Прыхільнікі Радаслава Астроўскага — Іван Касяк, Мікола Шчорс, Мікалай Лапіцкі ды інш. — адмоўна паставіліся да пераходу епіскапаў БАПЦ у РЗПЦ, спрабавалі перакаць іерархаў вярнуцца. Ад 1950 г. яны прыйшлі да высновы аб неабходнасці стварэння беларускіх парафіяў у юрысдыкцыі Канстанцінопальскага патрыярхату.

[198] **Украінская аўтакефальная праваслаўная царква** — Праваслаўная царква ва Украіне і за яе межамі, самастойнасць якой ад Маскоўскай патрыярхіі ўпершыню абвесцілі ў 1920 г. Адноўленая ў 1942 г. падчас нямецкай акупацыі. Пасля вайны дзеяла на эміграцыі. У цяперашні час легальна дзеіць і ва Украіне, у асноўным у заходніх абласцях.

[199] **Вячаслаў Навуменка** (1883–1979), расійскі вайсковы дзеяч, генерал-лейтэнант Генштаба. Падчас Грамадзянскай вайны ў Расіі служыў у Добраахвотніцкай арміі. Пасля паразы Белай Арміі выехаў на эміграцыю, дзе быў нязменным Паходным атаманам Кубанскага казацкага войска. Падчас Другой сусветнай вайны часова займаў пасаду начальніка Галоўнага кіравання казацкіх войскаў. Пасля вайны выехаў у ЗША.

[200] **Сяргей Паўлаў** (1896–1944), адзін з кіраўнікоў антыбальшавіцкага казацкага руху, генерал-маёр вермахта (пасмяротна). Падчас Грамадзянскай вайны ў Расіі ваяваў з бальшавікамі на Доне, пасля заканчэння вайны хаваўся пад чужым прозвішчам. Пасля ўступлення немцаў у горад Новачаркаск пачаў фармаванне казацкіх атрадаў, сфармаваў 5 казацкіх палкоў. Са снежня 1943 г. — паходны атаман казацкіх войскаў. Загінуў у баі з партызанамі.

[201] Маецца на ўвазе Наваградскі беларускі эскадрон, якім камандаваў Барыс Рагуля (1920–2005).

[202] **Браніслаў Камінскі** (1899–1944), адзін з камандзіраў расійскіх фармаванняў у складзе войскаў СС, брыгадэнфюрэр СС і генерал-маёр войскаў СС (1944). Расстраляны немцамі за марадзёрства.

[203] **Уладзімір Парэмскі** (1909–1997), расійскі эміграцыйны дзеяч, адзін з кіраўнікоў НТС. У 1920 г. эвакуяваўся ў Югаславію, затым жыў у Францыі і Нямеччыне. У гады вайны працаваў перакладчыкам у МЗС Нямеччыны, затым у лагерах Усходняга міністэрства. У 1944 г. немцы арыштавалі яго, але вызвалілі на хадайніцтва генерала А. Уласава. Пасля вайны жыў у Нямеччыне, у 1955–1972 гг. узначальваў НТС.

[204] **Уладзімір Самарын** (сапр. Сакалоў) (1913–1995), расійскі эміграцыйны дзеяч. Перад вайною жыў на тэрыторыі СССР. З ліпеня 1942 г. — на тэрыторыі нямецкай акупацыі. Працаваў у акупацыйнай прэсе, чытаў лекцыі вайскоўцам Рускай вызваленчай арміі. У 1944 г. выехаў на Захад, рэдагаваў розныя расійскія эмігранцкія выданні. Быў актыўным дзеячам НТС. У 1951 г. пераехаў у ЗША. У 1970-х гг. амерыканскія іміграцыйныя ўлады прыцягвалі яго да судовай адказнасці за падаванне несапраўдных звестак пра час свайго знаходжання на акупаванай немцамі тэрыторыі. У 1985 г. пазбаўлены грамадзянства ЗША і асуджаны на высылку. Апошнія гады жыцця правёў у Канадзе.

[205] Намеснікамі прэзідэнта БЦР былі: на Наваградскую акругу — Барыс Рагуля, на Баранавіцкую — Станіслаў Станкевіч, на Вілейскую — Язэп Малецкі; начальнікам БКА быў Франц Кушаль, у кіраўніцтва БЦР уваходзілі Аўген Калубовіч і Сымон Кандыбовіч — будучыя паплечнікі Стагановіча на эміграцыі. Карыстаючыся логікай аўтара ўспамінаў, ім таксама не мусяць дараваць ні гісторыя, ні беларускі народ. Але Стагановіч на гэта «забываецца» і бэсціць выключна паваенных прыхільнікаў Астроўскага, за выняткам Васіля Рагулі, і праціўнікаў Абрамчыка, што выйшлі з Рады БНР.

[206] Аляксандр Стагановіч выдае жаданае за сапраўднае. Пасля смерці ў сакавіку 1943 г. старшыні Рады БНР Васіля Захаркі толькі абмежаванае кола людзей — і дакладна не аўтар успамінаў — ведалі пра перадаванне паўнамоцтваў Міколу Абрамчыку. Ідэя аднаўлення Рады БНР толькі пачала афармляцца ўвосень 1945 г. А ўлетку 1944 г. адзіным

прадстаўнікоў інтарэсаў беларускага народа на эміграцыі сапраўды падавалася БЦР.

[207] **Тамара Стагановіч** (нар. 1930), дачка Аляксандра Стагановіча, вядомая беларуская мастачка.

[208] Эскадрон Барыса Рагулі браў удзел у пацыфікацыйнай акцыі пры канцы траўня — першай палове чэрвеня 1944 г. Падчас II Усебеларускага кангрэса ён ахоўваў гэтае мерапрыемства.

[209] **Граева** (*Grajewo*) — горад у Польшчы на поўначы Падляскага ваяводства.

[210] Відаць, пад Б. Н. Камітэтам маецца на ўвазе Беларуская Цэнтральная Рада, сябры якой якраз дзесьці ў той час эвакуяваліся з Менска ў Кёнігсберг, каб неўзабаве выправіцца адтуль у Берлін.

[211] **Філарэт Родзька** (1890–1977), беларускі дзеяч, у 1919–1920 гг. — удзельнік вайсковых фармаванняў С. Булак-Балаховіча. У 1942–1943 гг. настаўнік Наваградскай настаўніцкай семінарыі, з 1943 г. — дырэктар беларускай прагімназіі ў Наваградку, у траўні — чэрвені 1944 г. — акруговы начальнік БКА ў Наваградку. Ад 1944 г. — на эміграцыі, ад 1949 г. — у ЗША. Быў старшынёй аддзела БАЗА ў штаце Нью-Джэрсі, старшынёй аддзела Рады БНР у Нью-Джэрсі.

[212] **Мадэст Норык** (1892–1974), дзеяч грамадскага руху ў Наваградку. Да 1917 г. — афіцэр царскай арміі, у 1944 г. — асветны афіцэр БКА ў Наваградку.

[213] Тут, відаць, вядзецца пра **Уладзіміра Русака** (1913–2009), афіцэра БКА. Скончыў школу падхаружых у Зэмбраве (1935). У 1949 г. разам з жонкай Ганнай Русак выехаў з Нямеччыны ў ЗША. Браў актыўны ўдзел у дзейнасці БАЗА, кіраваў нью-ёркскім аддзелам БАЗА, уваходзіў у рэдкалегію газеты «Беларус».

[214] **Юрка Мазура** (1916–1990), беларускі грамадскі дзеяч. Швагер Язэпа Сажыча. Падчас нямецкай акупацыі — лейтэнант Наваградскага эскадрона, камандзір узвода, потым — афіцэр у Дальвіцкай школе. Пасля капітуляцыі Нямеччыны вучыўся ва ўніверсітэце Філіпса ў Марбургу, дзе стварыў студэнцкі хор. У 1949 г. выехаў у ЗША, пасяліўся ў Дэтройце. Разам з Язэпам Сажычам стварыў у Дэтройце аддзел БАЗА, браў удзел у стварэнні беларускай праваслаўнай парафіі ў Дэтройце.

[215] **Францішак Бартуль** (1918–2005), дзеяч беларускай эміграцыі. Перад Другой сусветнай вайной жыў у Латвіі. У 1944 г. скончыў Віленскую беларускую настаўніцкую семінарыю, выехаў на эміграцыю, жыў у Нямеччыне і Італіі, з другой паловы 1940-х гг. — у Вялікабрытаніі, дзе стаў адным з заснавальнікаў Згуртавання беларусаў у Вялікабрытаніі. З 1957 г. — у ЗША, узначальваў Беларускае акадэмічнае каталіцкае аб'яднанне «Рунь» і Фундацыю імя П. Крэчэўскага (1982).

[216] Маецца на ўвазе горад Дальвіц ва Усходняй Прусіі, дзе летам 1944 г. Абвер арганізаваў адмысловы навучальны цэнтр, які рыхтаваў добраахвотнікаў для наступнай дыверсійнай працы ў Беларусі. Палітычным кіраўніком гэтага цэнтра быў Усевалад Родзька.

[217] **Міхась Рагуля** (1914–2002), беларускі дзеяч, сын Васіля Рагулі. Падчас нямецкай акупацыі працаваў загадчыкам Аддзела культуры ў Віцебску, займаўся пытаннямі выдавецтва, школьніцтва, тэатра. Рэдагаваў бюлетэнь Беларускай незалежніцкай партыі. З лета 1944 г. — на эміграцыі. Вучыўся ў Нямеччыне, атрымаў дыплом інжынера, зрабіў кар'еру ў сферы будаўніцтва фабрычных печаў. З 1950 г. жыў у ЗША.

[218] **Усевалад Родзька** (1920–1946 (?)), беларускі палітычны і вайсковы дзеяч, публіцыст. З ліпеня 1941 г. быў бурмістрам Віцебска. Арганізатар нацыянальнага падпольнага і партызанскага руху. Ад сакавіка 1944 г. — камандзір 15-га батальёна БКА. Ад лета 1944 г. знаходзіўся ў Нямеччыне, быў адным з камандзіраў беларускага дэсантнага батальёна «Дальвіц». З чэрвеня 1945 г. жыў пад чужым прозвішчам у Польшчы, арганізоўваў падпольныя структуры. Арыштаваны і дэпартаваны ў Менск у 1945 г. Далейшы лёс дакладна невядомы.

[219] Маюцца на ўвазе Тацяна і Барбара Мазуры, сёстры Юркі Мазуры. **Барбара Мазура** (1919–1978). З лета 1944 г. — на выгнанні. Была жаўнеркай батальёна «Дальвіц». У 1946–1949 гг. вучылася ў Філіпс-універсітэце ў Марбургу. Узяла шлюб з Язэпам Сажычам. У ЗША — з 1949 г. Брала ўдзел у працы дэтройцкага аддзела БАЗА.

[220] **Язэп Сажыч** (1917–2007), беларускі грамадска-палітычны дзеяч. Падчас нямецкай акупацыі ўдзельнічаў у арганізацыі беларускіх вайсковых адзінак. З 1944 г. — на эміграцыі. У 1950 г. скончыў Марбургскі ўніверсітэт у Нямеччыне з дыпломам лекара і выехаў у ЗША. Стаў адным з заснавальнікаў аддзела БАЗА ў штаце Мічыган. З 1953 г. — сябра, у 1982—1997 — старшыня Рады БНР.

[221] **Кастусь Мерляк** (1919–2007), беларускі дзеяч, падчас нямецкай акупацыі працаваў у беларускай адміністрацыі на Навагрудчыне, у Беларускай народнай самапомачы, быў інтэндантам у Навагрудскім беларускім эскадроне. З лета 1944 г. — на эміграцыі. Інтэрнаваны амерыканскімі войскамі ў Італіі, у 1947 г. выехаў у Аргенціну, дзе заснаваў Згуртаванне беларусаў, з 1954 г. — у ЗША. У 1959–1964 гг. быў старшынёй Галоўнай управы Беларуска-амерыканскага задзіночання. У 1965 г. выйшаў з БАЗА і заснаваў Беларуска-амерыканскае аб'яднанне ў Нью-Ёрку, у 1968 г. у выніку канфлікту з епіскапам Васілём пакінуў парафію Св. Кірылы Тураўскага ў Брукліне і заснаваў парафію Св. Кірылы Тураўскага ў Рычманд-Гіле на іншым канцы Атлантык-авеню, толькі ў юрысдыкцыі Канстанцінопальскага патрыярхату. У 1970-я — віцэ-прэзідэнт БККА. У сярэдзіне 1990-х адышоў ад актыўнай грамадскай дзейнасці. У 1992 г. выдаў успаміны «Дзейнасць Кастуся Мерляка на эміграцыі».

[222] Магчыма, маецца на ўвазе горад **Цвікаў** (*Zwickau*) у сённяшняй зямлі Саксонія (Усходняя Нямеччына).

[223] **Янка Жамойцін** (1922–2003), беларускі дзеяч. Падчас Другой сусветнай вайны быў кіраўніком Навагрудскай акругі СБМ. Летам 1944 г. выехаў у Нямеччыну, працаваў у юнацкіх лагерах (Кёльн і Дэсаў), пасля капітуляцыі Нямеччыны апынуўся ў Польшчы. У 1949 г. яго дэпартавалі ў СССР, дзе быў зняволены ў лагеры да 1956 г. Пасля вызвалення вярнуўся ў Польшчу, жыў і працаваў у Варшаве. Удзельнічаў у беларускім жыцці ў Польшчы.

[224] Маецца на ўвазе **Браўнаў-на-Іне** (*Braunau am Inn*) — горад у Аўстрыі, у зямлі Верхняя Аўстрыя.

[225] Аляксандр Стагановіч-малодшы ў 1942 г., каб уратаваць сям'ю ад рэпрэсіяў, добраахвотна паехаў на працу ў Нямеччыну. Аднойчы, калі кіраваўся на адпачынак дахаты, у Варшаве быў арыштаваны і адпраўлены ў канцэнтрацыйны лагер у Дахаў.

[226] Канцэнтроўцы — маюцца на ўвазе вязні канцлагера Дахаў.

[227] Маецца на ўвазе белы арол польскага герба.

[228] **Шляйсгайм** (*Schleissheim*) — вялікі лагер для перамешчаных асобаў, які знаходзіўся непадалёк ад Мюнхена.

[229] **Мікола Гарошка** (1902–1979), беларускі грамадскі дзеяч, старшыня Беларуска-амерыканскага задзіночання ў 1949–1952 і 1965–1967 гг. Быў таксама першым старшынёй Фундацыі імя П. Крэчэўскага.

[230] **ЮНРРА** (*UNRRA — United Nations Relief and Rehabilitation Administration*) — Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў у Дапамозе і Рэабілітацыі, створаная краінамі антыгітлераўскай кааліцыі ў 1943 г. для дапамогі краінам, якія пацярпелі ў Другую сусветную вайну, у галіне фінансаў, прамысловага і сельскагаспадарчага аднаўлення, здароўя і інш. У складзе арганізацыі дзеяў таксама камітэт у пытаннях утрымання перамешчаных асобаў.

[231] **Віталь Кажан** (1916–2004), беларускі дзеяч, у часы Другой сусветнай вайны скончыў афіцэрскія курсы ў Менску, быў камандзіраваны ў Браслаў весці падафіцэрскія курсы Самаахоўы. Працаваў у Глыбокім сакратаром, заступнікам акруговага старшыні Беларускай народнай самапомачы. З лета 1944 г. — на эміграцыі. Пасля капітуляцыі Нямеччыны быў заступнікам каменданта (ліпень 1946 — люты 1948 гг.) лагернай паліцыі ў Шляйсгайме. Пасля пераезду ў лагер Остэргофен выконваў абавязкі адміністратара газеты «Бацькаўшчына», з лістапада 1948 г. — абавязкі каменданта лагернай паліцыі. З кастрычніка 1949 г. і да самай смерці — галоўны скарбнік Рады БНР. З 1950 г. жыў у ЗША (Стамфард, Канектыкут).

[232] **Уладзімір Бортнік** (1910–1988), беларускі дзеяч, журналіст, адзін з рэдактараў газеты «Бацькаўшчына».

[233] **Мікола Абрамчык** (1903–1970), беларускі палітык і грамадскі дзеяч, які ў снежні 1947 г. узначаліў Раду БНР. Жыў у Парыжы, займаўся актыўнай грамадскай дзейнасцю.

[234] Мітрапаліт Панцеляймон быў сынам царскага афіцэра.

[235] Маюцца на ўвазе Філафей (Нарко) і Апанас (Мартас).

[236] Ідзецца пра І З'езд беларускіх праваслаўных вернікаў у Рэгенсбургу 5 траўня 1946 г., на якім прысутнічалі больш за шэсцьдзесят дэлегатаў з трох акупацыйных зонаў Нямеччыны і Аўстрыі: амерыканскай, брытанскай і французскай. З'езд сабралі на заклік Ініцыятыўнай групы, у якую ўваходзілі Наталля Арсеннева, Аляксандр Асіпчык, Юрка Віцьбіч, Іван Касяк, Хведар Шыбут. Старшынёй з'езда абралі Мікалая Шчорса. Аляксандр Стагановіч у з'ездзе ўдзелу не браў.

[237] Абсалютная большасць беларускай палітычнай эліты на эміграцыі адмоўна паставіліся да такога кроку іерархаў БАПЦ. Але погляды на далейшае ратаванне сітуацыі былі розныя. Прыхільнікі Рады БНР выступалі за найхутчэйшае фарсіраванне сітуацыі і заручэнне падтрымкай УАПЦ. Прыхільнікі БЦР некаторы час спрабавалі пераканаць іерархаў БАПЦ выйсці з РЗПЦ. На гэта наклалася сітуацыя з аднаўленнем у 1948 г. БЦР і навязаннем кантактаў з заходнім светам, калі важна было мець падтрымку маральных аўтарытэтаў беларусаў — епіскапаў БАПЦ, якія цяпер складалі Беларускую мітраполію РЗПЦ. Вонкавая аўтаномія Беларускай праваслаўнай царквы захавалася, паколькі РЗПЦ была незалежнаю ад непрымальнай на Захадзе Маскоўскай патрыярхіі ды рэзка негатыўна ставілася да камунізму. Беларускія епіскапы РЗПЦ і падначаленыя ім святары сапраўды апекаваліся беларусамі ў лагерах для перамешчаных асобаў, спрыялі ім у рассяленні ў розныя краіны, падпісвалі і афармлялі неабходныя дакументы. Заўважных зменаў у рэлігійных практыках з далучэннем да РЗПЦ таксама не назіралася. Таму шмат хто ўспрыняў індыферэнтна праблему, каму беларускія святары мусяць падпарадкоўвацца на эміграцыі.

[238] Ідэя прыняцця беларусамі новай нацыянальнай назвы — крывічы — выказвалася яшчэ ў 1920-я гг., і адным з яе аўтараў і прапагандыстаў быў Вацлаў Ластоўскі. Лічылася, што такая назва паспрыяе таму, што беларусаў перастануць атаясамліваць з расейцамі. Новае жыццё «крывіцкая» ідэя атрымала пасля вайны, калі яе сталі актыўна прапагандаваць такія дзеячы, як Янка Станкевіч і Антон Адамовіч. Праз нейкі час праблема набыла палітычны характар, і «крывічамі» сталі называць прыхільнікаў Рады БНР на чале з Міколам Абрамчыкам, у той час як «беларусамі» заставаліся прыхільнікі Беларускай Цэнтральнай Рады на чале з Радаславам Астроўскім.

[239] **Уладзімір Тамашчык** (1900–1970), беларускі грамадскі і царкоўны дзеяч. У беларускім руху ўдзельнічаў з 1920-х гг. Вучыўся ў Празе і жыў там да вайны. У гады Другой сусветнай вайны вярнуўся ў Беларусь, праводзіў беларускую грамадска-культурную працу ў Беластоку. З 1944 г. — на эміграцыі, жыў і працаваў у Мюнхене. Як «нацыянальную здраду» ацаніў пераход епіскапаў БАПЦ у Рускую зарубежную праваслаўную царкву. У 1949 г. пастрыгся ў манахі, прыняўшы імя Васіль, пасля чаго вышэйшымі духоўнымі іерархамі Украінскай

аўтакефальнай праваслаўнай царквы ўзведзены ў сан епіскапа ў беларускай царкве Св. Мікалая ў г. Розенгайме. У 1951 г. абраны адміністратарам БАПЦ у ЗША, Канадзе і Еўропе.

[240] **Мікалай Дзямідаў** (1888–1967), беларускі грамадскі і вайсковы дзеяч. У 1918–1920 гг. займаўся арганізацыяй беларускіх вайсковых фармаванняў, браў удзел у паходзе С. Булак-Балаховіча. Ад 1923 г. жыў у Латвіі. Падчас нямецкай акупацыі настаўнічаў, быў школьным інспектарам Лідскай акругі. У 1944 г. выехаў з Беларусі, быў намеснікам кіраўніка падафіцэрскіх курсаў 1-га кадравага батальёна БКА. Ад 1950 г. жыў у ЗША.

[241] **Аляксандр Калодка** (1911–1985), беларускі дзеяч, выпускнік юрыдычнага факультэта Віленскага ўніверсітэта. У 1941–1943 гг. працаваў надзвычайным упаўнаважаным акруговага камісара ў Вілейскай акрузе, спрыяў беларусізацыі мясцовай адміністрацыі. У 1943 г. — арыштаваны, знаходзіўся ў канцэнтрацыйных лагерах у Асвенціме і Бухенвальдзе. З 1948 г. жыў у Аўстраліі, актыўна ўдзельнічаў у беларускім жыцці Мельбурна.

[242] Магчыма, маецца на ўвазе горад **Гайдэльберг** (*Heidelberg*) у зямлі Бадэн-Вюртэмберг, дзе знаходзіцца знакаміты ўніверсітэт.

[243] **Антыбальшавіцкі блок народаў** (АБН) — каардынацыйны цэнтр антыкамуністычных палітычных арганізацый эмігрантаў з СССР і іншых краін сацыялістычнага блока. АБН ставіла сабе за асноўную мэту адхіленне камуністаў ад улады і падзел СССР на нацыянальныя дзяржавы. Арганізацыя існавала ў 1946–1996 гг. і спыніла сваю дзейнасць у выніку дасягнення пастаўленых мэтаў.

[244] Відаць, маецца на ўвазе арганізацыя **Міжнародны рух свабоды**, якая ў 1947 г. выдала ў Бруселі адзін нумар часопіса «Інтэрнацыянал свабоды» на розных мовах, у тым ліку і на беларускай, а ў 1948 г. зноў злучылася з Антыбальшавіцкім блокам народаў.

[245] **Міхась Тулейка** (1915–1998), беларускі грамадскі дзеяч, адвакат. Скончыў Віленскі ўніверсітэт. Падчас нямецкай акупацыі быў дырэктарам Баранавіцкай настаўніцкай семінарыі, узначальваў камітэт БНС на Баранавіцкую акругу. З лета 1944 г. — на эміграцыі, арганізаваў і ўзначаліў Беларускае студэнцкае таварыства ў Мюнхене. У канцы 1940-х гг. выехаў у ЗША, дзе арганізоўваў беларускі скаўтынг

і быў старшынёй царкоўнага камітэта парафіі БАПЦ у Гайленд-Парку (Нью-Джэрсі).

[246] **«Неділя»** — украінская штотыднёвая газета, якая выходзіла пасля вайны ў заходненямецкім горадзе Фюрт (*Fürth*) пад рэдакцыяй Генадзя Катаровіча.

[247] Маецца на ўвазе **«Новы песеннік крывіцкі (беларускі) для школаў»**, выдадзены Янкам Станкевічам пад псеўданімам Брачыслаў Скарыніч у Аўгсбургу ў 1946 г.

[248] Негатыўнае стаўленне да Янкі Станкевіча падчас напісання ўспамінаў было падагрэтае тым, што ў 1957 г. ён дэманстратыўна выйшаў з Рады БНР, а таксама разгарнуў палеміку на старонках «Бацькаўшчыны» вакол успамінаў Васіля Рагулі, пра што згадвалася вышэй.

[249] Маецца на ўвазе лагер для перамешчаных асобаў (*displaced persons*) — людзей, якіх вывезлі ў часе Другой сусветнай вайны ў Нямеччыну з акупаваных ёю тэрыторыяў на прымусовыя працы.

[250] **Мітэнвальд** (*Mittenwald*) — лагер для перамешчаных асобаў, размешчаны ў аднайменным мястэчку на мяжы нямецкай зямлі Баварыя з Аўстрыяй.

[251] **Уладзіслаў Салавей** (1918–1974), каталіцкі святар заходняга і ўсходняга абраду, рэлігійны дзеяч беларускага замежжа ў Заходняй Нямеччыне. Высвячаны на святара ў 1946 г. У 1955 г. Апостальскі пасад прызначыў яго генеральным пастырам для беларусаў-каталікоў у Нямеччыне.

[252] ***IRO*** (*International Refugees Organization*) — Міжнародная арганізацыя справаў уцекачоў (асобаў, якія падчас Другой сусветнай вайны з розных прычынаў апынуліся ў Нямеччыне і Аўстрыі). Дзеяла ў 1947–1950 гг.

[253] **Лювенскі (Лёвенскі) каталіцкі ўніверсітэт** — найбольш старажытны ўніверсітэт у Бельгіі, заснаваны ў 1425 г. У першыя пасляваенныя гады ў ім вучыліся некалькі дзясяткаў маладых беларусаў, у тым ліку такія вядомыя пазней эміграцыйныя дзеячы, як Янка Запруднік, Вітаўт і Зора Кіпелі ды інш. Беларускім студэнцкім хорам тут кіраваў вядомы беларускі кампазітар Мікола Равенскі.

[254] Маюцца на ўвазе беларускія асяродкі ў гэтых суседніх — адлегласць між імі 10–15 км — гарадках. У Саўт-Рыверы існавала парафія

Св. Еўфрасінні Полацкай, а таксама дзеялі шматлікія суполкі арганізацыяў, прыхільных да БККА і БЦР. У Саўт-Рыверы праходзілі, напрыклад, кангрэсы беларусаў Амерыкі і пленумы БЦР. У Нью-Брансуіку / Гайленд-Парку дзеялі філіі арганізацыяў, што падтрымлівалі платформу Рады БНР, а таксама дзеяла парафія БАПЦ Жыровіцкай Божай Маці. І ў Саўт-Рыверы, і ў Нью-Брансуіку (дакладней, суседнім Іст-Брансуіку) ёсць нават беларускія могілкі. Фактычна, цэнтральная частка штата Нью-Джэрсі — цэнтр беларушчыны ў ЗША, што і зазначае Стагановіч.

[255] Ідзецца пра горад Кагоўз (*Cohoes*, штат Нью-Ёрк), размешчаны ў агламерацыі Трой, Олбані (адм. цэнтр штата Нью-Ёрк).

## Шэсцьдзесят год таму. У адзначэнне нашаніўскага года

Друкуецца паводле: Стагановіч, А. Шэсьцьдзясят год таму. У вадзначэньне нашаніўскага году // Беларус. № 111–112. Ліпень — жнівень 1966. С. 5.

[1] Відаць, Стагановіч мае на ўвазе падручнік «Родное слово» аўтарства знакамітага расійскага педагога Канстанціна Ушынскага (1824–1870). Напісаная яшчэ ў 1864 г., гэтая кніга выкарыстоўвалася ў навучальным працэсе да самага канца Расійскай імперыі.

[2] Насамрэч «Наша Ніва» спыніла сваё існаванне яшчэ да прыходу нямецкіх войскаў. Апошні яе нумар выйшаў 7 жніўня 1915 г., а немцы ўвайшлі ў Вільню толькі праз месяц.

[3] **Іван Луцкевіч** (1881–1919) — беларускі нацыянальны дзеяч, археолаг і этнограф. Адзін з заснавальнікаў і лідараў беларускага руху, яго ідэолагаў.

[4] **Аляксандр Уласаў** (1874–1941), беларускі грамадска-палітычны і культурна-асветніцкі дзеяч, адзін са стваральнікаў і кіраўнікоў БСГ, рэдактар-выдавец газеты «Наша Ніва». У міжваенны перыяд выбіраўся ў польскі Сенат, быў старшынёй ТБШ.

[5] Калі ў смерці Антона Луцкевіча і Аляксандра Уласава сапраўды можна адназначна вінаваціць камуністаў, бо яны хоць і не былі расстраляныя, але памерлі ў савецкай няволі на перасыльных этапах

(Уласаў — у 1941 г. на станцыі Марыінск Новасібірскай вобласці, Луцкевіч — у 1942 г. у горадзе Аткарск Саратаўскай вобласці), то адносна Вацлава Іваноўскага ўсё не так адназначна. Ён быў забіты на пачатку снежня 1943 г., займаў у той час пасаду бурмістра Менска і старшыні т. зв. Рады даверу, і найбольш аўтарытэтны сучасны даследчык яго жыцця і дзейнасці Юры Туронак прыводзіць у сваёй працы «Вацлаў Іваноўскі і адраджэнне Беларусі» факты, якія сведчаць пра тое, што замах на Іваноўскага быў здзейснены людзьмі, блізкімі да Радаслава Астроўскага, пры падтрымцы нямецкай акупацыйнай адміністрацыі. Ліквідацыя Іваноўскага нібыта здымала перашкоду для заняцця Астроўскім кіроўнай пасады ў беларускіх структурах, створаных немцамі. Гл.: Туронак, Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі. Вільня, 2006. С. 248–249.

## Праўда аб Грамадзе і «Змаганні»

Друкуецца паводле: Струг, Тарас. Праўда аб «Грамадзе» й «Змаганьні» // Бацькаўшчына. № 49 (331). 2 сьнежаня 1956. С. 3–4; № 50 (332). 9 сьнежаня 1956. С. 4.

[1] Маюцца на ўвазе наступныя артыкулы: Гаркуш, С. Беларуская Селянска-Работніцкая Грамада (Да ўгодкаў ейнае ліквідацыі польскім урадам) // Бацькаўшчына. № 4 (285). 22 студзеня 1956. С. 1; Станкевіч, Я. Пра Беларускую Сялянска-Работніцкую Грамаду // Бацькаўшчына. № 31 (313). 29 ліпеня 1956. С. 3; Лаўрыновіч, А. Святло й цені Грамады // Бацькаўшчына. № 32 (314). 5 жніўня 1956. С. 2–3; Станкевіч, Я. Яшчэ да Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады // Бацькаўшчына. № 34 (316). 19 жніўня 1956. С. 1; Гаркуш, С. Адказ на «Сьвятло й цені Грамады» // Бацькаўшчына. № 37 (319). 9 верасьня 1956. С. 1, 3; Каранеўскі, Я. Яшчэ аб блесках і ценях Грамады // Бацькаўшчына. № 41 (323). 7 кастрычніка 1956. С. 1; Лаўрыновіч, А. Да «Сьвятла й ценяў Грамады» // Бацькаўшчына. № 42 (324). 14 кастрычніка 1956. С. 3.

[2] **«Kurjer Wileński»** («Віленскі кур'ер») — польская газэта, якая выходзіла ў Вільні ў 1924–1940 гг.

[3] Цікава, што Васіль Рагуля, пад уплывам успамінаў якога А. Стагановіч у значнай ступені сфармаваў сваё ўяўленне пра тагачасныя

ўнутраныя працэсы, якія адбываліся ў Беларускім пасольскім клубе, меў пра сенатара Аляксандра Уласава крыху іншую думку: *«Стары, разгультаены, нічога не рабіў ні ў Клубе, ні вонкі. Паўжартам, паўсур'ёзна ён казаў: "Усё будзе добра, толькі нічога не трэба рабіць". Усе ягоныя планы праводзіў у жыццё сакратар Клуба Більдзюкевіч»* (Рагуля, В. Успаміны. С. 23).

[4] Магчымасць стварэння розных партый у Польшчы не з'явілася толькі пасля перавароту Пілсудскага. Наадварот, пасля перавароту пачалося паступовае, але няўхільнае абмежаванне палітычных свабодаў грамадзян Польшчы. Перыяд жа перад гэтым якраз-такі адзначаўся высокім узроўнем палітычных свабодаў і значным уплывам шматлікіх палітычных партый на жыццё грамадства. Пра тое, што магчымасці для самога існавання Грамады існавалі і перад травеньскім пераваротам, сведчыць сярод іншага і тое, што яе аналаг на польскіх этнічных тэрыторыях, Незалежная сялянская партыя, утварылася і распачала актыўную дзейнасць задоўга да яго, у лістападзе 1924 г.

[5] **Сяргей Баран** (1892–1937 (?)), беларускі палітык і грамадскі дзеяч, сябра партыі беларускіх эсэраў. У 1922 г. выбраны паслом у польскі Сейм. У 1923 г. арыштаваны польскімі ўладамі, асуджаны на 6 гадоў турэмнага зняволення. Датэрмінова вызвалены ў снежні 1926 г. У 1928 г. эміграваў у БССР, дзе пасля быў рэпрэсаваны.

[6] **Сымон Якавюк** (1881–1973), беларускі грамадска-палітычны дзеяч. У 1922 г. выбраны паслом польскага Сейма. У 1923 г. быў абвінавачаны ў арганізацыі партызанскага руху ў Заходняй Беларусі, перад пагрозай арышту выехаў у Літву. У 1932–1940 гг. старшыня Беларускага культурна-прасветнага таварыства ў Літве. З 1918 г. быў агентам ДПУ. Выконваў заданне па разбурэнні беларускага нацыянальнага руху, браў удзел у ліквідацыі ўрада БНР у 1925 г. Пасля Другой сусветнай вайны жыў у Горадні.

[7] **Антон Аўсянік** (1888–1933 (?)), беларускі грамадска-палітычны дзеяч. Сябра БСГ. У 1918 г. старшыня Беларускай рады ў Бабруйску, у 1918–1920 гг. сябра Рады БНР. Сябра шэрагу дэлегацый БНР на міжнародных перамовах. У 1919–1920 гг. намеснік старшыні Беларускай вайсковай камісіі. У 1920–1921 гг. паўнамоцны прадстаўнік БНР у Літве. У 1922–1927 гг. пасол польскага Сейма, да 1926 г. уваходзіў у Беларускі пасольскі клуб. Пасля эміграваў у БССР.

[8] На самай справе ні Сяргей Баран, ні Сымон Якавюк, ні Антон Аўсянік асабіста ніколі не зракаліся пасольскіх мандатаў. Сяргей Баран быў у 1923 г. абвінавачаны палякамі ў арганізацыі антыпольскага партызанскага руху на тэрыторыі Беласточчыны і Гарадзеншчыны і са згоды Сейма арыштаваны, а пасля асуджаны судом на 6 гадоў цяжкой турмы (пасля тэрмін быў зменшаны да 4 гадоў). Пры гэтым польскае заканадаўства ў такіх выпадках не вымагала пазбаўлення асуджанага пасла мандата і замены яго на іншага чалавека. Таму С. Баран увесь час адбывання свайго тэрміну зняволення па-ранейшаму лічыўся паслом, нягледзячы на тое што не меў магчымасці выконваць свае абавязкі. Пасля свайго датэрміновага вызвалення ў канцы 1926 г. ён нават з'явіўся на адно з сеймавых паседжанняў.

Што тычыцца Сымона Якавюка, то ён таксама быў абвінавачаны па адной справе з С. Баранам, але ў адрозненне ад яго здолеў пазбегнуць арышту, перабраўшыся на тэрыторыю Літвы. Тым не менш ад мандата ён таксама не адмаўляўся і быў яго афіцыйна пазбаўлены толькі 6 траўня 1925 г., але наступны за ім кандыдат-беларус у спісе Блока нацыянальных меншасцяў па Бельскай выбарчай акрузе Мікалай Якімовіч увайсці ў Сейм на ягонае месца не здолеў дзеля ўзніклых супярэчнасцяў паміж беларусамі і іх партнёрамі па БНМ — яўрэямі.

Апошні ж са згаданых А. Стагановічам паслоў, Антон Аўсянік, захоўваў пасольскі мандат на працягу ўсяго тэрміну яго дзеяння, адно што толькі практычна не браў удзелу ў працы Беларускага пасольскага клуба, а ў сакавіку 1926 г. увогуле афіцыйна з яго выйшаў, застаючыся да канца паўнамоцтваў Сейма «дзікім» паслом. Хутчэй за ўсё, Стагановіч паблытаў яго з Міхалам Кахановічам, які ў траўні 1925 г. сапраўды адмовіўся ад мандата, і на ягонае месца 12 студзеня 1926 г. у Сейм увайшоў Юры Сабалеўскі.

Такім чынам, у чэрвені 1925 г., калі прымалася рашэнне аб стварэнні асобнага пасольскага клуба Грамады, у склад Беларускага пасольскага клуба фактычна ўваходзілі 11 чалавек (8 паслоў і 3 сенатары).

[9] У наваствораны пасольскі клуб увайшлі спачатку не 5, а толькі 4 паслы (Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла, П. Валошын). Пяты (Ю. Сабалеўскі) тады афіцыйна паслом яшчэ не з'яўляўся і далучыўся да клуба БСРГ толькі праз паўгода, калі нарэшце прыняў пасольскую прысягу.

[10] **Аляксей Назарэўскі** (1881 — пасля 1941), заходнебеларускі грамадска-палітычны і царкоўны дзеяч, у 1922–1927 гг. сенатар. Сябра Беларускага пасольскага клуба. Працаваў у магістраце г. Баранавічы. Старшыня камітэта па будаўніцтве Свята-Пакроўскай царквы ў Баранавічах, дабіўся перадачы ёй мазаічных абразоў работы знакамітых расійскіх жывапісцаў з дэмантаванага ў Варшаве сабора Аляксандра Неўскага. У 1927 г. быў адным з заснавальнікаў Беларускага дэмакратычнага праваслаўнага аб'яднання, праз кароткі час адышоў ад яго і перайшоў да супрацоўніцтва з афіцыйнымі праваслаўнымі ўладамі ў Польшчы. Арыштаваны НКУС БССР у студзені 1940 г., асуджаны на 8 гадоў лагераў. У верасні 1941 г. вызвалены з Сіблага і накіраваны ў Паўладарскую вобласць. Далейшы лёс невядомы.

[11] **Вячаслаў Багдановіч** (1876 — пасля 1939), беларускі рэлігійны і грамадска-палітычны дзеяч, публіцыст. На пачатку 1920-х гг. в. а. рэктара Віленскай праваслаўнай семінарыі. У 1922–1930 гг. сенатар Польскай рэспублікі, сябра Беларускага пасольскага клуба. У 1927–1930 гг. старшыня Беларускага дэмакратычнага праваслаўнага аб'яднання. Пасля прыходу ў Вільню савецкіх войскаў 30 верасня 1939 г. арыштаваны. Далейшы лёс невядомы.

[12] Вячаслаў Багдановіч сапраўды вельмі адзначыўся ў міжваенным жыцці рускай супольнасці ў Вільні. Сярод іншага ён быў старшынёй Рэлігійна-філасофскага гуртка Віленскага рускага таварыства (1927), браў актыўны ўдзел у вечарынах яго літаратурна-мастацкай секцыі. З 1930 г. выкладаў у Рускай гімназіі імя А. С. Пушкіна ў Вільні, супрацоўнічаў з віленскімі рускімі газетамі, усяляк папулярызаваў класічную рускую літаратуру і рускую рэлігійную філасофію. Быў гарачым прыхільнікам захавання падчас праваслаўных набажэнстваў царкоўнаславянскай мовы. На пахаванні знакамітага віленскага адваката Тадэвуша Врублеўскага ў 1925 г., калі над труной гаварыліся прамовы на ўсіх краёвых мовах, выступаў па-руску ад імя рускага насельніцтва Віленшчыны. У 1927 г. падчас выбараў у Гарадскую раду г. Вільні атрымаў дэпутацкі мандат ад Беларуска-Рускага блока, і сваім дэпутатам яго лічылі як беларусы, так і рускія. На парламенцкіх выбарах 1928 г. некаторы час былі сумневы, які спіс будзе падтрымліваць Багдановіч — беларускі ці рускі. Аднак жа ўрэшце Багдановіч зрабіў выбар на карысць беларускага спіса, і на старонках рэдагаванай ім газеты «Праваслаўная Беларусь» у перадвыбарчы перыяд з'явіўся шэраг

артыкулаў з крытыкай антыбеларускіх пазіцый найбуйнейшай тагачаснай рускай арганізацыі ў Польшчы — Рускага народнага аб'яднання.

[13] Малаверагодна, што адмова Васіля Рагулі далучыцца да Грамады сапраўды неяк была звязана з асобай Радаслава Астроўскага. Падобна на тое, што гэтае тлумачэнне сапраўды даволі дзіўнай пазіцыі, занятай у той час Рагулем, было ўведзена ім самім ва ўжытак ужо на эміграцыі, а ідэалагічныя і асабістыя спрэчкі паміж асобнымі эміграцыйнымі дзеячамі былі ім перанесеныя на заходнебеларускую рэчаіснасць. Падрабязней пра першы перыяд існавання Грамады (у тым ліку і пра пазіцыю В. Рагулі) гл.: Пашкевіч, А. Беларуская сялянска-работніцкая Грамада ў першае паўгоддзе існавання (чэрвень — снежань 1925 г.) // Гістарычны альманах. 2006. Т. 12. С. 23–36.

[14] **Антон Неканда-Трэпка** (1877–1942), беларускі дзеяч, адзін са стваральнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады, працаваў у складзе выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца». З лета 1920 г. у Вільні, выкладаў у Віленскай беларускай гімназіі, у 1922–1923 і ў 1928–1930 гг. яе дырэктар. Адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў Таварыства беларускай школы. Выдаў падручнікі па фізіцы і матэматыцы для беларускіх сярэдніх школ. У 1939 г. арыштаваны і высланы ў Сібір, дзе і памёр.

[15] Маецца на ўвазе мера дроў, роўная 2 м$^3$.

[16] Размова пра артыкул А. Лаўрыновіча «Святло і цені Грамады», апублікаваны ў газеце «Бацькаўшчына» (№ 32 (314). 5 жніўня 1956 г.).

[17] Незразумела, навошта А. Стагановіч вырашыў ужыць у дадзеным выпадку стары стыль (паводле юліянскага календара), калі ў міжваеннай Польшчы ў свецкім жыцці выкарыстоўваўся толькі грыгарыянскі каляндар (новы стыль), а юліянскі — толькі ў практыцы Праваслаўнай царквы. Да таго ж ён чамусьці не адняў ад даты паводле грыгарыянскага календара 13 дзён, як гэта належала б, а дадаў іх, і ў выніку атрымалася недарэчнасць. На самай справе, калі карыстацца юліянскім календаром, арышт лідараў Грамады адбыўся ў ноч з 1 на 2 студзеня 1927 г. (пра што сам Стагановіч піша ў гэтым жа самым артыкуле ніжэй).

[18] Пад псеўданімам А. Лаўрыновіч выступаў **Язэп Малецкі** (1906–1982), беларускі грамадскі дзеяч, лекар, выпускнік медыцынскага факультэта Віленскага ўніверсітэта. Падчас нямецкай акупацыі працаваў у Віленскім беларускім камітэце, быў дырэктарам Медычнай шко-

лы ў Баранавічах, намеснікам прэзідэнта БЦР на Вілейскую акругу. З 1949 г. жыў у Аўстраліі, быў старшынёй аўстралійскага сектара Рады БНР. Аўтар успамінаў «Пад знакам Пагоні» (Таронта, 1976).

[19] Тут А. Стагановіч крыху блытае перыяды. Польская сацыялістычная партыя сапраўды была адзін час вельмі папулярная на Палессі, асабліва ў яго ўсходняй частцы, але толькі на самым пачатку 1920-х гг. Найбольш яскравае ўвасабленне гэта атрымала ў выдатных выніках, якія дадзеная партыя паказала на Палессі падчас парламенцкіх выбараў у 1922 г. Тады ППС, напрыклад, здабыла падтрымку 32 646 (67,8 %) выбаршчыкаў у Лунінецкім павеце і 19 101 (49 %) — у Пінскім, а таксама 8293 (46,9 %) — у Драгічынскім. Аднак з году ў год уплывы ППС на Палессі падалі, і да часу ліквідацыі Грамады падтрымка ППС на гэтай тэрыторыі зменшылася ў некалькі разоў. Праўда, гэта цяжка звязваць з дзейнасцю Грамады, бо апошняя ў Палескім ваяводстве дзейнічала фактычна толькі ў самых паўночных паветах (перадусім Косаўскім і Пружанскім), у той час як на астатняй тэрыторыі грамадоўскія ўплывы былі зусім нязначныя. На змену ППС на Палессі фактычна прыйшлі рускія і ўкраінскія нацыянальныя арганізацыі, а пасля адзінай палітычнай сілай, уплыў якой фіксаваўся тут па выніках парламенцкіх выбараў, быў праўрадавы Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам. ППС жа на выбарах у Сейм 1928 г. на тэрыторыі, дзе яна перад гэтым дамінавала, паказала наступныя вынікі: Пінскі павет — 5274 (10,3 %) галасы, Лунінецкі павет — 2585 (10,1 %), Столінскі — 2054 (6,9 %), Драгічынскі — 275 (0,9 %).

[20] Відаць, Стагановіч мае тут на ўвазе будынак на Віленскай вуліцы, № 8 у Вільні, у якім у міжваенны перыяд жыў з сям'ёй Антон Луцкевіч, пэўны час размяшчаліся Беларускі кааператыўны банк, Беларускае кааператыўнае таварыства «Пчала», а таксама рэдакцыі некалькіх беларускіх газет і часопісаў, у тым ліку і некаторых тых, што выдаваў луцкевіцкі Цэнтрасаюз.

[21] «Беларускае слова» — беларуская газета, друкаваны орган паланафільскай Тымчасовай беларускай рады, а затым (з чэрвеня 1926 г.) Беларускай нацыянальнай рады (старшынёй гэтых арганізацый быў Арсень Паўлюкевіч). Выходзіла з 3 лютага 1926 г. да 9 сакавіка 1928 г. пад рэдакцыяй Тодара Вернікоўскага. Радаслаў Астроўскі ніякага дачынення да выпуску гэтай газеты і дзейнасці арганізацый, органам

якіх яна была, не меў. Стагановіч, відаць, проста пераблытаў дзве зусім розныя арганізацыі, якія мелі ў заходнебеларускім грамадстве рэпутацыю паланафільскіх — Тымчасовую беларускую раду (Беларускую нацыянальную раду) і заснаваны ў 1930 г. Цэнтральны саюз беларускіх культурна-асветных і гаспадарчых арганізацыяў (Цэнтрасаюз), адным з лідараў якога сапраўды быў Астроўскі, а рэдактарам друкаванага органа — М. Сіняўскі.

[22] **Мікалай Сіняўскі** — настаўнік Віленскай беларускай гімназіі, выкладаў матэматыку і гімнастыку. Актыўны сябра БСРГ, сябра Управы ТБШ (1926). У 1930-я гг. уваходзіў у Цэнтральны саюз беларускіх культурна-асветных і гаспадарчых арганізацыяў, рэдагаваў яго друкаваны орган «Беларускі звон». У 1933–1935 гг. быў рэдактарам газеты «Родны край». Быў сябрам прэзідыума, сакратаром і старшынёй бацькоўскага камітэта Віленскай беларускай гімназіі.

[23] Грамада сапраўды развівалася надзвычай шпаркімі тэмпамі, але ўсё ж такі лічба ў 200 000 яе сябраў — відавочнае перабольшванне. На самай справе ў Грамаду, як сцвярджалі яе лідары) падалі заявы дзесьці каля 100–120 тысяч чалавек (пры гэтым некалькім дзясяткам тысяч проста не паспелі выпісаць членскія білеты).

[24] **Міхал Гурын (Маразоўскі)** (сапр. **Ханевіч**) (1891–1928), беларускі дзеяч. Да рэвалюцыі 1917 г. быў настаўнікам, скончыў Пскоўскі настаўніцкі інстытут. Сімпатызаваў эсэрам. З 1920 г. жыў у Менску, рэдагаваў шэраг газет, у тым ліку «Савецкую Беларусь». У 1924 г. быў падпольна пасланы з Менска ў Заходнюю Беларусь для арганізацыі камуністычнага руху. Стаў адным з лідараў т. зв. сэцэсіі ў КПЗБ у канцы 1924 г. Пасля сядзеў у польскай турме, пасля выхаду з якой выказваўся за супрацоўніцтва з польскімі ўладамі. Збіраўся даваць паказанні на працэсе над лідарамі Беларускай сялянска-работніцкай грамады, але 16 сакавіка 1928 г. быў забіты ў Вільні камуністам Сямёнам Клінцэвічам як правакатар. Пакінуў успаміны «З недалёкага мінулага», якія публікаваліся ў другой палове 1927 г. у беларускай паланафільскай газеце «Беларускі дзень».

[25] Можна спрачацца адносна таго, наколькі вялікае ўздзеянне на працэс развіцця Грамады маглі аказваць польскія ўлады, але ўплыву на яе камуністаў аспрэчыць ніяк нельга. Несумненна, што працэс стварэння арганізацыі ад самага пачатку знаходзіўся пад кантролем КПЗБ,

і можна казаць, хутчэй, пра тое, што беларускія нацыянальныя дзеячы імкнуліся апанаваць арганізацыю, першапачаткова створаную (хоць і пры іх дапамозе) камуністамі, а не наадварот. Пра гэта сведчыць хоць бы ход абмеркавання грамадоўскага пытання на III канферэнцыі КПЗБ у студзені 1926 г. Гл.: Тэрытарыяльная ці нацыянальная?: Дыскусія аб Грамадзе на III канферэнцыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі / падрыхтоўка публікацыі, прадмова і каментарыі А. Пашкевіча // Гістарычны альманах. 2006. Т. 12. С. 163–170.

[26] На самай справе радыкальныя настроі ў асяродку грамадоўцаў былі пашыраныя, як выглядае, куды больш. Пра гэта, у прыватнасці, сведчыў ва ўспамінах Васіль Рагуля, распавядаючы пра размову са старшынёй БСРГ Браніславам Тарашкевічам незадоўга да разгрому Грамады польскімі ўладамі: *«Вячэраючы, мы гутарылі аб вытвараным палажэнні. Я намаляваў яму падрабязна становішча на месцах і сказаў: “Што ж, калега, на весну давядзецца заклікаць народ да паўстання”. Ён, безнадзейна развёўшы рукамі, адказаў: “Лейцы, братка, выпалі з рук”. Пры гэтым ён пацвердзіў, што няма ніякай надзеі на дапамогу Саветаў»* (Рагуля, В. Успаміны. С. 53).

[27] Антон Луцкевіч ніколі афіцыйна не належаў да Грамады, хоць быў фактычным рэдактарам практычна ўсіх грамадоўскіх друкаваных выданняў. Доўгі час унікаў фармальнага афармлення членства ў партыі і Радаслаў Астроўскі, які афіцыйна далучыўся да яе толькі тады, калі колькасць сяброў партыі дасягнула 50 000 чалавек.

[28] Сёння дакладна вядома, што ў канцы 1925 г. афіцыйна ў КПЗБ уступіў лідар Грамады Браніслаў Тарашкевіч. Паводле яго ўласнай «Аўтабіяграфіі...», у другой палове 1926 г. былі таксама прынятыя ў партыю Павел Валошын, Пятро Мятла і Радаслаў Астроўскі.

[29] Дату Стагановіч назваў правільна, але праваслаўны Новы год (паводле юліянскага календара) святкуецца на дзень раней — 13 студзеня.

[30] **Ландварава** — горад, чыгуначны вузел на Вільню, Горадню і Коўна, які знаходзіцца за 18 км на паўднёвы захад ад Вільні. Цяпер афіцыйна называецца Лентварыс (*Lentvaris*).

[31] Справа выезду Юрыя Сабалеўскага ў Гданьск пасля арышту ягоных калегаў па пасольскім клубе Грамады — даволі заблытаная і цьмяная. Звяртае на сябе ўвагу, што Сабалеўскі выехаў у Гданьск

не адразу пасля арыштаў, а недзе праз 2 тыдні пасля іх, бо яшчэ 25 і 27 студзеня 1927 г. выступаў з сеймавай трыбуны, пратэстуючы супраць антыграмадоўскіх рэпрэсій. Гэта азначае, што прынамсі напачатку польскія ўлады зусім не збіраліся арыштоўваць Сабалеўскага — яны мелі для гэтага шмат магчымасцяў, але не спяшаліся з іх скарыстацца. Таму наўрад ці можна казаць, што ў Гданьск ён «уцёк», тым больш што праз паўгода, недзе на пачатку жніўня, Сабалеўскі вярнуўся назад у Польшчу, і ўлады яго не зачапілі. Дзеля таго справа выезду Ю. Сабалеўскага ў Гданьск у 1927 г. мусіць быць тэмай асобнага разгляду.

[32] На самай справе на лаве падсудных на працэсе Грамады, які праходзіў у Вільні 23 лютага — 22 траўня 1928 г., сядзелі 56 чалавек.

[33] Маецца на ўвазе жонка Антона Луцкевіча Зоф'я Абрамовіч, якая скончыла жыццё самагубствам падчас працэсу над лідарамі Грамады, 5 сакавіка 1929 г. Звязваць гэты факт з апраўданнем Луцкевіча на працэсе не зусім лагічна, бо самагубства З. Абрамовіч адбылося тады, калі да вынясення прысуду было яшчэ далёка.

[34] Тое, што разам з іншымі грамадоўскімі лідарамі вясной 1930 г. не быў вызвалены Павел Валошын, можа сведчыць пра тое, што з усімі тымі, хто вызвалены быў, польскім уладам праз Р. Астроўскага (ці праз некага іншага) удалося дасягнуць папярэдняга пагаднення аб іхнай далейшай лаяльнасці ў абмен на свабоду. Гэта сцвярджаў сярод іншых і вызвалены тады ж Фабіян Акінчыц. Прычынай жа невызвалення Валошына, хутчэй за ўсё, стала тое, што ён незадоўга перад гэтым, у траўні 1929 г., даслаў ліст да змаганскага пасла Ігната Дварчаніна з выказваннем гатоўнасці працягу ранейшай лініі. Больш падрабязна пра гэта гл.: Пашкевіч, А. Сымон Рак-Міхайлоўскі: старонкі жыцця і дзейнасці // Куфэрак Віленшчыны. 2007. № 1 (12). С. 22–23.

[35] У Польшчы ў 1925–1931 гг. сапраўды існавала левая партыя пад назвай *«Stronnictwo Chłopskie»* («Сялянская партыя»). Тут, аднак, Стагановіч відавочна мае на ўвазе не яе, а Незалежную сялянскую партыю (*«Niezależna Partia Chłopska»*) (гл. каментар 50 да «Успамінаў пасла»).

[36] Тут польскі палітык Людвік Хамінскі пераблытаны з Сільвестрам Ваявудскім (гл. каментары 51 і 52 да «Успамінаў пасла»).

[37] Фелікс Галавач быў арыштаваны разам з чатырма паслaмі Грамады, і адбылося гэта 17 студзеня 1927 г. Праз 18 месяцаў зняволення ён быў вызвалены без вынясення судовага прысуду.

[38] Сапраўды, Фелікс Галавач, які быў беларусам паводле паходжання і самасвядомасці, быў адным з лідараў Незалежнай сялянскай партыі, але ніколі не ўваходзіў не толькі ў кіраўніцтва, але нават проста ў склад Грамады.

[39] Тут Стагановіч памыляецца: у 1914–1918 гг., пасля вяртання з навучання ў Лювенскім універсітэце (Бельгія), Фабіян Абрантовіч працаваў прафесарам духоўнай каталіцкай семінарыі ў Петраградзе.

[40] Фабіян Абрантовіч узначальваў каталіцкую місію ўсходняга абраду ў Маньчжурыі і Кітаі крыху пазней — у 1929–1938 гг.

[41] Магчымасць выстаўлення т. зв. дзяржаўнага спіса была ўведзеная ў польскі выбарчы закон дзеля таго, каб па магчымасці забяспечыць камплектаванне Сейма прадстаўнікамі пераважна буйных палітычных арганізацыяў з агульнапольскай сферай дзеяння. З 444 паслоў Сейма 372 выбіраліся ў акругах непасрэдна насельніцтвам, а 72 уваходзілі з дзяржаўнага спіса. Выдзеленыя для гэтага спіса мандаты размяркоўваліся паміж партыямі прапарцыйна агульнай колькасці галасоў, аддадзеных за той ці іншы спіс на тэрыторыі ўсёй краіны. Правам атрымання мандатаў з дзяржаўнага спіса карысталіся толькі тыя партыі, якія атрымалі мандаты як мінімум у 6 розных акругах.

Выстаўленне на выбарах дзяржаўнага спіса было звязана з многімі цяжкасцямі, і дзеля таго невялікія арганізацыі з тэрытарыяльна абмежаванай сферай дзеяння, як правіла, на яго выстаўленне не ішлі. Праўда, на пачатку выбарчай кампаніі 1928 г. дзеячы, звязаныя з былой Грамадой, мелі намер выставіць дзяржаўны спіс (некалькі іх праектаў захаваліся ў архівах, гл.: Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 214. Арк. 7, 21–23), але гэтая задума не была рэалізаваная, хутчэй за ўсё, дзеля расколу былых грамадоўцаў на некалькі груповак, якія спаборнічалі паміж сабой. Няўдачай скончыліся і ўсе спробы арганізаваць выстаўленне агульнанацыянальнага беларускага дзяржаўнага спіса, у які ўвайшлі б беларускія дзеячы без розніцы палітычных поглядаў.

[42] Беларускі сялянскі саюз і Беларуская хрысціянская дэмакратыя ў складзе Блока нацыянальных меншасцяў выстаўлялі сваіх кандыдатаў

не толькі на «частцы Віленшчыны», але ва ўсіх заходнебеларускіх акругах, за выключэннем Лідскай, дзе спіс БНМ быўануляваны мясцовай акруговай выбарчай камісіяй. Іншая справа, што паслоў (П. Карузу, А. Стаповіча і К. Юхневіча) яны здолелі ўрэшце правесці толькі ў Свянцянскай выбарчай акрузе, а ва ўсіх астатніх выбары для іх завяршыліся няўдала.

[43] Радаслаў Астроўскі стаяў на другім месцы спіса № 41 па Наваградскай акрузе, адразу пасля Міхала Чатыркі. Ягоная прысутнасць у спісе сапраўды выклікала шмат пытанняў, бо ўсіх іншых лідараў Грамады, зняволеных у гэты час на Лукішках, палякі паспяхова нейтралізавалі, не даўшы ім магчымасці пераслаць сваю згоду на балатаванне, што было, згодна з выбарчым заканадаўствам, абавязковай умовай. Выключэнне, зробленае для Астроўскага, трэба было неяк патлумачыць, і дзеля гэтага незадоўга да галасавання на старонках выдаванай Янкам Станкевічам газеты «Народ» з'явілася зацемка наступнага зместу: *«Грам. Радаслаў Астроўскі, каторы гэтулькі зрабіў для вызвалення беларускіх працоўных масаў, спагадаючы нашай працы, згадзіўся выставіць сваю кандыдатуру на спіску Беларускіх Сялян і Работнікаў у Наваградскім вокрузе. Але цяжка было перадаць згоду з турмы, бо турэмная адміністрацыя гэтаму перашкаджала. Прыйшоў адзінаццаты дзень лютага — апошні дзень падавання заяваў аб згодзе на кандыдатуру. І ў гэты дзень заявы аб згодзе немагчыма было дастаць. Тады скемілі паслаць тэлеграму ў Наваградак аб згодзе. Дастаўшы гэтую тэлеграму, Акружная Выбарная Камісія ў Наваградку, згодна з уставай, прымушана была чакаць з выкасаваннем Р. Астроўскага із спіску ажно да друкавання афішаў, калі павінна была быць пададзена заява аб згодзе на пісьме. Прайшло яшчэ некалькі дзён. Нарэшце 15 лютага пракурор, нічога не ведаючы аб тэлеграме і, відаць, будучы пэўным, што згода ўжо спозненая, згадзіўся перадаць яе жонцы Р. Астроўскага. Заява аб згодзе без адкладу была павезена ў Наваградак і, дзякуючы тэлеграме, паспела ў пару»* (Выбарныя навіны. Як была дастана ад грам. Радаслава Астроўскага заява аб згодзе на кандыдатуру // Народ. № 7. 24 лютага 1928. С. 3).

Выглядае, што гэтае тлумачэнне — толькі легенда, прыдуманая для таго, каб адцягнуць увагу ад факта выстаўлення спісаў «Беларускіх сялян і работнікаў» у паразуменні з польскімі ўладамі. Тое, што апошняе мела месца, сёння ніякіх сумневаў не выклікае.

[44] Беларускі сялянскі саюз увогуле не выстаўляў на гэтых выбарах самастойных выбарчых спісаў, а ішоў на іх у складзе Беларускага цэнтральнага аб'яднанага выбарчага камітэта (БЦАВК), у які акрамя яго ўвайшлі таксама Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларускае дэмакратычнае праваслаўнае аб'яднанне і адзін з двух існаваўшых тады ў Вільні Беларускіх нацыянальных камітэтаў. Дадзены БЦАВК разам з аналагічнымі ўкраінскімі, яўрэйскімі і нямецкімі камітэтамі ўвайшоў у Блок нацыянальных меншасцяў, ад імя якога па ўсёй Польшчы выстаўляліся выбарчыя спісы № 18. У Наваградскай выбарчай акрузе, насуперак сцверджанням А. Стагановіча, спісы № 18 былі выстаўленыя як на выбарах у Сенат, так і на выбарах у Сейм. Праўда, на сеймавых выбарах БНМ дабіцца асаблівых поспехаў не ўдалося: ён атрымаў тут толькі 2215 галасоў выбаршчыкаў і не здабыў аніводнага пасольскага мандата.

[45] Гэтая лічба відавочна перабольшаная (гл. каментар 92 да «Успамінаў пасла»).

[46] Іван Грэцкі сапраўды прайшоў у Сейм па ўкраінскім спісе № 19 «Сельроб-лявіца» (фактычна ўкраінскі аналаг Грамады), але не па Пінскай, а па Берасцейскай выбарчай акрузе.

[47] ТАСС — Тэлеграфнае агенцтва Савецкага Саюза.

[48] Цяжка пагадзіцца з гэтым сцверджаннем А. Стагановіча. Якраз наадварот, Ігнат Дварчанін (як перад гэтым Браніслаў Тарашкевіч) падчас выканання пасольскіх абавязкаў фактычна закінуў навуковую працу і цалкам прысвяціў сябе палітыцы.

[49] Маецца на ўвазе Макатоўская турма ў Варшаве, якая знаходзіцца на Ракавецкай вуліцы.

[50] Янка Станкевіч меў на ўвазе **Мікалая Верамея** (1898–1937), беларускага левага дзеяча, які вучыўся ў Чэхаславакіі ў 1922–1929 гг., скончыў Пражскі электратэхнічны інстытут. Быў адным з арганізатараў марксісцкай групы ў асяроддзі беларускага студэнцтва ў Празе. Пасля вяртання дадому, у Заходнюю Беларусь, у траўні 1930 г. быў выбраны паслом польскага Сейма па спісе «Змаганне» на паўторных выбарах у Лідскай акрузе, якія былі прызначаны пасля анулявання вынікаў папярэдніх, 1928 г., якія Вярхоўным Судом Польшчы былі прызнаныя ў гэтай акрузе сфальсіфікаванымі. Аднак з-за датэрміновага роспуску парламента ў канцы жніўня 1930 г. ён прыняць прысягу і, адпавед-

на, пачаць выконваць пасольскія абавязкі не паспеў. Стагановіч пра гэта не ведаў, паколькі ў той час знаходзіўся ў турме. З сакавіка 1931 г. М. Верамей знаходзіўся ў СССР, у 1933 г. арыштаваны і высланы ў Хабараўскі край, дзе і загінуў.

[51] Маецца на ўвазе Флягонт Валынец.

## Якою меркаю мераеш, такою табе адмераюць!

Друкуецца паводле аўтарскага арыгінала. Артыкул падпісаны псеўданімам Д. Скобля.

[1] Маецца на ўвазе наступная публікацыя: Станкевіч, Я. На бакох «Успамінаў» В. Рагулі // Бацькаўшчына. № 18 (404). 4 траўня 1958. С. 2–3; № 19 (405). 11 траўня 1958. С. 2–3; № 20 (406). 18 траўня 1958. С. 3–4. Пазней гэты артыкул быў цалкам перадрукаваны ў выданні: Станкевіч, Я. За родную мову й праўдзівы назоў: Выбранае. Вільня, 2006. С. 260–270.

[2] Стагановіч не ўлічвае таго, што апісаныя Я. Станкевічам падзеі адбываліся ўжо пасля Лютаўскай рэвалюцыі, калі дысцыпліна ў расійскай арміі моцна ўпала, а афіцэры фактычна сталі залежаць ад салдацкіх саветаў. Таму правілы, паводле якіх жыла расійская армія да рэвалюцыі, у дачыненні да гэтага перыяду не заўсёды можна застасоўваць.

[3] **Аляксандр Сандэцкі** (1851 — пасля 1918), расійскі генерал ад інфантэрыі, камандаваў войскамі Казанскай вайсковай акругі ў 1907–1912 і ў 1915–1917 гг. У сакавіку 1917 г. пайшоў у адстаўку, па пастанове Часовага камітэта арыштаваны і пасаджаны пад хатні арышт. Абвінавачваўся ў жорсткасці падчас задушэння рэвалюцыі 1905–1907 гг., прыгнятанні асобы салдат, увядзенні расследаванняў на аснове ананімных лістоў, што падрывала маральную сувязь афіцэраў і салдат. Сцвярджалася, што дысцыпліна ў Сандэцкага трымалася толькі на страху, а ягоныя загады супярэчылі законам і г. д. У ліпені 1917 г. справа генерала Сандэцкага была перададзеная суду, але выйшла затрымка і больш да гэтага пытання не вярталіся.

[4] На самай справе ў першыя дні Лютаўскай рэвалюцыі генерал Сандэцкі быў толькі арыштаваны і пасаджаны на гаўптвахту, а пасля

пераведзены ў турэмную бальніцу. Вядома, што ў жніўні — верасні ён быў яшчэ жывы і знаходзіўся ў Маскве, але канчатковы ягоны лёс дагэтуль не высветлены.

[5] **Язэп Найдзюк** (1909–1984), беларускі дзеяч, які з канца 1920-х гг. працаваў у Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны ў Вільні, быў яе дырэктарам і рэдагаваў часопіс «Шлях моладзі». Падчас Другой сусветнай вайны працаваў у «Выдавецтве падручнікаў і літаратуры для моладзі ў Менску», быў членам Цэнтральнай рады Беларускай народнай самапомачы. У 1943 г. выдаў у Менску падручнік «Беларусь учора і сяння», на якую і спасылаецца А. Стагановіч. Пасля вайны жыў у Польшчы пад прозвішчам Александровіч.

[6] Дадзены закід Стагановіча на адрас Станкевіча — надуманы. Язэп Найдзюк пісаў у сваёй прадмове наступнае: «*Пры апрацоўцы гэтых нарысаў былі выкарыстаныя галоўным чынам працы з гісторыі Беларусі ведамых гісторыкаў — прафесараў: У. Ігнатоўскага, У. Пічэты, М. Доўнар-Запольскага, М. Любаўскага, Е. Карскага, акадэмікаў: В. Ластоўскага і В. Шчэрбакова, а таксама працы з галіны гісторыі Беларусі і беларускага адраджэнскага руху ведамых беларускіх дзеячоў: П. Крэчэўскага, А. Станкевіча, М. Шкялёнка, д-ра Я. Станкевіча, К. Езавітава, А. Луцкевіча і другіх. [...] У працы над гэтай кніжкай меў я помач ад: сп. Мікалая Шкялёнка, які, можна сказаць, быў хросным бацькам першага выдання яе; сп. Адама Станкевіча, які памагаў літаратурай і добрай радай, і сп. рэдактара Антона Адамовіча, які пераглядаў і рабіў некаторыя папраўкі ў часе ейнага друку ў газеце "Голас вёскі"*». Як бачна, аўтар не адзначае, якую канкрэтна інфармацыю ён узяў з прац Янкі Станкевіча, і зусім не згадвае пра тое, што апошні нейкім чынам асабіста заангажаваўся ў справу напісання і выдання ягонай кампіляцыйнай працы.

[7] Маецца на ўвазе **Крывіцкае (Беларускае) навуковае таварыства імя Пранціша Скарыны**, якое існавала ў 1946–1949 гг. у Германіі, а ў 1949–1976 гг. — у ЗША.

[8] Маецца на ўвазе **Беларуска-Амерыканскае Задзіночанне** (БАЗА), грамадская арганізацыя беларусаў у ЗША, якая была створаная ў 1949 г. і працягвае сваю дзейнасць і цяпер.

## У абарону «Успамінаў» В. Рагулі

Друкуецца паводле аўтарскага арыгінала. Гэты тэкст друкаваўся таксама: Стагановіч, А. У абарону «Ўспамінаў» Васіля Рагулі // Бацькаўшчына. № 29–30 (415–416). 10 жніўня 1958. С. 3–4.

[1] **Ян Ярушэвіч (Ярашэвіч)** — капітан царскай арміі. На з'ездзе беларусаў Заходняга фронту 18–24 кастрычніка 1917 г. у Мінску быў абраны старшынёй выканкама Беларускай цэнтральнай вайсковай рады. У 1919 г. з'яўляўся сябрам Гарадзенскай управы, працаваў у ёй пры аддзеле народнай асветы. Быў сябрам Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэта, клуба «Беларуская хатка», намеснікам старшыні Таварыства беларускіх вайскоўцаў у Гродне, Беларускай цэнтральный рады Віленшчыны і Гарадзеншчыны. У 1924 г. працаваў настаўнікам у Гродзенскай беларускай школе.

[2] На самай справе беларусы на тэрыторыі «рагулеўскай» Наваградскай выбарчай акругі атрымалі ў 1922 г. не 4, а толькі 2 пасольскія мандаты (для самога Рагулі і для Міхала Кахановіча). Два з чатырох мандатаў, сапраўды здабытых у акрузе Блокам нацыянальных меншасцяў, адышлі паводле перадвыбарчых дамоўленасцяў да яўрэяў (іх атрымалі сіяністы — лекар з Вільні Якаў Выгодскі і адвакат са Слоніма Ізраіль Люблінскі-Стучынскі). Гэта, аднак, аніяк не змяншае той сапраўды значнай ролі, якую падчас перадвыбарчай кампаніі адыграў Васіль Рагуля, бо ў Наваградскім павеце, у якім ён агітаваў, за спіс БНМ прагаласавалі 24 534 чалавек (ажно 79,1 % усіх выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у галасаванні). Для прыкладу, у Нясвіжскім павеце адпаведна было 17 493 чалавекі (57,3 %), у Стаўпецкім — 5537 (28,5 %), у Слонімскім — 8609 (28 %) і ў Баранавіцкім — 3686 (16,7 %).

[3] Сапраўды, абвінавачванне В. Рагулі ў русафільстве на падставе занадта частага згадвання апошнім расейцаў падчас выступлення ў Сейме 25 чэрвеня 1924 г., не мае пад сабой грунту. Рагуля насамрэч некалькі разоў згадваў пра рускую нацыянальную меншасць у Польшчы, але толькі ўпоравень з іншымі: беларускай, украінскай, нямецкай, літоўскай. Пры гэтым адна з падобных згадак (самая першая) была выразна справакаваная палітычнымі апанентамі, і яна выяўляла, хутчэй, не русафільскія, а агульнадэмакратычныя погляды

Рагулі: *«Сойм павінен адсунуць рукі тых, што не працуюць на зямлі, а аддаць яе ў мазалістыя рукі, з любасцю адданыя сваёй працы без розніцы паміж палякамі, беларусамі, украінцамі, немцамі і ліцвінамі. (Голас: І расейцы таксама?) А што ж вы думаеце, што расеец не мае права атрымаць зямлю, калі ён грамадзянін?»*.

[4] Усё ж такі агульнае русафільства Васіля Рагулі на працягу ўсяго яго жыцця аспрэчыць складана, што выяўлялася хоць бы ў стаўленні гэтага дзеяча да беларускай мовы. Нават пасля выбрання ў паслы польскага Сейма ён у публічных выступах і ў прыватным жыцці аддаваў перавагу рускай мове і, паводле сведчання пляменніка Барыса Рагулі, да самай сваёй смерці ў 1955 г. *«размаўляў толькі па-руску»*.

[5] Адносна агульнага кірунку прамоў Рагулі Стагановіч мае рацыю. У адной з тагачасных брашур, выдадзенай польскім памешчыкам А. Аскеркам і прысвечанай стварэнню Грамады, апісаны адзін з мітынгаў Васіля Рагулі ў траўні 1924 г. і нават працытаваны ўрывак з прамовы пасла на мове арыгінала (Рагуля заўсёды выступаў па-руску): *«Товарищи, не у одного из вас спина исполосована ненавистными белыми польскими нагайками, не у одного из вас под ногтями занозы, загнанные ненавистными белыми польскими палачами. Какая ирония судьбы! Здесь по вашим спинам безнаказанно гуляют белые польские нагайки, а там, за несколько вёрст на востоке, гордо развевает флаг свободной Белоруси. Паны тут назначают вам платить страховки, так покажите же вы панам страховку»* (Murdelio M. «Sęp nam wyjada nie serce lecz mozgi», Jak tworzyliśmy hurtki, Do obrońców sprawy białoruskiej. Wilno, 1927. S. 24).

[6] **«Сялянская ніва»** — беларуская газета, друкаваны орган Беларускага сялянскага саюза. Выходзіла ў Вільні з 6 снежня 1925 г. да 7 ліпеня 1930 г. (у 1928–1930 гг. — нерэгулярна).

[7] На самай справе Беларускі сялянскі саюз ніколі не падаваў мемарыялаў у Лігу Нацый самастойна, але ягоныя дзеячы падпісвалі дакументы, якія накіроўваліся ў гэтую міжнародную арганізацыю ад імя Беларускага пасольскага клуба. Да таго ж Васіль Рагуля і Фабіян Ярэміч некалькі разоў прадстаўлялі беларускую нацыянальную меншасць у Польшчы на штогадовых еўрапейскіх кангрэсах нацыянальных меншасцяў.

[8] **«Natio»** — штомесячны часопіс, прысвечаны нацыянальным справам у Польшчы, які выдаваўся сумесна прадстаўнікамі ўсіх асноўных

нацыянальных меншасцяў у 1927 г. на польскай, нямецкай, французскай і англійскай мовах пад рэдакцыяй доктара-ўкраінца Паўла Лысяка. Ад беларусаў у выдавецкі камітэт часопіса ўваходзіў пасол Сейма Фабіян Ярэміч.

[9] Несумненна, што Найвышэйшая Рада, якая была створаная 13 снежня 1919 г. у Мінску ў выніку расколу Рады Беларускай Народнай Рэспублікі з-за супярэчнасцяў паміж яе дзеячамі па пытанні аб адносінах да Польшчы і Раду Міністраў якой узначальваў Антон Луцкевіч, стаяла на пазіцыях цеснага супрацоўніцтва з палякамі. Аднак і Васіль Рагуля, і следам за ім Аляксандр Стагановіч ацэньваюць гэты факт без уліку тагачаснай геапалітычнай сітуацыі, фактычна ставячы роўнасць паміж паланафільствам Найвышэйшай Рады і пазнейшым паланафільствам у міжваеннай Польшчы, найбольш сімвалічнай фігурай якога з'яўляўся Арсень Паўлюкевіч. Між тым спроба некаторых беларускіх дзеячаў абаперціся на Польшчу была ў 1919—1920 гг. цалкам натуральнай, паколькі беларусы не мелі неабходных рэсурсаў для таго, каб дабіцца сваіх нацыянальных мэтаў самастойна, а тагачасны польскі лідар Юзаф Пілсудскі прапагандаваў прывабную для іх федэрацыйную канцэпцыю. Праўда, Луцкевіч вельмі хутка расчараваўся ў магчымасцях дасягнення беларускіх нацыянальных мэтаў у саюзе з Польшчай і ўжо 28 лютага 1920 г. адмовіўся ад пасады старшыні Рады Міністраў. Неўзабаве свет убачыла ягоная брашура «Польская акупацыя ў Беларусі», выразна скіраваная супраць польскага панавання.

[10] Тарас Струг — псеўданім самога Аляксандра Стагановіча.

[11] Публічная дыскусія адносна маёнтка, купленага Янкам Станкевічам на мяжы 1920—1930-х гг., бярэ пачатак яшчэ з таго часу, калі той быў толькі набыты. Перад паўторнымі выбарамі ў польскі Сейм у Лідскай і Свянцянскай акругах (выбары адбываліся адпаведна ў траўні і ў ліпені 1930 г. пасля таго, як польскі Вярхоўны Суд прызнаў папярэднія выбары, сакавіцкія 1928 г., у гэтых акругах сфальсіфікаванымі) у газеце беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў «Беларуская крыніца» (№ 15 за 18 красавіка 1930 г.) быў апублікаваны матэрыял, аўтар якога сцвярджаў, што Я. Станкевіч *«на супалку з Юстынам Мурашкам (кандыдатам у Сойм ад нумару 41 у Свянцянскім вокрузе) закупіў 600 дзесяцін зямлі. З ласкі панскай купіў ён гэту зямлю дужа танна з той мэтай, што адпрадасць яе нашым сялянам і шмат заробіць».*

У адказ на гэта Станкевіч палічыў патрэбным выказаць у друку свой погляд на рэчы, надрукаваўшы ў віленскай газеце «Наперад!» (№ 16 ад 30 красавіка 1930 г., с. 4) свой адкрыты ліст ад 19 красавіка 1930 г. пад характэрнай назвай «Адказ дэмаралізатарам беларускага жыцця», у якім адносна сваіх зямельных спраў заявіў наступнае:

*«А запраўды ёсьць начай.*

*З належачага да А. Аляксандрава ўрочышча Рудня (каля 600 гэктараў), Жойдзішнае вол., Вялейскага павету часьць купіў Язэп Сьвятліцкі з в. Руда Яворская, Курылавіцкае вол., Слонімскага пав., часьць Ю. Мурашка і каля 200 гэктараў запісана пры куплі на мяне. Ю. Мурашка купіў найменей. Точныя лічбы няведамы, бо зямля яшчэ не памерана.*

*Была думка, каб якая беларуская арганізацыя купіла сама ўсю Рудню дзеля таннай парцэляцыі паміж безьзямельнымі і малазямельнымі беларускімі сялянамі ды каб даць частку пад санаторыю для хварэючых на сухоты беларускіх дзеячоў. Але дзеля таго, што арганізацыі ня мелі грошаў, дык часьць купіў Я. Сьвятліцкі і часьць Ю. Мурашка. Калі-ж арганізацыя ня мела грошаў і на асталых 200 гэктараў (прыблізна), дык грошы на куплю іх пазычаў я ў свайго швагры доктара мэдыцыны Яр. Новака ў Празе, а тысяча (1.000) зал. пазычыў у свайго айчыма Антона Чатыркі. Рабіў я гэта маючы на ўвеце тыя самыя мэты, дзеля якіх гэную зямлю манілася купіць арганізацыя, г. зн. каб потым парцэляваць без заробку паміж безьзямельнымі й малазямельнымі беларускімі сялянамі ды даць частку пад санаторыю. Але заплаціўшы за зямлю пазычанымі грашыма, каб зябясьпечыць іх, мусіў зямлю запісаць на сябе.*

*На пазычаныя ў швагры грошы я маю дакуманты (грошы прысланы праз банк), а на пазычаныя ў айчыма Антона Чатыркі цікавыя могуць пабачыць у яго мой вэксаль (адрэс А. Ч.: Арляняты, Крэўскае вол., Ашмянскага п.).*

*"Biel. Krynica" піша, што, "З ласкі панскай купіў ён гэту зямлю дужа танна з тэй мэтай, што адпрадасьць яе нашым сялянам і шмат заробіць".*

*Ня ведаю, скуль "Biel. Krynica" ведае аб такіх плянах нейкіх ласкавых да мяне паноў зрабіць мяне багатым.*

*Але праўда, што ўсе тры мы купілі гэтую зямлю вельмі танна, бо разам з доўгам у банк гэктар абыйшоўся па 65 зал., а бяз доўгу ў банк, каторы трэба плаціць у працягу 51 г. — 40 зал. Але не было тут нічыеей ласкі. Гэтую «ласку» я магу пераўступіць кожнай беларускай арганізацыі, калі*

*толькі яна забавяжацца выпаўніць тыя заданьні, дзеля каторых куплена запісаная на мяне часьць Рудні, і толькі верне мне тыя грошы, каторыя я заплаціў. Навет няхай паразумеецца з маімі пазычэльнікамі (з тымі, што мне пазычылі грошы) і доўг з мяне перавядзе на сябе. Я із свайго боку абяцаю ўсякую помач у гэтай справе.*

*"Bieł. Krynica", сьвядома хвалшуючы справу куплі Рудні, хоча прадставіць мяне ў вачох нашага сялянства як чалавека, каторы забагацеў з пасольскага мандату. Гэтыя хвалшывыя закіды якраз робіць тая група, сябры каторай, будучы пасламі, пакуплялі сабе і сваім сваякам зямлю і ня толькі зямлю. Гэтак, кс. Адам Станкевіч купіў сваёй сястры Ганне Гарлуковічысе 18 гэктараў найлепшай зямлі ў Карпуцішках ля Барун і 3 гэктары ў Смалянцы недалёка Барун, другой сваёй сястры Амэлі, што замужам у Вішнёўцы, Крэўскае вол., перапаставіў увесь будынак, ня кажучы ўжо аб іншых ягоных падарках.*

*Я заяўляю, што ў згодзе з мэтамі, з якімі была купляна запісаная на мяне часьць Рудні, я гэную часьць магу памяняць на зямлю, купленую кс. А. Станкевічам яго сястры Г. Гарлуковічысе навет на адны яе Карпуцішкі.*

*Зробленыя ў гэтым лісьце заявы прашу прыняць як пропозыцыі».*

[12] Пад «арганістымі» Янка Станкевіч меў на ўвазе паслоў Альбіна Стаповіча і Паўла Карузу.

[13] Тут Стагановіч, відавочна, мае на ўвазе **Язэпа Макрэцкага** (1888 —?), пасла польскага Сейма ў 1928–1930 гг. ад Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам. Нарадзіўся ў вёсцы Лявонавічы Нясвіжскага павета. Быў самавукам. Гаспадарыў на зямлі ў роднай вёсцы, браў удзел у працы мясцовых органаў самакіравання. Звестак пра лёс пасля роспуску Сейма не выяўлена.

[14] **Ян Шчэрба** (1884 —?), пасол польскага Сейма ў 1928–1930 гг. ад Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам. Нарадзіўся ў вёсцы Падворышкі Лідскага павета, скончыў 4 класы гімназіі. Меў гаспадарку ў роднай вёсцы, а таксама арганізоўваў мясцовую кааперацыю. Звестак пра лёс пасля роспуску Сейма не выяўлена.

[15] Згодна з Рэгламентам Сейма Польскай Рэспублікі, прынятым у 1923 г. і дзейсным да 1930 г., у пастаянныя сеймавыя камісіі маглі накіроўваць сваіх прадстаўнікоў толькі клубы, якія мелі ў сваім складзе ня менш чым 11 чалавек. Тыя ж клубы, якія такой колькасці

сяброў не мелі, а таксама паслы, якія да клубаў наогул не належалі, маглі заявіць пра сваё далучэнне да сябраў іншага клуба, які патрэбную колькасць паслоў меў. Паслы Фабіян Ярэміч, Альбін Стаповіч, Павел Каруза і Канстанцін Юхневіч адразу пасля парламенцкіх выбараў дасягнулі паразумення з Украінскім клубам і стварылі сумесны Украінска-Беларускі клуб, што дазволіла згаданым паслам атрымаць месцы ў некаторых сеймавых камісіях. Аднак жа ўкраінцы не пагадзіліся дапусціць беларусаў у Асветную і Зямельную камісіі, якія былі для апошніх найбольш важнымі. Фабіян Ярэміч, такім чынам, у Асветнай камісіі не працаваў, а быў сябрам толькі Камунікацыйнай і Адміністрацыйнай камісій. Аднак сама прысутнасць беларускага прадстаўніка ў камісіі, якая складалася з 31 пасла, па сутнасці нічога не мяняла: так ці інакш патрабаваліся розныя закулісныя гульні з прадстаўнікамі іншых фракцый. Да таго ж канчатковае рашэнне ўсё адно прымалася на паседжанні ўсяго Сейма, а не адной камісіі.

[16] Эндэкі — сябры Польскай нацыянальна-дэмакратычнай партыі. Янка Станкевіч, адказваючы на дадзены артыкул (Станкевіч, Я. Колькі зацемкаў да Стагановічавае абароны «Успамінаў» В. Рагулі // Бацькаўшчына. 14 верасня 1958. С. 4), адзначыў, што *«хіба толькі Стагановіч верыць (калі верыць), што эндэкі маглі галасаваць за такое пасуленне»*, і, безумоўна, меў у гэтай справе рацыю, бо польскія эндэкі паслядоўна стаялі на пазіцыях будавання польскай нацыянальнай дзяржавы і негатыўна ставіліся да забеспячэння правоў нацыянальных меншасцяў. Дзеля таго беларускія дзеячы, калі праводзілі нейкія кулуарныя перамовы, маглі гэта рабіць толькі з прадстаўнікамі польскіх левых, у крайнім выпадку цэнтрысцкіх партый, з эндэкамі ж любыя размовы ў гэтым кірунку адпачатку былі асуджаныя на няўдачу.

[17] Усяго ў Сейм II склікання (1928–1930 гг.) было выбрана 46 украінскіх паслоў. Аднак жа яны, як і беларусы, былі падзелены на некалькі клубаў. Самы вялікі, Украінскі клуб, налічваў 26 паслоў, з іх 23 з'яўляліся сябрамі Украінскага нацыянальна-дэмакратычнага аб'яднання (УНДО). Былі таксама ў Сейме клуб Украінскай сацыялістычна-радыкальнай парламенцкай рэпрэзентацыі (УСРПР) (8 паслоў), клуб Украінскага сялянска-работніцкага сацыялістычнага аб'яднання «Сельроб» (4 паслы), клуб «Сельроба-лявіцы» (2 паслы) і Украінскай працоўнай партыі (1 пасол). 5 украінцаў уваходзілі ў склад праўрадавага Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з ура-

дам. Нават калі б гэтыя ўкраінцы ўсе без выключэння падтрымалі дамаганні беларусаў, адных іхных галасоў не хапіла б на правядзенне патрэбнага рашэння (усяго ў польскі Сейм уваходзілі 444 паслы). Таму без паразумення з прадстаўнікамі польскіх клубаў ніякага карыснага беларусам рашэння правесці б не ўдалося.

Увогуле ж атрыманне субсідый, як вынікае, стала вынікам агульных намаганняў беларускіх паслоў. Я. Станкевіч сапраўды агучыў з сеймавай трыбуны патрабаванне выдзялення пэўных сум на беларускую адукацыю з польскага бюджэту яшчэ ў сваёй першай прамове ад 30 сакавіка 1928 г. Аднак і іншыя паслы-беларусы (акрамя змаганцаў, якім забаранялі гэта рабіць камуністы) дабіваліся той жа мэты пры дапамозе ўласных каналаў. У свой час гэта падкрэслівалася і ў перадвыбарчай лістоўцы Я. Станкевіча на дадатковых выбарах у Сейм у 1930 г.: *«Гэтак, пасля доўгіх стаडранняў Станкевіча прынятая ягоная прапанова аб прызнанні 200 тысяч злотых на будову будынку Беларускай гімназіі ў Наваградку і вучаніцкае бурсы пры гімназіі, таксама па яго дамаганні і прапанове Сейм прызнаў сёлета 100 тысяч злотых на Беларускую настаўніцкую семінарыю і 150 тысяч злотых на беларускія вучыцельскія курсы (каб нам не закінулі, што замоўчваем праведзеныя прапановы іншых паслоў, адзначым тут, што Сейм сёлета па прапанове пасла Ярэміча, зробленай ім у паразуменні з ББСУ, прызнаў 50 тысяч "дзеля дання магчымасці друкавання беларускіх школьных падручнікаў". Шкада толькі, што гэтая прапанова так няўдала напісаная, што ўрад на беларускія выдавецтвы можа грошы ня даць, бо ўрад сам выдае беларускія кніжкі, і, як дагэтуль, шкодныя беларусам ("Лемантар" Ст. Любіч-Маеўскага)»* (НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 367. Арк. 2).

[18] **Беларускі гаспадарскі звяз**, культурна-асветная і гаспадарчая арганізацыя, якую Я. Станкевіч стварыў у канцы 1920-х гг. з мэтай супрацьдзеяння ўплывам апанаванага камуністамі Таварыства беларускай школы (ТБШ) і кіраванага дзеячамі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і Беларускага сялянскага саюза Інстытута беларускай гаспадаркі і культуры. Шырокай дзейнасці арганізацыя разгарнуць ня здолела.

[19] Сам Янка Станкевіч, натуральна, ацэньваў дзейнасць створанай ім арганізацыі куды больш пазітыўна, асабліва на першым этапе яе дзейнасці. Так, перад паўторнымі выбарамі ў Лідскай акрузе, якія адбываліся ў траўні 1930 г., у перадвыбарчай улётцы ён даў такую

справаздачу пра працу Беларускага гаспадарскага звяза: *«Найперш, каб стварыць лепшыя магчымасці культурнай і гаспадарскай працы беларусаў, Станкевіч арганізуе Беларускі гаспадарскі звяз. Пры звязе, як легальнай арганізацыі, заклаў ладне таварystваў (гуртстваў) Беларускага гаспадарскага звязу з чытальнямі, бібліятэкамі і народнымі дамамі. Пры некаторых таварыствах узніклі здольныя драматычныя дружыны, як у Валожыне, Маладзечне, Гародзьках і інш.*

*Адначасна арганізоўваліся, дзе гэта было магчыма, беларускія кааператывы.*

*Улетку 1928 г. арганізаваў выставу беларускіх хатніх промыслаў пры паўночным кірмашы ў Вільні. Увосень 1929 г. даў магчымасць 20 беларускім інтэлігентам з сяла праслухаць Кааператыўныя курсы.*

*Паслаў за свой кошт 10 чалавек вучыцца на малачарскіх інструктараў. [...]*

*"Дзеля пашырэння беларускай свядомасці, беларускага руху ды беларускай асветы і культуры Станкевіч заклаў беларускія кнігарні ў Валожыне, Маладзечне, Лідзе, Ашмяне (дзеля таго, што на кнігарню ў Ашмяне наклалі вельмі вялікі падатак, а куплялі ў кнігарні мала, кнігарня зліквідаваная, а замест яе будзе вялікая беларуская бібліятэка, пад каторую цяпер глядзіць памяшканне сябра М. Галас), сёлета ў лютым пачынае закладаць беларускую кнігарню ў Браславе.*

*Кнігарні ў павятовых мястэчках дадуць магчымасць кожнаму беларусу на месцы ў сябе купляць свае родныя кніжкі а, з другога боку, падымаць дух у нашым забітым народзе. Акрамя таго, як кнігарня стане аплачываць сябе, як гэта ёсць цяпер у Маладзечне і Валожыне, дык загадчык кнігарні можа з яе жыць і адначасова рабіць ладную беларускую працу".*

*Вялікую рупнасць Янка Станкевіч выказаў дзеля арганізацыі беларускіх прыватных школаў; на жаль, гэтаму перашкаджалі школьная адміністрацыя і нястача грошаў. Ён адчыніў і ўтрымоўвае 2 беларускія прыватныя школы ў Валожыне, дзе вучаць 2 настаўнікі, і ў Славенску, Забрэзскай гм. Валожынскага пав. Важна яшчэ тое, што ён прыгатоўвае грунт дзеля адчынення ладнай лічбы беларусіх школ к налеццю, г. зн. на 1930/31 год.*

*Ведама, якое мае значэнне беларуская кніга дзеля адраджэння і вызвалення беларускага народа. Станкевіч не забываецца і аб гэтай галіне беларускай працы. Сваім коштам і сваёй беспасрэднай выдавецкай працай ён выдаў гэткіх 13 кніжак беларускіх аўтараў»* (НА РБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 367. Арк. 2).

Натуральна, няпроста разабрацца, колькі ў гэтых словах было праўды, а колькі — прапаганды. У любым выпадку відавочна, што Я. Станкевіч, ствараючы сваю арганізацыю, ставіў перад ёй амбіцыйныя задачы, якія пасля, праўда, збольшага не ўдалося рэалізаваць. Да таго ж, як відаць з пераліку мясцовасцяў, у якіх Я. Станкевіч праводзіў (ці меркаваў правесці) нейкія мерапрыемствы, дзейнасць ягонай арганізацыі была тэрытарыяльна абмежаваная тэрыторыяй Віленшчыны і Лідчыны, а на Наваградчыну зусім не распаўсюджвалася. Так што А. Стагановічу, як жыхару вёскі ў Наваградскім павеце, дзейнасць Беларускага гаспадарчага звяза была б малапрыкметнай нават у тым выпадку, каб усё намечанае Я. Станкевічам удалося б рэалізаваць.

[20] Няма сумневу, што дзейнасць Беларускага гаспадарскага звяза не надта перашкаджала польскім уладам, асабліва ў пазнейшы перыяд ягонага існавання, але сам факт яго ліквідацыі ў пазнейшы тэрмін, чым астатніх падобных, ні пра што асабліва не сведчыць. З сярэдзіны 1930-х гг. палякі ўзялі цвёрды курс на поўную ліквідацыю ўсіх праяваў беларускага жыцця ў краіне і пакрысе, адну за адной, ліквідоўвалі ўсе арганізацыі, не надта ацэньваючы ўзровень іх шкоднасці для дзяржавы ці ступень актыўнасці. Так, напрыклад, да самага канца існавання міжваеннай польскай дзяржавы не была афіцыйна спынена дзейнасць Беларускага народнага аб'яднання (пераемніка Беларускай хрысціянскай дэмакратыі), хоць дзейнасць гэтай палітычнай арганізацыі відавочна «перашкаджала» палякам больш, чым дзейнасць малалікіх культурна-гаспадарчых аб'яднанняў.

[21] Пра нібыта нецярпімае стаўленне Я. Станкевіча да людзей, якія не размаўлялі па-беларуску, згадвалі і іншыя ягоныя зацятыя апаненты. У той жа час здараліся і адваротныя выпадкі — калі яму самому прыпісваліся антыбеларускія погляды. Так, аўтар датаванага 27 лютага 1948 г. прапагандысцкага пасквіля «Па старонках нашае жывое гісторыі. Характарыстыкі "крывічоў" і іх прыбочнікаў», кажучы пра валоданне Станкевічам у 1930-я гг. кнігарняй у Вільні на рагу вуліц Гетманскай і Вастрабрамскай, адзначаў, што *«гэты склепік быў чыста польскім і сам др. Янка Станкевіч ніколі ні з кім з гасцей не гутарыў па-беларуску, а выключна па-польску, нават са знаёмымі»*. Дадзены прыклад паказвае, наколькі асцярожна трэба ставіцца да падобных сведчанняў.

[22] Маецца на ўвазе выданне: Скарыніч, Б. Новы песеньнік крывіцкі (беларускі) для школаў. Аўгсбург, 1946.

[23] Маецца на ўвазе брашура, якя выйшла ў двух варыянтах, кірылічным і лацінкавым: Станкевіч, Я. Толькі сябром Рады Б.Н.Р. Да сяброў Рады Б.Н.Р. Нью-Ёрк, 1953. 15 с.; Stankievich, J. Tolki siabrom Rady B.N.R. Da siabroŭ Rady B.N.R. New York, 1953. 21 s. У ёй ішла гаворка пра палітычны раскол у БНР, друкаваліся дакументы пра асобных сябраў Рады БНР.

## Мой адказ Я. Станкевічу

Друкуецца паводле публікацыі: Стагановіч, А. Мой адказ Я. Станкевічу // Бацькаўшчына. № 47 (433). 7 лістапада 1958. С. 3–4.

[1] Пазней гэты артыкул быў цалкам перадрукаваны ў выданні: Станкевіч, Я. За родную мову й праўдзівы назоў: Выбранае. Вільня, 2006. С. 274–276.

[2] На самай справе рускія нацыянальныя арганізацыі разам з большасцю беларускіх, украінскіх, яўрэйскіх і нямецкіх уваходзілі ў склад Блока нацыянальных меншасцяў падчас правядзення парламенцкіх выбараў у 1922 г. У выніку дадзеных выбараў ім з агульнага спіса БНМ нават удалося правесці аднаго сеймавага пасла (Мікалая Сярэбранікава па дзяржаўным спісе) і аднаго сенатара (Мацея Каспяровіча ў Палескім ваяводстве). Што тычыцца выбараў 1928 г., то тады рускія нацыянальныя арганізацыі сапраўды ў Блок нацыянальных меншасцяў не ўвайшлі, а выставілі ўласны спіс, якому быў прысвоены № 20. Гэты спіс неспадзявана атрымаў ажно 16 849 галасоў у Пінскай выбарчай акрузе (9808 з іх у Столінскім павеце) і правёў з гэтай акругі свайго адзінага на гэтых выбарах пасла — лекара з Берасця Паўла Караля. Акрамя таго, даволі шмат галасоў (12 870) спіс № 20 здабыў у Свянцянскай выбарчай акрузе (перадусім у Браслаўскім і Дзісенскім паветах), дзе за яго ў асноўным галасавалі шматлікія ў гэтай мясцовасці стараабрадцы.

[3] На самай справе двух — сябе і Міхала Кахановіча.

[4] Васіля Рагулю судзілі за выступ на справаздачным пасольскім мітынгу ў Наваградку на Замкавай гары 22 траўня 1924 г., на якім ён

выступаў разам з іншымі беларускімі пасламі М. Кахановічам і А. Аўсянікам. Паводле справаздачы з працэсу, надрукаванай у беларускіх газетах, змест Рагулевай прамовы быў наступны: *«Рагуля чытаў слухачам адрыўкі з газетаў аб выбарах у Францыі, Англіі і Германіі, гаварыў, што цэлы свет ідзе налева. Гаворачы аб Польшчы, ён казаў аб адбіранні цэркваў, аб рэлігійных уцісках, аб тым, каб не пасылалі дзяцей да польскай школы. Гаварыў аб цяжкіх падатках, прычым сказаў: "Вы самі разумееце, што я не магу сказаць вам, каб не плацілі падаткаў, але вы і самі разумееце". Далей ён казаў: "Мы, беларусы — сіла, нас толькі падзялілі на дзве часткі, але і тая, усходняя, частка таксама ёсць Беларусь, і нашы браты за кардонам нам памогуць. Але перадусім мы мусім спадзявацца на саміх сябе", і тут прывёў верш з вядомай рэвалюцыйнай песні:*

*"Никто не даст нам избавленья: ни царь, ни раб и не герой.*

*Добьёмся мы освобожденья своею собственной рукой.*

*На нашых беларускіх абшарах садзяць асаднікаў, хочуць зрабіць з яе Польшчу, але тут павінна быць Беларусь". Закончыў ён прамову акрыкам: "Няхай жыве незалежная Беларусь!"»*. Гл.: Працэс б. пасла Рагулі // Праваслаўная Беларусь. № 7. 7 сакавіка 1928. С. 11–12; Praces pasła W. Rahuli // Biełaruskaja Krynica. № 21. 15 sakawika 1928. S. 2; Працэс быўш. пасла В. Рагулі // Сялянская ніва. № 24. 25 сакавіка 1928. С. 1.

[5] Тут Стагановіч цалкам мае рацыю. Да 1924 г. у Заходняй Беларусі захоўвалася надзвычай напружанае становішча і фактычна ішла падрыхтоўка да антыпольскага паўстання, якой аказвалася падтрымка з-за ўсходняй мяжы. Праз савецка-польскую мяжу пастаянна пераходзілі дыверсійныя групы, ствараліся таксама партызанскія атрады з мясцовага насельніцтва. Пры гэтым сітуацыя як вельмі сур'ёзная паўстае ў інтэрпрэтацыі самых розных бакоў: польскага дзяржаўнага, беларускага нацыянальнага і камуністычнага. Гл.: Кароткі нарыс беларускага пытаньня. Менск, 2009. С. 163–179, 204–214; Śleszyński, W. Walka instytucji państwowych z białoruską działalnością dywersyjną. Białystok, 2005; Атаман Іскра (С. Хмара). Партызанскімі сцежкамі // Слонімскі край. № 1. 2000. С. 35–57; Ваўпшасаў, С. А. На разгневанай зямлі. Мінск, 1963. Напружанасць сітуацыі зменшылася толькі пасля таго, як польскія ўлады стварылі спецыяльнае падраздзяленне для аховы ўсходняй дзяржаўнай мяжы — Корпус аховы памежжа, а кіраўніцтва кампартый Заходняй Беларусі і Польшчы на пачатку 1925 г. прызнала памылковым курс на падрыхтоўку ўзброенага

паўстання, пасля чаго цэнтральныя камітэты КПРП і КПЗБ заклікалі камуністаў і партызанаў спыніць узброеную барацьбу як нясвоечасовую і акцэнтаваць увагу на шырокай палітмасавай і арганізацыйнай працы сярод жыхароў заходнебеларускага краю.

[6] Палітыку, якую праводзіў Радаслаў Астроўскі на пасадзе дырэктара Віленскай беларускай гімназіі пасля 1928 г., цяжка ацаніць адназначна. Ён сапраўды ў гэты час практыкаваў даволі сур'ёзныя рэпрэсіі супраць вучняў гімназіі, якія выказвалі сімпатыі да камунізму, аж да выключэння з навучальнай установы і перадачы іх у рукі паліцыі. У той жа час гэта была, відаць, адзіная магчымасць увогуле захаваць гімназію як беларускую навучальную ўстанову, бо апанаванне гімназіяў камуністамі актыўна выкарыстоўвалася польскімі ўладамі як падстава для іх закрыцця. Так, у 1929 г. менавіта за гэта была закрытая Радашковіцкая, а ў 1931 г. — Клецкая беларуская гімназія. Іншая справа, што да свайго арышту па справе Грамады ў 1927 г. Радаслаў Астроўскі сам актыўна спрыяў радыкалізацыі гімназістаў, а пасля, згодна з трапным азначэннем Васіля Рагулі, толькі *«собскімі рукамі выкарчоўваў тое, што раней старанна сеяў»*.

[7] Тут Стагановіч мае рацыю. Цяжка прыгадаць выпадак, калі каго-небудзь з вязняў, асуджаных у Польшчы за правядзенне камуністычнай дзейнасці, уключалі ў спісы на абмен зняволенымі з СССР пры асабістай нязгодзе вязня на гэта. Праўда, прыведзены прыклад з Фабіянам Акінчыцам — не самы ўдалы, бо ён быў разам са сваімі калегамі-грамадоўцамі Браніславам Тарашкевічам Сымонам Ракам-Міхайлоўскім, Пятром Мятлой і Максімам Бурсевічам вясной 1930 г. датэрмінова вызвалены з турмы. Адпаведна з гэтым абмену вязнямі гэтыя дзеячы ўжо не падлягалі і прымалі рашэнне выехаць у СССР ці застацца ў Польшчы самастойна. З усіх вызваленых дзеячаў толькі Фабіян Акінчыц вырашыў застацца ў Польшчы, не маючы ілюзіяў, што яго і ягоных калег чакае ў савецкім «раі». Свае думкі на гэты конт ён выказаў тады на старонках дзвюх брашураў (Акінчыц Ф. Чаму гэта так сталася? (Да справы выезду за граніцу былых правадыроў Грамады). Вільня, 1931; Акінчыц Ф. Правакацыя беларускага народу (да справы б. старшыні Грамады Б. Тарашкевіча). Вільня, 1933), і гэтыя думкі аказаліся прарочымі.

[8] **Анры Філіп Петэн** (*Pétain)* (1856–1951), французскі генерал і палітык, кіраўнік калабарацыянісцкага ўрада «Вішы» падчас Другой су-

светнай вайны. Пасля вайны асуджаны французскім судом да смяротнага пакарання, замененага на пажыццёвае зняволенне.

[9] **Імрэ Надзь** (*Nagy*) (1896–1958), венгерскі палітычны дзеяч, адзін з лідараў мясцовай камуністычнай партыі. У 1930–1944 гг. жыў у СССР, дзе супрацоўнічаў з НКУС, пішучы даносы на венгерскіх камуністаў. У 1956 г. стаў прэм'ер-міністрам Венгерскай Народнай Рэспублікі, падтрымаў народнае паўстанне 1956 г., якое было задушана савецкімі танкамі. Павешаны за «дзяржаўную здраду».

[10] Стагановіч тут адказвае на наступнае выказванне Я. Станкевіча: *«Ганьба нашага часу, што А. Луцкевіч, аддаўшы ўсё сваё жыццё вызваленню свайго народа, дачакаўся, па мучаніцкай смерці, і Стагановічавага капыта»*.

## Адказ С. Прытыцкаму

Друкуецца паводле: А-іч. Адказ С. Прытыцкаму // Бацькаўшчына. № 6 (490). 7 лютага 1960. С. 2.

[1] **Прытыцкі Сяргей** (1913–1973), партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР. У 1930-я гг. актыўны ўдзельнік камуністычнага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі, у студзені 1936 г. у будынку Віленскага акруговага суда страляў у правакатара, за што быў прысуджаны да смяротнага пакарання. У сувязі са шматлікімі пратэстамі смяротны прысуд быў заменены на пажыццёвае зняволенне. Пасля 1939 г. займаў шэраг адказных партыйных і дзяржаўных пасад БССР, з 1968 г. старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

[2] Маецца на ўвазе наступная публікацыя: Прытыцкі С. У імя будучыні // Ніва. № 41. 12 кастрычніка 1958. С. 1, 6; № 42. 19 кастрычніка 1958. С. 3, 6; № 43. 26 кастрычніка 1958. С. 3, 6; № 44. 2 лістапада 1958. С. 4–5; № 45. 9 лістапада 1958. С. 3, 6; № 46. 16 лістапада 1958. С. 3, 6; № 47. 23 лістапада 1958. С. 3, 6; № 48. 30 лістапада 1958. С. 6; № 49. 7 снежня 1958. С. 3.

[3] Камасацыя — звядзенне ў адзін участак сялянскіх зямель, размешчаных раней цераспалосна. Правядзенне камасацыі было складовай часткай аграрнай рэформы, абвешчанай польскім Сеймам у 1919 г. У Заходняй Беларусі яна праводзілася на падставе законаў 1923 і 1925 гг.

[4] Сервітут — зямельная ўласнасць памешчыкаў, якой сяляне карысталіся на пэўных умовах. У міжваеннай Польшчы сервітуты заставаліся відавочным рэліктам феадальнай эпохі, але іх ліквідацыя выклікала супраціў бяднейшага сялянства, бо яны давалі сялянам права карыстацца сенажацямі, ляснымі ўгоддзямі, пасвіць жывёлу, лавіць рыбу і г. д.

[5] За час пачатку «высылкі правакатараў» Стагановіч, відавочна, прымае афіцыйнае стварэнне 30 лістапада 1923 г. Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Аднак жа яшчэ да гэтага на тэрыторыі Заходняй Беларусі існавалі камуністычныя арганізацыі пад розным назвамі, і эмісары з Масквы для арганізацыі падпольнай працы дасылаліся ў іх і раней.

[6] Абедзве даты ўзятыя А. Стагановічам з паветра. Насамрэч пра стварэнне Беларускай сялянска-работніцкай грамады ў форме парламенцкай фракцыі (пасольскага клуба) было абвешчана толькі 24 чэрвеня 1925 г., а дзейнасць яна як масавая арганізацыя разгарнула фактычна толькі з сярэдзіны 1926 г., пасля дзяржаўнага перавароту, здзейсненага Ю. Пілсудскім.

[7] Тут Флягонт Валынец, які быў паслом Сейма ўжо наступнага, другога склікання, паблытаны з Паўлам Валошыным.

[8] Стагановіч мае на ўвазе спробу пераходу Праваслаўнай царквы ў Польшчы на выкарыстанне грыгарыянскага календара, якое мясцовыя праваслаўныя іерархі пад ціскам свецкіх уладаў і з благаслаўлення канстанцінопальскага патрыярха паспрабавалі ажыццявіць у 1924 г. Дадзеная рэформа выклікала пратэсты насельніцтва, якое адмаўлялася наведваць храмы, і таму ўрэшце было прынята рашэнне праяўляць у дадзеным пытанні гнуткасць і там, дзе народ адмаўляўся прымаць новы стыль, благаслаўляць адбыццё набажэнстваў паводле юліянскага календара. У выніку большасць праваслаўных цэркваў на Валыні і ў Заходняй Беларусі вярнуліся да старога стылю.

[9] Стагановіч, несумненна, мае рацыю, калі гаворыць пра тое, што пасольскія клубы існуюць толькі падчас тэрмінаў паўнамоцтваў Сейма, а пасля яго роспуску спыняюць існаванне. Тым не менш раскрытыкаваная ім памылка Сяргея Прытыцкага — толькі тэрміналагічная, бо ў асноўным той мае рацыю. Пасольскі клуб «Змаганне» быў патрэбен камуністам не толькі дзеля таго, каб праводзіць працу ў парламен-

це, але перадусім для таго, каб выкарыстоўваць правы і магчымасці, якія даваліся польскім заканадаўствам парламентарыям, для непасрэднай працы з насельніцтвам. Для арганізацыі гэтай працы паслы «Змагання» легальна засноўвалі ў галоўных цэнтрах Заходняй Беларусі свае сакратарыяты, у выніку гэтага паўставала пэўная тэрытарыяльная сетка новай левардыкальнай арганізацыі, якая ўзнікла на месцы ліквідаванай Грамады. Да афіцыйнага афармлення існавання новай арганізацыі справа ніколі не дайшла (польскія ўлады гэтага ў тых умовах і не дапусцілі б), але фактычна такая арганізацыя была і перапыніла сваю дзейнасць толькі пасля датэрміновага роспуску Сейма 30 жніўня 1930 г. і арышту большасці паслоў «Змагання». Падрабязней пра гэта гл.: Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.). Мінск, 2007.

[10] Тут Стагановіч відавочна памыляецца: пасольскі клуб «Змаганне» быў створаны не праз 2 гады і 5 месяцаў, а праз 1 год і 2 месяцы пасля разгрому Грамады (калі пад разгромам Грамады разумець арышт яе лідараў у студзені 1927 г., а не афіцыйную дэлегацыю партыі, якая была аформлена толькі ў сакавіку 1927 г.). Магчыма, за пункт адліку дзейнасці клуба ён прымае ягонае афіцыйнае прыняцце ў траўні 1929 г. назвы «Беларускі сялянска-работніцкі пасольскі клуб», але матывы такога падыходу незразумелыя, бо гэта было звычайнае перайменаванне, якое на дзейнасць паслоў клуба, па сутнасці, ніяк не ўплывала. Самога Стагановіча, дарэчы, у той час у клубе ўжо не было.

[11] Тут Стагановічам ізноў пераблытаныя паслы розных скліканняў: Павел Валошын і Флягонт Валынец.

[12] Гл. каментар 58 да «Успамінаў пасла».

[13] Гл. каментар 161 да «Успамінаў пасла».

[14] **Генрых Гімлер** (*Himmler)* (1900–1945), адзін з галоўных дзеячаў Трэцяга Рэйха ў Германіі, у 1929–1945 гг. рэйхсфюрэр СС.

[15] **Герман Гёрынг** (*Göring)* (1893–1946), адзін з галоўных дзеячаў Трэцяга Рэйха ў Германіі, у 1932–1945 гг. старшыня рэйхстага, у 1935–1945 гг. рэйхсміністр авіяцыі.

[16] **Генрых Ягода** (1891–1938), наркам унутраных спраў СССР у 1934–1936 гг.; **Мікалай Яжоў** (1895–1940), наркам унутраных спраў СССР у 1936–1938 гг.; **Мікіта Хрушчоў** (1894–1971), у 1953–1964 гг. 1-ы са-

кратар ЦК КПСС, фактычны кіраўнік Савецкага Саюза. Цяжка сказаць, чым кіраваўся Стагановіч, паставіўшы Хрушчова ў адзін шэраг з Ягодам і Яжовым, імёны якіх непарыўна асацыююцца з правядзеннем масавых палітычных рэпрэсій у СССР у 1930-я гг. Хоць Хрушчоў, як і любы высокі партыйны функцыянер у сталінскім СССР, таксама браў актыўны ўдзел у правядзенні рэпрэсій, больш лагічным было б змяшчэнне побач з Ягодам і Яжовым прозвішча Лаўрэнція Берыі, які ўзначаліў савецкія карныя органы пасля іх.

[17] Мабыць, маецца на ўвазе вёска **Дольная Рута** цяперашняга Карэліцкага раёна.

[18] У дадзеным выпадку закіды Стагановіча ў дачыненні да камуністаў не маюць пад сабой грунту. На выбарах у польскі Сейм 1928 г. у Беластоцкай выбарчай акрузе (якая ўключала ў сябе Беластоцкі, Сакольскі і Ваўкавыскі паветы) быў выстаўлены спіс № 43 Беларускага незалежнага выбарчага камітэта сялян і рабочых, які быў паводле свайго характару абсалютна ідэнтычны спісу «Змагання за інтарэсы сялян і работнікаў» у Наваградскай акрузе, з якога прайшоў у Сейм сам Стагановіч. На першым месцы ў гэтым спісе быў пастаўлены вядомы беларускі нацыянальны дзеяч Рыгор Шырма. Праўда, дадзенаму спісу не ўдалося здабыць аніводнага пасольскага мандата, бо за яго прагаласавалі толькі 16 487 чалавек (патрэбна было 19 067), але наўрад ці гэта віна толькі камуністаў. Акрамя таго, у дадзенай акрузе быў выстаўлены таксама спіс № 18 Блока нацыянальных меншасцяў, у які сярод іншых уваходзілі і беларускія нацыянальныя партыі, перадусім Беларуская хрысціянская дэмакратыя і Беларускі сялянскі саюз. Праўда, беларускія кандыдаты Браніслаў Туронак і Антон Грыневіч (селянін з вёскі Харужанцы на Ваўкавышчыне) стаялі толькі адпаведна на 2-м і 3-м месцах, а спіс № 18 здабыў толькі адзін мандат, які атрымаў яўрэйскі купец Шыя Гесэль Фарбштэйн. Аднак дадзеная сітуацыя таксама не была вынікам нейкіх падкопаў з боку камуністаў, якія на расстаноўку кандыдатаў на спісах БНМ ніякага ўплыву не мелі. Змяшчэнне на агульным спісе на першым месцы яўрэйскага кандыдата ў дадзеным выпадку было цалкам справядлівым і аргументаваным, бо палову ўсіх галасоў, атрыманых за спіс № 18 на Беласточчыне (9873 з 19 242), аддалі жыхары самога горада Беластока (у асноўным гэта былі, несумненна, яўрэі).

Што тычыцца Піншчыны, то ў ёй сапраўды беларускія спісы выстаўленыя не былі (калі не лічыць спіса БНМ, які асаблівых поспехаў там не дабіўся), але прычынай гэтага была ўсё ж відавочная слабасць беларускага руху на гэтых тэрыторыях, а не нейкія перашкоды з боку камуністаў. Не нашмат у гэтым сэнсе лепшай была і сітуацыя на папярэдніх выбарах 1922 г., дзе беларусы хоць і здабылі на Піншчыне пасольскі мандат, але зрабілі гэта, паводле прызнання Васіля Рагулі, выключна «жыдоўскімі галасамі». За 5 гадоў сітуацыя з развіццём беларускага руху на Піншчыне не надта змянілася: туды амаль не даходзілі ўплывы ні Грамады, ні ТБШ, ні беларускіх партый нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі. У выніку на тэрыторыі Піншчыны куды больш ўплыў мелі ўкраінскія і рускія нацыянальныя арганізацыі, чым беларускія. Але ўскладаць за гэта віну толькі на камуністаў — відавочнае перабольшванне і спрашчэнне сітуацыі.

[19] Камуністычны функцыянер Назар Кандрацюк быў арыштаваны польскімі ўладамі за некалькі дзён да галасавання ў Сейм, таму ён не мог быць выдадзены камуністамі польскай паліцыі нібыта за іхны правал на выбарах у Сенат, якія адбываліся праз 10 дзён пасля яго арышту. Ды і ўвогуле, усе выстаўленыя пры падтрымцы камуністаў на выбарах у Сенат спісы быліануляваныя выбарчымі камісіямі яшчэ да галасавання, таму пра іх «поўную паразу» гаварыць не даводзіцца, Стагановіч тут відавочна нешта блытае.

# ІМЕННЫ ПАКАЗАЛЬНІК


Абрамава (Тэадаровіч) Надзея, грамадска-палітычная дзяячка *115, 211*

Абрамовіч Зоф'я, жонка Антона Луцкевіча *232*

Абрамчык Мікола, грамадска-палітычны дзеяч *8, 125, 180, 215, 219, 220*

Абрантовіч Фабіян, ксёндз *74, 77, 78, 141, 182, 183, 233*

Адамовіч Антон, навуковец, грамадска-палітычны і культурны дзеяч *8, 220, 237*

*Адамушка Уладзімір*, гісторык *50*

*Адзінец Аляксандр*, журналіст і гісторык *8, 192*

Акінчыц Фабіян, грамадска-палітычны дзеяч *93, 139–141, 164, 204, 232, 249*

Альшэўскі Міхаіл *гл. Кандрацюк Назар*

Аляксандр Неўскі, святы *227*

Аляксандраў А., землеўладальнік *241*

Аляхновіч Францішак, пісьменнік *93, 115, 137, 141, 205*

Аляшкевіч Анастас, грамадска-палітычны дзеяч *17, 29, 54, 79–81, 85, 87, 88, 109, 189*

Амэля, сястра А. Станкевіча *242*

Андэрс Уладзіслаў, польскі генерал *187, 199*

Апанас (Мартас Антон), праваслаўны дзеяч *116, 126, 213, 219*

Арсеннева Наталля, паэтэса *219*

Асіпчык (Асіповіч) Аляксандр, грамадска-палітычны дзеяч *91, 92, 144, 171, 202, 219*

Аскерка Аляксандр (Murdelio M.), памешчык *239*

Астроўскі Радаслаў, грамадска-палітычны дзеяч *14, 15, 47, 54–55, 76, 79–81, 90, 92, 93, 115, 117, 118, 137–140, 142, 156, 157, 159, 164, 184, 202–203, 209–211, 213–215, 220, 224, 228–232, 234, 249*

Атацюрк Кемаль, турэцкі палітык *180*

Аўсянік Антон, палітык, пасол Сейма *136, 183, 185, 225, 226, 248*

Аўсяны Павел, селянін, кандыдат у паслы Сейма *17*

Багдановіч Вячаслаў, грамадска-палітычны і культурны дзеяч *33, 137, 184, 185, 202, 227*

Багданчук Аляксандр, камуністычны дзеяч *17, 18, 20*

Балін Станіслаў, палітык, пасол Сейма *76, 186*

Баль Аляксей, селянін, кандыдат у паслы Сейма *17*

Балюк, жаўнер *66*

Баран (Баранаў) Сяргей, палітык, пасол Сейма *136, 183, 184, 225, 226*

Барскі, карэспандэнт ТАСС *84, 134, 144, 171*

Бартуль Францішак, грамадскі дзеяч *121, 217*

Барыс А., рэвалюцыянер *58, 131*

Барысёнак, паплечнік П. Крынчыка *171*

Бахар, селянін, камуністычны дзеяч *175*

Бахар Міхась, грамадскі дзеяч *197*

*Белазаровіч Віктар*, гісторык *46*

Берыя Лаўрэнцій, савецкі дзеяч *253*

Більдзюкевіч Адам, эканаміст і грамадска-палітычны дзеяч *225*

Бокун, польскі ўрадовец *76, 78, 94*

Бортнік Уладзімір, журналіст *125, 126, 219*

Бохар, камуністычны дзеяч *94*

Бохвіч (Бохвіц), старшыня Віленскага апеляцыйнага суда *55, 56, 89*

Брахоцкі, абшарнік *80*

Брылеўская Лангіна, грамадская дзяячка *197*

Бубноўскі, начальнік наваградскай паліцыі *111*

Бужэйка Язэп, аднавясковец А. Стагановіча *100*

Булак-Балаховіч Станіслаў, генерал *216, 221*

Булыга Пётра, рэвалюцыянер *58, 131, 132*

Буляк Мікола, грамадска-палітычны дзеяч *112, 113, 117, 209*

Бурсевіч Максім, грамадска-палітычны дзеяч *17, 93, 139, 140, 204, 249*

Бушэйка, камуністычны дзеяч *174*

Бычкоўскі, танкіст *100*

Бэчковіч Зыгмунт Казімір, наваградскі ваявода *19, 85, 197*

Бяляеў Іван, расійскі генерал *65, 181*

Бярковіч, крамнік *82*

**В**айцюк Якаў, камуністычны дзеяч *16*

Валенцюкевіч Я., начальнік фінаддзела *104*

Валодзя, муж пляменніцы А. Стагановіча *98*

Валошын Павел, палітык, пасол Сейма *10, 80, 91, 137, 139–141, 145, 171, 184, 185, 190, 226, 231, 232, 251, 252*

Валынец Флягонт, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *33, 37, 38, 41, 42, 81–84, 88, 91, 134, 144–146, 158, 170, 195, 201, 202, 236, 251, 252*

Варскі-Варшаўскі Адольф, камуністычны дзеяч, пасол Сейма *16, 80, 134, 171, 191, 197*

Васіль *гл. Тамашчык Уладзімір*

*Ваўпшасаў Станіслаў*, чэкіст *248*

Вашкевіч Андрэй, гісторык *40*

Ваявудскі Сільвестр, польскі палітык, пасол Сейма *76, 136, 232*

Венізелас Элефтэрыас, прэм'ер-міністр Грэцыі *180*

Венядзікт (Бабкоўскі Васіль), праваслаўны дзеяч *116, 213*

Верамей Мікалай, палітык *146, 159, 235, 236*

Вернікоўскі Тодар, паланафільскі дзеяч *229*

Вільгельм II Гогенцолерн, імператар Германіі *63, 180*

Віцьбіч Юрка, пісьменнік і грамадскі дзеяч *219*

Вішнеўскі, савецкі генерал *124*

Вольфмаер, наваградскі гебітскамісар *111, 208*

Выгодскі Якаў, яўрэйскі дзеяч, пасол Сейма *238*

Гадлеўскі Вінцэнт, ксёндз, грамадска-палітычны дзеяч *115, 212*

Галавач Фелікс, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *76, 141, 187, 233*

Галас Міхал, грамадскі дзеяч *245*

Галяк Леанід, грамадска-палітычны дзеяч *92, 196, 197, 203*

*Гаркуш С.*, публіцыст *224*

Гарлуковічыха Ганна, сястра А. Станкевіча *242*

Гарошка Мікола, грамадскі дзеяч *125, 128, 219*

Гарчыца, паліцыянт *52*

Гарэцкі Максім, пісьменнік *192*

Гаўраш Юзік, сусед А. Стагановіча *132*

Гаўрош, камуністычны дзеяч *175*

Гаўрош Канстанцін, камуністычны актывіст, старшыня сельсавета *104, 174, 207*

Гаўрош М., камуністычны актывіст *102*

Гаўрылік Язэп, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *17, 33, 37, 38, 41–43, 45, 47, 50, 80–84, 88, 89, 91, 143–145, 171, 190, 201, 202*

Гёрынг Герман, адзін з лідараў нямецкіх нацыстаў *172, 252*

Гімлер Генрых, адзін з лідараў нямецкіх нацыстаў *172, 252*

Гіндэнбург, Паўль фон, нямецкі фельдмаршал *150*

Гітлер Адольф, лідар нямецкіх нацыстаў *107, 173*

Глафіра, дзяўчынка-семінарыстка *119*

Глоба (Жлоба), старшы унтэрафіцэр *65*

Глоскаў, інжынер, казацкі дзеяч *128*

Гонігвіль, адвакат *85*

Гоцка Клаўдзія, камуністычная актывістка *17*

Грамыка, камуністычны актывіст *174*

Грыневіч Антон, селянін, кандыдат на выбарах у Сейм *253*

Грынеўскі, наваградскі стараста *40, 78*

Грыц Уладзімір, селянін, кандыдат ад камуністаў на выбарах у Сейм *16, 80, 191, 193*

Грышкевіч Вінцэнт *гл. Жук-Грышкевіч Вінцэнт*

Грэцкі Іван, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *33, 34, 36, 39, 43, 45, 48, 81–84, 91, 134, 144, 145, 171, 195, 197, 201, 202, 235*

Гурын (Маразоўскі) Міхал, камуністычны дзеяч *138, 230*

Гутаравіч, уладальнік садоў *100*

Гутовіч, селянін, сведка на судовым працэсе *40*

**Д**., дзеяч ТБШ *44*

Даніловіч Вячаслаў, гісторык *7, 33, 35, 48, 50, 252*

Даражэй, селянін *97, 99*

Даражэй М., сакратар А. Стагановіча *111, 121*

Дарашкевіч П., брыгадзір *104*

Дарашэвіч У., рэвалюцыянер *58, 131*

Дашынскі Ігнацы, польскі палітык *36*

Дварчанін Ігнат, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *17, 19, 21, 23–26, 33, 36, 41, 42, 45, 47, 50, 53, 62, 79, 80, 82, 83, 87–89, 91, 143–145, 153, 179, 189, 201, 202, 232, 235*

Дзю Жувэль (?), генерал *67*

Дзяковіч, жыхар Наваградка *117, 118*

Дзямідаў Мікалай, вайсковы і грамадскі дзеяч *126, 221*

Дзямук-Цішэўскі, жыхар мястэчка Гарадэчна *72*

Дзяржынскі Фелікс, камуністычны дзеяч *173*

Дмоўскі, старшыня Віленскага апеляцыйнага суда *89*

Доўнар-Запольскі Мітрафан, гісторык *237*

Дрозд, камендант паліцыі ў Гарадэчне *52*

Друцкі-Любецкі, князь *84, 150*

Друцкі-Падбярэскі Баляслаў, грамадска-палітычны дзеяч *75, 153, 183*

Дударэвіч Іван, грамадска-палітычны дзеяч *17, 80, 174, 190*

Езавітаў Канстанцін, грамадска-палітычны дзеяч *68, 182, 237*

Ермачэнка Іван грамадска-палітычны дзеяч *115, 210*

Еўфрасіння Полацкая, святая *204, 210, 223*

Жамойцін Янка, дзеяч СБМ *121, 218*

Ждан М., жаўнер *68, 70*

Жук К., старшыня калгаса *104*

Жук-Грышкевіч Вінцэнт, грамадска-палітычны дзеяч *89, 183, 199*

Журко Уладзімір, камуністычны актывіст *52–54, 95, 206, 207*

Заіка-Моніч, камуністычны актывіст *174*

Закгейм Э., яўрэўскі дзеяч *27*

Запароўскі Збігнеў, польскі гісторык *7, 40, 48–51*

Запруднік Янка, навуковец і грамадскі дзеяч *222*

Захарка Васіль, грамадска-палітычны дзеяч *215*

Іваноўскі Вацлаў, грамадска-палітычны дзеяч *115, 134, 150, 212, 224*

Ігнатовіч Міхаіл, грамадскі дзеяч *115, 211*

Ігнатоўскі Усевалад, гісторык *237*

Ігнаценка Ф., лугавод *60, 133, 134*

Кажан Віталь, грамадскі дзеяч *125, 219*

Казлоўскі Уладзіслаў, грамадска-палітычны дзеяч *115, 212*

Каліноўскі Уладзімір, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *183, 184*

Калодка Аляксандр, грамадскі дзеяч *127, 221*

Калубовіч (Каханоўскі) Аўген, грамадскі дзеяч *8, 215*

Камінская, старшая сястра шпіталю *113*

Камінскі Браніслаў, расійскі вайсковы дзеяч *117, 215*

Кандрацюк Назар (Альшэўскі Міхаіл, «Янак»), камуністычны функцыянер *52, 53, 81, 143, 176, 191–193, 254*

Кандыбовіч Сымон, грамадска-палітычны дзеяч *215*

Канстанцін І, кароль Грэцыі *180*

Кантар Фелікс (Файвель) («Макар»), камуністычны функцыянер *18–21, 25, 29, 52, 192*

Канчэўскі Арсень («Уладак»), камуністычны функцыянер *42–44*

*Каранеўскі Я.*, публіцыст *224*

Караткевіч, супрацоўнік шпіталю *113*

Кароль Павел, расійскі дзеяч у Польшчы, пасол Сейма *247*

Карпуцэвіч-Борыс Марыя, жонка А. Стагановіча *192*

Карпуцэвічы-Борысы, сям'я жонкі А. Стагановіча *192*

Карскі Яўхім, лінгвіст *237*

Каруза Павел, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *8, 33, 81–84, 194, 195, 202, 234, 242, 243*

Каспяровіч Мацей, расійскі дзеяч, сенатар *247*

Касяк Іван, грамадскі дзеяч *92, 115, 196, 203, 210, 213, 214, 219*

Касяк Кастусь, грамадскі дзеяч *210*

Касяк Лявон, грамадскі дзеяч *210*

Кахановіч Міхал, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *183, 226, 238, 247, 248*

Каханоўскі Аўген *гл. Калубовіч Аўген*

Кацюбінскі Ю., савецкі дыпламат *37, 39*

Кендыш Васіль, грамадскі дзеяч *212*

Керанскі Аляксандр, расійскі палітык *63, 65, 180*

Кіпель Вітаўт, навуковец і грамадскі дзеяч *222*

Кіпель Зора, навуковец і грамадскі дзеяч *222*

Кіртыкліс Стэфан, польскі ўраДовец *83, 151, 196*

Кірыла Тураўскі, святы *204, 218*

Кіт Барыс, навуковец і грамадскі дзеяч, *90, 200*

Клім, камуністычны дзеяч *25*

Клімовіч Адольф, грамадска-палітычны дзеяч *206*

Клінцэвіч Сямён, камуністычны дзеяч *230*

Комар, пракурор *89*

Коршун, камуністычны дзеяч *174*

Коўш Аляксандр, грамадска-палітычны дзеяч, праваслаўны святар *55, 79, 139, 140, 156, 189*

Крынчык Павел, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *6, 17, 44–46, 80, 88, 89, 91, 144, 145, 171, 190, 201*

Крэмес Станіслаў, аспірант паліцыі *51, 85, 87, 198*

*Крэнь Іван*, гісторык *46*

Крэчэўскі Пётра, палітычны дзеяч *217, 237*

Кузьміч Іван, селянін, кандыдат у паслы Сейма *17*

Куніцкі, камендант наваградскай паліцыі *114*

Кунцэвіч, сакратар воласці *60*

Кушаль, селянін *111*

Кушаль Франц, вайсковы і грамадска-палітычны дзеяч *8, 215*

Лабяк Антоні, паліцыянт *50, 51*

Ладноў Яўген, палітычны дзеяч *68, 182*

Лазарэвіч Я. (І.), камуністычны актывіст *97, 99*

Лапіцкая Лёля, дачка а. Мікалая Лапіцкага *210*

Лапіцкі Мікалай, праваслаўны святар і грамадскі дзеяч *92, 115, 203, 210, 213, 214*

Ластоўскі Вацлаў, грамадска-палітычны дзеяч і навуковец *150, 181, 220, 237*

Лаўрыновіч А. *гл. Малецкі Язэп*

Лахвіцкі Мікалай, расійскі генерал *65, 181*

Ленін Уладзімір, лідар расійскіх бальшавікоў *45, 173, 191*

Лецка Іван, селянін *51*

Ліс, знаёмы А. Стагановіча *110*

Лісоўскі В., рахункавод *104*

Лістапад Юрка, палітычны дзеяч *74, 161, 183*

Лобач-Растоўскі (?), князь *67*

Лойка Аляксандр, селянін, кандыдат у паслы Сейма *17, 80, 191*

Луцкевіч Антон, грамадска-палітычны і культурны дзеяч *15, 55, 68, 79, 134, 139, 140, 150, 156, 157, 159, 163, 164, 182, 203, 223, 224, 229, 231, 232, 237, 240, 250*

Луцкевіч Іван, грамадска-палітычны і культурны дзеяч *134, 150, 223*

Лысяк Павел, украінскі дзеяч *240*

Любаўскі Мацвей, расійскі гісторык *237*

Любіч-Маеўскі Станіслаў, педагог *244*

Люблінскі-Стучынскі Ізраіль, яўрэйскі дзеяч *238*

Любчанскі, камуністычны дзеяч *174*

Лявонаў, танкіст *100*

Маеўскі, студэнт *133, 134*

Маеўскія, сям'я рэвалюцыянераў *60, 61*

Мазалевіч І., стрыечны брат А. Стагановіча *73*

Мазалевіч Ф., служачы *61, 134*

Мазура Барбара, сястра Ю. Мазуры *217*

Мазура Таццяна, сястра Ю. Мазуры *217*

Мазура Юрка, грамадскі дзеяч *120, 121, 216, 217*

Мазуркевіч, дырэктар шпіталю *113*

Майнік, украінскі дзеяч *128*

Макрэцкі Язэп, селянін, пасол Сейма *159, 242*

Малец, камуністычны дзеяч *175*

Малец Аляксандр, камуністычны актывіст *16, 192*

Малец Антон («Стась»), камуністычны функцыянер *46, 51–54, 80, 86, 87, 108, 191, 193, 206, 207*

Малец Іван, камуністычны дзеяч *80, 81, 175, 176, 191, 206*

Малецкі Язэп (Лаўрыновіч А.), грамадска-палітычны дзеяч *138, 141, 212, 215, 224, 228*

Маргуліс Шмуль, камуністычны дзеяч *16*

Маркс Карл, нямецкі філосаф *45, 191*

Маслоўскі, паўстанец 1863 г. *57*

Мерляк Кастусь, грамадскі дзеяч *121, 218*

Місько, паплечнік П. Крынчыка *171*

Міткевіч Яўген, палітычны дзеяч *17, 18, 27*

Міхалеўская Ванда, камуністычная дзяячка *189, 206*

*Міхнюк Уладзімір*, гісторык *38*

Міхоўскі, паліцыянт *52*

Міцкевіч Адам, пісьменнік *153*

Мурашка Юстын, грамадска-палітычны дзеяч *240, 241*

Мурашка Я., аграном *60, 61, 64, 133, 134*

Мурза-Мурзіч Аляксандр, наваградскі суддзя *85–87, 198*

Мэнке Лявон, камуністычны дзеяч *42*

Мятла Пятро, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *10, 17, 80, 93, 136, 137, 139–141, 170, 184, 185, 190, 204, 226, 231, 249*

***Навіцкі Уладзімір***, гісторык *46*

Навуменка Вячаслаў, казацкі атаман *116, 214*

Надзь Імрэ, венгерскі палітык *164, 250*

Назарэўскі Аляксей, грамадска-палітычны дзеяч, сенатар *137, 184, 185, 227*

Найдзюк Язэп, грамадскі дзеяч *149, 150, 159, 237*

Негнявіцкі А. *гл. Орса Аляксандр*

Нікіпяровіч Аляксандр, селянін *51*

Нікіпяровіч Сцяпан, селянін *51*

Віхаёнак, селянін *90*

Новак Яраслаў, швагер Я. Станкевіча *241*

Норык Мадэст, грамадскі дзеяч *120, 121, 216*

**О**рса Аляксандр (Негнявіцкі А.), настаўнік і грамадскі дзеяч *112, 125, 126, 130, 189, 208*

О'Рурк, графіня *72*

**П**адоскі Багдан, польскі палітык, пасол Сейма *36*

Пазняк Ян, грамадска-палітычны дзеяч *206*

Палікарп, украінскі праваслаўны мітрапаліт *127*

Панцеляймон (Ражноўскі Павел), праваслаўны дзеяч *116, 126, 212, 219*

Панько, наваградскі староста *111, 112*

Панькоў Мікола, грамадскі дзеяч *196*

Парэмскі Уладзімір, расійскі дзеяч *117, 215*

Паўлаў Сяргей, казацкі атаман *116, 214*

Паўлік, турэмны службовец *85*

Паўлюць, суддзя *87*

Паўлюкевіч Арсень, паланафільскі дзеяч *27, 29, 229, 240*

*Пашкевіч Аляксандр (Алесь)*, гісторык *5, 11, 14, 46, 56, 228, 231, 232*

Петэн Анры Філіп, французскі генерал і палітык *164, 249*

Пілсудскі Юзаф, польскі палітык *9, 49, 56, 136, 145, 170, 185, 188, 191, 199, 200, 240, 251*

Пічэта Уладзімір, гісторык *237*

Пляскач Васіль, грамадскі дзеяч *110, 208*

Прайснер, граф *122*

Пронька-сын, камуністычны дзеяч *174*

Прытыцкі Сяргей, камуністычны дзеяч *8, 167–176, 250, 251*

Пушкарскі, селянін *90*

Пушкін Аляксандр, расійскі паэт *227*

Пянткоўскі, абшарнік *75*

Пятровіч Майсей, сведка на судовым працэсе *52*

Пятроўскі, сведка на судовым працэсе *85*

**Р**авенскі Мікола, кампазітар *222*

Рагуля Барыс, вайсковы і палітычны дзеяч *116, 119, 121, 209, 212, 215, 216, 239*

Рагуля Васіль, грамадска-палітычны дзеяч *8, 18, 19, 27, 28, 30–33, 34, 40, 55, 56, 58, 75, 76, 78–81, 86, 90, 91, 109, 117, 121, 132, 136, 137, 142, 143, 147–149, 151–159, 161–163, 165, 166, 175, 178, 183–184, 189, 202, 212, 215, 217, 222, 224, 225, 228, 231, 238–240, 243, 247–249, 254*

Рагуля Міхась, сын В. Рагулі *121, 217*

Радчэнка, жаўнер-украінец *66*

Ражанскі Гірш, рэвалюцыянер *58, 131, 132*

*Ракашэвіч Уладзіслаў*, гісторык *38*

Рак-Міхайлоўскі Сымон, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *10, 11, 80, 93, 136, 137, 139, 140, 153, 164, 170, 183, 185, 190, 204, 226, 232, 249*

Раманавы, расійская імператарская дынастыя *150*

Раманюк Іван, грамадскі актывіст *54, 87, 88, 174, 198*

Родзька Усевалад, вайсковы і палітычны дзеяч *121, 217*

Родзька Філарэт, вайсковы і грамадскі дзеяч *120, 121, 209, 216*

Русак Аляксандр, грамадска-палітычны дзеяч *115, 211*

Русак Ганна, жонка У. Русака *216*

Русак Уладзімір, васйковы і грамадскі дзеяч *120, 121, 216*

Рыдз-Сміглы Эдвард, польскі маршал *179*

Рыжы-Рыскі Уладзіслаў, каталіцкі святар, грамадскі дзеяч *92, 204*

Сабалеўскі Юры, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *5, 90, 121, 122, 137, 139, 170, 184, 196, 200, 226, 231, 232*

Сабачынскі, украінскі дзеяч *128*

Сабегнанскі, польскі ўрадовец *78*

Савёнак Лявон, грамадскі дзеяч *196*

Савонь Канстанцін, селянін *17, 23, 24*

Сажыч Язэп, грамадска-палітычны дзеяч *121, 216, 217*

Саковіч Юльян, грамадска-палітычны дзеяч *88, 199*

Салавей Уладзімір, каталіцкі святар *129, 222*

Салавей Язэп, грамадскі дзеяч, рэдактар *181*

Самарын (Сакалоў) Уладзімір, расійскі дзеяч *117, 215*

Сандэцкі Аляксандр, расійскі генерал *149, 236*

Сарайль, французскі генерал *67*

Сафія, каралева Грэцыі *180*

Сахацкі Ежы, польскі камуністычны дзеяч *80, 134, 191*

Светлік Аляксандр, сведка на судовым працэсе *52, 85*

Свірыд Павел, адвакат *85, 110, 197*

Сенажэцкі, сябра сельскагаспадарчага таварыства *40*

Серафімовіч, наваградскі віцэваявода *76, 138*

Сечка, сябра земляробчага гуртка *78*

Сідар, камуністычны функцыянер *26*

Сіняк Сяргей *гл. Хмара Сяргей*

Сіняўскі Мікалай, грамадскі дзеяч, рэдактар *138, 230*

Скарына Францішак (Пранціш), беларускі першадрукар *105, 150, 151, 196, 237*

Скарыніч Браніслаў *гл. Станкевіч Янка*

Скрабец Пятро, дырэктар Наваградскай беларускай гімназіі *82, 195*

Славай-Складкоўскі Феліцыян, польскі палітык *12*

Смяроўскі Яўген, адвакат *85, 89, 197*

Сокал-Кутылоўскі Антон, грамадскі дзеяч *80, 192*

Святліцкі Язэп, селянін *241*

Стагановіч Аляксандр (Шура), сын А. Стагановіча *104, 122, 124, 125, 192, 207, 218*

Стагановіч Леў (Лёва), сын А. Стагановіча *101, 109, 118, 119, 122, 123, 192, 207*

Стагановіч Лявон, бацька А. Стагановіча *57*

Стагановіч Паўліна, з дому Родзька, маці А. Стагановіча *57*

Стагановіч Тамара, дачка А. Стагановіча *8, 118, 192, 216*

Стагановіч Юры (Юрка), сын А. Стагановіча *118, 192*

Сталін Іосіф, камуністычны дзеяч *25, 97, 107, 108, 173*

Станкевіч Адам, ксёндз, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *42, 78, 137, 158, 184, 185, 188, 205, 206, 237, 242*

Станкевіч Станіслаў, навуковец, грамадска-палітычны і культурны дзеяч *8, 84, 196, 212, 215*

Станкевіч Янка (Скарыніч Packlaў), грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма, навуковец *14, 33, 34, 38, 41, 55, 79, 83, 84, 92, 115, 126, 127, 129, 142, 144, 146–166, 189, 195–197, 202, 204, 220, 222, 224, 234–237, 240, 242–247, 250*

Стаповіч Альбін, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *33, 81–84, 194, 202, 234, 242, 243*

Стасевіч, камуністычны дзеяч *175*

Сулак, паліцыянт *52*

Сцяпан (Сеўба Сямён), праваслаўны дзеяч *116, 213*

Сцяпанаў Мікалай, грамадскі дзеяч *184*

Сэмпалоўская Стэфанія, польская грамадская дзяячка *92, 203*

Сярэбранікаў Мікалай, расійскі дзеяч, пасол Сейма *247*

Талочка Уладзіслаў, ксёндз *150*

Тамашчык Уладзімір (Васіль), царкоўны і грамадскі дзеяч, япіскап БАПЦ *126–130, 220*

Тарашкевіч Браніслаў, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *10, 17, 22, 80, 92, 93, 136, 137, 139–142, 154, 170, 184, 185, 190, 204, 226, 231, 235, 249*

Тарбацавічанка, пападзячанка *112*

Таўлай Валянцін, паэт *11*

Трэпка (Неканда-Трэпка) Антон, інжынер і грамадскі дзеяч *76, 138, 228*

Тулейка Міхась, адвакат і грамадскі дзеяч *128, 221*

Турок, камуністычны дзеяч *174*

Туронак Браніслаў, лекар і грамадска-палітычны дзеяч *253*

Туронак Юры, гісторык *224*

**У**ласаў Аляксандр, грамадска-палітычны дзеяч, сенатар *14, 15, 134, 136, 137, 184, 185, 223–225*

Уласаў Андрэй, расійскі генерал *215*

Урангель Пётр, расійскі генерал *210*

Урублеўскі Тадэвуш, адвакат і грамадска-палітычны дзеяч *227*

Ушынскі Канстанцін, расійскі педагог *223*

***Ф**алей Яўгенія*, гісторык *38*

Фарбштэйн Шыя Гесэль, яўрэйскі дзеяч *253*

Фідэркевіч Адольф, польскі палітык, пасол Сейма *76, 187*

Філафей (Нарко Уладзімір), праваслаўны дзеяч *116, 126, 213, 219*

Фурса, камуністычны дзеяч *174*

**Х**адэцкі, наваградскі пракурор *53*

Хамінскі Людвік, польскі палітык, пасол Сейма *76, 93, 141, 186, 232*

Ханяўка Часлаў, грамадска-палітычны дзеяч *90, 200*

Хмара (Сіняк, Зіняк) Сяргей, палітык і грамадскі дзеяч *88, 91, 92, 100, 144, 171, 174, 199, 248*

Храптовіч-Бутэнёў, граф *107*

Хрушчоў Мікіта, камуністычны дзеяч *173, 252, 253*

**Ц**ар Станіслаў, польскі палітык *36, 89, 199*

Цвірка-Гадыцкі, сведка на судовым працэсе *51, 85, 198*

Цыбуля, бухгалтар *113*

Цыдзілін, вайсковец *72*

**Ч**абатарэвіч Віктар, грамадскі дзеяч *196*

Чарноцкі (Чарнецкі) *гл. Макрэцкі Язэп*

*Чарнякевіч Андрэй*, гісторык *7*

Чатырка Антон, айчым Я. Станкевіча *241*

Чатырка Міхал, грамадска-палітычны дзеяч *18–20, 40, 77, 79–81, 109, 142, 188, 194, 234*

Чывіджыеў, жаўнер-азербайджанец *66*

**Ш**акун Уладзімір, палітык, пасол Сейма *76, 186*

Шапель Антон, палітык, пасол Сейма *76, 186, 187*

Шаптыцкі Андрэй, грэка-каталіцкі мітрапаліт *74, 141, 183*

*Шарапа Аляксандр*, гісторык *38*

Шарэйка, следчы *87*

Шкялёнак Мікалай, гісторык і грамадска-палітычны дзеяч *237*

Шырма Рыгор, грамадскі дзеяч *253*

Шчорс Барыс, грамадска-палітычны дзеяч *211*

Шчорс Ігар, грамадскі дзеяч *211*

Шчорс Мікола, грамадска-палітычны дзеяч *84, 91, 92, 115, 127, 196, 197, 211, 214, 219*

Шчэрба Ян, пасол Сейма *159, 232*

Шчэрбакоў Васіль, гісторык *237*

Шыбут Хведар, грамадскі дзеяч *219*

Шыла Мікола, грамадска-палітычны дзеяч *184*

Энгельс Фрыдрых, нямецкі філасаф *45, 191*

**Ю**дзеніч Мікалай, расійскі генерал *68, 182*

Юрэвіч Лявон, даследчык беларускай эміграцыі *8*

Юхневіч Канстанцін, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *33, 81, 82, 194, 202, 234, 243*

Юшко М., селянін *90*

**Я**года Генрых, савецкі дзеяч *173, 252, 253*

Яжоў Мікалай, савецкі дзеяч *173, 252, 253*

Якавюк Сымон, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *136, 184, 225, 226*

Якімовіч Мікалай, грамадска-палітычны дзеяч *226*

Якуцэвіч Павел, грамадска-палітычны дзеяч *113, 118–120, 209*

Янкоўскі Ян, сведка *52, 85, 86*

Ярушэвіч (Ярашэвіч) Ян, вайсковы дзеяч *153, 238*

Ярэміч Фабіян, грамадска-палітычны дзеяч, пасол Сейма *33, 55, 56, 82, 84, 144, 159, 165, 184, 185, 202, 239, 240, 243, 244*

Ясюк Эмануіл, грамадскі дзеяч *115, 210*

Яцкевіч, камуністычны дзеяч *174*

*Зелинский Петр*, гісторык *6*

*Ковальский Юзеф*, камуністычны дзеяч *37*

*Мацко Александр*, гісторык *6*

*Орехво Николай*, камуністычны функцыянер і гісторык *28, 37, 46, 189*

*Полуян Владимир*, гісторык *6*

*Полуян Иван*, гісторык *6*

*Ракевич Николай*, гісторык *6*

*Розеншейн Давид*, камуністычны дзеяч *28*

*Самутин В.*, гісторык *6*

*Сташкевич Николай*, гісторык *28, 37, 46, 189*

*Ajnenkiel Andrzej*, польскі гісторык *28*

*Andrejuk Nestor*, абвінавачаны на судовым працэсе *40*

*B.*, публіцыст газеты «Biełaruskaja Krynica» *11*

*Bergman Aleksandra*, польскі гісторык *6, 15*

*Curie-Składowska Maria*, польскі фізік *49*

*Czubiński Antoni*, польскі гісторык *12*

*Duracz Teodor*, польскі адвакат *40*

*Mogilnicki Aleksander*, польскі юрыст *54*

Murdelio M. гл. Аскерка Аляксандр

*Rappaport Emil Stanisław*, польскі юрыст *54*

*Rzepecki Karol*, польскі выдавец *7, 30, 31*

*Rzepecki Tadeusz*, польскі выдавец *7, 30, 31*

*Śleszyński Wojciech*, польскі гісторык *248*

# Змест

*А. Пашкевіч.* Адзін год жыцця Аляксандра Стагановіча (Партрэт на фоне эпохі) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

Успаміны пасла . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57

Шэсцьдзесят год таму. У адзначэнне нашаніўскага года . . . . . . . . . . 131

Праўда аб Грамадзе і «Змаганні» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135

Якою меркаю мераеш, такою табе адмераюць! . . . . . . . . . . . . . . . 147

У абарону «Успамінаў» В. Рагулі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 152

Мой адказ Я. Станкевічу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 161

Адказ С. Прытыцкаму . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167

Каментары . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 178

Іменны паказальнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 255

Літаратурна-мастацкае выданне

**Стагановіч** Аляксандр Лявонавіч

**УСПАМІНЫ ПАСЛА**

Падрыхтоўка да друку *Л. Юрэвіч, А. Пашкевіч*

Адказны рэдактар *Н. Гардзіенка*

Адказны за выпуск *М. Шыбко*

Вёрстка *В. Нога*

Карэктар *М. Шавыркіна*

Падпісана ў друк 23.02.2011. Фармат 70×100 1/32. Папера афсетная.
Афсетны друк. Ум. друк. арк. 11,4. Ул.-выд. арк. 14,1. Наклад 300 асобн. Заказ 1870.

Выдавецтва ТАА «Лімарыус». ЛВ № 02330/0494401 ад 16.03.2009.
Вул. Стралковая, 14, 220030, г. Мінск.

Надрукавана ў друкарні ТДА «НоваПрынт».
ЛП № 02330/0552786 ад 25.02.2009. Вул. Геалагічная, 59, к. 4, п. 10. Мінск, 220138.

**Стагановіч, А. Л.**

С 76 Успаміны пасла / Аляксандр Стагановіч; прадм. А. В. Пашкевіча; камент. А. В. Пашкевіча, А. Э. Гардзіенкі. — Мінск: Лімарыус, 2011. — 270 с.: іл. — (Беларуская мемуарная бібліятэка)

ISBN 978-985-6968-14-6.

Гэтай кнігай пачынае жыццё новая серыя, якая не мае аналагаў у нашай краіне: «Беларуская мемуарная бібліятэка». Тут будуць сабраныя ўспаміны, дзённікі, эпісталярыі, пакінутыя беларусамі або выхадцамі з беларускіх земляў пра падзеі, што адбываліся ў Беларусі, у блізкім і далёкім замежжы цягам апошніх стагоддзяў.

Часам зусім невядомыя, часам нанова адкаментаваныя, выдадзеныя ў серыі мемуарныя тэксты будуць прыдатныя і для гісторыка, і для аматара прыгожага пісьменства.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.3(4Беи)**



ISBN 978-985-6968-14-6

9 789856 968146

Беларуская
мемуарная
бібліятэка

Аляксандр
Стагановіч

# Успаміны пасла